БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

# ФАЛЬКЛОРНАЯ ПРАКТЫКА:

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ І ПРАГРАМА-АПЫТАЛЬНІК

*Рэкамендавана
Вучэбна-метадычным аб'яднаннем
па гуманітарнай адукацыі
ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка
для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі,
якія навучаюцца па спецыяльнасцях
1-21 05 01 «Беларуская філалогія (па напрамках)»,
1-21 05 02 «Руская філалогія (па напрамках)»*

МІНСК
БДУ
2021

УДК 398:378.147(076)
ББК 82р30
Ф19

*3-е выданне, дапрацаванае і дапоўненае*

Аўтары:
**Р. М. Кавалёва, В. В. Прыемка, Т. А. Марозава,
Т. В. Лук'янава, В. І. Палукошка**

Рэцэнзенты:
кафедра рускай і сусветнай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны (загадчык кафедры кандыдат філалагічных навук *І. М. Афанасьеў*);
кандыдат філалагічных навук *А. Г. Алфёрава*

**Фальклорная** практыка: метадычныя рэкамендацыі і праграма-
Ф19 апытальнік : вучэб.-метад. дапам. / Р. М. Кавалёва [і інш.]. — 3-е выд., дапрац. і дап. — Мінск : БДУ, 2021. — 199 с.
ISBN 978-985-881-091-7.

Прадстаўлены метады збірання фальклорных матэрыялаў, патрабаванні да іх запісу і правілы афармлення твораў для захавання ў архівах. Студэнтам прапануецца праграма-апытальнік, мэта якой — вызначыць кірунак работы практыкантаў па збіранні фальклору, аблягчыць працэс зносін з выканаўцамі і зафіксаваць асаблівасці функцыянавання фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу ў розных рэгіёнах.

Для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасцях 1-21 05 01 «Беларуская філалогія (па напрамках)», 1-21 05 02 «Руская філалогія (па напрамках)».

**УДК 398:378.147(076)**
**ББК 82р30**

**ISBN 978-985-881-091-7**

© Кавалёва Р. М., Прыемка В. В., Марозава Т. А., 2008
© БДУ, 2021

# СЛОВА ДА ПРАКТЫКАНТАЎ

Збор фальклору — пачэсная праца, працяг традыцый славутых збіральнікаў і даследчыкаў фальклору — З. Даленгі-Хадакоўскага, І. Насовіча, П. Шэйна, Е. Раманава, М. Федароўскага, Д. Булгакоўскага, У. Дабравольскага, Р. Шырмы, Г. Цітовіча і інш. Яны з вялікай цікавасцю і павагай ставіліся да беларускіх сялян, носьбітаў адметнага каларытнага слова, якія ва ўсёй чысціні і прыгажосці захавалі гэты каштоўны скарб.

Памятайце, што ацэнку вашай працы дае не выкладчык, а ўдзячныя сучаснікі і нашчадкі. З вашых запісаў яны даведаюцца пра духоўныя скарбы беларускага народа. Ваша справаздача знойдзе сваё пастаяннае месца ў фальклорным архіве Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гэта патрабуе ад практыкантаў асаблівай сумленнасці і стараннасці: вы адказваеце сваім добрым імем за кожнае слова, якое пры вашай дапамозе можа ўвайсці ў навуковы ўжытак. Дакладныя запісы будуць спрыяць умацаванню аўтарытэту фальклорнага архіва БДУ.

Вы будзеце працаваць самастойна. Побач не будзе кіраўніка, але нашы парады і апытальнік дапамогуць вам найлепшым чынам зрабіць пачэсную справу — сабраць і сістэматызаваць творы беларускага (рускага, украінскага, польскага) фальклору.

З апытальнікам вы здолееце збіраць фальклор усюды — у вёсцы і ў горадзе, у мястэчку і на хутары, у цягніках і дамах адпачынку, у Беларусі і па-за яе межамі. У наш час гэта стала значна прасцей і ў тэхнічным плане, калі пад рукой ёсць смартфон з функцыямі аўдыя- і відэазапісу.

На месцы правядзення практыкі звярніцеся да мясцовых улад, настаўнікаў, работнікаў культурных устаноў. Праз іх паспрабуйце высветліць, хто ў вёсцы ці ў горадзе вядомы як добры спявак, казачнік, наогул мудры, дасведчаны чалавек. Скарыстайце таксама дапамогу вашых родзічаў, сяброў, знаёмых, удакладніце месца, дзе можна паспяхова зрабіць запіс фальклорных матэрыялаў.

Памятайце: ва ўсіх абставінах вельмі важна карыстацца паслугамі аўтарытэтных людзей, паважаных дарадчыкаў. З імі лягчэй працаваць. Мы ўпэўнены, што яны шчыра сустрэнуць вас і адчуюць ваш клопат. Жадаем поспехаў!

Над дапаможнікам працавалі: Р. М. Кавалёва («Слова да практыкантаў», «Фальклорная проза», «Дыскурсіўная няказкавая проза», «Фальклорная казкавая проза», «Карагодныя песні», «Баладныя песні (балады)», «Духоў-

ныя вершы, канты і псальмы», Т. В. Лук’янава («Наратыўная няказкавая проза»), В. В. Прыемка («Малыя жанры беларускага фальклору», «Замовы», «Сямейна-абрадавыя песні», «Дзіцячы фальклор»), Т. А. Марозава («Крытэрыі ацэнкі справаздачы студэнта па фальклорнай практыцы», «Парады па афармленні фальклорных матэрыялаў», «Патрабаванні да запісу фальклорных матэрыялаў», «Каляндарна-абрадавыя песні», «Пазаабрадавая лірыка», «Жорсткі раманс», «Народна-драматычнае мастацтва»), В. І. Палукошка («Сучасны фальклор: гарадскі і вясковы», «Шматнацыянальны фальклор Беларусі»).

У трэцім выданні (першае выйшла ў 2008 г., другое — у 2009 г. у электронным выглядзе) пашырыўся склад аўтараў, змянілася структура матэрыялу і падыходы да класіфікацыі. Як і раней, вучэбна-метадычны дапаможнік змяшчае падрабязныя рэкамендацыі па збіранні фальклору, праграму-апытальнік, правілы запісу і афармлення твораў. У дапоўнены варыянт кнігі ўключаны новы раздзел «Шматнацыянальны фальклор Беларусі».

# КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ СПРАВАЗДАЧЫ СТУДЭНТА ПА ФАЛЬКЛОРНАЙ ПРАКТЫЦЫ

## Склад справаздачы

По заканчэнні фальклорнай практыкі студэнт-першакурснік павінен прадставіць кіраўніку сабраныя і сістэматызаваныя фальклорныя матэрыялы, зафіксаваныя на флэш-накапляльніку (флэшцы). Дадзены электронны носьбіт павінен захоўвацца ў папяровым канверце з падпісанай вокладкай і аркушам паперы ўнутры канверта, на якім пазначаны змест таго, што запісана на флэшцы.

*Узор афармлення вокладкі канверта*

Матэрыялы фальклорнай практыкі

**Мацюк Бажэна Юр'еўна**

Месцы запісаў: г. Вілейка Мінскай вобл.;
в. Давыдкі Вілейскага раёна Мінскай вобл.;
в. Касцяневічы Вілейскага раёна Мінскай вобл.;
в. Ілья Вілейскага раёна Мінскай вобл.

**Кіраўнік**: Іванова І. У.

Змест дыска: дзённік, рэестравая ведамасць уліку матэрыялаў, жанравыя карткі, 49 аўдыязапісаў, 5 відэазапісаў, 7 фотаздымкаў

**2021**

Студэнтам аднаго кіраўніка дазваляецца запісваць свае справаздачы на адной флэшцы. У такім выпадку кожны студэнт захоўвае свае справаздачныя матэрыялы ў электроннай папцы са сваім прозвішчам. Змест кожны рыхтуе і раздрукоўвае свой. Агульнай будзе толькі вокладка, дзе інфармацыя пра збіральніка і месца запісу падаецца спісам.

Акрамя **канверта з флэш-накапляльнікам**, студэнт абавязкова здае:

1) раздрукаваныя **Рэестравыя ведамасці ўліку матэрыялаў;**

2) раздрукаваны і падпісаны практыкантам **Дазвол** на перадачу матэрыялаў у фонд вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ для іх далейшай апрацоўкі і выкарыстання (абавязкова з подпісам студэнта).

*Узор дазволу*

> ДАЗВОЛ
>
> Я, [прозвішча, імя, імя па бацьку], даю згоду на перадачу сваіх справаздачных матэрыялаў па фальклорнай практыцы ў фонд вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ для іх наступнай апрацоўкі і выкарыстання.
>
> Дата                                   Подпіс

**Крытэрыі выстаўлення адзнак**

Сярэдняя адзнака — **6** балаў — выстаўляецца за выкананне справаздачнага мінімуму: запіс 50 адзінак фальклорнай прозы, змешчаных у дзённіку і на жанравых картках, дзённік фальклорнай практыкі, аўдыя- і відэазапісы. Пры наяўнасці адзначанага мінімуму справаздача прымаецца да праверкі. **У адваротным выпадку практыка лічыцца неадпрацаванай і адзнака не выстаўляецца.**

Студэнт можа павысіць адзнаку за кошт выканання наступных умоў:

- + 1 бал — наяўнасць матэрыялаў па адной з тэм праграмы-апытальніка (гэтая тэма агучваецца перад фальклорнай практыкай);
- + 1 бал — высокая якасць запісаў, правільнае вызначэнне жанраў;
- + 1 бал — з густам аформленая справаздача;
- + 1 бал — перавышэнне мінімуму на 50 %;
- + 1 бал — за лепшы навуковы даклад, агучаны на форуме «Фальклор, час і мы».

На зніжэнне адзнакі ўплываюць наступныя крытэрыі:

- – 1 бал — нясвоечасовая здача матэрыялаў практыкі;
- – 1 бал — памылкі пры вызначэнні фальклорных відаў і жанраў;
- – 1 бал — нізкая якасць запісаў;
- – 1 бал — нізкая якасць афармлення справаздачы і жанравых картак.

Практыка **не залічваецца**, калі кіраўнік выявіць хоць адзін факт фальсіфікацыі матэрыялаў (перапісвання з анталогій і зборнікаў фальклорных матэрыялаў, капіравання чужых аўдыя- і відэаматэрыялаў і г. д.).

# ПАРАДЫ ПА АФАРМЛЕННІ ФАЛЬКЛОРНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

Справаздачу па фальклорнай практыцы студэнт рыхтуе ў электроннай форме. Частка дакументаў прадстаўляецца ў раздрукаваным і электронным варыянтах (вокладка канверта і змест справаздачы, дазвол і рэестравая ведамасць). ***Прадстаўленне запісаных матэрыялаў з'яўляецца абавязковым.*** Іх адсутнасць не дапускаецца. Пры фіксацыі пісьмовых форм фальклору прадстаўляюцца адпаведныя фотаздымкі ці скан-копіі.

**Агульныя правілы афармлення электронных носьбітаў**

На электронным носьбіце (флэш-накапляльнік) размяшчаюцца тэкставыя файлы, аўдыя, відэа, фота, прыдатныя для прачытання на іншым камп'ютары. У суправаджальным файле трэба пазначыць, з дапамогай якіх праграм адкрываецца той ці іншы запісаны ім файл. Калі выкарыстоўваецца адмысловая кадзіроўка, на флэшцы змяшчаецца праграма, з дапамогай якой файл можна адкрыць і прагледзець.

Кожны з файлаў (акрамя тэкставых) павінен мець каментарый. Для фотаздымкаў і відэазапісаў пазначаецца, што ці хто зняты, па якой прычыне збіральнік уключыў гэтыя матэрыялы ў справаздачу па фальклорнай практыцы.

Справаздача на электронным носьбіце падаецца ў поўным аб'ёме з усімі неабходнымі файламі.

***Абавязкова робіцца вокладка на канверт для флэшкі.***

**Увага!**
Лічбавыя носьбіты павінны быць у добрым стане.

Пры афармленні электроннай дакументацыі па фальклорнай практыцы неабходна прытрымлівацца наступнага фармату:

- тып файла — rtf;
- інтэрвал адзінарны;
- шрыфт — Times New Roman, 14 кегль;
- палі: верхняе і ніжняе — 2 см, левае — 3 см, правае — 1,5 см;
- абзацны водступ (чырвоны радок) — 1,25 см, водступы злева і справа — 0 см; інтэрвалы «перад» і «пасля» — 0 пт.

**Змест справаздачы**

1. Тытульная старонка. Афармляецца асобным файлам у адпаведнасці з патрабаваннямі.

*Узор афармлення тытульнай старонкі*

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Філалагічны факультэт

Кафедра тэарэтычнага
і славянскага літаратуразнаўства
Вучэбна-навуковая лабараторыя
беларускага фальклору

ФАЛЬКЛОРНАЯ ПРАКТЫКА
студэнткі І курса спецыяльнасці «Беларуская філалогія»
Мацюк Бажэны Юр’еўны

Месцы запісаў: г. Вілейка Мінскай вобл.;
в. Давыдкі Вілейскага раёна Мінскай вобл.;
в. Касцяневічы Вілейскага раёна Мінскай вобл.;
в. Ілья Вілейскага раёна Мінскай вобл.
Колькасць адзінак: 76
Час: 14 дзён (з 28 ліпеня па 10 жніўня 2021 г.).

Кіраўнік: Іванова І. У.

МІНСК 2021

2. Змест фальклорных твораў па жанрах. Афармляецца асобным файлам. Параметры старонкі не мяняюцца.

*Узор афармлення зместу твораў*

Рытуальна-магічная сфера.
Каляндарна-абрадавая паэзія — 28 адзінак, з іх:
- вяснянак — 18;
- жніўных дажынкавых — 7;
- восеньскіх канапляных — 3.

Сучасны гарадскі фальклор — 22 адзінкі, у яго складзе:
- гарадскі раманс — 10;
- садысцкія вершыкі — 12.

Усяго — 50 адзінак.

3. Дзённік фальклорных назіранняў. У дзённіку падаюцца ўсе абставіны запісаў, інфармацыя пра выканаўцаў (прозвішча, імя, імя па бацьку, год і месца нараджэння, адукацыя, біяграфічныя звесткі, якімі інфарманты маглі падзяліцца з практыкантам ці якія вядомы збіральніку, апісанне знешнасці, манеры выканання), заўвагі да запісаных твораў, фотаздымкі інфармантаў і пэўных артэфактаў (вышываныя і тканыя вырабы, выцінанкі, пляценне, рукапісныя песеннікі і зборнікі замоў, дэмбельскія альбомы, армейскія блакноты, графіці і пад.). Можна змяшчаць кароткія гістарычныя і этнаграфічныя звесткі пра населены пункт, дзе запісваецца фальклор.

Запісы ў дзённіку афармляюцца падзённа. Дата (дзень і месяц) пішацца злева. Асноўны тэкст афармляецца з новага радка.

*Узор афармлення дзённіка па днях з улікам абставін пошуку інфармантаў*

«2 жніўня

Калі прачнулася раніцай, да мяне прыйшло проста геніяльнае рашэнне маіх “бедаў” з практыкай. І як я магла забыць, што сярод маіх знаёмых ёсць чалавек, які непасрэдна звязаны з фальклорам і які не адмовіць аказаць мне дапамогу ў такой нялёгкай справе?

Гэты чалавек — Дзік Наталля Валер’еўна, хормайстар нашага мясцовага СДК. Лёс звязаў мяне з ёй яшчэ ў дзяцінстве, калі Наталля Валер’еўна запрасіла мяне, тады дзяўчынку 5 гадоў, у свой гурт “Ліхтарыкі”, дзе я, разам з такімі ж дзяўчынкамі і хлопчыкамі, упершыню заспявала. А спявалі мы тады не што іншае, як фальклорныя песні. Адсюль і пачалася мая любоў да роднага слова.

Адправілася я ў Дом культуры той жа раніцай. Наталля Валер’еўна сустрэла мяне добрай усмешкай, і толькі праз хвілін дзесяць нашага дыялогу мы дайшлі да сутнасці нанесенага мной візіту.

— Фальклорная практыка… Зараз нешта змайструем!

Крыху падумаўшы, Наталля Валер’еўна ўспомніла, дзе сама калісьці збірала мясцовы фальклор, і, запланаваўшы маршрут на наступны дзень, мы развіталіся. Праца ішла як мокрае гарыць, але план быў намечаны і ад таго мне нават спалася больш спакойна.

Як мокрае гарыць.

Заўвага: малыя жанры беларускага фальклору — прымаўка».

[З дзённікавых запісаў студэнткі 1 курса спецыяльнасці «Беларуская філалогія» БАРАВОЙ Алесі, год запісу 2020 г.].

*Узор афармлення вокладкі дзённіка*

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Філалагічны факультэт

Кафедра тэарэтычнага
і славянскага літаратуразнаўства
Вучэбна-навуковая лабараторыя
беларускага фальклору

ФАЛЬКЛОРНЫ ДЗЁННІК
студэнткі I курса спецыяльнасці «Беларуская філалогія»
Мацюк Бажэны Юр'еўны

Месцы запісаў: г. Вілейка Мінскай вобл.;
в. Давыдкі Вілейскага раёна Мінскай вобл.;
в. Касцяневічы Вілейскага раёна Мінскай вобл.;
в. Ілья Вілейскага раёна Мінскай вобл.
Колькасць адзінак: 76
Час: 14 дзён (з 28 ліпеня па 10 жніўня 2021 г.).

Кіраўнік: Іванова І. У.

МІНСК 2021

Пасля першай старонкі з вокладкай неабходна выканаць устаўку разрыву старонкі і пачаць асноўную частку свайго дзённіка з новай старонкі.

**Увага!**
Функцыя «Разрыў старонкі» пры афармленні дзённіка выкарыстоўваецца толькі пасля тытульнай старонкі, перад зместам дзённіка і старонкі з карткамі інфармантаў.

***Забараняецца***: выкарыстоўваць розныя шрыфты і кеглі; рабіць падкрэсліванні, вылучэнні тлустым і курсівам; выкарыстоўваць аўтаматычную нумарацыю твораў; пакідаць лішнія прабелы ў тэксце; карыстацца прабеламі і табуляцыяй замест выраўноўвання тэксту з дапамогай лінейкі пры ўтварэнні абзаца і размяшчэнні твораў.

У дзённіку абавязкова павінна быць адлюстравана наступная інфармацыя:

1) пачатковая дата і падрыхтоўчая работа: чаму фальклор збіраецца менавіта ў гэтых мясцінах, хто падказаў, хто дапамог, як шукалі інфармантаў, як яны сустракалі і г. д. Асаблівую каштоўнасць маюць творчыя партрэты выканаўцаў;

2) пры афармленні дзённіка павінна быць дакладная ***пашпартызацыя*** твора, каб было абсалютна зразумела, ***дзе, калі, ад каго*** ён запісаны: прозвішча, імя, імя па бацьку інфарманта, яго год нараджэння, адкуль родам, з якога часу пражывае ў гэтай мясцовасці, ад каго перайшла песня, казка (усё гэта складае ў фалькларыстыцы паняцце «пашпарт фальклорнай адзінкі»). Пры жаданні можна зафіксаваць нацыянальнасць, адукацыю, прафесію, веравызнанне;

*Узор афармлення пашпартызацыі твора*

Запісала студэнтка I курса спецыяльнасці «Беларуская філалогія» філалагічнага факультэта БДУ Баравая Алеся Дзмітрыеўна ў в. Мілавіды Расонскага раёна Віцебскай вобласці ад Старыковіч Яўгеніі Пятроўны, 1935 г. н., беларускі, пісьменнай, мясцовай.

3) характарыстыка абставін выканання: дзе, калі, хто прысутнічаў, рэагаванне, манера выканаўцы, рэплікі падчас выканання і г. д.;

**Увага!**
Творы запісваюцца па днях праходжання практыкі адразу пасля інфармацыі пра абставіны запісу, знаёмства з інфармантам і інш.

4) нумарацыя твораў суцэльная на працягу ўсяго дзённіка. Побач з нумарам запісваецца назва твора. Калі яе не існуе, то назва даецца па першым радку, ніжэй у дужках — азначэнне твора паводле слоў выканаўцы (напрыклад, «Як лён бяруць», «Вясна», «Палотная», «На куста» і г. д.);

*Узор запісу твора ў дзённіку*

1. Ой, рана-рана куры запелі… («Каляда»).

[Далей тэкст твора і неабходныя заўвагі. Гэта прыблізна выглядае так:

З а ў в а г і:  жанр песні — велічальная калядная дзяўчыне.

З а ў в а г і  в ы к а н а ў ц ы:  «Куры — гэта пра пеўняў так кажуць»].

5) кожны дзень практыкі павінны адлюстроўваць запісаныя вамі творы;

6) пасля апошняга дняназіранняў трэба абавязкова прадставіць *сваю матываваную ацэнку практыкі*: спадабалася ці не і чаму, а таксама парады і пажаданні, якія вы асабіста вынайшлі падчас практыкі (калі такія будуць);

7) «Картка інфарманта», якая змяшчае інфармацыю пра выканаўцу і запісаныя ад яго творы.

*Узор афармлення карткі*

<table>
<tr><td>Год</td><td>Картка інфарманта</td></tr>
<tr><td colspan="2">1. Прозвішча, імя, імя па бацьку.<br>2. Год нараджэння.<br>3. Пашпартызацыя:<br>а) месца запісу;<br>б) нацыянальнасць;<br>в) адукацыя;<br>г) мясцовы ці не (адкуль і калі прыехаў);<br>4. Колькі адзінак запісана (расшыфраваць па жанрах, напрыклад, агульная колькасць адзінак — 56, з іх:<br>• няказкавай прозы:<br>легендарнай — 3;<br>• пазаабрадавай паэзіі:<br>прыпевак — 23;<br>• малых жанраў фальклору:<br>загадак — 30).<br>5. Збіральнік Прозвішча, імя, імя па бацьку</td></tr>
</table>

**Увага!**
Колькасць картак інфарманта павінна адпавядаць колькасці выканаўцаў.

4. Жанравая картка — асобны файл для афармлення кожнай фальклорнай адзінкі. Дадзеныя файлы-карткі групіруюцца ў асобныя электронныя папкі па назве населенага пункта, затым — раёна і вобласці (напрыклад: «Брэсцкая вобласць» → «Столінскі раён» → «в. Белавуша» → файлы з жанравымі карткамі, дзе змяшчаюцца запісаныя ў гэтай вёсцы творы).

*Узор афармлення жанравай карткі*

<table>
<tr><td rowspan="2">Год запісу<br>**2021**</td><td rowspan="2">Запісала студэнтка I курса спецыяльнасці «Беларуская/руская філалогія» Чаркасава Ірына Віктараўна ў в. Азярышча Мінскага раёна Мінскай вобласці ад Корзун Ганны Піліпаўны (1925 г. н., бел., пісьм., мясцовая)</td><td>Жанр:<br>велічальная калядная песня (дзяўчыне)</td></tr>
<tr><td>Заўвагі:</td></tr>
</table>

| |
|---|
| 1. Ой, рана-рана куры запелі…<br>(«Каляда»)<br><br>*Прыводзіцца тэкст твора*<br><br>Кіраўнік (прозвішча, ініцыялы) |

**Увага!**
На картках размяшчаць фальклорныя творы трэба з указаннем падраздзелаў (напрыклад, Фальклорная проза, Каляндарна-святочная, Купалле: апісанне пляцення вянкоў).

5. Змест аўдыя- і відэазапісаў. Спачатку трэба сказаць, хто вядзе запіс, дзе, калі. У залежнасці ад сітуацыі запісу перад або пасля кожнага твора аб'яўляюцца яго назва, жанравая прыналежнасць, прозвішча выканаўцы з указаннем узросту, адукацыі, крыніц ведаў пра твор, мясцовы ці не, адкуль прыехаў.

Усе запісаныя ў аўдыя- і відэафармаце творы павінны быць пералічаны ў парадку іх выканання.

*Узор афармлення зместу аўдыя- і відэазапісаў*

| Год запісу |
|---|
| Збіральнік: Свірко Вольга Эдуардаўна<br>Інфарманты: Міпрончык Ірына Пятроўна (1936)<br>Міпрончык Іван Сцяпанавіч (1926)<br>Аксак Тамара Рыгораўна (1932)<br>*Заўвага! Расказваюць разам* |
| 1. Гульні на Каляды.<br>2. Размова пра калядную варажбу.<br>3. Размова пра сватанне |

Гэты змест абавязкова раздрукоўваецца і ўкладаецца ў канверт разам з флэшкай. На самім канверце павінна змяшчацца раздрукаваная вокладка.

6. Рэестравая ведамасць уліку запісаных матэрыялаў. Гэта пажадана рабіць у Microsoft Office Excel і раздрукоўваць з разлікам на альбомную старонку.

**Увага!**
Калі матэрыял збіраўся ў розных абласцях, то ствараюцца асобныя рэестравыя ведамасці па кожнай вобласці.

*Узор запісу*

Рэестравая ведамасць уліку матэрыялаў
(УКАЗАЦЬ ВОБЛАСЦЬ)

| Нумар папкі (запаўняецца супрацоўнікамі лабараторыі) | Год запісу | Месца запісу (вёска, горад, пасёлак, раён, вобласць) | Агульная колькасць адзінак, з іх па жанрах | Інфармант (указаць год нараджэння) | Збіральнік (указаць спецыяльнасць) |
|---|---|---|---|---|---|
| | 2021 | в. Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна | 120 адзінак, з іх па жанрах: фальклорная няказкавая проза: легендарная — 5; фальклорная магічная проза: прыкметы — 18; пазаабрадавая лірыка: бытавая: сямейныя песні — 25; любоўныя песні — 12; прыпеўкі — 60 | І. П. Нікіфарэнка (1945) | А. А. Андрэева, руская філалогія |

# ПАТРАБАВАННІ ДА ЗАПІСУ ФАЛЬКЛОРНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

1. Пры наборы фальклорных тэкстаў абавязкова захоўвайце ўсе асаблівасці мясцовай гаворкі, дайце характарыстыку дыялекту (окаюць ці акаюць).

2. Запішыце тлумачэнні выканаўцаў незразумелых слоў ці выразаў.

3. Пастаўце націскі (гу́ляла, гуляла́).

4. У паэтычных творах дакладна вызначце радкі, строфы, прыпеў, паўторы, часціцы і выклічнікі.

5. Дакладнасць — галоўная якасць запісу фальклорнага твора. Лепш зрабіце пропуск, але не рэдагуйце твор, не дапісвайце таго, чаго там не было, не выдаляйце з тэксту грубыя ці лаянкавыя словы.

Не злоўжывайце часам і фізічнымі магчымасцямі выканаўцаў. Тэмы размоў падкажа наш апытальнік. Напачатку папрасіце іх расказаць ці праспяваць самыя ўлюбёныя творы. У момант выканання нельга спыняць спевака. Усе пытанні задаюцца пасля.

**Фальклорнай адзінкай лічыцца**:

• кожны асобны твор любога жанру;

• апісанне абраду;

• дакладна запісаны ***разгорнуты адказ*** інфарманта на пытанні праграмы.

**Парада**

Майце на ўвазе, што ***начытаныя*** на дыктафон творы фальклорнай адзінкай не лічацца! Калі гэта асабістыя запісы бабулі, або маці, або іншых родных ці знаёмых вам людзей, лепш сфатаграфаваць запісы і прыкласці фота, але не начытваць на дыктафон як самастойныя адзінкі. У падлік яны ўключаюцца.

Начытаныя на дыктафон творы з хрэстаматый і любых зборнікаў фальклорных твораў фальклорнай адзінкай не з’яўляюцца і ў падлік не ўключаюцца!

Кароткія або недакладна запісаныя адказы інфармантаў выкарыстоўвайце ў дзённіку. На карткі яны не пераносяцца.

Спадзяёмся, што вы ўлічыце нашы парады і аформіце справаздачу належным чынам. Поспехаў!

# ПРАГРАМА-АПЫТАЛЬНІК

## 1. ФАЛЬКЛОРНАЯ ПРОЗА

Фальклорную прозу можна запісаць практычна ад любога чалавека. Для гэтага трэба добра ведаць склад фальклорнай прозы, методыку яе збірання, ініцыятыўна выкарыстоўваць апытальнікі. У іх улічаны не ўсе нюансы, таму апытальнікам трэба валодаць творча, у залежнасці ад абставінаў удакладняць і развіваць пытанні, працей фармуляваць іх, умела наводзіць інфарманта на патрэбныя вам звесткі.

Вопыт збіральніцкай дзейнасці фалькларыстаў XIX—XX стст. сведчыць, што запісваць фальклорную прозу «з голасу» вельмі складана. Пры знаёмстве з фальклорнымі зборнікамі адразу бачна, што часцей за ўсё мы маем справу не з дакладнымі запісамі празаічных аповедаў, а з больш-менш удалымі пераказамі таго, што пачуў збіральнік.

**Увага!**
Выкарыстанне тэхнічных сродкаў фіксацыі прозы абавязкова! Яны не толькі палягчаюць збіральніцкую справу, але і робяць яе цалкам паспяховай.

Фальклорная проза складаецца з дзвюх частак:

1) фальклорная няказкавая проза, якая ўключае: а) дыскурсіўную няказкавую прозу; б) наратыўную няказкавую прозу; в) парэмійную (у тым ліку рытмічна арганізаваную) прозу — так званыя малыя жанры фальклору;

2) фальклорная казкавая проза.

## 1.1. ФАЛЬКЛОРНАЯ НЯКАЗКАВАЯ ПРОЗА

### 1.1.1. Дыскурсіўная няказкавая проза

Дыскурсіўная (ад фр. *discours* — 'маўленне, гаворка') няказкавая проза ўяўляе сабой выказванні інфармантаў аб сваёй уласнай культуры. Напрыклад, запіс Генадзя Лапаціна ад Варвары Грэцкай (1925 г. н.) з пасёлка Амяльное Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці аб каляндарным свяце Саракі і выпяканні птушак:

*«Называецца — соракі, такія вот пцічкі із цеста. Ета матка дзелала. Цеста дзелаець з пшанічнае мукі. Тады ж прасты памол быў, не так як*

*спярва белая мука, дак яны іх учыняць і пякуць: як вутачкі, як цыпляткі, і ножкі дзелаюць ім...»*

Калі інфармант не схільны да доўгага аповеду, распачынайце з ім дыялог. У такім выпадку пры афармленні справаздачы неабходна пазначаць пытанні і адказы:

З б і р а л ь н і к: Што вы казалі, як зажынаць пачыналі?

І н ф а р м а н т: Зажон, Прачыстая Маці,
Памажы нам жыта жаці.
— А як табе памагала,
Дай і жыта не ляжала.
А як будзе ляжаць,
То не буду памагаць.

З б і р а л ь н і к: Вы «бараду» завівалі?

І н ф а р м а н т: Завівалі.

З б і р а л ь н і к: А выполвалі яе ці не?

І н ф а р м а н т: Палолі, чысцілі.

З б і р а л ь н і к: А чым вы завязвалі зверху?

І н ф а р м а н т: А ўсякімі кітайкамі красівымі, усякімі трапачкамі. Сем каласкоў і дзевяць каласкоў — бараду дзелалі. І вот эта здзелаеш, каласочак той, штоб ужо, вот, на саламніцы, дзе ўжо вышэ каленца, штоб чысценька была саломка.

Мэтазгодна задаваць інфарманту спачатку пытанні агульнага характару, а пасля — удакладняльныя.

Тое, што паведамляецца ў дыскурсе, мае розны камунікатыўны статус: 1) веды інфарманта; 2) яго перакананні; 3) меркаванні; 4) разуменні.

Напрыклад, Варвара Грэцкая ***ведае***, як фарбаваць яйкі:

*«Туда шалупайкі накладзеш у чугунок ці ў кастрюлю і гарачым кіпяткам налівайш, яна пастаіць і прыкіпіць, а тады ўжо яйцы кідаіш, яна красная вада, і яйцы красяцца. А тая вада, шалупайкі, стаяць да Радуніцы на дварэ...»*

Яна ***пераканана***: *«“Стралу” водзяць, штоб ужо ўражай быў. Ета ж — Ушэсце. Ета ж ішчэ рана, ета да Троіцы ішчэ...»*

***Мяркуе***, што трэба зважаць і на Бога, і на чорта: «...*Патаму што з табой ангел ідзець паўз адзін бок, паўз правы, а чорцік ідзець паўз левы. І каждага чылавека саправаждаюць. І, як наш Сяргей едзя экзамены здаваць, я гавару: “Па правай руцэ ў цібе ангел. А па левай — чорцік”. Гаворяць: “Богу маліcь, і чорта не гняві”*».

Няказкавы дыскурс звязаны або з натуральнай камунікатыўнай падзеяй з удзелам дзвюх ці больш асоб, або са штучнай, калі адной

з асоб з’яўляецца збіральнік. Менавіта ён пазначае тэму гутаркі і задае пытанні, якія абавязкова трэба запісваць. Напрыклад, Генадзь Лапацін удакладняе пра ваджэнне «стралы» і песні-*лёлюшкі:*

З б і р а л ь н і к: Лёлюшкі ў пост пелі?

І н ф а р м а н т: Як Стрялу водзяць, вой лі, вой люлі скрозь пяюць. У пост пяюць «Як жыла ўдава пасярёд сяла...» Дак ета паставая. Люлі-люлі етыя пяюць, а словы толькі паставыя...

З б і р а л ь н і к: Песні бываюць кругавыя?

І н ф а р м а н т: Як Стрялу водзяць, пасярод сяла, а як Закружжа дліннюшчая, там, можа, і тры раза, дзе шырэйшая места, карагод водзяць, пяюць: «Ой, ёрь-рі маёррі...»

З б і р а л ь н і к: А гэтыя як называюцца, дзе лёлюшкі?

І н ф а р м а н т: Ета ж гаворяць, давайця кругавую, а тыя стрэлавыя. Стралу ж вядуць, за рукі бяруцца, ідуць...

Няказкавы празаічны дыскурс не мае строгай жанравай формы і класіфікуецца згодна з тыповай тэматыкай. Менавіта такім чынам і трэба пазначаць запісанае:

1) міфалагічны дыскурс;
2) магічны дыскурс;
3) каляндарна-святочны дыскурс;
4) сямейна-абрадавы дыскурс;
5) народна-хрысціянскі дыскурс;
6) сацыяльна-бытавы дыскурс.

**Увага!**
Кожны запіс павінен мець загаловак, які прысвойвае яму практыкант. Адсутнасць загалоўкаў зніжае ацэнку.

*Узор запісу*

**Народна-хрысціянскі дыскурс.**
«**Пра святога Мікалая і малітоўны зварот пры пачатку сяўбы**»

Мікалаю-чудатворцу так усюды просяць. Ён чудатворыў багата гдзе. І ў лес ідуць, і сеяць ідуць, сеялі ж тады з каробкі. Прыдзе, панюхае хазяін зямлю вясной: ці варта яна ўжэ, прытуліць, пацалуе, перакрэсьціць і просіць: «Зарадзі, Божа! Дай на ўсякага долю і пшанічку, і масьнічку...

**Магічны дыскурс.**
**«Дзіцячы абыдзённік для выклікання дажджу»**

Пралі дзеці. У адзін дзень снавалі, пралі і абхадзілі з іконамі вакруг дзярэўні. І ўсё ў адзін дзень. Эта на Дзевятнік. Празднік е, Дзевятнік. І патом такой лівень пашол.

З б і р а л ь н і к: І колькі вам гадоў было, калі ткалі?

І н ф а р м а н т: Мы пралі, ткалі, как маглі. Я дак ужэ ўмела прасць. Помню маленькая, прасць навучылісь харашо. Как пралі, не важна, но все в адзін дзень дзелалі. Полдзерэвні дзяцей пралі. Сабіралі нас. Аснавалі, напралі і выткалі. І тагды ўзялі ікону, абышлі ўсе сяло, і такі лівень ішоў, што. А то не было дажджу.

## Міфалагічны дыскурс

Да міфалагічнага дыскурсу адносяцца ўяўленні, якія датычацца персанажаў вышэйшай і ніжэйшай міфалогіі беларусаў, міфалагізаваных прыродных з'яў і стыхій, расліннага і жывёльнага свету, міфалагічнай семантыкі рэчываў, прадметаў, чалавека і частак яго цела, працы і г. д., па сутнасці, літаральна ўсяго, што нас акружае.

Памятайце, што гэта не сюжэтныя аповеды, а тлумачэнні, апісанні, паведамленні, меркаванні. Яны не жанры, а форма міфалагічнага дыскурсу.

**Вышэйшая міфалогія.** Лічыцца, што ў народнай свядомасці амаль не захавалася ўяўленняў, звязаных з вышэйшай міфалогіяй, ва ўсякім разе дакладных звестак аб ёй занатавана няшмат. Аднак маштабных росшукаў у гэтым кірунку не праводзілася. Толькі апошнім часам фалькларысты быццам схамянуліся і пачалі мэтанакіравана шукаць усё, што яшчэ засталося.

**Даведка**

Персанажы вышэйшай міфалогіі: Дзіў, Бог, Род, Сварог, Дажбог, Пярун, Вялес, Мокаш, Лада, Юр (Юрыла, Юрай), Белбог (Бялун), Чарнабог.

**Парада**

Перш-наперш высветліце, ці ведае або ці чуў інфармант пра Бога, Рода, Сварога і г. д. Любы адказ, станоўчы і адмоўны, мае навуковую каштоўнасць. У выпадку станоўчага адказу ўдакладніце, што ведае інфармант аб тым ці іншым персанажы: хто ён такі, які мае выгляд, дзе знаходзіцца, чым займаецца, у якіх ён стасунках з людзьмі і іншымі персанажамі, што ад яго залежыць і г. д.

Не ўсе навукоўцы згодны з тым, што ў беларусаў існавалі багіня Лада, Чарнабог і інш. Калі вам будуць раказваць пра Ладу і іншых боствaў, абавязкова ўдакладніце, адкуль у суразмоўцы такія звесткі: ад людзей (ад каго канкрэтна, пры якіх абставінах, калі?), з кніжак (якіх?), з інтэрнэту.

**Ніжэйшая міфалогія.** Сфера беларускай ніжэйшай міфалогіі надзвычай багатая і разгалінаваная. Уяўленні аб разнастайных духах локусаў, якія месцяцца ў пэўнай прасторы – культурнай (хата, гаспадарчыя пабудовы) і прыроднай (лес, балота, возера, рэчка, поле і да т. п.), захаваліся нераўнамерна. Стаўленне да іх можа быць дваістае – як да апекуноў і як да шкоднікаў. У апошнім выпадку гэтыя міфалагічныя персанажы поруч

з чортам адносяцца да нячысцікаў. Задача збіральніка — высветліць, наколькі жывымі з'яўляюцца вераванні ў існаванне разнастайных духаў і што пра іх кажуць нашы сучаснікі.

**Даведка**
Апекуны зямнога жыцця: Лада, Дзявоя (Сава), Ярыла, Цёця, Ляля, Жыцень і Жытняя Баба, Зюзя, Мароз, Шчадрэц.
Духі культурнай прасторы: дамавік (хатнік), дамавуха, хут, змей, валасень, злыдні, кікімара, чур, хлеўнік, лазнік, палявік, спарышка і інш.
Духі прыроды: лясун, купальскі дзядок, вадзянік, русалкі, сарэны (фараонкі), балотнік, багнік, кадук, лазавік, лойма (чарціха), хапун і інш.
Насельнікі неба і паветра: грамаўніца, гарцук, паветрыкі.
Жыхары падземнага свету і пекла: ох, кладнік, жыжаль (зніч), чорт (д'ябал, сатана, бес, нячысты дух, Люцыпар), пякельнікі, прахі і да т. п.
Шкоднікі: цмок, шатаны, паралікі, шэшкі, стрыга і інш.
Нечысці: Баба Яга (Ягіня, Юга), ведзьмакі і чараўнікі, вупыр, ваўкалак, дзікія людзі.
Хваробы і насланні: Паморак, Ліхаманка (Трасца), Халера, Чума (Мор), Воспа, начніца, Мара, падвей і інш.
Смерць: Смерць, Марэна, Паляндра.

**Парада**
Так жа, як пры збіранні звестак аб персанажах вышэйшай міфалогіі, запішыце тлумачэнні адносна прадстаўнікоў ніжэйшай міфалогіі: хто яны такія, адкуль узяліся, чаму так называюцца, дзе жывуць, які маюць выгляд, чым займаюцца, які ў іх характар, як ставяцца да людзей, чаму спрыяюць або шкодзяць, як да іх ставяцца людзі, калі яны з'яўляюцца і куды знікаюць і г. д.

**Міфалагізаваныя з'явы прыроды.** У міфалагічнай свядомасці беларусаў існуе адметная карціна свету, дзе прыродныя з'явы маюць дадатковы сэнс, маркіруюцца станоўча, адмоўна або дваіста. Адны істоты лічацца чыстымі, свяшчэннымі, боскімі, святымі, другія — нячыстымі, дэманічнымі; адзін час усведамляецца як добры, спрыяльны, другі — як нязручны, небяспечны. Адпаведна і расліны паўстаюць у якасці шчаслівых ці нешчаслівых, адсюль – дазволы ці забароны на іх ужыванне. Некаторым жывёлам (напрыклад, зайцу) надаюцца двaістыя якасці: у некаторых выпадках выяўляецца іх добры пачатак, у іншых – дрэнны.

**Даведка**
Асноўныя паняцці для збору матэрыялаў аб міфалагізаваных з'явах прыроды: час — зямля — неба — свяцілы (сонца, поўня (месяц), зоркі, каметы) — стыхійныя бедствы і з'явы (навальніца, гром, град, маланка, віхура, засуха, паводка, землятрус, пажар) — расліны — жывёлы — птушкі.

## ? АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ ПРОЗЫ МІФАЛАГІЧНАГА ДЫСКУРСУ

1. Які час сутак лічыцца небяспечным для чалавека і чаму? Чым небяспечныя поўдзень і поўнач? Што нельга рабіць пасля заходу сонца і чаму? Чаму нельга спаць на захадзе сонца?

2. Якія дні тыдня і года (гадавых свят) лічацца спрыяльнымі або неспрыяльнымі для розных работ (сяўбы, пасадкі агародніны, зімовых нарыхтовак, жаночай працы, будаўніцтва і г. д.)?

3. Чаму зямля лічыцца святой і чыстай? Як трэба ставіцца да яе? У якіх выпадках звяртаюцца да зямлі, выкарыстоўваюць жменьку зямлі? Адкуль узялася зямля?

4. Што сабой уяўляе неба? Хто там жыве?

5. Як з'явілася сонейка? Чаму яно рухаецца па небе? У якія святы назіраюць за «ігрой» сонца? Чаму?

6. Ці лічыцца ў вас, што поўня (месяц) вельмі ўплывае на лёс чалавека, можа прыносіць дабро і шкоду, пасылаць хваробу і вылечваць яе, уплываць на рост раслін, жывёл і людзей, якасць лекавых траў, прадказваць лёс, надвор'е, падзеі і здарэнні, прымаць душы памерлых і г. д.?

7. Як у вас называюць розныя зоркі і сузор'і? Ці можна варажыць па зорным небе? Калі і якім чынам? Што ў вас кажуць пра паходжанне зорак? Як яны звязаны з лёсам чалавека, яго жыццём і смерцю? У якім выглядзе ўяўляліся «хвастатыя зоркі» — каметы (напрыклад, ведзьма на мятле)? Чым яны небяспечныя? Куды вядзе Млечны шлях?

8. Высветліце, што лічыцца звышнатуральнай прычынай канкрэтных стыхійных бедстваў і з'яў і якім чынам можна іх нейтралізаваць. Напрыклад, прычынай віхуры магло быць наступнае: вяселле чарцей, смерць чараўніка, пагоня чарцей за душамі людзей, дзеянні тапельнікаў і шыбенікаў. А каб спыніць віхуру, кідалі ў цэнтр нож, сякеру і інш.

9. Якія дрэвы, расліны, кветкі лічацца чыстымі і нячыстымі, добрымі і дрэннымі (злымі), шчаслівымі і нешчаслівымі, гаючымі і шкоднымі? Чаму? Як іх выкарыстоўвалі і дзеля чаго? Пра якія расліны кажуць, што гэта пераўтвораныя людзі?

10. Якія павер'і і прыкметы звязаны з пэўнымі жывёламі? Пра якіх жывёл казалі, што гэта пераўтвораныя людзі? Якія павер'і звязаны са змеямі, змяіным царом? Ці чулі вы пра лятучых змеяў? Да каго яны прылятаюць, што прыносяць?

11. Што і чаму трэба зрабіць, калі ўбачыш першую птушку, асабліва бусла, ластаўку, зязюлю? Якім птушкам нельга шкодзіць? Чаму? Якія словы чуюцца ў крыках і спевах птушак, што яны азначаюць, на што арыентуюць (напрыклад, на пачатак жніва, касьбы і г. д.)? Пра якіх птушак кажуць, быццам яны паходзяць ад чалавека?

## УЗОРЫ ЗАПІСУ ПРОЗЫ МІФАЛАГІЧНАГА ДЫСКУРСУ

| | |
|---|---|
| Міфалагічны дыскурс. Апісанне Мароза | Мароз — стары сівы дзед з сінім або чырвоным носам. Замест вусоў і барады спускаюцца сапляке аж да долу, на галаве ўся гіра пакрыта белым інеем. Ён заўжды любіць дужацца з сонейкам, але не мажэ яго пабароць. Сонейка шуткуе з Марозам, а ён злуе да кліча сабе да памогі вецер... |
| Міфалагічны дыскурс-тлумачэнне, чаму ў русалкі вянок на галаве | Кожная дзеўка, што памрэ ў русальным тыжні, на том свеце жыве Русалкаю, а ходзіць з вянком на галаве голая, штоб відна было, што яна яшчэ не саграшыла... |
| Міфалагічны дыскурс-паведамленне пра Халеру і яе пагібельную сілу | Халера — то чорная, худая, страшная баба, яна зусім бы то з імглы злеплена была: дзе яна пяройдзе, то там зараз народ пачне ўміраць. |
| Міфалагічны дыскурс пра Бога | Біг ны тылько на нэбы, біг э всюды. І тут коло нас він е, і дэсь далёко, і там, і там, і в гэтый траві (паказвае мне купіну травы), і в гэтый (паказвае іншы кусцік травы), і всюды. Мы ёго ны бачымо і ны можымо бачыты. А він нас бачыць, він всэ бачыць. Біг — добрый. |
| Міфалагічны дыскурс пра Перуна і яго стрэлы | Перуну пакланяліся, яго стрэлам — каменным і жалезным рэчам. Жанкі закопвалі стралу на полі, каб яно радзіла, каб маланак не было. |
| Міфалагічны дыскурс пра дамавіка | І ў хлеві, і ў хаті е домовік. От прікінеца — іде чэловек які, а ун жэ не чэловек, а бо яо зна што такее. Он і собакой мо скінуца ці котом. |
| Міфалагічны дыскурс пра дамавіка і ласку | Дамавік і ласачка — то адінакаво. |
| Міфалагічны дыскурс пра пярэваратня | Расказувалі: десь у лесе буў пень такі. Пойде перекуліца і стане воўкам, а назад перекуліца — ізноў хлопцам. |

| | |
|---|---|
| Міфалагічны дыскурс пра лесавіка | У лесе е дзед такій, у него баба Марына. Хадзяін леса — буйный, губы велікіе, нос велікій, сам агромный. Барада па пояс, барада і вусы. |
| Міфалагічны дыскурс пра паходжанне ведзьмы | Як деўка ўродыть деўку, а вона тыж деўкою ўродыць деўку, так третья будэ вэдьмоў. |
| Міфалагічны дыскурс пра русалку | З б і р а л ь н і к: А якой уяўлялі русалку: прыгожай або пачварнай?<br>В о л ь г а  М а ж у р о в а: Ну, гаворюць, не йдзіце, рябяты, там у жыце русалка. Баба так гаваріла,што красівая дзеўка сядзіць на ветках, калышацца і завець:<br>А лю-ля, лакута,<br>Хадзіце ка мне сюда!<br>Агу-та-та! Агу-та-та!<br>З б і р а л ь н і к: А калі хто прыйдзе, што будзе?<br>В о л ь г а  М а ж у р о в а: Зашчакочэць.<br>М а р ы я  С а ф р о н а в а: Да хто іх відзеў? То ўсё пустое. |
| Міфалагічны дыскурс пра забарону на прадзенне | На Ганну, Варвару, Саву не пралі, толькі пачынкі вялі, пражу маталі ў клубкі, а то на матавілы. Варвара, гаворaць, яна сільна праціўна. На Варвару не нада нічога дзелаць. |
| Міфалагічны дыскурс пра павер'і і прыкметы | Шмат вавёрак у лесе — да неўраджаю ці вайны; вёска згарыць, калі ў яе забяжыць заяц, ці маці памрэ; дождж пойдзе, калі заб'еш жабу; каб воўк не крануў ні жывёлы, ні птаства, трэба падкурваць немаўлят «ваўчынымі кіпцямі»; калі лось вясною зойдзе на азіміну пасвіцца — трэба чакаць добрага ўраджаю жыта. |
| Міфалагічны дыскурс пра пачырванелы месяц | З б і р а л ь н і к: А калі месяц пачырванелы?<br>І н ф а р м а н т: То ета к вайне. Ета, гаворюць, бальшая праливія крові. |
| Міфалагічны дыскурс пра цара вужоў | З б і р а л ь н і к: А расказвалі пра цара вужоў?<br>І н ф а р м а н т: Ён, гаворaць, чорны, красна галава, чорныя рогі, да з беленькаю грудзінкаю... Дак яшчэ гаварылі: нада сьняць белы платок і разаслаць. Ці скацерць, ці што перад тым вужам. І ён ськідае рогі. |
| Міфалагічны дыскурс пра тое, як «сонца гуляе» | Калі гуляе сонца, то на яго грэх глядзець, гаворaць, шанцаваць не будзе, а я бачыла, як яно гуляе — усякімі палосамі лятае-лятае, кроўю наліваецца. Гаворaць, яго тады ведзьмы хватаюць. |

| | |
|---|---|
| Міфалагічны дыскурс пра Млечны Шлях, зоркі, душу чалавека | І н ф а р м а н т: Млечны Шлях — гэта атлятаюць жураўлі ці прылятаюць — ён абазначан.<br>З б і р а л ь н і к: А не называлі яго «птушыная дарога», «дарога ў вырай»?..<br>І н ф а р м а н т: Казалі, што ў вырай. Атлёт, прылёт...<br>З б і р а л ь н і к: А казалі, што сколькі зорак на небе, столькі людзей на зямлі? І калі чалавек памірае — зорка падае?<br>І н ф а р м а н т: І ета казалі. Даказана і ўчонымі, і ўсімі, што цела — эта прах зямны, а душа нявідзімая. Ну вот і паглядуюць на нас... |

## Магічны дыскурс

Магічны дыскурс — гэта вобласць празаічных выказванняў носьбітаў фальклорна-этнаграфічнай традыцыі аб магічнай практыцы бытавога характару, яе мэтах, рэгламенту правядзення, выніках і г. д. Паведамленні грунтуюцца на ўяўленнях, быццам выкананне пэўных дзеянняў, норм паводзін або, наадварот, іх пазбяганне дапамогуць засцерагчыся ад магчымай небяспекі, ліквідаваць негатыўныя наступствы, паспрыяць надыходу жаданага, або на крытычным стаўленні да магіі як невуцтва. З вуснаў у вусны перадаваліся звесткі пра тое, што трэба зрабіць, каб пазбавіцца ад хваробы (напрыклад, закапаць волас з галавы хворага на крыжавой дарозе), паспрыяць ураджаю (напрыклад, раяць выбіраць самую доўгую дарогу, калі едзеш сеяць лён, каб ён вырас доўгі), з дапамогай варажбітных прыёмаў даведацца пра свой лёс і да т. п.

**Праблема класіфікацыі.** Магічны дыскурс не мае жанраў, таму адзінай яго класіфікацыі не існуе. Класіфікаваць празаічныя выказванні можна паводле:

1) функцыі магіі (дыскурс пра засцерагальную, ахоўную, прадуцыравальную магію і г. д.);

2) тэматыкі прадметаў, якія выкарыстоўваліся ў магічных мэтах (дыскурс пра магічнае выкарыстанне хлеба, посуду, ткацкіх вырабаў, пражы, адзення, травы і г. д.);

3) мэтанакіраванасці, зыходзячы з таго, каго ці што імкнуліся засцерагчы, каму ці чаму магла пагражаць небяспека, г. зн. з той сістэмы каштоўнасцей, якая была для соцыуму галоўнай.

У традыцыйным грамадстве яе аснову складалі чалавек, яго маёмасць, свойская жывёла, ураджай, прычым чалавек успрымаўся з боку яго

стану, статусу, становішча (здаровы/хворы, нованароджаны, нявеста, парадзіха, жняя, жанчына/мужчына, падарожны і г. д.).

**Структурныя элементы магічнай прозы.** У працэсе бытавой камунікацыі, выключанай з поля зроку збіральнікаў, і пры адказах на пытанні збіральніка магічны дыскурс тычыцца парад, патрабаванняў, тлумачэнняў, перасцярог, забарон, рэгламентацый, якія актуалізуюцца пад час правядзяння тых ці іншых магічных дзеянняў.

**Парада**
Каб запісаць магічную прозу, трэба з дапамогай пытанняў стварыць штучную сітуацыю, у якой студэнт-практыкант становіцца адрасатам, атрымальнікам звестак.

*Узор запісу*

З б і р а л ь н і к: **А што, неяк выходзяць грошы з-пад зямлі?**

І н ф а р м а н т: Дык эта ж закалдованая золата выходзіла. Закалдуюць, ляжыць, ляжыць, тады яно ўжо стане гаварыць: «Ляжала, яшчэ буду ляжаць». Так, кажуць, гавораць. А тады ўжэ, каб тоя золата дастаць, тады нада ўжо тую скацерку, што на стол накрываюць, пасьвяціць у цэркві, штоб сьвечаным пасьцяліць туды. Тады яно выкачваецца на эту скацерку. Так гаварылі.

Зразумела, што адказы на пытанні — гэта не сама магічная проза, бо яна не паддаецца назіранню збоку, а толькі магчымы карэлят, які дае ўяўленне аб яе змесце і форме. У адказах фігуруюць розныя абярэгі, якія, на думку інфармантаў, дапамагаюць пазбегнуць няшчасцяў, перамагчы іх; пазначаюцца забароны, якіх трэба пільнавацца, каб не здарылася дрэннага; агучваюцца нормы правільных паводзін, якія спрыяюць надыходу пажаданых вынікаў і да т. п.

Магічная проза звязана таксама з каляндарнымі святамі і сямейнымі абрадамі. Напрыклад, падчас першых зімовых гулянак маладая пара выходзіла з хаты праз кажух, разасланы поўсцю ўверх, каб засцерагчы сябе ад нечаканай бяды; «*аладак на Масленіцу пяклі столькі, колькі ў двары жывёлы, каб каровы, авечкі, коні былі здаровыя*»; «*на Тройцу хадзілі ў лес, ламалі май. Упрыгожвалі ім хату, вароты, брамку, веснічкі. Казалі: “Будзе хадзіць ведзьма, дык каб у каровы малако не адабрала”*»; «*на граной нядзелі забаранялася ўсякая работа, каб худоба не нарадзілася калекай*».

**Парада**
Пры размове з інфармантам абавязкова канкрэтызуйце пытанне. Напрыклад, спытайце, як засцерагацца ад чорта, ведзьмы, вупыра, ваўкоў і да т. п.

**Увага!**
Калі ў склад аповеду ўваходзяць заклінанні, праклёны, адсыланні, замовы ці песні, іх таксама трэба старанна запісаць.

## АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ ПРОЗЫ МАГІЧНАГА ДЫСКУРСУ

1. Ці ведаеце вы, як можна засцерагчыся ад нячысцікаў, сурокаў, чараў, ваўкоў і г. д.?

2. Што забаранялася рабіць цяжарнай жанчыне і чаму?

3. Што рабілі, каб роды былі лёгкія?

4. Як адратаваць дзіця ад начніц, крыксаў, пярэпалаху, сурокаў і г. д.?

5. Што рабілі, каб пазбавіцца ад усялякай хваробы?

Вам могуць адказаць, напрыклад, што мыліся ў Чысты чацвер да ўзыходу сонца, вылівалі ваду пасля мыцця хворага на ростанях, пралазілі праз дупло, прасоўвалі кашулю хворага праз пракоп у зямлі і да т. п. Гэта ўніверсальныя прыёмы.

6. Што рабілі і казалі, каб пазбавіцца ад канкрэтных хвароб і насланняў?

У гэтым выпадку трэба добра ведаць народную медыцынскую тэрміналогію, якая ўключае пазначэнні агульнавядомых хвароб (крывацёк, удар, скула, зубны боль і г. д.) і такіх, якія цяжка суаднесці з пералікам хвароб з прафесійнай медыцыны (падвей, прыстрэк, стаццё, сцень і г. д.). Заўсёды ўдакладняйце пытанне, тым самым вы актывізуеце памяць інфармантаў.

**Даведка**
Пералік хвароб, ад якіх імкнуцца пазбавіцца, выкарыстоўваючы розныя магічныя дзеянні і заклінанні: барадаўка, крывацёк, ціск, звіх, выбой, удар, падвярот, зубны боль (зубішча, цемяннік), скула (рожа, залатуха), вогнік, астуда, жар (гарачка), лішай («кругі»), валасень, грыжа («грызь»), залатнік («роды, выкідыш, маціца»), болі ў жываце, доннік, каўтун (каўтуніца), бяльмо, ячмень, хвароба вачэй, ліхаманка, хінцюха (хінця, цётка, варагуша, трасца), урокі (зглаз, прыгавор, суроцы, стацце), нарадка, падучая, чорная хвароба, нязбытнік, падзіў, прыдзіў, прымаўка, прыстрэк, нагавор, сцень, падвей, ляк (спужанне, спуг, пярэпалах, упуд, зляк), начніцы (крыксы, плаксы), дзяцінец, радзімец, патайнік, сухоты, сухотнік, бязбытнік, боль (у розных месцах), нервы, раны, абвар, абжог, кашаль, чума, касцяная балячка, колька, патніца, запор, ікаўка, пякота, туга, смутак, гора, нуда, запой, перапой, п’янства.

7. Як засцерагчы свойскую жывёлу і птушку ад нячыстай сілы, сурокаў, нападу драпежнікаў? Што рабілі, каб карова давала многа малака?

8. З якой мэтай, калі і які хлеб давалі карове? Што рабілі, каб карова (кабыла) «пагуляла»?

9. Што рабілі падчас пошасці (паморку) жывёлы? Ці практыкавалі ў вас абворванне вёскі? Як гэта адбывалася? Ці ткалі спецыяльнае палатно (абрэканне, завеса, аброк, абыдзеннік і г. д.) і што з ім рабілі, каб спыніць паморак жывёлы?

10. Што рабілі пры ворыве, сяўбе, жніве, каб быў добры ўраджай? Напрыклад, бралі з сабой хлеб, кашу, яйка, закопвалі ў баразну велікоднае мяса, косткі, клалі ў насенне яйка, даручалі засяваць чалавеку з вялікай барадою, засявалі зернем з дажынкавага снапа, вянка, пакідалі ў полі «бараду» («казу», «перапяліцу», «дажынкі», «кветку») і г. д. Што рабілі ў іншыя дні і святы?

11. Што рабілі, каб падчас працы на полі не балелі паясніца, спіна, рукі?

12. Як засцерагчы ўраджай і агарод ад буры, граду, засухі, нячыстай сілы, мышэй і птушак? Як выклікаць дождж?

13. Як засцерагчы хату і маёмасць ад пажару, навальніцы, маланкі, паводкі, нячыстай сілы, зладзеяў, прусакоў, блох, мух і г. д.?

## УЗОРЫ ЗАПІСУ ПРОЗЫ МАГІЧНАГА ДЫСКУРСУ

| | |
|---|---|
| Магічны дыскурс пра засцярогу ад ваўкоў | Як зобачыш одного воўка, то кажы: «Воўк, воўк, гдэ ты буў, як Суса Хрыста распыналы?» І як два воўка, то скажы так: «Воўкы, воўкы, дэ вы былі тогді, як Суса Хрыста на роспятые бралы?» І воўк не ўкусыть, у його зубы замыкаюцца. |
| Магічны дыскурс пра ахову дзіцяці | Штоб у хвартух не брала ні круп ніякіх, ні хлеба, штоб с хвартуха не ела, бо, кажуць, дзіця будзе ў каждаго прасіць. Як бере с калодзезя воду, дак нельзя атліваць — у дзіцяці так сліна будзе ісці. |
| Магічны дыскурс пра лёгкія роды | Як жанчына ў полазе, ёй кладуць на пасцель нож і суровыя ніткі, каб яна пры родах доўга не мучылася. |
| Магічны дыскурс пра ратаванне дзіцяці ад начніц | Трэба прынесці ў новум вядры з трох калодзесяў ці з-пад млына ваду, паставіць пад калыскаю і кінуць у тую ваду нож, іголку і тры вугалькі. Калі маці гэта зробіць, хутка і бы ненарокам, так што ніхто не прыкмеціць, то дзіця адразу засне і начніцы мінуцца. |

| | |
|---|---|
| Магічны дыскурс про пазбаўленне ад працяглай хваробы | Як боліе вэльмі, возьмы волос з больного, с потылыцы, да нэсы ў дванаццаць часоў на крыжову дарогу да закопай у зэмлю і кажы: «Кладу косы в сырую, холодную, німую, глухую зэмлю, коб вон одубеў, онэмеў, охолоў». |
| Магічны дыскурс пра пазбаўленне ад чорнай хваробы | Ну, бувае чорная болезь. І гаворать, шо праходзіть так. Узять накрыть, як не бачыў ніколі шчэ, шоб брало каго горе таке, узяць накрыть яо платком чорным і сесті, на бального сесті (голым задам) на голову і сказать: «Зеленое да рутачка жолтенькі цвет, было горачка, а сечас нет». Трі разы сказать». |
| Магічны дыскурс пра пазбаўленне ад каўтуна | З пэрэпугу волосы звіваюцца ў коўтун, у кучу, як шапка. У Чыстый чэтвер мэюцца да сходу сонца, коўтунчыкы одбываюць камэньем, у новый платок звязываюць і на бэгучую воду, дэ вода бэжыть, упускають тые коўтуны. |
| Магічны дыскурс пра пазбаўленне ад бародавак | Помілом (печным) зміталі: по рукі звоныш — бородівкі пропалі. Або той пэсок трэба потэрты, дэ кура купаецця. |
| Магічны дыскурс пра пазбаўленне ад сурокаў | Каб surокі зняць, то бяруць тры вугля, каб з бярозы толькі, кладуць у ваду і шэпчуць: «Вазьмі, чорны вугалю, з раба божага ўсё плахое і злое. Адкуль, чарната, прыйшла, туда і ідзі». Тры разы шэпчуць, а ваду тую нагавораную бяруць ды мыюць таго, каго сурочылі, а астаткі выліваюць, штоб сурокі туды і пайшлі, не вярнуліся назад. |
| Магічны дыскурс пра абарону жывёл | Хвост у каровы абразалі, каб не браў урок. Ніты замукалі на варацях — эта ад звера. Каб каню не шкодзілі ўрокі, то трэба кусочак жычкі (чырвонай тасёмкі) уплесці ў грыво альбо прышыць да ўздэчкі. Воўк пойдзе з пэўнай мясцовасці, калі абнесці вакол яе і ўтыркнуць на шост галаву зарэзанага ім сабакі. |
| Магічны дыскурс пра павелічэнне надою | На вербну нядзелю ў цэркаў ідзём, вербу свецім. Этай вербай кароў первы раз паганяем. С хлебам кароў вуганяюць. Кажу: «Не будзь урочна, а будзь малочна». |

| | |
|---|---|
| Магічны дыскурс<br>пра выкарыстанне кашы<br>на добры ўраджай жыта | Як ідём жыто зажынать, наварым жыто в малом горшчыку і спорняком (трава) абвяжом его і бером с собою его на жніво. Нажнём, сноп не вяжэм, седаем ету кашу йісты з жыта. Ету кашу возьмем по трі раза в рот, а востальную з горшыка возьмем, выкідаём в сноп, і етот спорняк з горшыка снімаем і ў снуп кладём, да скажым: «А теперь дай нам божэ эту ніву даганіть да на будушчій год на этом месце доброго стога поставіть большого, і жыто штоб було ядренее, а нам штоб буг даў, штоб нам хліба свого хватало от нового до нового». |
| Магічны дыскурс<br>пра гушканне<br>на вялікі лён | У нас на Петра колыханкі на вероўкі завязвалі і дзеці колыхаліcь, шчоб лён велікі рос і коноплі... Да оны э ешчэ спевалі такую песенку:<br>Гу-та-та, гу-та-та,<br>Крышка хлеба на Петра... |
| Магічны дыскурс<br>пра выкарыстанне травы<br>і галінак дуба<br>ад зморанасці | Як ідзём колісь жыто зажынать, то рвом этот спорняк (траву) і обв’язываем серп коло ручкі і на ручкі трохі, коб спурно было жать. І за пояс затыкаем, штоб не так поясніца болела. Голінку з дуба выломіло, затыкнём за пояс, штоб спіна не болела, штоб была спіна, як дуб, мочна. |
| Магічны дыскурс<br>пра засцярогу ўраджаю<br>ад мышэй | Брацъ перву копу ржы, выежджаеш на поле со снопамі, і первый камэнь, который ў колесо стукнэ, взять его і прывезты в клуню, у сторону, куда класть рож (ад мышэй). |
| Магічны дыскурс<br>пра выкліканне дажджу | Як даждю нема доўго, дак у тры калодзезі мак сыплюць, дак ужэ дождж пуйдзе. |
| Магічны дыскурс<br>пра спыненне дажджу | Шэ я помытаю от шчо. Оно ны знаю, чы гэто ад дожчу, чы од болезні якэйі. Я роспытаю одну старэньку бабу, то я вам ніколы раскажу. Ткалы кросна. За ныч выткалы гыбу на ручныкы. За ныч ўсё і спрэлэ, й основалэ, й выткалэ, й на ручныкэ порізалэ. Стоев крыж, на той крыж вішалэ. |
| Магічны дыскурс<br>пра выкарыстанне лапаты<br>ад навальніцы | А як дождж вэлікі быў — лопату вынесуць і пастаўляць под окно, як грымецьмэ, коб ня здубіло хату, к хмары той стороною, шчо садзіш хлеб. |

| | |
|---|---|
| Магічны дыскурс пра выкарыстанне бараны ад перуна | Каб пярун не ўдарыў у будынкі, то найлепш дзе на страху борану завалачы, каб бусел гняздо залажыў. |
| Магічны дыскурс пра імітацыю вяселля пры вывядзенні прусакоў | Хочэш с хаты тараканы вывесці, зав’яжы ныточкою за ногу і через дарогу тягай і вэсілля спевай:<br>Вэзу батэньку богатую,<br>Жэнэмо коні вороныйі...<br>Вороныйі коні на стаеньку,<br>Половыйі волы до оборы... |

**Каляндарна-святочны дыскурс**

Каляндарна-святочная проза існуе ў дзвюх формах — натуральнай і штучнай. У натуральным выглядзе яна ўяўляе сабой адказ на пытанне аднавяскоўца, што было на Купаллі, як вадзілі Куста, ці калядавалі на іх вуліцы і г. д., або, напрыклад, эмацыянальнае выказванне наконт таго, што моладзь цяпер не так весяліцца, як раней. Далей суразмоўца можа распавесці, як хадзілі на вячоркі, спраўлялі дажынкі, гулялі пасля шчадравання і г. д. Звычайна ў гэтых аповедах згадваюцца канкрэтныя асобы, сітуацыі, выпадкі, смешныя здарэнні, прыклады недарэчных паводзін і г. д. У штучным выглядзе каляндарна-святочны дыскурс паўстае ў адказах на пытанні збіральніка.

Існуюць якасны і колькасны падыходы да збірання звестак. Пры ***якасным*** падыходзе практыкант толькі задае агульную тэму размовы (напрыклад, Гуканне вясны, Вялікдзень і г. д.), каб інфармант свабодна абіраў накірунак паведамлення, зыходзячы са сваёй дасведчанасці, і не перашкаджае наваднымі ці іншымі пытаннямі.

***Колькасны*** падыход скіраваны на атрыманне як мага большай колькасці звестак ад розных інфармантаў па канкрэтным пытанні. Напрыклад, вы ведаеце наступны магічны дыскурс: «Каб карова давала многа малака, трэба яе выганяць на Юр’еву расу», і вас наогул зацікавіла пытанне, што гэта за раса. З ім вы звяртаецеся да розных асоб. У выніку можна атрымаць па-мастацку значныя юраўскія дыскурсы.

Якому падыходу аддаць перавагу, залежыць ад канкрэтных абставін. Абедзве формы апытання дастаткова выніковыя, але па-рознаму. Лепш за ўсё напачатку паспрабаваць выкарыстаць абедзве, параўнаць іх і абраць для сябе больш камфортную. Тады і працаваць будзе цікава.

**Калядна-навагодні дыскурс.** Асноўныя тэмы калядна-навагодняга дыскурсу: Пілiпаўскі пост, «супрадкі» (вячоркі); Каляды (Нараджэнне

Хрыстова), забароны працаваць, тры куцці (посная перад Раством, багатая перад Новым годам, посная перад Вадохрышчам); варажба; калядныя абходы двароў, абход з зоркай, пераапрананні, ваджэнне «казы» і іншых «жывёл»; калядныя ігрышчы, гульні, забавы («Яшчар/Яшчур»), «Жаніцьба Цярэшкі»); Вадохрышча, пачатак Мясаеду.

Асобная тэма — з паваротам сонца мядзведзь паварочваецца на другі бок. Унікальны запіс Генадзя Лапаціна ад Варвары Грэцкай (Веткаўскі раён):

*«Баба калісь казала: "Сёдні паверніцца мядзведзь... На адном баку ляжыць, а ета ўжо мядзведзь перяверніцца на другі бок у спячцы. Ета ўжо будзя меніць ноч". І я тое запомніла. І вот будзіма... Паўз сцяну Ваня ляжаў, тады Маша, тады я, тады Ягорка, і баба... Ён каля бабы... І будзім варочацца, варочацца... То ня спіцца нам... Я была, як жыгала... То перявярнусь... Баба будзе казаць: "Варячка, іщчэ мядзведзь не варочаіцца другім бокам. Так шта ляж ціхінька". — "А то што будзя?" — "Мядзведзь прыдзя ноччы із лагва свайго, да із'есць".*

*Гаворяць: "Мядзведзь з етага ўрэмя перяварачываіцца на другі бок. Ён на баку ляжыць. А ета перяварячыіцца, пашаволіцца. І будзя патрохі, будзя перяварачывацца на другі бок".*

*Первая мета: сонца паварачыіцца. Ужо сонца на мінуту будзя раней узыходзіць. Калісь гаварыла баба. Сонца павярнулась ужо, і мядзведзь павярнуўся».*

**Стрэчаньскі дыскурс.** Стрэчанне – хрысціянскае свята, якое апелюе да сустрэчы Ісуса Хрыста са старцам Сімяонам, што сімвалізуе сустрэчу Старога і Новага запаветаў. У народзе гэтае свята называецца таксама Грамніцы і лічыцца часам сустрэчы зімы з летам і пачатку грымот. Гэтыя грымоты асэнсоўваліся як выпрабаванне Грамаўнікам, богам веснавых навальніц і дажджоў, сваіх стрэл-маланак і грому. Удакладніце, калі і як святкуецца Стрэчанне. Хто з кім сустракаецца? Які вынік сустрэчы? Даведайцеся, чаму свята называецца таксама Грамніцы. Хто каго *громіць*? Якую ролю адыгрывала грамнічная свечка? Як яе выраблялі? Якім чынам яе выкарыстоўвалі ў гаспадарцы? Што адбывалася на вуліцы? Ці вазілі каго-небудзь на санках? Хто гэта рабіў і з якою мэтай? Якія прыкметы існавалі на гэты дзень?

**Масленічны дыскурс.** Уласна масленічны дыскурс тычыцца звычаяў Масленага (Сырнага, Крывога, Пустога, Развітальнага) тыдня – апошняга перад Вялікім постам. З ім звязаны аповеды пра апошні тыдзень перад самой Масленкай, які меў шэраг назваў: Рабы тыдзень, Вясельніца, Масляныя Загвяны. Важна даведацца, ці адзначаюць цяпер Масляныя Дзяды (у які дзень? якім чынам?), як яны называюцца ў пэўнай мясцо-

васці (Мясаедныя, Паставыя, Зімовыя, Стрэчаньскія). Звярніце ўвагу на народныя звычаі, звязаныя з першым тыднем Вялікага посту. Даведайцеся, ці прытрымліваюцца ў нашы дні былых паставых прадпісанняў і забарон, ці адзначаюцца (якім чынам?) дні асобных святых. Самае галоўнае — запісаць разгорнуты аповед пра святкаванне Масленіцы. Асноўнае пытанне: «Як у вас святкавалі Масленіцу?»

Удакладняйце, пра што вы хацелі б даведацца. Напрыклад, чым пачыналася свята, што рабілі ў асобныя дні Масленічнага тыдня (напрыклад, чаму чацвер на масленічным тыдні называўся Валоссе, якія звычаі яму ўласцівы), ці выраблялі чучала Масленіцы, які яно мела выгляд, што з ім рабілі, чым адзначалі апошні дзень Масленічнага тыдня і інш.

Звярніце ўвагу на такія тэмы масленічнай прозы, як масленічныя стравы (які быў іх склад? што з імі рабілі? напрыклад: насілі на могілкі бліны, частавалі наведвальнікаў); чучала Масленіцы; масленічныя лялькі; масленічныя пераапрананні; склад пераапранутых персанажаў (напрыклад: «мужчыны», «старцы», «цыганы», «дзед», «поп» і інш.), іх выгляд, дэталі касцюмаў — хаджэнне пераапранутых па вуліцы, наведванне хат, песні і віншаванні — катанні з гор (іх сэнс) — катанні на конях (з якой мэтай?) — ушанаванне маладых шлюбных пар (хто наведваў маладуху? што казалі і спявалі? што ў адказ рабіла маладуха? ці разувалі маладых? ці распраналі маладуху? ці вазілі яе на санках па вуліцы?) — звычай «цягаць калодку» (якім чынам гэта рабілі? што сабой уяўляла «калодка»? каго прымушалі яе цягнуць? на каго накідвалі? каму прышпільвалі? хто і чым адкупляўся ад «калодкі»? сэнс звычаю?) — звычай «цягаць ступу» (жарты, свавольствы, сваркі пераапранутых, фрывольныя паводзіны, «самадзейная музыка», што выкарыстоўвалі ў якасці музычных інструментаў?) — звычай вазіць на санях бабу-павітуху, частаваць яе — разыгрыванне традыцыйных сцэнак (напрыклад: «пахаванне дзеда», «пахаванне бабы») — жаночыя вечарынкі з песнямі і танцамі — масленічныя вогнішчы (дзе іх распальвалі? што туды кідалі?) — провады Масленіцы і пачатак гукання вясны.

Асобная тэма — святкаванне гарадской і вясковай Масленіцы ў нашы дні, мясцовы сцэнарый, роля работнікаў культуры ў яе правядзенні, роля вядучых, новыя гульні, забавы, стравы і г. д.

**Дыскурс гукання і провадаў вясны.** Гуканне вясны шчыльна звязана з аграрным календаром. Лічыцца, што да пачатку земляробства народная свядомасць еўрапейцаў фіксавала толькі зіму і лета. Відаць, напачатку вясну сапраўды толькі гукалі, не спяваючы ніякіх песень. Нездарма ў беларускім фальклоры захавалася назва Гувясна, а ў рускіх традыцыях вяснянкі трэба было не спяваць, а выкрыкваць.

Гуканне вясны ў розных мясцовасцях адбывалася ў розны час, але пераважна з 1 сакавіка – «на Аўдакею». У царкоўным календары гэты дзень звязаны з шэрагам кананізаваных імёнаў пакутніц за веру, а ў народным – з Аўдоццяй Вясноўкай і вялікай колькасцю звычаяў, сярод якіх трэба адзначыць звычай чысціць зямлю, калі спальваюць увесь хлам.

Майце на ўвазе, што веснавы міф звязаны з Зямлёй-маці і яе дачкой Вясной, таму звярніце асаблівую ўвагу на высвятленне сучасных звычаяў Благавешчання (Звеставання).

Задача збіральніка — запісаць аповед аб мясцовых звычаях гукання вясны. Асноўныя пытанні:«Як у вас гукалі вясну? Ці гукаюць цяпер? Калі гэта адбывалася, да якога свята (або свят) прымяркоўвалася?».

Не задавольвайцеся самым агульным адказам, што выходзілі на вуліцу (за вёску, на пагорак, да рэчкі) і спявалі вяснянкі. Каб актывізаваць памяць суразмоўцы, пакажыце сваю дасведчанасць у вясковых звычаях, якія існавалі ў розных лакальных традыцыях. Напрыклад, запытайцеся:

- аб прымеркаваным да гукання вясны звычаі выпякаць з цеста «жаўранкаў», «буськавы лапы», «галёпы» (што з выпечаным рабілі?);
- гушканні на арэлях (дзеля чаго?);
- звычаі вадзіць карагоды (дзе? калі? якія?);
- звычаі пускаць па вадзе дошчачку з хлебам і свечкай, кідаць у ваду булачку, распальваць вогнішчы, скакаць цераз вогнішча, запальваць кола, качаць колы, абходзіць двары;
- звычаі завіваць бярозкі стужачкамі, выбіраць сярод дзяўчат Вясноўку, вырабляць для дзяцей-загукальнікаў птушкі-свісцёлкі, закідваць на бярозу вянкі, а потым збіваць іх з дрэва, насіць упрыгожаную маленькую ёлачку, «чыркаваць» (пець вяснянкі);
- звычаі перарываць 40 шнуркоў (каб разбурыліся маразы), перакідваць 40 палачак цераз страху, паламаць 40 дошчачак (для дзяўчат), разбіць 40 колаў (для хлопцаў), падкідваць у карагодзе кавалачкі сыру, яек, масла ўверх і г. д.

Праваджалі вясну не паўсюдна, хоць у той ці іншай форме гэты язычніцкі звычай быў засведчаны ў многіх народаў. Звычайна ляльку, якая сімвалізавала вясну, тапілі, спальвалі або закопвалі ў зямлю, каб праз смерць вясна зноў адрадзілася на наступны год. Тым больш вельмі важна знайсці інфармацыю, у якіх рэгіёнах існаваў або існуе ў жывым бытаванні гэты звычай. Рэальна запісаць аповед аб ім на Гомельшчыне, а дзе яшчэ — на сённяшні дзень фалькларысты не ведаюць. Спадзяёмся на новыя адкрыцці.

**Велікодны дыскурс.** Велікодная проза тычыцца двух галоўных момантаў свята: уласна Вялікадня (Пасхі), яго звычаяў і хаджэння валачобнікаў. У залежнасці ад вашага пытання вы можаце атрымаць адказ, у якім спалучаюцца народна-хрысціянскія і язычніцкія тэмы: «*Як ужэ заходыть пасха, йшлы в цэркву на всюнычню. У півночы ужэ выклыкалы Хрыста. Ходять около цэрквы с кресным ходом і спывають певчы. Некоторыйі прыносылы сыра с платочковы. А той сыр був гэтакі. Шэ на масленіцу, як ляжылыс спаты, то клалы кусочок сыра за губу. Як до ранку сыр ны роставав, то бралы ёго на всюнычню. І вжэ як батюшка выклыкае Хрыста, то тэйі, хто с сыром, побачаць відьму. Як уже розвідняе, то святять пасху (хрінь, сіль, яйца, мясо). Урано прыходзять з цэрквы і на сніданні йідять тое, што посвятылы*».

Агульная тэма размовы з інфармантамі — Вялікдзень і яго звычаі: сустрэча Пасхі, гульні, гушканне на арэлях, дзіцячыя абходы, валачобны абрад, склад валачобнікаў, дыялогі з гаспадарамі, узнагарода за спевы, «ігра» сонца, забарона на пэўную працу і інш.

**Юраўскі дыскурс.** Дадзены дыскурс звязаны з дзвюма асноўнымі тэмамі каляндарнага свята Юр'я (Юры, Юрэй, Юр'е, Ягорай) — жывёлагадоўчай (звычаі першага выгану жывёлы на пашу) і земляробчай (агледзіны нівы, хаджэнне на Юр'еву расу, карагодны абход палёў). Казалі: «На Юрэй, як хорошэго году, то жыто ў колосе, а як плохого — то ў колодзі». У кожнай мясцовасці існавалі свае лакальныя звычаі. Напрыклад, быў зафіксаваны звычай *юраціца*, аналагічны звычаю траецкага кумлення дзяўчат, віншаванне хлопцамі і дзяўчатамі жанчын-замужніц, якія частавалі іх сырам, паленне вогнішчаў («Юр'евое купайло»), шчадраванне дзяўчынак напярэдадні Юр'я і г. д.

**Дыскурс ваджэння і пахавання «стралы».** Гэты каляндарнаабрадавы комплекс яшчэ існуе ў жывым бытаванні на Гомельшчыне. Яго часавыя рамкі — ад Благавешчання (Звеставання) да Ушэсця, калі «стралу» водзяць апошні раз. Яго выконваюць жанчыны, якія рухаюцца шарэнгай, «упоперак вуліцы», на скрыжаванні водзяць танкі ў выглядзе змейкі, а потым накіроўваюцца да поля, дзе на ніве закопваюць «стралу» ў зямлю. Яе маглі ўвасабляць розныя дзявочыя рэчы, а таксама грошы, «каб быў ураджай харошы». Лічылася, што тым самым праз пахаванне «стралы» адводзілі ад вёскі навальніцу з громам і маланкай-стралой, а таксама спрыялі ўраджаю. Удзельніцы качаліся па зямлі, магчыма, каб набрацца ад яе сіл. Вадзілі таксама кругавы карагод, у цэнтры якога адна з жанчын падкідвала ўверх дзіця. Потым усе вярталіся ў вёску, але спявалі ўжо не *стрэльныя (стралавыя)* песні, а іншыя.

Трэба сказаць, што ваджэнне «стралы» не мае кананічнай формы. Гэта і ўжо адзначаны рух шарэнгі ўпоперак вуліцы, і хуткі бег з аднаго канца вуліцы ў другі, і энергічнае закручванне шарэнгі ў кола, і спакойнае шэсце са спевамі...

Калі вы будзеце працаваць на Веткаўшчыне або ў сумежных раёнах, высветліце ў жыхароў, ці чулі яны пра карагод пад назвамі «Страла», «Стрылка», «Вадзіць стралу», «Сула», «Вадзіць сулу». Напрыклад, дзякуючы нашым студэнтам мы маем звесткі аб жывым велікодным звычаі вадзіць карагод «Стрылка» на плошчы перад царквой пасля святочнага набажэнства (в. Бездзеж Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці). Магчыма, ён існаваў і ў іншых вёсках, але звесткі пра бытаванне карагодаў з падобнай назвай у нашых матэрыялах адсутнічаюць.

У выніку чарнобыльскай катастрофы і адсялення жыхароў з іх родных вёсак значна скараціўся арэал «Стралы». У 1992 г. Варвара Грэцкая з яшчэ адной жанчынай выправіліся у бязлюднае Амяльное, каб правесці там апошнюю «Стралу»: *«Ляксаніха прыйшла: "Давай жа пройдзіма, «Стрялу» правядом". Прайшлі ў тэй бок, там пабылі і назад ішлі, ізноў круг прапелі, а тады на край, адкуль начыналі, і да самага края дайшлі, ямку выкапалі, капаніцу яна ўзяла дома, выкапалі ямку, пакідалі трэсачак, закапалі — і ўсё. Ішлі ўдвох, на ўсю глотку равелі. Ужо трыццаць гадоў там не жывом. Трыццаць адзін ужо»*. На той час ёй было 67 гадоў. Кажуць, што людзі на аўтобусным прыпынку стаялі, слухалі песню, што лілася з адселенага пасёлка, і некаторыя плакалі, як звычайна плачуць на могілках. Відаць, добра разумелі, што выпадкова прысутнічаюць пры пахаванні самой старадаўняй народнай традыцыі — іх «Стралы». Ці адродзіцца яна калі-небудзь у Амяльном і іншых апусцелых вёсках?

**Куставы дыскурс.** Ваджэнне Куста/Кусты ў цяперашні час ахоплівае частку беларуска-ўкраінскага памежжа. У гістарычнай рэтраспектыве арэал Куста суадносіцца з заходняй ускраінай праславянскай зарубінецкай культуры, пазней стасуецца з заходнепалескай дрыгавіцкай, прычым ядром арэалу, відаць, заўсёды была фальклорна-этнаграфічная зона пінскіх палешукоў. У залежнасці ад мясцовай традыцыі, акрамя асноўнай назвы «куст», песні маюць дваістае або часам траістае пазначэнне: «куст» і «трыйца», «куст» і «вэсна», «трыйца» і «вэсна», «куст» і «танок»; «куст» — «трыйца» — «вэсна», «куст» — «трыйца» — «танок». Дадзеныя азначэнні могуць тычыцца як усяго кола куставых песень, так і асобных варыянтаў твора: для адных выканаўцаў гэта, так бы мовіць, «куст», а для другіх — «танок». Памыляліся тыя даследчыкі, якія разглядалі Куст усяго толькі як самабытную разнавіднасць траецка-сёмушных звычаяў:

насамрэч абодва абрады — заходнепалескі з Кустам і руска-беларускі з бярозкай — самастойныя і незалежныя адна ад адной часткі Зялёных святак. У іх адсутнічае агульны песенны фонд і няма перакрыжавання варыянтаў. Кожнаму ўласцівы ўстойлівы сцэнарый правядзення.

У прыказках куст ужываецца ў значэнні старажытнага паважанага роду, а яго галінкі сімвалізуюць годных нашчадкаў: «Дзе стары куст, там двор не пуст» («Дзе стары кусток, там няма пусток»), «Добрага куста добрыя адросткі», «Які куст, такія адросткі», падкрэсліваецца неабходнасць ушанавання роду: «Пакланіся кусту, то ён дасць хлеба лусту».

Куст прадстаўляе дзяўчына або дзяўчынка ў зялёным убранні. Структура «чалавек + зяляніна» шырока распаўсюджана ў абрадавай культуры еўрапейскіх народаў, але блізкіх аналогій да імя «Куст» у ёй няма. Дадзены Куст не ўмоўны знак, не каляндарны сімвал: згодна з рытуальным момантам, ён сапраўднае ўвасабленне свайго роду, у іншым выпадку гэта быў бы не абрад, а імітацыя, падробка пад яго, пусты знак. Відаць, зяляніна Куста сімвалізавала жывое адзінства ўсіх членаў роду, пачынаючы ад першапродкаў і да сучасных нашчадкаў. Сіла Куста-роду ў яго сувязі з зямлёй:

Труйца, Труйца, зэмля народжаецца,
А дочка мамцы до нужок кланяец(ца):
— Ой, позволь, маты, да до Куста ходыты,
Да з дівонькамы корогоды водыт(ы).

З дзённіка фальклорнай практыкі Ніны Макарскай у в. Парэчча Пінскага раёна:

*«Свята працягваецца тры дні. Куст водзяць у першы дзень, пачынаюць дзесьці пасля паўдня, каля трох гадзін. Водзяць Куст толькі жанчыны, мужчыны ў гэтым абрадзе не ўдзельнічаюць... Жанчына ці дзяўчына, якую прыбяруць, здалёк паходзіць на сапраўдны куст. У вёсцы звычайна водзяць не адзін Куст, іх можа быць да дзесяці. Падлеткі водзяць свой Куст, дзяўчаты — свой, а жанчыны таксама свой. Кустам можа быць і дзяўчына, і жанчына, гледзячы якая кампанія. Дзяўчыну ці жанчыну ўпрыгожваюць такім чынам: на галаву надзяваюць вянок з галінак клёна, дуба, ліпы. Наверх яшчэ накладаюць вянок з кветак. Ад вянка спускаюцца гірлянды з галінак; гэтыя гірлянды пакрываюць усю фігуру такім чынам, што не пазнаць, хто прыбраны Кустам. Дзве жанчыны або дзяўчыны бяруць Куст з абодвух бакоў і вядуць. Астатнія ідуць ззаду і спяваюць песні. Колькасць удзельніц бывае розная (10–20 чалавек), у залежнасці ад*

*ступені арганізаванасці шэсця. Усю дарогу спяваюць песні. Ідуць па хатах, спяваюць над вокнамі, іх запрашаюць у хату, частуюць, даюць з сабой пірагі, яйкі і іншыя прадукты. Вось так праходзяць усёй вёскай ці, калі вёска вялікая, толькі часткай. Потым збіраюцца ў адной з удзельніц, здымаюць з Куста ўбранне і балююць».*

**Траецка-сёмушны дыскурс.** Тройца, або Сёмуха, адзначаецца паўсюдна. Народная назва — Зялёныя святы, але трэба быць вельмі ўважлівымі: ёсць яшчэ лакальныя для асобных дзён (напрыклад, Зялёна субота перад Тройцай, Зылынэц — дзявяты чацвер пасля Пасхі, «Сёмушна субота — дыды» і інш.) І яшчэ адна акалічнасць — перакрыжаванне даўніх язычаскіх і новых хрысціянскіх звычаяў. Напрыклад: *«После Трийцы жывэ Зэлэнець, на другим тыжни после Трийцы. Тожэ зиллечко зрывають, светять его, виночки вьють и светять у цэркви, оны помоцные. Если витёр яки плохый найдэ, паралич, тым зиллем накурваюцца».*

Галоўная задача — высветліць, ці захаваўся звычай хадзіць гуртам у лес менавіта да бярозкі і што там адбывалася.

**Русальны дыскурс.** У народным календары пасля Тройцы пачынаўся Русальны (Граны) тыдзень. З ім быў звязаны шэраг забарон, у тым ліку забарона на працу на тры дні або нават на тыдзень. Не пачыналі ніякай новай работы. Асабліва цікавай была забарона на стук, «штоб пярун ня біў», «штоб град не аббіваў»: «Граная нядзеля — эта ад грому». Лічылася, што на гэтым тыдні актывізуюцца русалкі: яны бегаюць, пужаюць людзей, асабліва маладых хлопцаў. Лічылася, што на гэтым тыдні лепш не хадзіць у лес, дзе яны гойдаюцца на галінах дрэў. Русалкамі пужалі малых дзяцей, каб яны не хадзілі ў поле, бо русалка зацягне ў жыта. Карацей кажучы, размова з вясковымі жыхарамі аб звычаях Русальнага тыдня (як яшчэ ён называўся?), каляндарных забаронах (іх даволі шмат), вераваннях, звязаных з русалкамі, провадах русалкі абяцае быць цікавай.

**Увага!**
Русальны абрад — адметная з'ява традыцыйнай культуры Усходняга Палесся (Гомельшчына). Галоўныя структурныя русальнага абрадавага комплексу наступныя: выбар прыгожай дзяўчыны на ролю русалкі, часам яе суправаджае дачка і русалін — провады русалкі ў жыта (часам разам з абраным хлопцам) — выкананне праводных песень — часам вяртанне за русалкай, якая выходзіла з жыта і пачынала ганяцца за дзяўчатамі — вяртанне ў вёску.

Русальны дыскурс уяўляе сабой аповед аб лакальнай версіі Русальнага тыдня і абраду провадаў русалкі (або адной з яго частак). Абавязкова

занатоўвайце мясцовую абрадавую лексіку. Напрыклад: «лавіць русалку», «весці ў танок», «весці праз вёску», «весці ў жыта» і інш. Даведайцеся, што ў дадзенай мясцовасці рабілі з абрадавымі атрыбутамі. Напрыклад, у адным выпадку русальныя вянкі спальвалі, у другім — сплаўлялі па вадзе, у трэцім — закідвалі на дрэва.

**Купальскі дыскурс.** Геаграфія купальскай прозы значна шырэйшая за геаграфію песенных твораў. Яе можна запісаць у тых рэгіёнах, дзе Купалля як такога няма, але яно вядома пад іншымі назвамі. Напрыклад, на Гомельшчыне гэты дзень называцца Іван Вядзьмарскі, Іван-ды-Мар'я, Іван Пукайло і інш.

Звярніце ўвагу на асноўныя тэмы купальскай прозы: мясцовыя назвы свята і звязаныя з ім уяўленні — ваджэнне русалкі напярэдадні купальскай ночы — збіранне зёлак (лекавых раслін), ягад (Янавы ягады), карэнняў, кветак для вянкоў, асвячэнне зёлак — прыкметы, павер'і, перасцярогі — вогнішчы (атрыбутыка купальскага вогнішча) — свавольствы моладзі — пошукі папараць-кветкі — купальскія ведзьмы і іх выкрыванне — купальскае кумаўленне — гульні маскіраваных — патапленне русалкі — купанне на досвітку —назіранне за «ігрой» сонца і інш.

**Жніўны дыскурс.** Паспрабуйце даведацца, як адбываліся зажынкі і дажынкі раней і як цяпер. Даведайцеся таксама пра звычай талакі і ці запрашаюць на талаку ў нашы дні. З аднаго боку, зажынкі — гэта просты пачатак жніва, з другога — абрад. Зажынаць ішлі з малітваю, прасілі ў Госпада дапамогі, бралі з сабою хлеб. Шукалі ў жыце заломы, якія магла зрабіць вядзьмарка: «Як сажнеш — забалееш». Адпаведнымі абрадамі суправаджаліся дажынкі.

**Восеньскі дыскурс.** Слаба прадстаўлены ў студэнцкіх фальклорных матэрыялах, адпаведна, і ў фальклорным архіве. Варта пачаць з высвятлення звычаяў, звязаных з Успенскім пастом (Спасаўкай), на які прыпадаюць тры святы (Спасы), прысвечаныя Збавіцелю. Высветліце, якія Спасы адзначаюцца ў той ці іншай мясцовасці, як яны называюцца і адзначаюцца.

Восеньскі каляндар беларусаў адметны шэрагам унікальных абрадаў і звычаяў, частка якіх знаходзіцца ў жывым бытаванні, частка ўзнаўляецца аўтэнтычнымі фальклорнымі гуртамі і постфальклорнымі калектывамі. Найбольш значныя – Засеўкі, свята Багач, палескі абрад «Жаніцьба коміна» ды інш. З асаблівай увагай беларусы ставяцца да адзначэння восеньскіх Дзядоў, звязаных з памінаннем і ўшанаваннем продкаў.

## АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ ПРОЗЫ КАЛЯНДАРНА-СВЯТОЧНАГА ДЫСКУРСУ

### Калядна-навагодні дыскурс

1. Як у вашай вёсцы адбывалася калядаванне, шчадраванне, навагодняе засяванне?

Абавязкова ўдакладніце, хто ўваходзіў у склад гуртоў. Напрыклад, у некаторых вёсках існавалі свае правілы і абмежаванні: калядавалі мужчыны, а шчадравалі змешаныя гурты моладзі або хлопцы і дзяўчаты хадзілі асобна.

2. Ці захаваліся святочныя абходы цяпер і ў якім выглядзе?

Засяродзьце ўвагу на тым, якія маскі былі ў пераапранутых. Спытайце, ці былі сярод іх Каляда, Шчодра (Шчадрэц), каза, конь, мядзведзь, воўк, журавель, бусел, тур, бык, вол, заяц, дзед, баба, анёл, чорт, ведзьма, цыган, смерць, каваль, салдаты, цары, каралі. Як яны выраблялiся, што рабілі пераапранутыя? Ці насілі з сабою зорку, які яна мела выгляд? Калі ёсць магчымасць, знайдзіце маскі і зорку, сфатаграфуйце (замалюйце) іх. Чым адорвалі калядоўшчыкаў?

**Увага!**
Калі ў прозе з'яўляецца песня, яе трэба дакладна запісаць і прысвоіць асобны нумар. У такім выпадку на картцы будуць пазначаны два нумары або некалькі, калі песень больш. У правым баку карткі запіс будзе мець наступны выгляд: шчадраванне + 1 (2, 3, 4) шчадрэцкая песня.

3. Як і колькі разоў спраўлялі куццю?

Удакладніце, з якіх круп яна варылася, якія існавалі правілы прыгатавання і наступны рэгламент спажывання, каго і якім чынам запрашалі на куццю (у прыватнасці святых дзядоў), што рабілі з рэшткамі, як варажылі аб будучым ураджаі і г. д.

4. Ці ведаеце вы гульні і прадстаўленні, што ладзіліся на Каляды? Як яны называліся? Хто ў іх удзельнічаў, ці былі сярод гульцоў пераапранутыя? Ці былі сярод гульняў такія, калі кагосьці жартам хавалі або жанілі?

Майце на ўвазе, што калядных гульняў было шмат, але фалькларысты звычайна проста самі апісвалі іх. Пры збіранні фальклорнай прозы трэба даваць дакладны запіс.

**Даведка**
Прыкладныя назвы калядных прадстаўленнях і гульняў: «Яшчар», «Жаніцьба Цярэшкі», «Пава з павуком», «Каза», «Кабыла», «Цыганы», «Ма-

ланка», «Памярла наша Мальвіна», «Мядзведзь», «Пекчы ката», «Гульня ў нябожчыка», «Стукач», «Стук», «Сарві вішню», «Жаніць Бахара (Бахурку)», «Бахар», «Верабей», «Тры каралі», «Цары», «Шчодра», «Шчадрацы», «Падушачка», «Рэдзька», «Зязюля» і інш.

5. Як у вас варажылі на Каляды (Новы год)?

6. Ці чыніліся ў вас на Каляды свавольствы? Якія? Хто гэта рабіў? Чаму? Як ставіліся да калядных свавольстваў вяскоўцы?

7. Што рабілі на заканчэнне Каляд? Ці выпраўлялі Каляду «на дуба»?

8. Як называўся першы дзень Новага года? Хто хадзіў «засяваць»? Ці захаваўся гэты звычай?

**Увага!**
Абавязкова адзначайце сучасны стан традыцыі. Задавайце пытанні тыпу: «Ці адбываецца “ваджэнне казы” цяпер?».

## Велікодны дыскурс

1. Як святкуюць у вас Вялікдзень? Чаму ён так называецца? Ці гушкаецца моладзь на арэлях?

2. Што робяць з яйкамі-крашанкамі? Як іх выкарыстоўваюць? Напрыклад, гуляюць у біткі, качаюць з горкі або з жолаба, кладуць разам з золатам і серабром у ваду, якой умываюцца на першы дзень Вялікадня; маці гладзілі чырвонымі яйкамі па тварыках усіх сваіх дзяцей і г. д.)?

3. Якія прыкметы звязаны з валачобнай ноччу? Ці назіралі за «ігрой» сонца?

**Увага!**
Звесткі пра валачобніцтва можна запісаць на тэрыторыі Мінскай, Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай вобласці, а таксама ў Ганцавіцкім, Пружанскім і Столінскім раёнах Брэсцкай вобласці, Акцябрскім, Мазырскім, Рагачоўскім і Светлагорскім раёнах Гомельскай вобласці.

4. Ці ходзяць у вашай мясцовасці на Вялікдзень валачобнікі? Як іх у вас называюць? Можа, інакш (напрыклад, ралёшнікі, лалоўнікі, лалыншчыкі, кукольнікі, ранцавальнікі, валоўнікі, хрыстоснікі і г. д.)?

5. З каго складаўся гурт валачобнікаў (выключна мужчын, адных жанчын ці толькі дзяўчат)? Ці мог быць валачобнікам любы жыхар вёскі? Ці былі абмежаванні на ўдзел у валачобным абходзе? Якімі якасцямі павінны валодаць валачобнікі? Ці хадзілі валачобнікі ў мястэчках і гарадах? Што пра гэта вам казалі вашы бацькі і дзяды? Колькі чалавек бывае ў валачобным гурце (пяць, восем, пятнаццаць, дваццаць)?

6. Як размяркоўваліся ролі ў валачобным гурце? Як называліся яго ўдзельнікі (пачынальнік, запявала, падхватнічкі, музыка, механоша і г. д.)? Якую ролю адыгрываў пачынальнік? Якімі якасцямі ён павінен быў валодаць? Як яго ў вас называлі? Што рабілі падхватнічкі і як іх называлі ў вашай мясцовасці? Каму адрасаваліся валачобныя песні?

7. Якія музычныя інструменты былі ў валачобнікаў і з якімі яны ходзяць цяпер (гуслі, дуда, скрыпка і г. д.)? Як называўся выканаўца музыкі (скамарох, музычын, музычына)?

8. Што ўваходзіла ў абавязкі механошы і як яго ў вас называлі (механоша, механошы, кашаноша і г. д.)? Ці хадзіў механоша з высокім шастом у руках, на якім быў кавалак ці некалькі кавалкаў сала?

9. Што трэба было рабіць на Вялікдзень і што нельга?

## Юр'еўскі дыскурс

1. Як у вашай вёсцы адбываўся першы выган жывёлы на пашу? Што давалі жывёле есці? Чым яе падганялі? Якія прымалі ахоўныя меры, каб засцерагчы жывёлу ад хвароб, драпежнікаў, нячыстай сілы? Якія прадметы і рэчы выкарыстоўвалі ў якасці абярэгаў (напрыклад, сякеру, замок, касу, серп, нож, яйка, фартух)?

2. Што рабілі падчас сямейнага агляду жыта? З якой мэтай? Напрыклад, каб абараніць ніву ад граду, закопвалі ў канцы поля косткі, якія засталіся ад велікоднай трапезы. Гаспадар прамаўляў: *«Святый Боже, святый Еры! Заховай ніўку от граду!»*

3. Як адбываўся калектыўны карагодны абыход жытнёвага поля? Што насілі з сабою карагодніцы (каравай і граблі, крыж і ручнікі)? Што яны рабілі на полі (качаліся па расе, збіралі расу, вадзілі карагоды)?

4. Якім чынам вызначалі ведзьму-малочніцу?

5. Ці існавалі юраўскія забароны?

## Комплекс ваджэння і пахавання «стралы»

1. Як у вашай вёсцы адзначаюць «Стралу» («Ушэсце», «Хрэн», «Сена»)? Калі гэта адбываецца? Да якога каляндарнага свята прымеркавана? Чаму песні называюцца «лёлюшкі»?

2. Што сабой уяўляе «страла»? Што з ёю робяць? З якой мэтай?

3. Ці ўдзельнічаюць у абрадзе пераапранутыя? Які іх склад? Як яны сябе паводзяць? Як да іх ставяцца прысутныя?

4. Што адбываецца на полі? Якая функцыя дзяцей і пераапранутых? Ці выкарыстоўваюць абрадавыя стравы? Якім чынам? З якой мэтай? Што закопваюць у зямлю?

5. Якім чынам водзяць карагоды? Як яны называюцца?
6. Што адбываецца на другі дзень?
7. Ці адбываецца варажба?

**Куставы дыскурс**

1. Ці водзяць у вашай вёсцы Куста? Калі, у які дзень, у нядзелю ці панядзелак пасля Тройцы?

2. Як у вас называюць Куста (напрыклад, Куст ці Куста, Густ ці Густа, Молодая ці дві Молодых (дві Панны), Коста)? Як называецца сам абрад — «водыты Куста» ці «ходыты ў Куста»?

3. Хто выконваў ролю Куста? Дзе і як «апраналі» Куста? Галінкі якіх дрэў выкарыстоўвалі для ўбрання Куста? Куст быў увесь схаваны ў зеляніну або меў толькі вянок на галаве? Калі Куста называлі «молодой» (нявестай), то як ён быў прыбраны?

4. Як называлі тых, хто хадзіў з Кустам? Хто ўваходзіў у склад групы (жанчыны рознага ўзросту або дзяўчынкі, дзяўчаты і жанчыны вадзілі Куста паасобку)? Як хадзілі з Кустам — гуртам ці парамі? Куды ішлі напачатку — на поле ці па дварах (або толькі па дварах)? Якая размова адбывалася паміж выканаўцамі абраду і гаспадарамі? Што давалі гаспадары гурту? Ці вадзілі танкі? Якім чынам і пад якія песні?

5. Што рабілі з Кустам пасля заканчэння абходу (напрыклад, разрывалі зялёную вопратку на вуліцы, захоўвалі яе да Купалля, штурхалі Куста ў ваду, вялі ў хату, дзе здымалі з Куста ўбранне)? Што рабілі з вянком Куста і вянкамі дзяўчат? Ці дазвалялася прысутнічаць на частаванні мужчынам (хлопцам)? З якой мэтай вадзілі Куста і ці водзяць Куста цяпер?

**Дыскурс траецкай прозы**

1. Як дакладна ў вашай мясцовасці называецца свята Тройцы (напрыклад, Тройца, Трыйца, Труйца, Сёмуха, Сёмка, Зялёныя святы, Зялёныя сваткі)? Выкарыстоўваецца адна назва ці некалькі?

2. Як святкавалі Тройцу раней і як цяпер? Ці ўпрыгожваюць хаты ўнутры і звонку зелянінай? Якой? Што з ёю потым рабілі? Як яна называлася (напрыклад, май, тройца, клечанне)?

3. Ці хадзілі калі-небудь у лес да бярозкі? Ці знаёмы вам такія выразы, як «завіваць бярозку», «развіваць бярозку», «завіваць вянкі», «развіваць вянкі»? Што гэта значыць? Што рабілі з вянкамі? Ці варажылі на вянках? Ці адбываецца цяпер гулянне каля бярозкі?

4. Ці памятаюць у вас пра такі траецкі звычай, як кумленне? Хто і з кім куміўся?

5. Як святкуюцца Траецкія дзяды? У які дзень? Што адбывалася на сямейнай вячэры? Як называецца памінальная вячэра (напрыклад, Духовая субота, Тройчатыя дзеды і інш.)?

6. Якія цікавыя траецкія звычаі вы ведаеце?

### Русальны дыскурс

1. Як у вашай мясцовасці называюць абрад провадаў русалкі (напрыклад, «паліць русалку», «тапіць русалку», «закапуваць русалку», «заганяці на грушу»)? Калі ён адбываецца?

2. Што гэта была за русалка? Гэта быў жывы чалавек ці чучала? Якім чынам апраналі русалку? З якіх галінак і кветак выраблялі вянок русалкі? Ці была ў русалкі пара (напрыклад, русалін, «дачка»)?

3. Як пачыналіся провады? Адкуль і куды вялі русалку? Што з ёю рабілі? Як сябе паводзіла русалка? Ці шукалі русалку? Дзе яна хавалася?

4. Як паводзіла сябе русалка з абраным хлопцам?

5. Як завяршаўся абрад? Ці вярталіся за русалкай? Што рабілі з вянкамі?

6. Навошта, з якой мэтай праводзілі русалку (напрыклад, каб задобрыць яе, выгнаць, як шкодную істоту, на добры ўраджай і да т. п.)?

### Купальскі дыскурс

***Назвы свята***

1. Як у вашай мясцовасці называлася свята, якое адбывалася з 6 на 7 ліпеня?

2. Як называўся наступны дзень 7 ліпеня?

***Запальванне купальскага агню***

1. У якія дні года распальвалі (раскладвалі) вогнішчы (на Каляды, Вялікдзень, Благавешчанне, Юр'е, Купалле, Пятра і г. д.)?

Дайце кароткае апісанне абраду запальвання купальскага агню.

2. Ці выбірала моладзь кіраўніка або распарадчыка («урадніка») гэтага дзейства? У якім месцы распачыналі дзейства? Дзе раскладвалі вогнішча (каля вады, на адкрытым месцы за вёскай, на ўзвышшы, вакол дрэва, менавіта якога дрэва?).

3. Ці існаваў у вашай мясцовасці звычай зносіць з усёй вёскі ўсялякія старыя рэчы (старое адзенне, боты і г. д.)? А цяпер? Што пасля рабілі з гэтым хламам (вывозілі сабраны хлам на поле, дзе звальвалі ў кучу і пакідалі да ночы)?

4. Ці існаваў у вашай мясцовасці звычай падпярэзвацца палыном, ідучы на ігрышча? Як паводзіла сябе моладзь, ідучы на Купалле (браліся за рукі і выходзілі на поле з песнямі)?

5. Ці захаваўся звычай здабываць «жывы» агонь шляхам трэння сухога дрэва аб дрэва?

***Атрыбутыка купальскага вогнішча***

1. Ці ўтыкалі ў зямлю вакол вогнішча зялёныя дрэўцы? Для чаго гэта рабілі? Што ўтыкалі непасрэдна ў агонь? Як гэты прадмет называўся? Што на ім было (шчыт, кола, пудзіла)? Што дадзеная кампазіцыя сімвалізавала?

2. Што рабілі ўдзельнікі абраду, падпаліўшы касцёр (уладкоўваліся каля агню, частаваліся, спявалі, вадзілі карагоды і г. д.)? Што кідалі ў агонь? Як размяшчаліся вакол вогнішча хлопцы і дзяўчаты (па розныя бакі, побач, не мела значэння)?

3. Хто і як скакаў цераз агонь (хлопцы і дзяўчаты, паасобку, парамі, накрыж)? Як называлі тую дзяўчыну, якая не магла пераскочыць цераз вогнішча (напрыклад, ведзьмай)?

***Купальская ведзьма***

1. Каго лічылі ведзьмай (таго, хто не прыйшоў на Купалле; дзяўчыну, якая не пераскочыла цераз вогнішча; жанчыну, якая падышла да кастра і папрасіла агню). Каго яшчэ? Хто мог выконваць ролю ведзьмы (самая старая бабулька)? Як яна сябе паводзіла (падкрадвалася і спрабавала ўзяць галавешку з агню)?

2. Ці рабілі ў вас пудзіла ведзьмы? З чаго? Які яно мела выгляд? Што з ім рабілі (апраналі, насілі па вёсцы, спальвалі, тапілі, разрывалі на часткі і г. д.)? Як моладзь вартавала касцёр (праганяла «ведзьму», біла яе палыном і г. д.)?

3. Што яшчэ магло сімвалізаваць ведзьму (галава (чэрап) каровы або каня, якую спальвалі ў агні)?

4. Як абаранялі ад ведзьмаў і нячыстай сілы хату, жывёлу, жыта, малочны посуд?

***Звычай кумаўлення***

1. Ці існаваў у вашай мясцовасці звычай кумаўлення? Калі гэта адбывалася (у час Купалля, у Пятроў дзень, на Тройцу)?

2. Хто куміўся на Купалле (дзяўчаты паміж сабой, дзяўчаты з хлопцамі)?

***Папараць-кветка***

1. Ці шукалі на Івана Купалу папараць-кветку? Ці было павер’е, што з дапамогай гэтай кветкі можна бачыць усё, што згублена, схавана, знайсці клад?

2. Ці казалі, што кветку папараці ў гэту ноч ахоўвае нячыстая сіла? Ці былі спецыяльныя ўмовы для людзей, якія ішлі шукаць папараць-кветку? Ці існавала павер’е, што той, хто знойдзе папараць-кветку, будзе шчаслівы?

3. У некаторых месцах існуе павер’е, што папараць-кветку можна было ўбачыць роўна апоўначы. А як у вас? Ці існуе ў вашай мясцовасці легенда пра чалавека, які знайшоў папараць-кветку? Запішыце яе, калі ёсць.

***Бясчынствы***

1. Якія бясчынствы рабіліся ў купальскую ноч (цягалі колы, бочкі, пераварочвалі іх, закідвалі на дах; здымалі платы, выводзілі скаціну з хлява і г. д.)? Навошта гэта рабілася?

2. Як ставіліся вяскоўцы да гэтых бясчынстваў?

***Купанне***

1. Ці прытрымліваліся звычаю, што на Івана Купалу трэба купацца, або, наадварот, нельга было купацца?

2. Калі купаліся (ноччу, на досвітку, раніцай)?

3. Як купаліся хлопцы і дзяўчаты — паасобку ці разам? У якім выглядзе?

***Варажба***

1. Якім чынам варажылі на Купалле? Атрыбуты варажбы.

***«Ігра» сонца***

1. Як называецца «ігра» сонца (сонца грае, купаецца і г. д.)? Што гэта значыць?

2. Як трэба назіраць за «ігрой» сонца (прыжмурыўшы вочы, не моргаючы)?

## Жніўная проза

1. Як рыхтаваліся да зажынак? Як апраналіся, што бралі з сабою?

2. Каму даручалі зажынаць першаму? Ці ўдзельнічалі ў зажынках мужчыны? Што яны рабілі і як сябе паводзілі? Колькі снапоў нажыналі ў дзень зажынак? Што рабілі з першым снапом?

3. Што рабілі, каб пры жніве не балелі рукі (абвязвалі іх ніткай з вясельнага каравая, каласамі, вырванымі на тым месцы, дзе зажыналі, латачкай, якой былі звязаны ногі нябожчыка)?

4. Што рабілі, каб не балела спіна (затыкалі нешта за пояс, падпяразваліся перавяслам, качаліся на зямлі, нешта прыгаворваючы)?

5. Што рабілі з рэшткамі ежы пасля палуднавання на полі (пакідалі на мяжы для птушак, мышэй, мураўёў і нешта прамаўлялі, прыносілі дахаты для дзяцей і жывёлы)?

6. Што рабілі, калі знаходзілі ў жыце «залом», «завітку»? Які выгляд мелі гэтыя злакі? Каго вінавацілі ў «заломах»? Хто і як мог абясшкодзіць залом? Якую шкоду гаспадару поля чыніў «залом», калі яго выпадкова зжыналі?

7. Каго і якім чынам запрашалі на талаку? Як дражнілі жняю, што жала горш за іншых, заставалася апошняй?

8. Якімі абрадамі адзначалася заканчэнне жніва? Ці пакідалі на полі некалькі калоссяў і ў якім выглядзе (перавязвалі чырвонай шарсцяной ніткай, заплятлі, аблівалі вадой, палолі, клалі камень, хлеб, соль, пры-

гіналі да зямлі)? Як яны называліся («каза», «барада»)? Ці перакульваліся падчас дажынак па полі? Што яшчэ рабілі? Ці выбіралі каго-небудзь на ролю талакі?

9. Як вярталіся дадому пасля заканчэння жніва? Ці рабілі спецыяльны дажынкавы «букет»? Як ён называўся (вянок, кветка, барада, каза)? Які меў выгляд? Што з ім рабілі? Куды ставілі астатні сноп? Якім чынам потым выкарыстоўвалі зерне з яго?

10. Як сустракалі талачан? Што адбывалася паміж імі і гаспадарамі?

**Восеньская проза**

1. Якія вы ведаеце кароткія ўстойлівыя выразы наконт восеньскіх месяцаў, іх якасцей («Халодны верасень, але сыты»; «Лістапад зіме сцежку пракладае» і да т. п.)?

2. Ці прымяркоўваюць у вас час сяўбы азімых да пэўнай каляндарнай даты? Які час лічыцца найбольш спрыяльным (на Баўтрамея казалі: «Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей»)? Чаму?

3. На які дзень зямля «закрываецца» на зіму, адлятаюць птушкі ў вырай, хаваюцца ў норы змеі? Што ў вас кажуць пра вырай (дзе ён знаходзіцца, што гэта такое, чаму так называецца і г. д.)? Ці чулі вы што-небудзь пра змяінага цара? Што трэба рабіць пры сустрэчы з ім?

4. Ці чулі вы пра абрад «жаніцьба коміна» (пасвета, лучніка)? Калі і як ён адбываўся? Хто ўдзельнічаў? З кім «жанілі комін»? Ці спявалі пры гэтым песні? Якія?

5. Ці спраўляюць у вас свята Багач (Багатнік, Багатуха, Другая Прачыста (Спажа, Спожка), Гаспожка Багатая, Зельная)? Ці насілі ў гэты дзень кошык з жытам і свечкай у кожную хату і адрыну? Дзе яго пакідалі? Якія яшчэ звычаі звязаны са святам уборкі зерневых?

6. Ці спраўляюць у вас Стаўроўскія Дзяды? Якім чынам?

7. Ці ведаеце вы, чаму свята называецца Пакровы (Пакроў)? Якія прыказкі існуюць пра гэты дзень? Ці адметны ён якімі-небудзь звычаямі (дзяўчаты вытрасалі з прыполу апалае лісце і назіралі: у які бок яго панясе вецер — туды і замуж ісці)?

8. Раскажыце, калі ласка, як у вашай мясцовасці адзначаюцца Дзяды. Як называюцца асобныя памінальныя дні? Што павінна быць на стале? Якімі словамі запрашалі «дзядоў» на вячэру? Што казалі, выпраўляючы з хаты душы памерлых? Які быў парадак памінальнай вячэры? Што казалі пра «дзядоў»?

9. Раней дзяўчаты і жанчыны хадзілі на попрадкі. Ці збіраюцца суседкі на попрадкі цяпер, ці кожная прадзе ў сваёй хаце?

10. Ці вядомы вам забароны, звязаныя з прадзеннем (нельга прасці ў пэўныя дні тыдня, на святы, у той ці іншай квадры месяца, бо аслепнеш, будзеш пакараны (кім?), на тым свеце будуць калоць верацёнамі, маланка спаліць сена і г. д.)?

11. Ці чулі вы пра тое, што ноччу нехта мог прыйсці прасці ці ткаць («Пятніца», Божая Маці, русалка, хатнік і г. д.)? Што пры гэтым адбывалася?

12. Ці пралі часам своеасаблівую нітку? Калі, з чаго, якім чынам, дзеля чаго (для лячэння, варажбы, чараўніцтва і г. д.)?

13. Якія звычаі і забароны звязаны з днём Параскевы Пятніцы? У якім выглядзе яе ўяўлялі? З якімі просьбамі звярталіся дзяўчаты і жанчыны да Пятніцы?

14. Чым адзначана свята Кузьмінкі (Кузьма-Дзям'ян, Касьма Даміян)? Што расказваюць пра Кузьму і Дзям'яна? Хто яны такія? Аб чым клапоцяцца? Ці вядомы ў вашай мясцовасці расказы пра змаганне кавалёў Кузьмы і Дзям'яна са змеем?

15. Ці адзначаюцца ў вас, акрамя Дзядоў, таксама і Бабы? Калі?

16. Якія назіранні, прыкметы, звычаі і забароны звязаны з апошнім святам года — Міхайлавым днём (мядзведзі кладуцца на спячку, унукі наведваюць бабуль, да Міхайла трэба выткаць адны кросны і г. д.)? Ці лічыцца ў вас Міхайла абаронцам ад грому, уладаром вятроў? Што трэба рабіць у гэты дзень, каб не пакрыўдзіць Міхайлу?

17. Якія звычаі і прыкметы звязаны з піліпаўскімі запустамі (заговінамі) і Піліпаўкай? Што вы ведаеце пра «воўчае вяселле»?

## УЗОРЫ ЗАПІСУ ПРОЗЫ КАЛЯНДАРНА-СВЯТОЧНАГА ДЫСКУРСУ

| | |
|---|---|
| Калядны дыскурс пра выраб маскі казла | Бацька казла спляце з саломы, куль саломы падвяжуць, ды рогі сплятуць, ды хвост сплятуць, ды бубенчыкаў начапляюць на тога казла. І кажух такі яму падбяруць, цвет ці чорны, ці сівы, ці белы ўжо такі, але падбіраюць кажух, каб быў аднаго цвету. |
| Шчадрэцкі дыскурс пра маску ваўка, пераапрананні, весялосць | ...Строілі маску ваўка, убіралі аднаго парня, штоб шчодры сабраць і малышэй у хаце пужаць, штоб ім страшна была.<br>А як шчадруюць? Весела ды па-разнаму. Шчадруюць 6 января — вечар перад Калядамі. Моладзь ідзе ў шчодры, а то і старыя, перадзеюцца, |

| | |
|---|---|
| | бывала, шчокі буракамі мазалі, пераапранаюцца мужчына ў жэншчыну і наадварот, сажай мазаліся, а то, бывала, вадзілі, помню,ката на вяроўцы. Ат, дурэлі, весяліліся. Хадзілі пад вокнамі, пелі песні, славілі хазяіна і яго хазяйства дамашняе. А пелі такое:<br>Шчадрую, шчадрую,<br>У клеці сала чую... |
| Калядны дыскурс пра хаджэнне з зоркай | Молодэнько конэ запрагалэ в санкэ, то хутко бэжыть! Звэзду дэлалэ малые. Колэсцэ вырізвають, конікі уставляють, вонэ крутэтца. Ходыв стары чоловік со звэздой, научылэс од нэго. Як нэма дэтэй, то пелі: «Застылай столы, клады пэрогы» (далей падаецца поўны тэкст песні). |
| Калядны дыскурс пра куццю | Стол ставілі пад абразамі, а на стол пад вечар лажылі небагата сена і на яго ставілі гаршчок з куццёй. Куццю елі самі і давалі курам, каб добра несліся. |
| Калядны дыскурс пра закліканне Мароза | На багатую куццю гатовяць ежу разную, гасцей обязацельно завуць і крычаць у акно: «Мароз, мароз, ідзі куццю есці!» І даўжны обязацельно выстраліць із ружжа. |
| Калядны дыскурс пра гульні | Вечарам збіраемся ў адной хаце і гуляем у розныя гульні. У хванты, у жмуркі ці ўздумаем жаніць каго-небудзь, выбіраем жаніха і нявесту, садзім іх у вазок, самі ўпрагаемся і хутка вязем іх вянчацца. І вось у хаце мы гуляем вяселле, пажэнім, а тады радзілі яны ўжо. Яна платочак на жывот пакладзе — ужо пузаценькая ходзіць. Кукалку скруцім, мордачку нарысуем. Радзіла — надо ў адведкі ісці, хлеба і сала несці. |
| Калядны дыскурс пра варажбу з блінамі і каменнем | Дзеўкі хадзілі варажыць з блінамі. А першы жа блін маці на скаварадзе спячэ, дык з першым жа блінам бегаем. Каго ўстрэця? Як устрэця мужчыну старога, то так будзе там ці Мікалай, ці Пятро, ці Апанас, так будуць яе мужыка зваць.<br>Хадзілі ў баню, каменне кідалі ў пельку. Як каторая ўжо ўпусце камень, да не забурчыць, дык свякруха будзе харошая. А як у каторай забурчыць ужо, то свякруха будзе буркатлівая, не дай бог. |

| | |
|---|---|
| Хрышчэнскі дыскурс пра варажбу з ільном | Сіялэ сімне зо льну кай калодзеза і прыказувалы: «Дай божэ знаты з кім на шлюб статы». Увечыры той завжды прысныцца. Гадалы на Крышчэнне, 19 января. |
| Калядны дыскурс пра варажбу з абуткам | І тухлі, і валенкі выкідалі... Чэряз хвортачку выкідаіш: у які бок наском ляжа... Ці валенак кінеш, ці бурак, ці галош, хто ў чом абут... У які бок... У тэй бок замуж пойдзіш. |
| Стрэчаньскі дыскурс пра сустрэчу зімы з летам | Зіма з летам ўстрычаіцца на Ўстрэчанне... І вось хтось доўжын напіцца вады із стряхі... Ці певень?.. Баба казала.<br>Зіма ўходзя. Усё баба казала: «Зіма ўходзя... Зіма з летам стрячаіцца на Стрэчанне». |
| Стрэчаньскі дыскурс пра свечкі | На Стрэтэнье святять свички и гаворать, што эти свички — од грому. |
| Масленічны дыскурс пра маску «дзеда» | Адзежу яму — так як і чалавеку, і абуем. Размер, як сапраўдны чалавек. Глазы наводзім, бараду з ільну. Абкруцім твар белым палатном і на ём наводзіць глазы, нос, рот вуглём. Дзеду рабілі маркоўку і вяроўкай цягалі, каб маркоўка ўстала. Накрывалі цюлем, як пакойніка. |
| Масленічны дыскурс пра памінальную суботу | Радзіцелей мы памінаем у Тройцу, у Раданіцу і на Дзмітру. А яшчэ тая сыбота перад Масленкай, «таўстая» сыбота, радзіцельская. Матка наваріць куццю, спячэць бліноў абізацельна, кісель аўсяны...<br>А еслі баню ты топіш, становіш вядро з вадой, венік для пакойных радзіцелей. Ужо памыесся, усе з бані выйдуць, а паследні, хто выходзіць, кладзе на палок усё гэта. Радзіцелі піходзяць мыцца ў баню. |
| Масленічны дыскурс-дыялог пра пахаванне «дзеда» (Гарадоцкі раён) | З б і р а л ь н і к: А хто ён?<br>І н ф а р м а н т: Ну, дзед, стары.<br>З б і р а л ь н і к: А як дзелают?<br>І н ф а р м а н т: А во, з тряпак, з барахла.<br>З б і р а л ь н і к: А з чаго рукі і галаву?<br>І н ф а р м а н т: А з барахла, з саломы, ці з чаго. Ну і пыцу ягоную здзелаеш, канешна, як у чалавека, і нос — палку прыдзелаеш. Ну і паложыш яго на |

| | |
|---|---|
| | кут. Вот і сабіраюцца жэншчыны — піць і гуляць. Во зберуцца, кажный са сваёй бутылкай і закускай прыходзюць. Ну і танцуюць тада, дзеда харонюць, п’юць, гуляюць усю ноч.<br>З б і р а л ь н і к: А дзе харонюць, як харонюць?<br>І н ф а р м а н т: Завязлі куды за кусты, абярнулі і ўсё... |
| Масленічны дыскурс пра пахаванне «бабы» (Шумілінскі раён) | А яшчо знаеш, што было раз? Як Арліха на кут лягла. Бабу паміналі нейкую, сырам падавілася. І лягла на куце і ляжыць ужо, а жэншчыны падходзяць і галосяць па ёй. Як па пакойніцы галосюць, ага. Жывая лажыцца і здаровая, а яны ходзюць кругом... |
| Масленічны дыскурс пра «разуванне маладухі» | На Масленку хадзілі па хатах і пелі песні парам маладых, якія пажаніліся не больш года. Гэта называлася «маладуху разуваць». За спетую песню маладыя ставілі частаванне:<br>На вуліцы дзеўкі гулялі, гулялі,<br>Мяне, маладзеньку, гукалі, гукалі... |
| Веснавы дыскурс пра пусканне па вадзе запаленага кола | Звязуюць плот, на гэты плот ложуць калясо старое, запальваюць і пускаюць па рэчкі і ідуць з песнямі і пяюць эту самую вясну. Ідуць з песнямы ў край сяла, прыходжуюць патом на мост, там пяюць і абратна дальшы. Устрычаюцца два сяла, уліцы. І празнік. |
| Веснавы дыскурс пра гуканне вясны на Благавешчанне | Гукаць вясну пачыналі на Благавешчанне (7 апрэля). А да Благавешчання ніякіх песень не пелі. На Благавешчанне спявалі песні толькі пра вясну:<br>Ой, на первы дзень,<br>На Вялікдзень,<br>Ручэй коціцца,<br>Гуляць хочацца...<br>Ля вады распальвалі касцёр, вадзілі карагоды і спявалі песні «Вясна-вясёначка», «Закацісь да закаціся, сонейка». |
| Веснавы дыскурс пра провады вясны на Ушэсце | Вясну праважалі на Ушэсце. Сабіраюцца жанчыны, выбіраем жанчыну, адзяваем яе ў мужчынскую адзежу. Гэта паніч у нас. Потым паненка красівей адзяваецца, атлічаецца. Ідуць |

| | |
|---|---|
| | яны пасярэдзіне, а людзі ідуць паабапал. Пяём песні. А да рынку дойдзем, танкі водзім. А тады ўжо ідзём к жыту, дзе жыта пасеяна, і ў жыце закапваем ляльку. Ляльку такую ўжо носім у люляцці, у каробацццы — гэта ўжо лічыцца вясна. Закопваем і ўсе пяём. Хто кажа: «Ты сёлета была нехарошая, сухая, каб ты такая не вярнулася, вясна, болей. Ты нам не нада! Закапайце яе!» Хто што прыказваюць, плачуць, выдумляюць што. А тады кажуць: «Хадзіце, людзі, на абед, ужо пахавалі вясну». Ідзём на абед. А як па вуліцы ідзём, «стралу» пяём.<br>Пачынаем хадзіць: ходзім, каб усе вуліцы абысці. На той бачок зойдзем, гарманіста возьмем. Пяём усякія песні — «Паня папа не ўзлюбіла» (далей падаецца поўны тэкст песні). |
| Велікодны дыскурс пра гушканне «на калысках» | На Вялікадне калыска была абязацельна. Піялі асобенныя песні: «Ускалыхніце высока, каб я відзела далёка». Гэтыя песні пелі толькі на калысцы. |
| Велікодны дыскурс пра гульню з яйкамі | У первы дзень пасля разгавення людзі сярэдніх лет яйкі качалі. Зроблены былі такія, як карыцечкі, латкі, адзін метр і меншы. І многа такіх наставяць пад наклонам, і кажды у свой латок кладзе яйка, і пакоціцца яно далёка, далёка... Ну а тады ўжо тваё і маё пакацілася, і калі стукнуцца, а маё зверху, то я выйграю... |
| Велікодны дыскурс пра «ігру» сонца | А вот раз відзела ў малых гадах, як сонца іграла. Ай, як прыгала, каб ты відзела! Ай, як красіва, як красіва! І во так, і во так, і во так... Папалам раздзяляецца, вот эта я відзела сваім глазам. Так іграла! |
| Велікодны дыскурс пра ўшанаванне пастуха | На Паску, як товар иде, и пастуху выносят хлиб, яйцо, сало. |
| Велікодны дыскурс пра забарону працы на полі | На Пастку Сухи чятвер, не можно ў поли робить, полоть, бо посохне, не буде дождя. |
| Юраўскія дыскурсы | На Юр'я рано, рано, до сонца выгонялы коровы на Юр'еву росу. Старалыся першым выгнать, а гэто до чого, шоб корова много молока давала.<br>На Юр'я, кажуць, што Бог дае расу, і пагэтаму гоняць першы раз скаціну на раніцу, каб з расою |

| | |
|---|---|
| | паела скаціна тае травы. Кажуць, як на Юр'я карова паесць травы з Божаю расою, то будзе многа малака, малочна будзе карова.<br>Людзі ж хадзілі і расічку збіралі цадзілачкамі, каб кароўка малака давала многа. Назбіраюць Юр'евай расы і ў гэтай расе цадзілку мылі, што малако цэдзяць... |
| Юраўскі дыскурс<br>пра абярэг скаціны | На Юр'я клала гаспадыня тапор на зямлю каля варотаў (на двары) і прыгаворвала: «Як гэтае жалеза ляжыць, хай так і скаціна з поля не сходзіць». |
| Юраўскі дыскурс пра<br>агледзіны поля з караваем | Гаспадар бярэ каравай і ідзе аглядаць пасевы. Калі каравай вышэй жыта, то будзе добры ўраджай. |
| Юраўскі дыскурс<br>пра абход поля з хлебам | Пырыд Юрыем пыклы пырогы. До всходу сонца ідуць на росу с хлібом, обходять Юр'евыка, там, дэ посіяно жыто чы пшыныця. |
| Юраўскі дыскурс<br>пра карагод | Дзеўкі на Юрэй роб'яць корогода, лом'яць цветы і затыкаюць у той корогод. Становіць хлопец той корогод у жыто. Дзеўкі ў жыце поспеваюць: «От жэ корогод, от жэ наглы, дзе корогод ходзіць, там жыто родзіць, а йдзе не бувае, там жыто ўлегае». |
| Юраўскі дыскурс<br>пра вызначэнне ведзьмы<br>з дапамогай ручніка | Жэншчыны, у каторых рубасцы нема, напрадуць і вуткуць рушніка за дзень. На Юр'я ідуць на капліцу і несуць іконы. Расцілаюць рушнік між йікон, і кажна гоніць сваіх кароў. А катора жэншчына малако атнімае, дак ужэ і не пагоніць. І му ўжэ прігледаемся. Мурашок еціх, кастріцы набером, возьмом і пойдом іх двор перасыпаць. Ані ужэ назаўтра клянуць нас — юй ужэ чэрві ў малаке. |
| Юраўскі дыскурс<br>пра забарону працы<br>і выкарыстання жывёлы | На Юрья старые людзи повупрагаюць волы и сидзяць пуд плотом — нихто ни за во што не береца. На Юръя, борони Бог, не запрагали, кони, волы гуляюць па пашы. Юрей ля худобу, штоб худобу Господь хранил од ўсякого. |
| Стралавы дыскурс<br>пра грамадскае значэнне<br>абраду | Па-калісяшнаму, па-божэскі «Стрялу» правесць — ета большое дзела. І баба гаворя: «Дай, Госпадзі, штоб я і на лета правяла "Стрялу"... Штоб я дажыла і да таго года...» |

| | |
|---|---|
| Стралавы дыскурс — апісанне абраду «Хрэн» | У нашай мясцовасці празднавалі «Хрэн» («Страла») пасля Пасхі на шастой нядзелі ў чацвер. Спачатку дзеўкі ёлку дзелалі з сухога дзерава, дзелалі бумажныя цвяты на ёй. Потым ідом таўпой па вуліцы, нясом ёлку да жыта, танцуем і пяём «Хрэна» (далей ідзе тэкст песні «У пастын хаджу, хрэн-рамон саджу»).<br>Пасля ў жыце ўжэ не пяём, елку ў жыта ставім. Нітачкі з хустак дзеўкі ў зямлю закапываюць, штоб жыта расло. Пелі песню «З-пад лесіку, леса цёмнага» (далей ідзе тэкст песні).<br>Пасля ідом на вёску, заходзім у адну хату, там стол стаіць, гарэлка. Гуляем у той хаце, потым ідзём у другую хату, там пяём, танцуем, далей пайшлі. Так і гуляем цэлы дзень. |
| Стралавы дыскурс пра ўдзел у абрадзе пераапранутых | На Ушэсце стралу вадзілі. Ідуць тры-чатыры рады па вуліцы. Выбіралі старцаў, якія ішлі спераду. Старцаў рабілі для шутак. Ляльку рабілі. Цыган і цыганка ідуць, з лялькай шуцяць. Пелі песню «Ды ідзець страла ды ўдоль сяла» (поўны тэкст). Да жыта вадзілі стралу. Там ставяць стол, выносяць хлеб-соль, карагод водзяць. Бяруць зямлю і кідаюць уверх, каб лён радзіў. Ад Пасхі да Ушэсця пелі лёлюшкі, а потым ужо нельга пець іх. |
| Стралавы дыскурс пра дзеянні на полі | ...Потым вядом стралу ў жыта. У нас так казалі, што страла ходзя па малання, то людзей б’е, то хаты паля. Так кажуць, што трэба яе адвесці ў поле і закапаць, каб яна не хадзіла па дзярэўне і шкоды не рабіла. Калі закапвалі, то гаварылі: «Ляжы, мая страла, ды на лецейка, пакуль я прыду». Хто каласкі закапваў, а хто капейкі, хто што закапвалі… А тады шчэ рвуць тры каласкі, нясуць дамоў, над крышай торкаюць, штоб вецер крышу не рваў. |
| Стрэлавы дыскурс пра «Шуму» | «Шума» — гэта высокі шост, а зверху на ім салома. Дзяўчыну падсаджвалі к шасту, а тая павінна была падчапіць і закруціць саломінку (нібы прадзе кудзелю), астатнія вадзілі карагод і спявалі: «Ой, нуце, туце, я ў шуму гуляці». А як карагод наблізіцца да дзяўчыны, яна б’е тычкай па нагах, астатнія ратуюцца ад удара. |

| | |
|---|---|
| Стрэлавы дыскурс пра ваджэнне «сулы» | На другі дзень, як выйдуць з цэркви, вадзілі сулу. Пачыналі з аднаго краю сяла і ішлі сялом у лес, там танцавалі і пелі песню «Да Сула, Сулачка»… |
| Куставы дыскурс пра адсутнасць традыцыі | Нашы жэншчыны не вадзілі, а ў нас прыхадзілі з другоі вёскі, з Багданаўкі, гэта Лунінецкі раён. Прыходілі жэншчыны з мужчынамі, адяваліся, Куста ўбіралі і вадзілі, у нас такога не было. |
| Куставы дыскурс пра прыбыранне хаты зелянінай і ваджэнне Куста | Прыносылы з лісу бырызытыну, клён і прыбывалы до хаты кай двырэй і кай окон, у хаты тожэ затыкалы ў кутках, за образы, над двырэма. Рвалы яйір і сыпалы на дворі, каля хаты. Дівчану обкручвалы клёнам, бэзом, бырэзыною, ано то могла руку высунуты. А потым водылы по сылі, водылы Куста. Спывалы гэту пысню:<br>Выдэм Куста в зылёному клёну,<br>Выкынь, пане, хоть по золотому.<br>Выдэм Куста в зылёному бырвынцу,<br>Выкынь, пане, да хоч по чырвінцу.<br>За пысню люды давалы дар, хто шчо мае. |
| Куставы дыскурс пра ваджэнне Куста ў выглядзе малодой | На Труйцу Куста водять — як молодую уберуть, венка наложать. |
| Куставы дыскурс са згадваннем коста | На Труйцу ўбыраюць девочку чи мальчика, да голлем утычуть — лыпу, сырэнь. Да йдуть. Йдуть до пана у маентак. [Там пели:] «Убралы коста да з великого клёна. Дай, нам, паночку, хоть по золотому». |
| Куставы дыскурс пра ўбранне Куста дзяўчатамі | Раньшэ водылы Куста, яшчэ була тогді мала, годов восім було, но я всё равно цікавіласа. Ломалы клён, вэлы вэнкы, збіралыса дэвкы, дома убыралы. На дворы збыралыса, вэнкы тые на голову накладалі... дэвкы нэзамужніе. Одна нэсла на голові, остальные шлы позаді. |
| Куставы дыскурс пра ўпрыгожванне калодзежа | Як назбыраюць грошэй, хто яйця давав, хто грошы давав, хто сало, да ужэ вэнка прыносять до колодезя, втягають коворота того і на коворот вішалы. Я сама тые разы усё прыглядаюса, і вун цэлу нэділю вісіть, покуль труйца вэдэцца. |

| | |
|---|---|
| Траецкі дыскурс пра назву свята | Тройца называецца Дух. Клён ломляць і несуць на могілкі мёртвым. Вроде жывым Тройца і мёртвым Тройца. Дух мо ў понеделок. |
| Траецкі дыскурс пра выкарыстанне зеляніны | Як Труйца, то бацько закопае бэрозу, орабыну коло порога, позатыкають голынкы у хаты — і гэтэ высушыть, і хавають, пока класты жыто у стожок. Клалы і казалы, то мышы нэ будуть йісты жыта. |
| Траецкі дыскурс пра купанне, спевы, моладзевую вячэру | Як я мала была, то говорылі на Духа надо іцці купацца. То мы ідём на рэчку купацца первы раз. Колісь до Духа старыя не купалісь. Говорылі, трэба первы раз на Духа пойці помыцца, до Тройцы, девка, не іді купацца.<br>На Тройцу тры дня нічога не делаем, а тры дня можна, але всё роўна<br>Тройчаны тыждень. Жэншчыны собіраюцца чоловек 50, беруцца за рукі і ідуць по уліцам, співають тройчаны песні.<br>У нас на Тройцу дівкі готовяць вечэру, хлопцы ідуць. І сейчас у нас таке. Жарят яечніцу, выпіўку беруць. Галі я сама дала. Два вечары гулялі, под радіолу танцовалі. |
| Русальны дыскурс пра апрананне і ваджэнне русалкі, свавольствы хлопцаў | На русальную нядзелю калісь вадзілі русалку. І сьпеваюць: «Проведу, проведу русалочку до бору». І тады венкі етые скідаюць з галоў. А дзе русалка йшла, з берозы венок чэпляюць у варота кладбішча. Русалку адзявалі ў белае адзенне і зелёный венок да розавуй. А дзевушкі другіе ў всякуму разнум. А венкі сабе кожна саўе із цветоў, па лесу наломець. Кагда с кладбішча ідуць, ну, тады хлопцы маладые сабіраюцца туды. Венкі тые пашшыбаюць ужэ, угору падкідаюць. Да хлопцы іх — панамочваюць розкі, наломяць да хочуць пабрыскаць дзевак. Дак хто куды папала ўцекае. І агні палілі. Бяросту здзерэ з берозы, берэсцінку, да накіне, да запаліць. Пробуе і агнём подпаліць дзевак. Русалкай выбіралі кого папала, хто согласіцца: я, чы ву, чы ані, хто согласіцца. От я буду русалка. У русалкі венок з бярозы, здоровуй, аж цягнецца по землі. |

| | |
|---|---|
| Русальны дыскурс пра дзеянні з русалкай у полі | Праводзіцца абрад гэты ў полі, усе ўдзельнікі свята ідуць туды з песнямі і плясками, вядуць русалку ў жыта і там качаюць яе па жыту. А хлопцы дзевак стрыкаюць крапівой, дзеўкі прыгаюць цераз вогнішча і хаваюцца ад хлопцаў у жыта, а хлопцы шукаюць дзяўчат у жыце. |
| Русальны дыскурс пра магічнае выкарыстанне вянкоў | Правядуць русалку, а самі ідуць дадому, кідаюць вянкі на грады, на гуркі. Гэта, кажуць, на ўраджай. Гэта па-калішняму такая прымха была. |
| Русальны дыскурс пра русалку-чучала | Чучала рабілі з саломы, з сярэдняга куля, здзелаям як чалавека, уніз калосся, а ўверсе камель. Пасярод перавяжам повясам (у каго е дзіравій, красный), а тады павірэзуім шыю кругам, кала камлей тады пахожа як галава. На ету галаву зав'яжам завязку і надзенем чапец... Тады напраном попку — кароткія армякі, шчо па тры хвасты ззаду. І рукі дзелаям: выхвацім з бакоў па жмені саломы, да абкруцім хустамі, да парав'яжам пат плечы, яны і стырчаць. На шыю хустачку красненькую зав'яжам... На галаву вянок кладом із красак... |
| Купальскі дыскурс пра паленне траецкага маю | Вот пад Івана Пукайла ўжэ нясом еты траецкі май пад лес. У нас там лес такі, пад лесам пясок, мы ў гэты пясок усе дзеравы свае ўстаўляем, а тады запалім. |
| Купальскі дыскурс пра абарону ад ведзьмаў і ваўкоў | На Купалу бараніліся ад ведзьмаў і ваўкоў. Ну, косы лажылі ці чартапалох, крапіву на парог. Што-небудзь на парог вострае лажылі ці то палын, чартапалох, крапіву затыкалі так вот пад дзвярамі. Гэта лічылася, што ведзьма прыйдзе, туто парэжацца, апячэцца, уколецца. Ну, не выпускалі коней на ноч. Гэта так абаранялі гэтыя дзверы, бо казалі, што ў гэтую ноч ведзьмы крадуць. |
| Купальскі дыскурс пра выкарыстанне папараці | Купалля. Ета ціперь ужо здзелалі празнік Купалля. А тады Купалля, баба скажа: «Сёдні дзень Купалля». Ну і ўсё. «Ідзіця, дзеці, папараці ў двор прынясіця». Яна клала папараць у сараі, утыквала. Папараці ж каровы не ядуць. Дак яна: «Бярыця, утыкнём!» Утыкня ў сцяну папараць тую, у хату паложа. [А для чаго тая папараць?] Ета калі б счас бы — папытаў. А тады кладзе баба, ета бабіна дзела... |

| | |
|---|---|
| Купальскі дыскурс пра вясковыя свавольствы | На Купайло лодки повысмыкають на дорогу. Немовыста робыли што у нас. Завалять дорогу, немовыста нэ пройдэш. |
| Купальскі дыскурс пра варажбу па вянках | Абязацельна вілі вянкі, сплятал і. Выходзілі вечарам, вянкі на воду кідалі і загадвалі ўжэ свае загадкі: чый паплыве — дак ужо тая замуж пойдзе, чый патоне — тая памрэ. А для русалак абязацельна рвалі з жоўтых люцікаў. Етыя цьвяты ў нас называліс «русалкі». |
| Купальскі дыскурс пра час, калі сонца «іграе» | Тэпэр Купайло — сонцэ грае, потом на Яна ранэнько грае, а потом ўвечары грае. Грае, але кажуть, што сонцэ клынэ, як на его дывяца. |
| Жніўны дыскурс пра першую жменьку жыта | Ужыная перву жменьку — як сярпом узяць — нясе дадому перву жменьку і ня кажа: «Прынесла станок», а скажа: «Прынесла кулідку і піражок!» Дома схаваюць. А як ацеліцца кароўка, тады нада працадзіць малозіва цераз эту саломку. А тады тую саломку бярэ, парыц даёнку этай саломкай, кідае цаглінку туды, штоб малако чыстая було, штоб сыр моцны буў. |
| Жніўны дыскурс пра ведзьмаў і завіткі | Ведьмы роздевалыса догола і шлі завіваты, находылы, коб нэ до пары буў куст. Робылы тэе, коб у хозяйстве нэ вэлось. Бояцца завітку зачэпыты — обожнуть, покінуть, а тогді ужэ вырвуть, альбо на месті там запалють. Вырвы да спалы, то, кажуть, на крыжову дарогу трэба вынэсты да тожэ спаліты чы закопаты. Знахор паліть ее ноччу, у двенадцать часоў ночы. |
| Жніўны дыскурс пра казу | Каза — гэта недажатае жыта. Вот, напрімер, становяцца жанчыны жаць... А ты астаўся ссадзі — значыт, на казе. |
| Жніўны дыскурс пра дажынкавую «бараду» | Як дажынаюць жыта, возьмуць пяць каласкоў, палку паставяць і к палке каласкі прывяжуць. Цвятоў многа нарвуць, ету бараду прыбяруць красіва — ззяе, як кукла, тая барада. На полі палосак было многа — і ў каждага барада: стаяць, як куклы. Хлеб-соль лажылі, нада зямлю паблагадарыць, што дала ўраджай, таму і астаўляюць. |
| Жніўны дыскурс пра ўшанаванне жней | Як жнеі ідуць да хазяіна, ён устречаець іх з булкай хлеба. Жнеі адзяюць на голаву хазяіна вянок, а ён ім плоціць за ета дзеньгам, жнеі паюць яму. Потым хазяін запрашае іх за стол. |

## Сямейна-абрадавы дыскурс

Сямейна-абрадавая проза — вельмі шырокі пласт народнай культуры, звязаны з радзінамі, хрысцінамі, вяселлем і пахаваннем. Яна добра знаёма вясковым жыхарам, таму знайсці дасведчаных інфармантаў зусім нескладана. Жанчыны здольны падрабязна расказаць, як адбываецца, напрыклад, вяселле, якіх правілаў прытрымліваюцца пры пахаванні набожчыка, а вось запісваць аповеды «ўручную» вельмі цяжка. Лепш за ўсё карыстацца тэхнічнымі сродкамі. Калі вы не ўсё паспелі запісаць дакладна і вымушаны пераказваць сваімі словамі, то пры афармленні гэту частку трэба пазначыць квадратнымі дужкамі. А калі ўвесь запіс з'яўляецца вашым уласным пераказам, то ён цалкам падаецца ў квадратных дужках.

**Радзінна-хрэсьбінны дыскурс.** Каб лепш арыентавацца ў радзінна-хрэсьбіннай частцы сямейна-абрадавага дыскурса, трэба ведаць яе галоўныя тэмы. Яны наступныя: нараджэнне дзяцей, забароны пры цяжарнасці, прыёмы палягчэння родаў, роды і паводзіны прысутных, дзеянні з пупавінай і паследам («дзіцячым месцам»), правілы прыёму нованароджанага, першае купанне, імя немаўляці, хрэсьбіны, хрэсьбінныя чыны, бабіна каша, падарункі і зычэнні, ушанаванне бабкі.

**Вясельны дыскурс.** Асноўныя тэмы вясельнай прозы датычацца пэўных момантаў вясельнай абраднасці, дзеянняў вясельных чыноў, вясельных атрыбутаў, іх вырабу і дзеянняў з імі, вясельных гульняў і пераапрананняў. Пры захаванні агульнага сцэнарыя вяселля яго этапы могуць мець варыянтныя назвы, якія збіральнік павінен высветліць. Акрамя таго, існуюць лакальна-рэгіянальныя элементы вясельных абрадаў, якія адсутнічаюць у іншых мясцовасцях. Напрыклад, на Гомельшчыне гэта «Продаж ёлкі».

### Сямейна-абрадавы звычай «Продаж ёлкі»

«*Як у хату маладое прыйшоў малады і запалілі свечкі, то ён з княжнымі — дружкамі і сватамі — павінен выкупіць ёлку. Дзяўчаты таргуюцца за яе і за мала не хочуць аддаваць і пяюць: “Мы па ёлку хадзілі...”*»

Мясцовымі з'яўляюцца таксама звычаі «страляць зайца», «гуляць куру» і інш., таму заўсёды варта пацікавіцца, якімі вясёлымі момантамі вызначаецца вясковае вяселле.

Пры афармленні запісу трэба праз загалоўкі адзначыць моманты вясельнага абраду. У кожным канкрэтным выпадку загалоўкі будуць розныя. Напрыклад: сямейна-абрадавы дыскурс пра сватанне, сямейна-

абрадавы дыскурс пра заручыны, сямейна-абрадавы дыскурс пра першы дзень вяселля, сямейна-абрадавы дыскурс пра каравай, сямейна-абрадавы дыскурс пра расплятанне і заплятанне касы і пад. Трэба арыентавацца на змест расказанага.

Можа стацца так, што інфармант раскажа пра які-небудзь адзін вясельны абрад, тады яму таксама трэба даць загаловак, выкарыстоўваючы мясцовую тэрміналогію. Напрыклад: «Сваты», «Сватанне, запоіны», «Змовіны (заручыны)», «Завіванне маладой», «Суканне свечак», «Пасад», «Трэці дзень», «Пятухі». Калі вы запісалі кароткі аповед пра ўсё вяселле і няма сэнсу вылучаць часткі вясельнай абраднасці, зрабіце агульны загаловак, напрыклад «Вяселле ў вёсцы Палацечка Баранавіцкага раёна».

Такім чынам, мэта збіральніка — запісаць складныя аповеды пра мясцовае вяселле, яго асобныя этапы, абрады і звычаі: даведкі, сватанне, запоіны, заручыны, зборная (суборная) субота (вяночкі, паненскі вечар і г. д.), каравай, пасад (саджэнне на дзяжу, расплятанне касы, застрыганне, пакрыванне); прыезд дружыны маладога да маладой, розныя віды выкупаў, шлюб (вянчанне); пераезд да маладога, камора, пасаг, выпрабаванне маладой, падзел каравая, адорванне маладых, «цыганы»; пярэзвы і г. д.

**Парада**
Запісваючы адказы на пытанні, звярніце асаблівую ўвагу на вызначэнне семантыкі рытуальных і культавых прадметаў. У адпаведнасці з поліфункцыянальнасцю вясельных абрадаў асаблівым багаццем вызначаецца сімволіка зерня, хлеба, расліннасці, ручніка.

Запішыце самыя цікавыя прыклады выкарыстання хлеба ў перадвясельных абрадах, выявіце яго функцыянальнасць. Хлеб сімвалізаваў сур'ёзныя намеры сватоў і жаніха, жаданне жыць у згодзе і шчасці, згоду дзяўчыны на шлюб, дастатак у новай сям'і. Хлеб і сыр сімвалічна раскрывалі жаданне сялян прадоўжыць род.

**Даведка**
Вялікае значэнне для шчасця будучай сям'і меў вясельны каравай, выпечаны ў адпаведнасці з абрадам. Склад каравайніц у розных вёсках фарміраваўся згодна з мясцовым звычаем, але заўсёды сачылі за тым, каб у выпечцы каравая прымалі ўдзел здаровыя, шчаслівыя ў сямейным жыцці жанчыны і мужчыны. Выпечку каравая падрабязна абмяркоўвалі ў час змовін. Кожная каравайніца прыносіла, калі так было прынята, пшанічную муку, хлеб, сыр, масла, ужо гэтым забяспечваючы перадачу маладым шчасця і дабрабыту.

Перш чым сыпаць у дзяжу муку, хросная маці або старшая каравайніца тройчы прасіла благаславення ў Бога і ўсёй грамады «краснай панне каравай учыніць». Вядомы звычай перакручваць дзяжу і ставіць яе на крыж супраць печы. Пільна назіралі за надвор'ем. Напрыклад, у пахмурны дзень рашчынялі каравай, як толькі сонца выглядвала з-за хмар, каб у жыцці маладых не было няшчасцяў і клопатаў. Каравай ніколі не рабілі моўчкі, а абавязкова пад рытуальныя спевы.

Ручнік быў адным з неабходных атрыбутаў у вясельным абрадзе. Ён займаў важнае месца ў пасагу нявесты, у падарунках маладой маладому, сватам, родзічам жаніха. Ручнікам перавязвалі цераз плячо найбольш важных асоб вяселля (сватоў, бацькоў). Ручнік падсцілалі як «падножнік», на які станавіліся жаніх і нявеста ў час царкоўнага вянчання. Нельга было абысціся без ручнікоў у час абрадавага звязвання маладых, выкарыстоўвалі іх для абгортвання рук маладой і маладога ва ўрачыстыя моманты вясельнай цырымоніі. На Палессі ручнік, завязаны на руку, дапаўняў вясельны строй маладой.

Адна з найбольш характэрных абрадавых адметнасцей вяселля — наяўнасць надзвычай багатай сімволікі, якая сустракаецца ўжо ў час перадшлюбных абрадаў. Варта спыніцца толькі на асноўных момантах.

У зборную суботу («дзявочы вечар», «паненскі вечар», «зборны вечар») дзяўчаты садзіліся за сталом і вілі вянкі, якія адыгрывалі важную ролю на вяселлі, сімвалізуючы сабою дзявочую чысціню, маладосць. Упрыгожанні з кветак і стужак рыхтаваліся не толькі для нявесты, але і для маладога, шафераў і шаферак. У асобных мясцовасцях, напрыклад на Гомельшчыне, дзяўчаты «вілі ёлку» — упрыгожвалі каляровымі кветкамі, саламянымі крыжыкамі, свечачкамі галінку елкі ці вішні.

У хаце маладой качалі цеста пад спевы, а старшая дружка віла ў гэты час вяночак на пярсцёнку, уплятала ў яго руту. Вяночак, які аздобіць галаву маладой, дорыць ёй на каравай малады. Гэта сімвалізуе згоду і надзею на ўзаемнае шчасце. Вянок мог сімвалізаваць і адмову нявесты ад шлюбу. У гэтым выпадку вянок чаплялі на доўгую палку і ўтыкалі яе на двары жаніха.

Паэтычнасць вясельных сімвалаў пацвярджаецца песнямі, у якіх выкарыстана народная паэтычная сімволіка і тлумачыцца яе сэнс. Напрыклад, каліна сімвалізавала дзявочую цноту. У Столінскім раёне і цяпер у некаторых вёсках нявеста, якая захавала сваю цнатлівасць, спявае песню пра каліну. Каліна сімвалізуе таксама і дзявочую прыгажосць.

**Пахавальны дыскурс.** Пахавальна-памінальны фальклор падзяляюць на *плачы*, *хаўтурныя* і *памінальныя галашэнні*, *песні-псальмы*. Складанасць запісаў галашэнняў заключаецца ў іх абумоўленасці абрадам і ў імправізацыйным характары. Асноўная частка пахавальных абрадаў амаль не захавалася, але зафіксаваць галашэнні магчыма і цяпер, таму што інфарманты памятаюць, як гэта рабілася раней, і ўзнаўляюць традыцыю.

**Увага!**
Неабходна адрозніваць плачы і галашэнні. Плачам не трэба было вучыцца, гэта — крык душы, маўленчае выражэнне гора, таму фармальна плачы часцей за ўсё былі кароткімі сапраўднымі імправізацыямі. У галашэннях жа захоўваецца традыцыйны паэтычны малюнак, які і ўзнаўляецца выканаўцамі. Звычайна інфарманты пагаджаюцца выканаць менавіта галашэнні (не плачы!), але памятайце, што гэта патрабуе ад іх вялікага эмацыянальнага напружання.

Задача збіральніка — запісаць аповеды аб пахавальным рэгламенце ў канкрэтнай мясцовасці і памінанні нябожчыкаў. Асаблівую ўвагу звярніце на тое, каб зафіксаваць народную тэрміналогію і фразеалогію.

Перш за ўсё даведайцеся, што кажуць пра чалавека, які памірае (напрыклад, «збіраецца ў дарогу», «зямлёй пахне»), знаходзіцца ў стане прадсмяротнай агоніі (напрыклад, «канае»), і пра сам смяротны канец (напрыклад, «сканаў», «пайшоў да дзядоў»).

Засяродзьце ўвагу на галоўных тэмах, звязаных з пахаваннем і памінаннем: падрыхтоўка набожчыка да пахавання, правілы вынасу труны, правілы пахавання, рэгламент памінак, памінанне на працягу года, агульныя памінанні ўсіх нябожчыкаў, уяўленні пра смерць і душу.

## ? АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ ПРОЗЫ СЯМЕЙНА-АБРАДАВАГА ДЫСКУРСУ

### Радзінна-хрэсьбінная проза

1. Што рабілі для таго, каб былі дзеці або каб яны нарадзіліся праз два — чатыры гады пасля вяселля? Напрыклад, у першым выпадку на вяселлі клалі за пазуху яйка, садзіліся на лаўку, дзе ляжаў хлеб, з’ядалі зерне жыта-самасейкі і г. д., а ў другім — кідалі грошы на (у) печ, на вяселлі садзіліся на пальцы і г. д.

2. Што забаранялася рабіць цяжарнай жанчыне? Чаму?

3. Як у вашай мясцовасці называлі жанчыну, што дапамагала пры родах (бабка, павітуха, родавая бабка і інш.)?

4. Якімі словамі звычайна запрашалі павітуху?

5. Што рабілі для палягчэння родаў?

Абавязкова паспрабуйце высветліць ролю мужа. Напрыклад, вядома, што на Палессі існаваў звычай «кувада», калі муж, каб дапамагчы жонцы, сімвалічна браў на сабе яе боль, стагнаў і войкаў. Даведайцеся, ці памятаюць пра гэты звычай, ці прытрымліваюцца яго ў наш час.

6. Як называлася «дзіцячае месца»? Што з ім рабілі — закопвалі (дзе, асобна або з іншымі рэчамі) ці захоўвалі (з якой мэтай)?

Якія існавалі правілы адразання пупавіны, яе прыкладання да пэўнай рэчы (якой і чаму), закопвання і захавання (для чаго)?

7. Хто першы раз купаў нованароджанага? Ці існуюць розныя правілы купання дзяўчынкі і хлопчыка? Якія і чаму?

8. Як засцерагалі парадзіху і нованароджанага ад сурокаў?

9. Каму дазвалялася адведваць парадзіху, а каму не? Што неслі на адведкі? Якія пажаданні выказваліся парадзісе наведвальніцамі?

10. Як святкавалі хрэсьбіны? Каго, хто і якімі словамі звычайна запрашаў у кумы? Як яны павінны сябе паводзіць, ад'язджаючы да царвы, у дарозе, вяртаючыся пасля хрышчэння?

11. З якімі словамі бабка перадавала дзіця кумам перад хрышчэннем?

12. Калі сядалі за хрэсьбінны стол?

13. Калі і як адорвалі нованароджанага, парадзіху, бабку?

14. Што прыгаворвалі бабка, кум, кума падчас хрэсьбіннага стала, «бабінай кашы»? Што гэта была за «бабіна каша»? Як яе трэба гатаваць? Чым завяршаўся хрэсьбінны стол («кашай», «торгам»)? Што рабілі з «кашай»?

15. Ці выконваліся спецыяльныя велічанні для бацькі дзіцяці?

16. Якім чынам выказвалі пашану бабцы?

17. Што прыгаворвалі падчас прарэзвання зубоў, пры выпадзенні першага малочнага зуба, пры першых кроках?

18. Якія пажаданні адрасаваліся дзіцяці падчас першага падстрыжэння? Хто іх выконваў?

## Вясельная проза

### *Этапы беларускага вяселля*

1. Якую назву ўжываюць у вашай мясцовасці: «вяселле» ці «свадзьба»?

2. З якіх асноўных этапаў складаўся вясельны абрад у вашай вёсцы? Паступова пералічвайце назвы этапаў і запісвайце ў сшытак тыя, якія назаве інфармант: пярэпыты, даведкі, сватанне, заручыны, змовіны, запоіны, узгледзіны, сугляды, ладзіны, запой, дзявочы вечар, зборная (суборная) субота, вяночкі, ёлка, каравай, пасад, расплятанне касы, вян-

чанне, вяселле ў маладой, вяселле ў маладога, дзяльба каравая, раздача каравая, пярэзвы, гасціна, «цыганы», бабскі вечар. Якія яшчэ?

3. Ці вядомы ў вас такія звычаі і назвы, як «закідваць зайца», «страляць зайца», «гарох малаціць», «княжаства», «княжны стол», «выкупіць стол», «дагулкі», «званкі», «крошкі»? Якія яшчэ? Дакладна запішыце адказы.

***Вясельныя чыны***

1. Як называюцца ў вас вясельныя чыны? Колькі іх бывае? Што яны робяць на адпаведных этапах вяселля? Што гавораць?

Паступова пералічвайце назвы вясельных чыноў і адразу запісвайце адказы: дружка, дружок, дружба, дзядзька, свяцілка, касянка, закасянка, стараста, княжы, княжок, падкняжы, князь, харунжы, маршалак і г. д.

Спытайце, якія яшчэ чыны ёсць, адзначце варыянты назваў. Асобна адзначце, якую ролю выконвалі падчас вяселля хросныя бацькі жаніха і нявесты, як яны называліся, які абавязак быў у брата нявесты.

***Пярэпыты, даведкі, сватанне***

1. Ці можна было прыйсці да дзяўчыны ў сваты без папярэдняга візіту маці (хроснай маці, сваячкі) са свахай?

2. Хто і калі ідзе ў сваты (сват з бацькам жаніха, сват з жаніхом, адзін сват, бацькі і жаніх)? Ці была абавязковай прысутнасць жаніха на сватанні?

3. Хто з’яўляецца галоўнай асобай у сватанні (маршалак, дружка, сват)? Як гэта пасада называецца ў вас? Што патрабавалася ад свата?

Запішыце, якая размова адбывалася паміж сватамі і бацькамі дзяўчыны.

4. Як павінна была паводзіць сябе дзяўчына, калі прыходзілі сваты (заставалася ў хаце, хавалася, сыходзіла з хаты)?

5. Што рабілі ў знак згоды на шлюб ці адмаўлення ад яго?

**Даведка**

Прыкметы згоды на шлюб: дзяўчына прымае ад сватоў хлеб, выпівае чарку, кідае ў бутэльку некалькі зярнятак, калупае печ, мяце хату ад дзвярэй да печы ці стала, перавязвае сватоў ручнікамі цераз плячо і г. д. Прыкметы адмаўлення ад шлюбу: вяртаюць пустую бутэльку, а за выпітую гарэлку плацяць, утыкаюць галень у воз сватоў, прычэпліваюць на вопратку нітку, дзяўчына мяце хату ад стала да дзвярэй і г. д.

***Узгледзіны (сугляды, змовіны, запоіны, запівіны, заповіны), малыя заручыны, малая гарэлка, барышы, заручыны, ладзіны, запой***

1. Як у вашай мясцовасці называюць такую частку вяселля, як запоіны? Калі і як гэта адбывалася (адразу пасля згоды на шлюб ці праз

некаторы час)? Якімі словамі запрашалі родных і вяскоўцаў на запоіны (заручыны і г. д.)?

2. Як адбываўся абрад «злучэння» маладых (завязвалі канцы адзення, сплятал разам валасы, сашчэплівалі рукі і г. д.)?

3. Якія стравы пры сватанні павінны быць на стале?

4. Ці адорвае дзяўчына сватоў льнянымі ручнікамі?

5. На заручынах дамаўляюцца пра дзень шлюбу. Спытайце, на які час звычайна назначаюць вяселле, ці прытрымліваюцца квадраў месяца (маладзік, поўня, сход).

6. Ці збіраюцца ў вас асобна на змовіны (заручыны, вялікую гарэлку, вялікія запоіны)? Ці магчыма адмаўленне ад шлюбу пасля змовін? Якія наступствы адмаўлення?

***Зборная (суборная) субота, дзявочы (дзявічы) вечар, паненскі вечар, вянкі, зборны вечар***

1. Як у вашых мясцінах называюць вечар перад вяселлем, калі да нявесты прыходзяць яе сяброўкі? Што азначала зборная (суборная) субота?

2. Што рабілі дзяўчаты ў час зборнай суботы?

Ці існаваў у вашых мясцінах звычай «віць ёлку» — упрыгожваць кветкамі, свечачкамі, саламянымі крыжыкамі і г. д. галінку елкі ці вішні? Што з ёю рабілі далей?

3. Ці дазвалялася прыязджаць «на вянкі» жаніху? Калі ён прыязджаў, то з кім (з бацькам, сватам, сябрамі, музыкам)? Што адбывалася далей па прыездзе маладога з роднымі і сябрамі «на вянкі»?

4. Ці існаваў у вас звычай, каб маладая ў час зборнай суботы хадзіла ў лазню? Калі такога звычаю прытрымліваліся, то што ён азначаў?

***Каравай***

1. Ці пякуць у вас на вяселле каравай? Калі прыступаюць да падрыхтоўкі каравая (адразу пасля запоін, заручын)? Ці раяцца на змовінах пра каравай?

2. Колькі бывае каравая ў (адзін ці два)?

3. Хто і якімі словамі прасіў благаславення рашчыняць каравай (г. зн. рыхтаваць цеста для каравая)?

4. У які дзень і час рашчыняюць каравай? Каго нельга запрашаць на росчын каравая? Ці прысутнічаюць пры гэтым мужчыны? Колькі звычайна бывае каравайніц? Хто бывае старшай каравайніцай? Што прыносяць з сабою каравайніцы?

5. Хто і як садзіць каравай у печ? Ці выпякаўся каравай на лісцях дрэў або іншых раслін? Чаму так рабілі?

6. Які выгляд меў каравай маладой (маладога)? Якія ўпрыгожанні былі на каравai (месяц, сонца, птушачкі, крыжыкі, пляцёнкі і г. д.)? Ці выпякаліся «шышкі»? Колькі? Які выгляд яны мелі?

7. Ці пяклі які-небудзь іншы хлеб, акрамя каравая? З якой мэтай? Як ён называўся?

8. Хто дастае каравай з печы? Куды нясуць і на што кладуць спечаны каравай? Хто гэта робіць?

9. Што адбывалася ў хаце маладога ў той час, калі ў маладой рашчынялі каравай?

10. Калі дзялілі каравай? Ці клалі што-небудзь у сярэдзіну каравая?

**Парада**
Калі ёсць магчымасць, сфатаграфуйце вясельны каравай, а калі няма — схематычна намалюйце яго, адзначце кожную дэталь, упрыгожанні, узоры, іх назвы, памеры.

***Пасад***

1. Каго не садзілі на пасад (удаўца, удаву, цяжарную жанчыну або тую, якая мела няшлюбнае дзіця, і інш.)?

**Даведка**
Майце на ўвазе, што існавалі тры тыпы пасаду, якія адрозніваліся рытуалам і пэўным значэннем:
1) пасад маладой і маладога (кожнага асобна) перад шлюбам;
2) сумесны пасад маладой і маладога пасля вянчання ў сувязі з абрадам звядзення;
3) трэці тып — пасад маладых у розныя часы: а) у час завівання; б) на заручынах; в) у зборную (суборную) суботу; г) у час сустрэчы маладых пасля шлюбу.

***Пасад маладой***

1. Дзе знаходзілася нявеста непасрэдна перад тым, як яе праводзілі на пасад?

2. Ці меў права малады прысутнічаць на пасадзе маладой і дзе ён знаходзіўся ў час гэтага абраду?

3. Як маладую вялі на пасад, хто яе прыбіраў і суправаджаў? Хто першы ўваходзіў у хату? Хто звычайна вёў маладую на пасад? Хто і якімі словамі прасіў благаславіць маладую на пасад пасадзіць? Што на гэта адказвалі прысутныя?

4. Якое значэнне мела хлебная дзяжа, што з ёй рабілі? Як маладую садзілі на пасад? Як садзілі на пасад маладую, калі яе бацькі мелі пчол?

Ці садзілі маладую на пасад, калі яна не захавала цнатлівасць? Чым высцілалі сенцы, праз якія вялі прыбраную маладую?

5. Хто расплятаў, расчэсваў касу маладой? Ці мачылі грэбень у мёд і масла? Хто падсмальваў яе валасы? Куды дзявалі грэбень пасля часання валасоў маладой?

6. Як убіралі маладую пасля часання і падсмальвання валасоў?

7. Што рабіла маладая перад тым, як сесці на пасад? Што рабілі яе бацькі, брат? Як у песнях называецца месца пасада (дзяжа, лава і інш.)? Ці галасіла маладая або яе маці падчас пасада?

8. Што клалі на калені маладой, калі яна сядзела на пасадзе? Што давалі ёй у рукі?

9. Хто падымаў маладую з пасаду? Дзе яе садзілі пасля пасаду? Дзе садзіліся малады і яго бацька?

10. Што рабілі з дзежкай пасля пасаду?

***Пасад маладога***

1. Калі адбываўся пасад маладога (увечары напярэданні шлюбу, удзень перад ад'ездам жаніха да нявесты)?

2. Каго прасіў малады блаславіць яго пасад? Хто вёў маладога да дзяжы? Якім чынам гэта адбывалася? Хто садзіў маладога на дзяжу? Ці ставілі яму пад ногі пасудзіну з жытам, калі ён паведамляў, што варты пасада?

3. Хто часаў маладому валасы, змазваючы грэбень мёдам і маслам? Ці засмальваліся яму валасы грамнічнай свечкай? Ці застрыгалі маладога? Хто гэта рабіў? Ці перапівалі маладога ў час пасаду?

4. Што адбывалася пасля таго, як малады ўстаў з пасаду?

***Сумесны пасад маладога і маладой***

1. Калі і дзе адбываўся сумесны пасад маладога і маладой (у час заручын, у хаце маладога)?

2. Ці існаваў у вашай вёсцы сумесны пасад маладога і маладой у час абрада звядзення маладых у хаце нявесты? Як гэта адбывалася?

3. Ці вядомы ў вашых мясцінах сумесны пасад маладога і маладой у час завівання маладой у зборную суботу? Як гэта адбывалася?

***Прыезд дружыны жаніха па нявесту***

1. Як праходзілі зборы маладога ў дарогу да маладой? Ці быў пасад маладога, падстрыганне валасоў, іх падсмальванне? Хто і як гэта рабіў? Ці садзіліся перад ад'ездам за стол? Як быў апрануты жаніх у былыя часы? Як цяпер?

2. Што рабіла маці жаніха непасрэдна перад самым ад'ездам?

3. Як адбывалася сустрэча дружыны маладога з раднёй маладой, яе сяброўкамі раней і як цяпер? Ці захаваўся звычай перагароджваць дарогу, зачыняць вароты і г. д.?

4. Як выкуплялі маладую жаніх і яго дружына?

5. Што адбывалася ў момант ад'езду маладых да вянца (ці ў ЗАГС, сельсавет на рэгістрацыю шлюбу) і пасля іх вяртання?

6. Як адбываўся ад'езд маладой да маладога? Хто суправаджаў яе (шаферкі, хросная маці і інш.)?

7. Ці галасіла нявеста або яе маці падчас ад'езду да маладога?

8. Якія пажаданні адрасавалі маладой?

9. Як сустракаюць маладых у доме жаніха? Ці перагароджваюць хлопцы вясельнаму поезду дарогу ў двор? Што павінны рабіць сваты, каб выкупіць сабе праезд?

10. Ці адорвае маладая радню маладога? Якія гэта падарункі (пояс, хустка, кашуля, фартух, грэбень і г. д.)?

11. Хто праводзіць маладую ў хату жаніха (свёкар, сват і інш.)?

12. Ці існуе ў вашай мясцовасці абрад завівання маладой (пераапранання яе ў жаночае адзенне — намітку, чапец, хустку)? Калі і як гэта робяць?

13. Калі ў хату маладога прывозяць пасаг маладой? Хто і як гэта робіць?

14. Як адбываецца вясельнае гулянне ў доме жаніха? Якія тосты, зычэнні гучаць падчас вясельнага застолля?

15. Ці заходзяць у хату ў час вяселля тыя, хто не быў запрошаны? Ці частуюць іх? Якія песні яны спяваюць, каб атрымаць пірага ад свата і сваццi? Ці бываюць на вяселлі «цыганы»? Што яны робяць?

16. Як праходзіць ад'езд дадому гасцей з боку маладой? Як заканчваецца вяселле?

17. Якімі дзеяннямі суправаджаецца адыход маладых у камору пасля вясельнага гуляння? Якія дзеянні адбываюцца раніцай пасля шлюбнай ночы (родныя заходзяць у пакой маладых з віншаваннямі, вывешваюць у акне прасціну маладых і інш.)?

18. Ці бываюць праз некаторы час пасля вяселля (калі?) пярэзвы (спачатку запрашаюць у дом маладога бацькоў маладой і некаторых гасцей на застолле, потым бацькі маладой запрашаюць да сябе (перазываюць) бацьку і маці маладога)?

19. Ці праводзіць маладая пасля вяселля «бабскі вечар»? Што на ім адбываецца? Як адбываўся пераход ад вяселля да самастойнага жыцця маладой сям'і?

**Пахавальная проза**

1. Што робяць у хаце адразу пасля смерці чалавека (спыняюць гадзіннікі, завешваюць люстэркі) і чаму?

2. Каго запрашаюць памыць і апрануць нябожчыка, зрабіць труну, выкапаць дол?

3. Як апраналі і абувалі нябожчыкаў рознага ўзросту і полу? Што падсцілалі ў труну, чым набівалі падушку, як яе шылі, чым накрывалі нябожчыка? Што клалі ў труну жанчынам, мужчынам, дзецям, старым, халастым? Чым звязвалі ногі?

4. Як трэба выносіць труну, несці або везці да могілак? Якіх коней і кабыл пазбягалі запрагаць? Як трэба сябе паводзіць пры сустрэчы з пахавальнай працэсіяй? Што рабілі з лаўкай, на якой стаяла труна?

5. Якім чынам быў арыентаваны дол? Дзе ставілі крыж? Ці клалі на магілку дубовыя калоды і калі гэта рабілі? Калі і як упрыгожвалі крыжы?

6. Колькі разоў на год паміналі нябожчыка? Як называліся гэтыя дні? Ці наведвалі нябожчыка на другі дзень пасля пахавання? Як называліся агульныя для ўсіх памерлых памінальныя дні, як і калі яны адзначаліся (Дзяды, Бабы, Наўскі Вялікдзень, Наўская Тройца, Асяніны)?

7. Дзе і як хавалі няхрышчаных дзяцей, памерлых не сваёй смерцю, чараўнікоў? Што трэба зрабіць, каб нябожчык «не хадзіў»?

8. У якім выглядзе з'яўлялася перад паміраючым смерць? У якім выглядзе можа з'явіцца душа памерлага?

## Узоры запісу прозы сямейна-абрадавага дыскурсу

| | |
|---|---|
| Сямейна-абрадавы дыскурс пра яйка і роды | От як меня забралі ужэ к мужу весці вечэрам, далі мне йийцо, за пазуху. І ужэ мы ідом, вот уж му пораўну з йім, і ужэ му ідом, я несу ўжэ ікону на руках — без іконы ж не пуйдзеш — і на порогі чэраз дзвер дак я за пояса сягнула на парогі, йийцо разбілася, я й пашла. Дак ета гаварыць, што ета будзеш дзеці лехко раджаць. |
| Сямейна-абрадавы дыскурс пра грошы і роды | А каторыя не хацяць, дак ідзе ўжэ, сабіраеца к мужу ўжэ іці, як ей муж забірае ўжэ, дак яна ідзе, на дзверах да за дзеньгі да і кіне о туды о, у той попел, о дзе от ямка — угребём о с печы. Туда і кідае. То кажуць, не будзе дзецей: пьяць капеек кіне — хоч о пьяць гадоў, трі капейкі, дзві капейкі, капейку кіне... А ці праўда ета ці не? Ета я чула. |

| | |
|---|---|
| Сямейна-абрадавы дыскурс пра забароны цяжарнай жанчыне | Штоб свечкі не сукала із воску, бо як будзеш сукаць, дак у дзіцяці будзе з вуш цекці. |
| Сямейна-абрадавы дыскурс пра забароны цяжарнай жанчыне | У празнік ў лес, кажэ, не хадзілі, коб дзіця калекаю не было. |
| Сямейна-абрадавы дыскурс пра забароны цяжарнай жанчыне | Як ідзе беременна ў дзверах, штоб яна не застаівала, а то застай зробіцца ў вароцях, як будзе родзіцца. |
| Сямейна-абрадавы дыскурс пра адразанне пупавіны | Баба одмеряе на трі пальца з лішнім пупавіну тую кішэчку і зав'яжэ ніточкою крепко і адрэжэ. Як хлопец, так к обуху положыть, к секіре, а як деўка, то к грэбёнцы, штоб діўчына грэбёнку брала да пряла... Пуповіну з месцэм одрежэт і закопваеш в землю... Казалі: еслі хлопца хочэш, закопай каля дверей, каля вушака, а дівчіну — ўжэ где хочэш... |
| Сямейна-абрадавы дыскурс пра «бабіну кашу» | Ну, баба зваріць кашу с пшана і прідзе ўжэ на радзіны і прінесе два пірагі ўжэ яна ў кародцы ілі там у сумцы ілі ў чум. У седаюць за стол ўжэ і пьюць і ўсе і ўжэ падаюць. Баба ўжэ падасць, пародуха, боршч, і той ужэ боршч стануць есьці. Да куды есьці без пірага без бабінага! Давайце бабінага пірага, якога баба спекла там — мо, з мёдам, ці яна з макам, ці ж чым — будзем бачыць. Ужэ возьмуць таго пірага, не режуць нажэм, нада паламаць...<br>Ну, ўжэ паедзяць боршч, пададуць тую кашу — ужэ на стале. Баба ўжэ ўстае, шчэ што робіць баба — шчэ возьме да й цветоў у тую кашу наўтыкае, коб «эта каша загранічная і очэнь дарагая», ўжэ смеяцца да ўдумляюць. Эта ж купа людзей. У ўжэ паставіць туды ўжэ баба на стул і возьме за тую кашу чысту тарелачку, ў эту тарелачку ўкалупіць тую зверху пігарку, што засхне ўжэ на кашы. Паложыць і ўжэ кладзе грошы... |
| Сямейна-абрадавы дыскурс пра «бабіну кашу» | Бабка пры раздачы кашы кажа: — Во пасылаець вам пані палагавая кашы і масла к ней. Кушайце за здаровейка нашай радзіны. Штоб здароў быў і добра малаціў. |

| | |
|---|---|
| Сямейна-абрадавы дыскурс пра «бабіну кашу» | Наце вам народжана, нам прынясець хрэшчна… Занясі, божа, да храста святога, пазволь, божа, ва хрысціянскую веру ўвясці. Прывядзі, божа, і парадзіллю да першага здароўя; дай, божа, шчоб вана яго ахрысціла, і да розума давяла, і на вяселлі пагуляла. |
| Сямейна-абрадавы дыскурс. Словы, з якімі сваты прыходзілі ў дом дзяўчыны | У хаце нявесты старшы сват гаворыць: «Мы — людзі з далёкага краю, дарогаю прытаміліся, ці не пусціце, людзі добрыя, ноч пераначаваць?» Бацька маладой дазваляе. Тады сваты пытаюць: «Мы чулі, што ў вас цялушка ёсць, ці не прадасце вы яе нам?» Бацькі нявесты адказваюць, што няма ў іх цялушкі. Тады сваты гавораць: «Не, людзі добрыя, нам не цялушка патрэбна. Мы чулі многа добрага аб вашай дачушцы, што яна і прыгожая, і гаспадыня сдбайная, і да работы спраўная ды скорая. А ў нас ёсць галубок да пары вашай галубцы: і прыгожы, і гаваркі, і ў полі работнік, пашукаць такога. Дык ці не спараваць нашых галубкоў? Каб яны разам жылі, дзетак расцілі ды й на нас не забываліся?» |
| Сямейна-абрадавы дыскурс. Галашэнне па нябожчыку | Ой, мой жа ж ты мой міленькі, да куды ж ты ад мяне адлучыўся? Ды засталіся дзеткі ўсе маленькія… Ой, да з кім жа я цяпер буду жыці? Да з кім жа я буду гаварыці? Да тваіх дзетак усе будуць біці, бо няма ў іх заступы, бо яны сіроты. |
| Сямейна-абрадавы дыскурс. Словы, якімі звычайна звярталіся да нябожчыка | Ой, мой дубанька кучаравы, дзе ж я цябе буду шукаць? Ох, дзе ж я цябе буду выглядаць? А хто цябе, мой сынок, хто цябе зваліў такога маладзенькага? Раба зязюлька будзе вясною каваці, а я ж буду свайго сына выглядаці, мо’ зязюленькаю скінуўся ды пryляцеў каваці. Да чужыя хлопчыкі будуць ісці, а я свайго сынанька буду выглядаці, мо’ дзе забавіўся… |
| Сямейна-абрадавы дыскурс. Словы, з якімі нябожчыка абмывалі, апраналі, клалі ў труну | Обрадзілі мы вам госьціка почасного, покутнаго: прымайця, шануйця, частуйця яго, каб ён су ўсвятымі спочываў у царстві нябеснэй, раю просветлым, зы вас Бога замовляў… |
| Сямейна-абрадавы дыскурс. Словы, з якімі нябожчыка абмывалі, апраналі, клалі ў труну | Дзяды, бабулькі, бацькі, матулькі, дзядзюхны, цётухны, прымеце к сабе памёршага нашага бацюхну і жывіце тамокі з ім добрэ, не спорэцеся… |

| | |
|---|---|
| Сямейна-абрадавы дыскурс пра пахаванне нябожчыка | Мертвеца с хаты вынеслі, зараз за пасцель. Выносяць і лаўку змівають. У люді ж на могілках пабудуть, дак ужэ так не садяца кушаць, а треба шоб кожэн чэлавек памыл рукі. Кожны шоб памыл. Ось мі атнеслі на могілкі, мі вянкі неслі зараз. Стаіть людзіна і загадуе: мійце рукі. От мі памілі рукі, тады і ішлі кушаць ужэ. От як це ўжэ такі закон. |
| Сямейна-абрадавы дыскурс пра пахаванне нехрышчонага немаўляці | Нехрішчанэ діця калісь не клалі на могілках. Нехрішчане діця дома хавалі. Де-небудь у саду — ці пад ябланькаю, ці... |

## Народна-хрысціянскі дыскурс

Пасля ўвядзення хрысціянства ў беларускай народнай культуры пачаўся працэс асіміляцыі і трансфармацыі хрысціянскіх уяўленняў, што і прывяло да зараджэння народна-хрысціянскай прозы.

**Парада**

Каб паказаць сябе дасведчаным падчас гутаркі з інфармантам, раім звярнуць увагу на наступныя пытанні.

1. Персанажы хрысціянскай міфалогіі, іх імёны.
2. Асноўныя ўяўленні хрысціянскай міфалогіі (напрыклад, аб трыадзінстве Бога, аб выратавальніцкай місіі Ісуса Хрыста, яго ўкрыжаванні, уваскрашэнні, ушэсці і г. д.).
3. Хрысціянская тапаніміка (зямля, нябёсы, рай, чысцец, апраметная, Галгофа і інш.).
4. Імёны некаторых святых і іншых асоб, якім прысвечаны пэўныя дні ў народным календары (Андрэй, Васіль, Іаан Хрысціцель, Аўлас, Мікола, Ілля, Юрый і інш.).
5. Назвы фалькларызаваных хрысціянскіх свят і пастоў (Піліпаўка, Раство, Вадохрышча, Звеставанне, Тройца, Пятроўка, Спас, Пакровы і г. д.).

Народна-хрысціянскі дыскурс датычыцца народных уяўленняў пра Госпада Бога, Ісуса Хрыста, Божую Маці (Прачыстую), святых, хрысціянскія святы і звязаныя з імі агульнабеларускія і мясцовыя звычаі, прыкметы, павер'і, прыказкі, забароны, перасцярогі, дазволы і г. д. Часам гэтыя ўяўленні вельмі арыгінальныя, фантастычныя і далёкія ад хрысціянскіх. Вось што, напрыклад, расказвала палеская жанчына пра Ілллю: «*Ілля громамэ, хмарамэ владэе. До Ллі хмара, кудэ надумае, ідэ. Она борэтца з вітром. Мы думалэ, Лля дэ Лля, а він нэ жэнчына, а мужчына. А после Ллі він хмарамэ не нэ владэе. Его просять: "Ілля-пророк, розжэнэ гэты оболок!"*»

З цягам часу працоўны каляндар селяніна пачаў сувымярацца з хрысціянскім, адсюль, напрыклад, такі мікольскі звычай: «*Затыкають тычкамы, дэ косыты траву, шоб ны ходылы там коровы. "Мыкола — пыдуть тычкы окола"*».

Свяціцелям надаюцца нетыповыя рысы і функцыі. Напрыклад, 31 студзеня, дзень, прысвечаны свяціцелю Афанасію, у народнай традыцыі атрымаў розныя назвы — Апанасся, Апанас, Апанасій і, акрамя таго, Гусінае свята, Гусеўнік. Паколькі на гэты час прыпадалі маразы, то папярэджвалі: «*Хавай нос у апанасаўскі мароз*». З іншага боку, Апанас пачаў лічыцца абаронцам жывёлы ад марозу, яго прасілі аб захаванні жывёлы: «*Святы Уласій, Ахванасій, саблюдзі, божа, красуль нашых*». Лічылі, што калі на Апанасся мяцеліца, то выведзецца многа гусянят, з гэтага дня гусей кармілі «зірнятамі ў абручыку».

Дзень прападобнай Еўдакеі (14 сакавіка атрымаў у народным календары шэраг жаночых і мужчынскіх назваў: Яўдоха, Аўдоння, Аўдуська — Галдакей, Аўдакей, Аўдокій. Аўдоццю называлі вясноўкай і лічылі, што гэтае свята трымае ў руцэ лета. Па гэтым дні прыкмячалі надвор'е: калі Галдакей цёплы, то вясна і лета будуць цёплымі, спрыяльнымі для сенакосу, а калі ідзе дождж, то чакай ураджай на жыта. Дзень Аўдоцці называўся яшчэ «бабскім святам», таму жанчыны «не пралі, не снавалі».

У мясцовай традыцыі святы могуць называцца так, што іх бывае цяжка ідэнтыфікаваць. Напрыклад, 15 лютага, вядомае як Грамніцы, Стрэчанне, у Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці мае назву «Ровнэцэ». І толькі пасля аповеду можна здагадацца, якое агульнабеларускае народнае свята маецца на увазе: «*Святэлэ свічку в цэрквэ. Проходэлэ до хатэ і спірша подпалювалэ косэ крэшку у каждого в своюй сымні, шоб ны боелыс грому. Потом віпалювалэ крэжа на стэлі, на бальцэ. Гэто тожэ, шоб грім в хату ны влэтяв.*

*На Ровнэцэ нап'ецца півінь водэцэ,*
*А на Юрія найісця він травэцэ*».

З прыведзеных прыкладаў бачна, які багаты матэрыял назапашаны народна-хрысціянскай прозай. Справа за малым — паспрабаваць запісаць больш-менш складныя апавяданні на адпаведныя тэмы, пазначаныя ў апытальніку.

**Даведка**

Дні, прысвечаныя святым: Пракоп, Васіль, Іаан Хрысціцель, Аксіння, Тацціяна, Апанас, Тры Свяціцелі, Трыфан, Валянцін, Аўлас, Збор

(Ізбор), Аўдоцця Вясноўка, Аляксей Цёплы, Дар'я Вясенняя, Юрый (Юр'е), Аўсей, Барыс, Іван Веснавы, Мікола Веснавы, Алёна (Ульяна), Пятро і Паўла, Агрыпіна Купальніца, Кузьма і Дзям'ян, Андрэй, Ілля, Флор і Лаўр, Параскева Пятніца, Мікола Зімовы і інш. Звычаі, павер'і, прыкметы, забароны, звязаныя з такімі фальклярызаванымі хрысціянскімі святамі і пастамі, як Піліпаўка, Раство, Вадохрышча, Стрэчанне (Грамніцы), Сорак пакутнікаў (Саракі), Дабравешчанне (Звеставанне), Вялікі Пост, Вербніца, Чысты чацвер, Вялікдзень (Паска, Пасха), Ушэсце, Тройца, Пятроўка, Дзевятнік (Дзевятуха), Дзесятнік (Дзесятуха), Казанская (градавы дзень), Спасаўка (пост) і Спасы (Макавей, Яблычны, Хлебны), Узвіжанне, Прачыстая, Пакровы (Трэцяя Прачыстая), Увядзенне і інш. Больш інфармацыі глядзіце ў кнізе Алеся Лозкі «Беларускі народны каляндар» (Мінск, 2002).

## АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ НАРОДНА-ХРЫСЦІЯНСКАЙ ПРОЗЫ

1. Што вы ведаеце пра Госпада Бога, Ісуса Хрыста, Божую Маці (Прачыстую), архангелаў, анёлаў?

2. Што ў вас кажуць пра д'ябла, Люцыпара, антыхрыста?

3. Як вы ўяўляеце рай, чысцец, пекла? Хто куды трапляе пасля смерці? Якім чынам можна выратаваць сваю душу?

4. У календары ёсць дні, прысвечаныя святым. Якія мясцовыя звычаі, павер'і, прыкметы, забароны, парады, перасцярогі, прыказкі звязаны з гэтымі датамі?

## УЗОРЫ ЗАПІСАЎ НАРОДНА-ХРЫСЦІЯНСКАЙ ПРОЗЫ[*]

Народна-хрысціянскі дыскурс пра Госпада Бога

З б і р а л ь н і к: Вы сказалі: Ісус Хрыстос з Госпадам Богам. Бог — гэта хто?

І н ф а р м а н т: Самы глаўны. Ета саздацільусяго міра. Баба казала. Саздаціль усяго міра. Ета — Гасподзь. А ета ўжо Сын Божжы. Ён ад Духа Святога радзіўсь. Ну, можа, як ціпер іскуствінна дзелаюць дзяцей, і скот асеменяюць.

[*] Прыклады ўзяты з кнігі Генадзя Лапаціна «Варвара Грэцкая як з'ява беларускай народнай культуры» (Гомель, 2015).

| | |
|---|---|
| Народна-хрысціянскі дыскурс-дыялог пра рай і ад | ...А хто нічога ня дзелая такога, не крычыць, не сварыцца з маткай — тый будзя ў райскім саду, там пцічкі райскія.<br>— Баб, ё ж там яблакі?<br>— І яблачкі ё. Будуць есць тыя дзеткі. А етыя будзіця ў адзі.<br>— Баб, што-та за ад такі?<br>— Ад — смала кіпіць і туда Бог будзя скідаць, прыгаць будзіця, так здзелая, самі прыгніцё. Будзіця ўвесь век там кіпець... |
| Народна-хрысціянскі дыскурс пра святога Міколу | Адзін прэсвяты Мікола засявае, штоб ўсё ўражайная было, ета — веснавы. А восеньскі, ета, ужо, ён уражай пасабірая і людзей усіх панаграждая, штоб у каждага на зіму есць што-нібудзь. Дак усё калісь казалі... |
| Народна-хрысціянскі дыскурс пра Юрыя і гром | Як гром, яна гаворя: «Юрый-Ягорый на калясніцы едзя». Не казала на калёсах — на калясніцы. «Во, на калясніцы ўжо едзя Юрый-Ягорый. Ён пешкі ні ходзя». |

**Сацыяльна-бытавы дыскурс**

Дадзены дыскурс існуе здаўна. Магчыма, ён суправаджае чалавецтва яшчэ з дагістарычных часоў, а вывучацца пачаў толькі з другой паловы XX ст., больш актыўна — з 1990-х гг. у сувязі з агульнай дэмакратызацыяй грамадства. У рэшце рэшт сацыяльна-бытавы дыскурс быў адзначаны ў кнізе «Восточнославянский фольклор: Словарь научной и народной терминологии» (Минск, 1993) праз такія тэрміны, як *чуткі*, *пагалоска* (бел.), *слухи*, *толки* (рус.), *чутки*, *поголоски*, *гутірки* (укр.) (с. 332). Апошнім часам назіраецца тэндэнцыя далучаць да галіны сацыяльна-бытавой прозы *плёткі.*

Чуткі і плёткі мінулых часоў даносяць да нас пісьмовыя крыніцы (летапісы, мемуары, прыватныя дзённікі, лісты і інш.). З адной такой плёткай — аб нізкім паходжанні Кія, легендарнага заснавальніка Кіева, спрачаўся аўтар «Аповесці мінулых гадоў», сцвярджаючы, што насамрэч Кій быў князем. Чуткі і плёткі з'яўляюцца часткай маўленчай паўсядзённасці вёскі, мястэчка. Тып языкатай бабы-пляткаркі займае адметнае месца ў грамадскай свядомасці, асабліва на вёсцы ці ў пэўным калектыве, дзе такія асобы добра вядомыя і даверу да іх няма. Каларытныя вобразы пляткарак створаны ў мастацкай літаратуры.

У звычайным паўсядзённым маўленні тэксты сацыяльна-бытавой прозы ўяўляюць сабой цяжкавызначальныя адзінкі. Аднак ёсць сітуацыі, калі іх

пачатак добра маркіраваны словамі «*я чула*», «*кажуць*», «*ёсць чутка*» і пад. Напрыклад, «*кажуць, што грыбы і ягады людзі вязуць з чарнобыльскай зоны і ніхто іх не спыняе*», «*а я чула, што БНФ трымаецца на амерыканскіх грошах*», «*мне сказалі, што малы бізнес перамясціўся ў Расію*» і г. д. Справа ў тым, што ўсе мы ў той ці іншай ступені, усведамляючы гэта або зусім неўсвядомлена, з'яўляемся носьбітамі плётак і чутак, нават у сітуацыі, калі падсмейваемся з іх, выкрываем іх бязглуздасць, адмаўляемся ім верыць.

**Жанравая спецыфіка чутак, плётак, пагалоскі.** У чутках і плётках фіксуюцца падзеі, якія быццам бы ўжо адбыліся або толькі прагназуюцца (наконт экалагічных і антрапалагічных катастроф, палітычнага і эканамічнага становішча, навуковых сенсацый і г. д.). Інфармацыя, якую яны перадаюць, можа быць станоўчай, нейтральнай ці негатыўнай, прычым апошняя пераважае.

Даставернасць чутак і плётак не мае значэння для фалькларыстыкі. Яны прэтэндуюць на дакладнасць падобна традыцыйным жанрам фальклору, у прыватнасці легендам, быліцам, прымхліцам і інш., а насамрэч з'яўляюцца вельмі суб'ектыўным, прычым масавым, перажываннем сучаснасці, гісторыі і будучыні.

Чуткі і плёткі запаўняюць недахоп інфармацыі, і тут назіраецца цікавая рэч: афармленне можа ісці згодна з даўно вядомымі ў фальклоры клішэ, матывамі, формуламі. Так, фальклор многіх народаў утрымлівае легенды аб героях і вызваляльніках, якія быццам бы не загінулі, а толькі часова зніклі. Імі могуць быць народныя барацьбіты, высакародныя князі, каралі, цары. Дадзены матыў неаднаразова ажываў з новымі персанажамі, напрыклад, з героем грамадзянскай вайны Васілём Іванавічам Чапаевым, з героямі Вялікай Айчыннай вайны Канстанцінам Заслонавым, Алегам Кашавым, нават з першым касманаўтам Юрыем Гагарыным. Гатовы фальклорны матыў у рускай прасторы даў чутку ў выглядзе аднаго сказа: «*Джохар Дудаев, слышала, не умер, а за границей скрывается*».

**Роля сацыяльна-бытавога дыскурсу ў развіцці фальклору.** Жыццё чутак, плётак і пагалоскі нядоўгае, аднак яны адыгрываюць важную ролю ў развіцці фальклору і характарыстыцы грамадскіх настрояў. Іх функцыі наступныя:

1) жанраўтваральная: чуткі і плёткі — пажыўная глеба для стварэння легенд і анекдотаў;

2) класіфікацыйная — дадзеныя бессюжэтныя тэксты з'яўляюцца захавальнікамі традыцыйных фальклорных матываў і кандэнсатарамі новых;

3) ідэалагічная — калі праз фальклор народ выражае свае думкі, ідэалы, мары і спадзяванні, стаўленне да грамадства, побыту, эканомікі

і розных асоб, то чуткі (якія адлюстроўваюць надзеі, страхі, ухваленні, перасцярогі, папярэджванні і пад.) з'яўляюцца скандэнсаваным выражэннем народнага ўспрымання плыняў жыцця ў сінхраніі і дыяхраніі сацыяльна-культурнага працэсу.

Іншая справа — чуткі-помста, плёткі. Частка з іх нараджаецца з браку дакладнай інфармацыі, а частка мае свядомы паклёпніцкі характар. Апошнія шырока выкарыстоўваюцца ў сучасных паліттэхналогіях у мэтах дыскрэдытацыі апанентаў. Дзякуючы СМІ яны хутка распаўсюджваюцца, пераходзячы на побытавы ўзровень. Ёсць кур'ёзныя чуткі-плёткі, якія знаходзяцца ў рэчышчы народнай смехавай культуры. Чалавек можа сам распускаць чуткі пра сябе і сваю сям'ю.

Задача збіральніка — паспець занатаваць прыклады сацыяльна-бытавога дыскурса. Можна пачаць з сябе. Ці знаёмы вам філфакаўскія чуткі, плёткі, байкі? Якая дысцыпліна найбольш страшная? І што там гавораць наконт стыпендый?

**Увага!**
Памятайце, што сацыяльна-бытавы дыскурс — бессюжэтны, яго тэксты пазначаюцца паводле дамінантнай тэмы. Напрыклад, «Сацыяльна-бытавы дыскурс-плётка пра амурныя прыгоды NN», «Сацыяльна-бытавы дыскурс-чутка пра павышэнне стыпендый на 50 %», «Сацыяльна-бытавы дыскурс-пагалоска пра высадку іншапланетнікаў» і пад.

## 1.1.2. Наратыўная няказкавая проза

Да наратыўнай (ад фр. *narrative* — 'расказваць', 'апавядаць') няказкавай прозы адносяцца жанравыя творы з выражаным апавядальным пачаткам. Гэта невялікія па аб'ёме творы, у якіх расказваецца пра нейкія з'явы, дзеянні, падзеі, што ўжо адбыліся ці адбудуцца.

Наратыўная няказкавая проза складаецца з наступных частак, кожная з якіх мае адпаведныя жанры:

1) легендарная (легенды);

2) прымхлівая (прымхліцы);

3) рэалістычная (апавяданні-ўспаміны, бываліцы);

4) смехавая (небыліцы, анекдатычныя казкі, анекдоты, жарты, досціпы, гумарэскі).

**Легендарная проза.** Легендарная проза ўключае ў сябе:

1) міфалагічныя легенды:

• касмаганічныя (пра стварэнне свету і яго асобных частак);

• заагенічныя (пра з'яўленне жывёл, птушак, раслін);

• антрапагенічныя (пра паходжанне чалавека);
• эсхаталагічныя (пра канец свету ці яго частак);

2) гістарычныя легенды, у якіх падаюцца міфалагізаваныя звесткі аб этнічнай гісторыі беларусаў, аб паходжанні іх асобных груп (напрыклад, палешукоў і палевікоў), расказваецца аб першых насельніках беларускай зямлі, гістарычных падзеях мінулых часоў, ёсць указанні на гістарычных асоб, грамадскія адносіны і г. д.;

3) тапанімічныя легенды, звязаныя з геаграфіяй пэўнай мясцовасці, яе памятных ландшафтных аб'ектаў, з паходжаннем гарадоў, вёсак, азёраў, рэк, урочышчаў, курганоў і іх назваў; ад гістарычных легенд яны адрозніваюцца дамінантнай мэтай: тапанімічныя легенды скіраваны на тое, каб даць гістарычнае або псеўдагістарычнае тлумачэнне паходжання назваў геаграфічных аб'ектаў;

4) маральна-этычныя легенды, галоўны матыў якіх — пакаранне за зло і ўзнагарода за дабро. Большая частка гэтых легенд развівалася ў рэчышчы народнай хрысціянскай культуры.

**Увага!**
Некаторыя тапанімічныя легенды могуць утрымліваць матывы, характэрныя для міфалагічных, гістарычных, маральна-этычных. У такім выпадку трэба арыентавацца на асноўную мэту аповеда — патлумачыць паходжанне геаграфічнага аб'екту, паселішча або яго назвы.

**Парада**
У некаторых выпадках пачуць легенду можна, калі папрасіць інфарманта патлумачыць пэўныя правілы паводзін, забароны, перасцярогі і г. д. Напрыклад, Вера Мікалаеўна Круцікава (1919 г. н.) з в. Старыя Крукі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці ўпэўнена, што чалавеку трэба клапаціцца пра катоў і сабак, «*бо мы ўсе на кашэчай і сабачай долі жывем*».
З б і р а л ь н і к: Як гэта?
І н ф а р м а н т: Раней колас быў ад самай зямлі. І хлеба многа, дык людзі сталі раскідваць. Бог угневаўся і давай сашморгваць колас. Трохі да верху засталося. Дык каты і сабакі заяўкалі, каб з голаду не памерці. Вот на іх долю бог аставіў. На іх долі мы жывем.

**Прымхлівая проза.** Прымхлівая проза (прымхліцы) грунтуецца на народных павер'ях і ўяўленнях аб персанажах ніжэйшай міфалогіі, такіх як русалка, дамавік, лясун і інш. Ядро аповедаў — сутыкненне чалавека са светам звышнатуральнага, цудоўнага, цудадзейнага, незвычайнага, з тым, што раптам перапыняе натуральнае існаванне або вылучае нейкія з'явы,

аб'екты, рэчы, прадметы з ліку звычайных, натуральных. Напрыклад, ёсць звычайныя людзі і ёсць ведзьмы, чараўнікі, варажбіты, ваўкалакі; звычайныя камяні і божыя, цудадзейныя, чортавы; звычайныя месцы і заклятыя.

**Рэалістычная проза.** Рэалістычная проза прадстаўлена апавяданнямі, звязанымі з падзеямі недалёкага мінулага, якія адбыліся на памяці апошніх пакаленняў, тычацца ўсіх жыхароў вёскі або асобнай сям'і і яе членаў.

*Апавяданні-ўспаміны* звычайна з'яўляюцца мемуарамі сведкаў прыгонніцтва, ваенных часоў, перыяду калектывізацыі і да т. п. Напрыклад, Я. Ф. Добранскі (1891 г. н.) з в. Прудок Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці ўспамінае: «*Був некалі в Юравічах пан. Гадов пад сорак було яму тады. Звався Рыгорам, а фамілію забув ужо давно. Було в гэтага пана чатырыста каров, сто двадцать коней, сто валов. І рабів я в яго дзесяць гуд. Зямлі сваёй в мяне не було, вось і прыходзілася рабіць ад сонца да сонца на пана. У бацькі майго було пяць сынов. Я був старэйшы. Тых грошай, што мне давав пан за работу, нам не хапала. Часам зімой і босыя ездзілі па дровы. У пана рабіла чалавек пяцьдзесят. Бувала змокнеш на рабоце, а пасушыцца няма дзе. Так і лажылісь мокрыя спаць в бараке. Вось, дзеткі, як прыходзілася жыці раней*».

*Бываліцы* — рэалістычныя, сюжэтна афармленыя, фабульныя апавяданні пра тое, «што ў жыцці бывае», жыццёвыя гісторыі. Бываліцы часта маюць камічны пафас. У іх сюжэце пераважае пабытавы матэрыял, ён можа быць прыгаданы выканаўцам з любой нагоды, у любым месцы: рыбацкія, паляўнічыя, вайсковыя, любоўныя гісторыі, кур'ёзныя выпадкі і інш. Вось што расказала Т. Д. Юр'ева (1911 г. н.) з в. Ордаць Шклоўскага раёна Магілёўскай воласці: «*Былі такія слыхі. Умерла жэншчына. На 9 дней пілі водку на кладбішчы. Адна бабка напілася там і заснула. А хлопцы ўзялі і пайшлі на кладбішча піць. Адзін і гаворыць: "Стакана няма!" А бабка прачнулася і крычыць: "Хлопцы, у мяне ёсць!" Хлопцы, калі мелі ногі, пабеглі. А ў аднаго сэрца разарвалася*».

Апавяданні рэалістычнай прозы могуць быць па-свойму цудоўнымі, незвычайнымі, фантастычнымі, але ў іх аснове ляжыць тое, што ўразіла нашых сучаснікаў, падалося ім значным, істотным (напрыклад, факты цудоўных выратаванняў, здзейсненых прадказанняў, сноў, сутыкненні са сферай незвычайнага, што нядаўна ўвайшло ў свядомасць і знаходзіцца па-за сферай традыцыйна-міфалагічнага). У ранейшыя часы рэалістычная проза была той глебай, на якой паступова фарміраваліся часткі легендарнай.

**Смехавая проза.** Смехавая проза скіраваная на тое, каб выклікаць у слухача ўсмешку. Да яе ліку адносяцца такія жанры, як *небыліцы, анекдатычныя казкі, анекдоты, жарты, гумарэскі*.

Ваша задача будзе скіравана на тое, каб адшукаць і запісаць беларускія анекдоты, якія ў сваёй тэматыцы і стылістыцы маюць нацыянальныя рысы, расказваюцца па-беларуску, лічацца сваімі. Даследчыкі фальклору слушна падкрэслівалі, што ў анекдотах своеасаблівасць нацыянальнага і мясцовага матэрыялу праяўляецца значна вастрэй, чым, напрыклад, у казках. Нярэдка на адзін і той жа сюжэт бытуюць уласна анекдоты і анекдатычныя казкі. Як іх адрозніваць? Практычна па колькасці эпізодаў. Анекдот — гэта часцей за ўсё аднаэпізоднае апавяданне пра смешную падзею, сітуацыю, рысу характару чалавека ці ўчынак, якое мае неспадзяваную камічную развязку.

Вось які анекдот расказала Е. Я. Памазкова (1904 г. н.) з в. Дабранка Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці:

*«Ідзе п’яны кравец. Ідзе, ды ніяк не знойдзе сваёй хаты.*

*— Скажы, брат, дзе тут жыве кравец Кандрат? — пытае ён у другога чалавека.*

*Той глядзіць яму ў вочы. Думае, што кравец з ума сышоў.*

*— Ты ж сам Кандрат-кравец!*

*— Я не пытаю ў цябе, хто я. Ты мне скажы, дзе я жыву».*

Анекдатычныя казкі звычайна не абмяжоўваюцца адным эпізодам, імкнуцца да разгорнутасці, сюжэтнасці, «абрастання» трапнымі мастацкімі дэталямі.

Некаторыя беларускія вёскі, як і балгарскі горад Габрава, славіліся сваімі анекдотамі. Вёска Маркавічы, што на Гомельшчыне, напрыклад, карысталася ў беларусаў тою ж славай, як Пашахонне ў рускіх. У 1930-я гг. фалькларысты запісалі анекдоты аб хваенцах (в. Хвойня Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці), якія нібыта цягнулі вяроўкай вала на дуб, каб прымерыць кульбаку, усцягвалі на страху карову паесці зялёнае жыта, якое парасло з нявымалачанай саломы, і інш.

Жарты і гумарэскі вельмі блізкія да анекдотаў. Аснова жарту — смешнае здарэнне, дасціпная насмешка над асобнымі рысамі і якасцямі людзей. Яго найбольш папулярная форма — дыялог з нечаканай завяршальнай фразай. У адрозненне ад анекдота ў гумарэсцы можа адсутнічаць нечаканая камічная развязка. Гумарэска характарызуецца незласлівасцю і добразычлівасцю насмешкі з прыватных з’яў.

Аднак і прафесійныя фалькларысты з цяжкасцю адрозніваюць жарты і гумарэскі ад анекдотаў, таму ў выданнях змяшчаюць іх пад агульнай назвай «Жарты, анекдоты, гумарэскі», а ў каментарыях не пазначаюць жанравую прыналежнасць таго ці іншага твора.

## АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ НАРАТЫЎНАЙ НЯКАЗКАВАЙ ПРОЗЫ

### Легендарная проза

1. Ці чулі вы ад старых людзей, як стварыўся свет (зямля, неба, сонца, месяц, зоркі), адкуль узяўся чалавек, жывёлы, расліны?

2. Ці памятаюць вашы людзі аб падзеях далёкага мінулага (аб старых князях, панах, разбойніках, асілках, волатах, веліканах; аб тым, як з'явіліся на гэтай зямлі беларусы, палешукі, ліцьвякі, хто заснаваў вашу вёску; аб татарах, шведах, французах і іншых народах)?

3. Што ў вас расказваюць пра тое, чаму так называецца ваша вёска або суседняя? Як і чаму называецца возера, рэчка, балота, урочышча, курган, гара, луг, лес?

4. Ці ведаеце вы расказы пра тое, як Бог, Божая Маці, святыя хадзілі па зямлі, каралі злых, сквапных нядобразычлівых людзей і ўзнагароджвалі добрых; пра вялікіх грэшнікаў або святых пакутнікаў; пра мясцовых прападобных і іх цуды; пра святыя прошчы і звязаныя з імі цуды; пра цудоўныя абразы, іх з'яўленне; пра абразы, якія плачуць, сыходзяць крывёю і г. д.?

5. Ці ведаеце вы расказы пра цэрквы і касцёлы, якія чамусьці праваліліся пад зямлю, і звязаныя з імі падзеі, цуды, здарэнні?

6. Што бывае з чалавекам, які звязаўся з нячыстай сілай, прадаў душу чорту, д'яблу? Ці расказваюць у вас пра такія выпадкі?

7. Як ставіцца да жанчын, якія не ў свой час прадуць? Што такое Параскева Пятніца?

8. Ці ведаеце вы выпадкі цудоўнага выздараўлення і выратавання людзей, якія шчыра верылі ў Госпада Бога, Ісуса Хрыста, Прачыстую і святых?

### Прымхлівая проза

1. Ці ведаеце вы жудасныя або смешныя гісторыі аб сустрэчах людзей з рознымі нячысцікамі (дамавіком, лесуном, русалкай і інш.), нябожчыкамі, ведзьмамі, ваўкалакамі?

2. Ці ведаеце вы аб выпадках, якія адбываліся ў заклятых месцах, каля цудадзейных крыніц, камянёў, дрэў?

3. Ці ведаеце вы аб дапамозе розных духаў чалавеку?

### Рэалістычная проза

1. Ці памятаеце вы, як жылося людзям «пры Польшчы», «пры Расіі», «пры Саветах»?

2. Што расказвалі пра першы дзень Вялікай Айчыннай вайны; паводзіны немцаў і партызан; апошні дзень вайны; вяртанне з вайны, пасляваенныя гады?

3. Якія цяжкасці былі ў вашым асабістым жыцці, цікавыя ці незвычайныя здарэнні?

### Смехавая проза

1. Ці ведаеце вы такія смешныя расказы, дзе ўсё парушана, адбываецца навыварат? Вось як у гэтым: «*Наняўся я ў аднаго гаспадара пчол пáсціць — пяцьдзесят раёў пчол. Кожны дзень трэба было іх сашчытаць і выпусціць за пажыўнасцю. Вернуцца — трэба пералічыць іх, выдаіць і ў вуллі пазаганяць...*»

2. Ці ведаеце вы розныя смешныя кароткія гісторыі:

- пра паноў, папоў, ксяндзоў, аканомаў, войтаў, наглядчыкаў і г. д., пра іх махлярствы і любоўныя пахаджэнні;
- кемлівых мужыкоў;
- хітрых і разумных жонак;
- кемлівых салдат, жабракоў, зладзеяў;
- ашуканага мужыка;
- цыганоў, яўрэяў, ліцвінаў, палешукоў, мазураў, ляхаў, маскалёў, хахлоў, немцаў, жыхароў пэўнай мясцовасці, мястэчка, вёскі, членаў сям'і з пэўным прозвішчам, мянушкай і г. д.;
- мужыка і жонку, пра бацькоў і дзяцей;
- дурняў, хітруноў, п'яніц, гультаёў, абжор, жулікаў і г. д.?

## УЗОРЫ ЗАПІСУ НАРАТЫЎНАЙ НЯКАЗКАВАЙ ПРОЗЫ

| | |
|---|---|
| Легенда міфалагічная (заагенічная) «Адкуль кукушка» | Кукушка, шо куе, была девушкай. Дак купалася девушка і купалася ў моры. Прылятеў змей і хател забрать ее будта бы за жэну. Мужык такі быў. І ана не пашла: «Я за тебе не пайду!» І юн сказаў ей так: «Ну, еслі ты за мене не пайдеш, то каваць табі век». І зрабіў яе на зязюлю. І яна лятае і куе, будта бы так. Де кукушка куе, да і гаварать: о тая кукушка была девушкай. |
| Легенда тапанімічная «Сопачкі» | Калісь даўно вязлі з нейкай вайны нейкага галоўнага цара царэй. Так вось, як там яго вязлі на вазу, што стаў ён разваліваццa. Тут, каля нас, |

| | |
|---|---|
| | вываліліся вантробы. Ну, і насыпалі вялікую гару. Павязлі далей. Адарвалася ў яго рука, кажуць, недзе ля Адамова, і яе так жа засыпалі. Вось так тут курганоў скрозь і панасыпалі. |
| Легенда міфалагічная (касмагенічная) «Адкуль на Лагойшчыне горы» | Вы бачылі, што ў нас тут на Лагойшчыне гор многа. Дык вось як гэта было, як яны тут сталі. Гэта даўно было, як толькі свет зараджаўся, патоп быў, вады многа было. Дык тая вада вельмі шумлівая была. Унесла яна шмат зямлі і камення рознага. Дзе лясы былі, гэтыя пяскі і каменні асядалі. Дзе лес вышэйшы — там і гара высокая, а дзе лес ніжэйшы — то там і горачка нізкая. Гэта вада аж да Чорнага мора дайшла. А калі ішла, то многа яе ў зямлю ўходзіла, і к Чорнаму мору гэтай вады ўжо не стала. Лясоў там таксама не было, і таму на Украіне раўніны. |
| Легенда гістарычная «Гарадзец» | Кажуць, даўней жылі тут людзі. Недзе тут, на Гарадцы. Плавалі па Дзвіне на лодках. Но было гэта так даўно, што старыя і не помняць калі. Рабілі людзі віно і вазілі на лодках прадаваць. А хавалі гэта віно ў каменных склепах. А як віном таргаваць перасталі, так і плаваць тут перасталі, жыць на Гарадцы.<br>Вось з таго часу людзі і знаходзяць тут то паўкірпіча, то цэлы кірпіч. Кажуць, гэта з тых склепаў, тых людзей. Мы, як малыя былі, так пачулі пра гэта і хадзілі на гэты Гарадзец, капаць яго, віно шукаць. Но колькі ні шукалі, нічога не нашлі. |
| Легенда гістарычная «Пра турак» | Ну, это ж шоў турок. Да ўбіваў людей. Моцно. Ну, у нас трі семьі осталося да вуховаліся... |
| Легенда тапанімічная «Пра назву Замошша» | Калісьці на месцы нашай вёскі, ды не толькі нашай, але і многіх навакольных таксама, было мора... Плавалі на ім караблі — драўляныя, вялізныя, на два ды на тры паверхі. <...> А потым і мора тое прапала. Здарылася гэта так. Ішла Божая Маці і несла дзіця-немаўля, а тут хваля як шухнула — і панесла яго. Так і не выратавалася дзіця. Дык Божая Маці пракляла мора і сказала, каб яно балотам, парослым імхамі, стала. Так і здарылася. Пазней сталі вёскі будаваць. Нашу паставілі якраз за тым балотам — імхом, дык і назва да яе адпаведная прыліпла — Замошша. |

| | |
|---|---|
| Легенда маральна-этычная «Нельга клясці» | Ішоў некалі адзін голы чалавек па зямлі. Сустрэў ён праз некаторы час Бога. Бог кажа: «Чаму ты голы?» Той адказвае: «Няма чаго надзець». Ну, некалі ж плаццяў было многа-многа, калі лічылі іх, дык на платах вешалі. Дык вось Бог і кажа: «Ідзі, знімі от у етай кабеты, тады сходзі пад вакно і паслухай. Калі не будзе клясці, дык занясі і назад павесь. А калі будзе — надзявай і ідзі, куды табе трэба». Так той голы чалавек і зрабіў. Тая маладзіца, у якой ён світку ўзяў, кажа: «Мабыць, гэта нехта голы быў, бо толькі адну пару узяў. Няхай сабе бярэ». Ну, тады Бог кажа: «Занясі, бо будзе грэх. Пайдзі да другой». Пайшоў то чалавек да другой, зняў, дык яна ужо ўсялякімі славамі — вядома ж, баба! Бог і кажа: «Вось гэта насі, праз гэта ня будзе табе граха, а толькі ёй, таму што нельга чалавеку клясці адзін аднаго. А будзеш клясці — сам такі зробішся». |
| Прымхліца «Як чоловік до дому ходыв» | Умэр чоловік і ходыв до дому. Жонка его взяла ботню, дэ одэжда ляжала. Ботню поставіла кай порога і одэжу чэрэз порог пэрэкладае в ночы. Вун ідэ і спрашывае: «Шо ты робіш?» Вона кажэ: «Убране шукаю». — «А нашто тобі то убране?» Вона кажэ: «На вэсілле пойду». — «Куда жэ ты пойдэш на вэсілле?» — «Брат с сэстрою жэніцца». Вун кажэ: «Нігдэ на світы нэ мае, коб брат с сэстрою жэнівся». Вона одказывае: «Нігдэ нэ можэ буты, коб умэр да ходыв». Вун до кажэ: «Вот догадалася». Ушов і больш нэ прыходыв. |
| Апавяданне-ўспамін «Першы трактар» | Даўно ета было, я тады яшчэ маладая была. Яшчэ толькі-толькі паявіўся калхоз. Я пасьціць кожны дзень хадзіла на работу. Ета ж цяпер кругом цехніка была, іна за людзей усё робіць, дык людзям можна і адпачыць і па хазяйству што-небудзь зрабіць. А раней усё рукамі ды рукамі. Помню, першы трактар паявіўся, дык уся вёска ішла глядзець. Бабы гаворáць: «Тырахтыр нейкі прыедзе, араць поля будзіць, пайдзём паглядзім». Усе пайшлі, і я тожа. Ох і страшным зверам здаўся нам еты «тырахтыр». Тырахціць, як пустая бочка, трасецца ўвесь і яшчэ густы дым пускаець, як Піліп са сваёй піпкі. А як паехаў па вёсцы, дык старыя бабы |

| | |
|---|---|
| | хутчэй у хату і праз вакно пазіралі на чуда. Хораша ён тады араў, але ж адзін многа ня зробіць. Работы нам сіраўно хватала. Бывала, як наробішся на полі, ці на дворні за дзень, дужа заморысся, а дома яшчэ трэба карову падаіць, свіней, курэй, гусей пакарміць і дзецям павячэраць. Маладая была, усё спраўлялася, ні хвілінкі свабоднай не было. |
| Бываліца<br>«Як анныя людзі жыто кралі» | Анныя павялі коней пасвіць. Даўней гэто было. І пасвілі яны іх каля могілак. А было яшчэ каля могілак бацюшково поле. А другія людзі прыехалі якраз жыто красці бацюшково. Ну і німа як красці, тут жа тыя коні коней пасуць.<br>Надумаўся адзін чалавек з тых, што прыехалі жыто красці, як ім пастухоў адвясці ад гэтага месца. Раздзеўся ён да кашулі, падвязаўся повясам ды лёг на магілі. А тыя ўжо пастухе засыналі. Коней пусцілі пад могілкі ды засыналі. А тут давай стагнаць на магілі: «Ой, як мне тут цяжко ляжаць! Ну, як устану, — ну і дам, ну і дам!»<br>Тыя пастухе глянулі на магілу — ляжыць у белай кашулі. Гэтыя людзі ледзь не абамлелі. Як сталі яны ўцякаць, на коней скарэй. А адзін мужчына абамлеў. Яго як-то ўжо там пасадзілі на каня, а як ад’ехалі шагоў на сто, давай яго аттрасаць, ледзьве аттраслі.<br>А тыя сабе накралі жыта ды давай смяяцца. Гэта праўда было, мама мая мне казала. |
| Небыліца<br>«Бацюшка без галавы» | Кагда-то, давным-давно ездзілі на валах у Крым за соллю. Но патом людзі падумалі пра сябе: «Чаго мы паедем аж у Крым за соллю, калі можнаі тут пасадзіць яе, ды й вырасце соль». Падумалі-падумалі, ды так і зрабілі. Пасадзілі соль, паліваюць яе, а ўсходаў усё нема і нема. Адзін раз у нядзелю, убачылі чэй-то след на полі. Глядзелі-глядзелі, думалі-думалі, чый гэта можа быть след, значыць, той і соль пабраў з поля, ды й не дадумаліся і паслалі за бацюшкам. Прыйшоў бацюшка, паглядзеў на след і кажа: «След гэты мядзведзя, а вядзе ён вунь у тое дупло ў дрэве». |

| | |
|---|---|
| | А недалёка ад таго месца, дзе людзі соль садзілі, расло вялізнае-вялізнае дрэва з такім жа як і само дуплам, у якім жыў мядзведзь. Пайшоў бацюшка да гэтага дупла па слядам. Падыйшлі і думаюць, як жа туды залезці. Думалі-думалі, усе зноў сказалі: «Лезці толькі бацюшке». Палез батюшка ў дупло. Людзі чакаюць яго, нема і нема. Аж глядзяць адні ногі тарчаць, пацягнулі за ногі і выцягнулі батюшку без галавы. Сталі і зноў людзі думаюць: была ці не ў бацюшкі галава. Пазвалі наймічку. Наймічка не помніць, была ці не ў бацюшкі галава. Затым пазвалі матушку, уж хто-хто, а яна дык павінна ведаць, была ці не была галава ў бацюшкі. Прыйшла матушка, у яе і пытаюцца людзі: «Матушка, скажы нам, была ці не была ў бацюшкі галава». Падумала матушка і кажа: «Да нейкая балталась, да і тая атарвалась». |
| Анекдот «Запрагайце, хлопцы» | Ідзе п’яны па вуліцы і спявае: «Запрагайце, хлопцы, коні, распрагайце, хлопцы, коні, запрагайце, хлопцы, коні!» Насустрач яму ідзе другі п’яны. Пачуўшы песню, кулаком даў у вуха спеваку і гаворыць: «Нашто скаціну мучыш?» |
| Жарт «Напаіў каня» | — Паіў ты каня?<br>— Паіў.<br>— А чаго ў яго пыса сухая?<br>— Да вады не дастаў. |
| Гумарэска «Як спораўцы вала кармілі» | Дзядзько не вымолоціў чысто зерно з жыта і накрыў соломой хату. Колоскі проросլі на крышы Спороўцы рэшылі засунуць туды вала, каб тую зеленую рож поз’ядаў. Оны узялі яго за вяроўку, шо на горло накінулі, вероўку закінулі на крышу і волокут, а ссаду палкамі вола б’ют, коб ішоў. хутше. Прыехала поліція штраф даваці, шо вола душат. Вол вываліў языка, бо ўжэ здыхаў.<br>А спороўцы радуюцца: «Гледзі, гледзі, які жадны: яшчэ до зелля не долез, а ўжэ языком замелае».<br>А поліцыянт шукае, хто вола задушыў, коб штраф даці, а адзін падумаў, шо гэто грошы дают за тое, што як вола волоклі, палкамі ззаду помогалі. Вон і крычыт: «І мяне запішы, шо раз даў!» |

| | |
|---|---|
| Анекдатычная казка «Салдат» | Салдат ішоў з белага свету. Пытае яго адна баба:<br>— Адкуль ты ідзеш, салдацік?<br>— Іду з белага свету.<br>А яна не дачула, дый пытае:<br>— З таго свету? А бачыў ты там майго бацьку ды маці? А што яны там робяць?<br>— Смалу на сябе возяць, — кажа салдат.<br>— Дык можа ты, мой салдацік даражэнькі, завёз бы туды дзенег і касцюм?<br>— Хораша, занясу.<br>Баба дала яму дзенег ды касцюм, салдат узяў і пайшоў. Прыходзіць дзед. Баба яму кажа:<br>— Прыходзіў салдацік з таго свету, бачыў там маіх бацьку з маці. Яны смалу на сябе возяць, абарваныя, дык я перадала ім трохі дзенег і касцюм.<br>Дзед гаворыць:<br>— Ён жа абмануў цябе. Куды ён пайшоў?<br>— Тым шляхом, — гаворыць баба.<br>Паехаў дзед за салдатам. А салдат убачыў яго, надзеў касцюм, прысланіўся да бярозкі і стаіць. Пад’ехаў к яму дзед і пытае пра салдата. А той гаворыць:<br>— Тым шляхам пайшоў.<br>Не дагнаў дзед салдата, вярнуўся к яму і кажа:<br>— На табе коня, чалавеча, вярні мне яго. Ждаў, недай, дзед коня, ды так і не даждаўся. Вярнуўся вечарам да бабы і кажа:<br>— Ты дала толькі дзенег і касцюм, а я яшчэ коня, каб тваі бацька і маці смалу на сабе не вазілі. |

## 1.2. ФАЛЬКЛОРНАЯ КАЗКАВАЯ ПРОЗА

Казкавая проза мае некалькі жанравых відаў: *анімалістычныя казкі,* або *казкі пра жывёл; чарадзейна-фантастычныя; рэалістычныя*, г. зн. жыццепадобныя, якія, у сваю чаргу, падзяляюцца на *авантурна-навелістычныя казкі пра прыгоды героя, бытавыя, сацыяльныя*. Акрамя таго, сустракаюцца казкі з адметнай кампазіцыяй — *кумулятыўныя* (ланцужковыя з паўтарэннем ці нарошчваннем аналагічных дзеянняў ці эпізодаў) і *дакучныя* (бясконцыя або звышлаканічныя тыпу «Жили-были два гуся. Вот и сказка вся»). На гэтую класіфікацыю вы і будзеце арыентавацца пры вызначэнні жанравай разнавіднасці казкавых тэкстаў.

**Увага!**
Ідэальны запіс казкі можна атрымаць пры выкарыстанні тэхнічных сродкаў. Запісваючы казку «ўручную», збіральнік павінен імкнуцца занатаваць тэкст слова ў слова, каб перадаць яе жывы вобраз з усімі паўторамі, удакладненнямі, заўвагамі выканаўцы. Напрыклад: «*Жылі два браты. Адзін жыў у пана, войтам, а другі брат узяў ажаніўся, сын у іх радзіўся. Радзіўся сын, і сам памёр, і маць памерла, асталася сірата гэтая. Вот яны жывуць. Гэты ўжо войт, брат гэты, хоча, штоб як памёр пляменнік, штоб яму часць асталася. Так хлопец сабраўсяі пайшоў...*»

**Абавязкова** зрабіце адзін з наступных каментарыяў: «Дакладны запіс казкі», «Дакладны запіс казкі з элементамі пераказу» (пры гэтым частка, якая з’яўляецца пераказам, падаецца ў квадратных дужках), «Вольны запіс казкі», «Пераказ казкі».

Задача практыканта — выявіць натуральную лінію жывога бытавання казак, калі яны сапраўды перадаюцца з вуснаў у вусны, а не бяруцца з кніжак. Тым не менш нават калі казка атрымала другаснае жыццё, увайшла ў побыт праз чытанне надрукаванага тэксту, пры вусным узнаўленні выканаўца міжволі будзе прыстасоўваць яе да мясцовай традыцыі і сваёй індывідуальнасці, таму добра вядомыя сюжэты набываюць differs рознае тэкставае афармленне. Параўнаем пачаткі казкі пра казу і ваўка.

1. *Жыла козачка ў маленькім-маленькім доміку. Аказянілася. Ну, ідзець на паляванне:*

*— Дзеці, нікому не адкрывайце. Закрывайце, не адкрывайце.*

*Паходзіць, прыбягае:*

*— Мае дзетачкі, казянятачкі, адчыніце, атварыце, ваша мамка ідзець, малачка вам нясець, поўны цыцы малацыцы, поўны рожкі вадзіцы.*

2. *Здзелала козачка сабе хатку ў лясу і жыве, расціць дзяцей. А казлянятак тых было пяць штук. А гэтыя казляткі ўсе роўненькія, а адзін — самы маленькі казлёначак. Вос яна, гэта каза, закрые хатку, пойдзе ўжо, насабіраецца, наесца, напасецца, прыйдзе і говорыць:*

*— Казлятушкі-дзіцятушкі, атапрыцеся, я — ваша маць — прыйшла, малачка вам прынясла.*

Як бачна, тэксты істотна адрозніваюцца ад апрацаванай і добра вядомай вам казкі пра ваўка і сямярых казлянят.

**Парада**
1. Высветліце прозвішчы вядомых на вёсцы казачнікаў або проста добрых выканаўцаў і накіроўвайцеся да іх.
2. Пра патэнцыяльных інфармантаў можна даведацца ў дзяцей і падлеткаў. Спытайце іх, хто і калі расказваў ім казкі (маці, дзядуля, бабуля, суседзі, равеснікі). Цікава запісаць казку двойчы — ад дзетак і ад дарослых.

3. Калі вы маеце справу з дарослым чалавекам, які згодны расказаць казку, высветліце, хто яго навучыў казкам, дзе, калі, у якім узросце, ад каго ён яе чуў, і запішыце адказ.
4. Запісвайце літаральна ўсе казкі, якія ёсць у рэпертуары выканаўцы, нават калі высветліцца, што яны запазычаны з надрукаваных зборнікаў. Такім чынам, мы атрымаем казку, якая ўвайшла ў вуснае бытаванне і, магчыма, набыла новыя дэталі падчас імправізацыі.
5. Звярніце ўвагу, як выканаўцы называюць казкі (напрыклад, *байкі*), як пазначаюць назвы казак (напрыклад, «Пра казу і ваўка», «Казляты і воўк»; «Як воўк дзедаву гаспадарку паравёў», «Коляды» (пра ваўка-калядоўшчыка, які выманіў у дзеда ў якасці каляды ўсю жывёлу і птушку), «Як дзед ваўка абдурыў» (версія таго ж сюжэта); «Каза-дзераза», «Пра казу лупленую» і г. д.).
6. Высветліце, ці існуюць асобныя казкі для дзяцей і дарослых, «мужчынскія», «жаночыя», «сараматныя», якія расказваюцца толькі ў пэўнай кампаніі. Апошніх у нашым фальклорным архіве вельмі мала: звычайна гэта эратычна-сексуальныя творы накшталт тых, што былі надрукаваны А. Афанасьевым у кнізе «Русские заветные сказки. Только для взрослых!!! Только для мужчин!!!»

## ? АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ КАЗКАВАЙ ПРОЗЫ

1. Якія казкі вы чулі ў дзяцінстве? Ад каго? Якая ваша самая любімая казка? Ці расказваеце вы казкі сваім дзецям (унукам)? Якія? Ці пераказваеце вы ім казкі, якія калісьці чыталі або вывучалі ў школе? Якія?

2. Можа, вы ведаеце казкі пра лісу, якая прыкінулася мёртвай і выкрала рыбу з воза; пра ваўка ля палонкі, ашуканага лісой; пра лісу-павітуху; пра звяроў у яме, якія з'ядаюць адзін аднаго; пра зайца і лісу (ледзяную і лубяную хаткі гэтых звяроў); пра лісу і дразда (салаўя, дзятла); варону і лісу; лісу і жураўля; пра ката, пеўня і лісу; пра дурную лісу, якая топіць збан; пра ваўка ў гасцях у сабакі; пра сабаку-шаўца; пра ката, які напалохаў у лесе звяроў; пра вайну свойскіх жывёл з дзікімі; пра пахаванне мышамі ката, які прытварыўся мёртвым; пра ваўка-дурня; пра ваўка і казлянят; пра жывёл, якія ўцяклі ад гаспадара ў лес; пра мужыка, мядзведзя і лісу; пра ўдзячнага мядзведя; пра вяршкі і карэньчыкі; пра мядзведзя на ліпавай (бярозавай) назе; пра спевы ваўка з мэтай выманіць у старога маёмасць; пра камароў і мядзведзя; пра церамок мухі; пра размову жаб і інш.?

3. Ці ведаеце вы якую-небудзь дакучную казку, якую расказваюць, каб адчапіцца ад дзяцей?

4. Можа, вы чулі такія казкі, дзе шмат паўтораў? Напрыклад, «Казу гнаць»: каза не хоча ісці з лесу з арэхамі, па казу выпраўляюць ваўкоў,

на ваўкоў мядзведзя і г. д.; пра тое, як пеўнік выбіў курачцы вока, бо ляшчына парвала яму порткі, а ляшчыну абгрызлі козы, бо іх не глядзелі пастухі і г. д.; пра разбітае яечка, пра калабка, пра былінку і вераб'я, пра церам мухі, пра рэпку і да т. п.

5. Ці чулі вы калі-небудзь «сараматныя» казкі з брыдкімі словамі? Дзе і калі іх расказваюць?

6. Ці ведаеце вы чарадзейныя казкі? Напрыклад, пра пераможцу змея і вызваленне царэўны; пра Кажамяку; пра тры падземныя царствы; пра салдата, які знайшоў царэўну; пра смерць Кашчэя; пра Кацігарошка; пра Бабу Ягу; пра звярынае малако; пра няверную жонку, што выкрала ў мужа чарадзейны прадмет і перадала палюбоўніку, а мужу дапамаглі верныя жывёлы ці дзяўчына; пра хітрую навуку ў чараўніка; пра дзяцей, якія трапілі да ведзьмы і выратаваліся; пра хлопчыка і ведзьму; пра каваля і чорта; пра салдата і смерць; пра людаеда; пра жаніха-ваўкалака; пра зачараваную царэўну; пра царэўну-жабу; пра падменную нявесту або жонку; пра падчарку і родную дачку бабы; пра дзяўчыну-кветку; пра скамянелае царства; пра пунсовую кветачку; пра жонку вужа; пра Фініста — Яснага сокала (мужа-асла, барана, казла); пра братоў-крумкачоў; пра падарожжа да сонца; пра Марку Багатага; пра заляцанні цара да прыгажуні — жонкі мужыка (слугі); пра самаграйныя гуслі; пра мачаху і падчарку; пра дванаццаць месяцаў; пра Папялушку; пра цудоўную карову; пра Сіўку-бурку; пра Канька-гарбунка; пра Ямелю; пра Нязнайку; пра ката ў ботах; пра ката Максіма; пра шэрага ваўка; пра маладзільныя яблыкі; пра Жар-птушку; пра залатую рыбку; пра чарадзейны пярсцёнак; пра жывёл-зяцёў; пра Івашку Мядзведжае вушка; пра Еруслана; пра Іллю Мурамца; пра скрыпача ў чарцей; пра сынка з кулачок; пра Снягурачку; пра Бязручку; пра Баву-каралевіча; пра мёртвую царэўну і чарадзейнае люстэрка; пра пеўня і жорны; пра Гора, пра Шчасце і Багацце; пра цудоўных дзяцей; пра жывую ваду і г. д.

Як толькі інфармант скажа, што ведае тую ці іншую казку, папрасіце яго расказаць яе, а потым рухайцеся далей. Калі любімай казкай інфарманта аказваецца рэалістычная, то, магчыма, у яго рэпертуары іх некалькі. Паспрабуйце даведацца, ці знаёмы яму казкі пра дурную бабу (жонку); лянівую жонку; разумную дзяўчыну; абгавораную жонку (дзяўчыну); верную жонку; прытворна памёршую дзяўчыну; непраўдзівыя абвінавачванні; выпраўленне лянівых; пана і мужыка; папоў; няверную жонку і разбойніка; высакародных разбойнікаў; дурнога чорта; спаборніцтва ў смеху; спрэчкі, хто мацнейшы, хто праспявае песню даўжэй; разумных і дурных; уцёкі парабка; прыгоды салдата і г. д.

# 2. МАЛЫЯ ЖАНРЫ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ

Да гэтага пласта народнай творчасці далучаюцца прыказкі, прымаўкі, загадкі, выслоў'і, прыкметы, павер'і, тлумачэнні сноў і інш. Малымі іх назвалі па фармальнай прыкмеце — творы гэтых жанраў сапраўды невялікія па аб'ёме.

Фалькларыстамі XIX—XX стст. былі распрацаваны розныя метадычныя прыёмы фіксацыі твораў малых жанраў. Напрыклад, вопытныя збіральнікі рэкамендуюць уважліва прыслухоўвацца да мовы выканаўцаў, вылучаючы ў ёй прымаўкі і прыказкі і запісваючы іх.

**Парада**
Галоўнае не толькі запісаць прымаўку, прыказку, выслоўе ці загадку, але зафіксаваць іх у кантэксце, адзначаючы, з якой нагоды яны згадваліся. Можна таксама падрыхтаваць асобны спіс прымавак, прыказак, выслоўяў ці загадак (прыкладна каля 200 адзінак абранага жанру) і ў размове з інфармантам павольна прачытаць творы. Гэта, без сумнення, актывізуе памяць выканаўцы і дасць вам магчымасць пачаць дыялог і запісаць творы малых жанраў.

**Увага!**
Абавязкова фіксуйце ўсе каментарыі выканаўцы, напрыклад, калі і ў якіх абставінах кажуць так ці інакш.

**Даведка**
Выслоўі — трапныя і дасціпныя выразы, часцей гумарыстычнага характару, пазбаўленыя элементаў афарыстычнасці і навучальнасці, уласцівых прыказкам, якія нібы толькі жартам, мімаходзь падкрэсліваюць тую ці іншую з'яву, дробную бытавую падзею, асобную рысу ў характары чалавека, у паводзінах жывёлы, у стане прыроды. Да выслоўяў даследчыкі таксама далучаюць такія характэрныя ўзоры народнай словатворчасці, як скорагаворкі, застольныя жарты, прыгаворкі і тосты, вітанні, зычэнні, ветлівыя і ласкавыя звароты, прысяганні і бажба, праклёны і абзыванні-ганьбаванні, нават калі яны выражаны адным словам.

## ? АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ ТВОРАЎ МАЛЫХ ЖАНРАЎ

### Прыказкі і прымаўкі

1. Якія мясцовыя назвы існуюць для гэтых жанраў?
2. Ці адрозніваюць выканаўцы прыказку ад прымаўкі? Якім чынам? З якой мэтай іх выкарыстоўваюць?

3. Якія тыпы прыказак найчасцей ужываюцца: у прамым значэнні (*лепш пазней, чым ніколі*) або ў пераносным (*кашу маслам не сапсуеш*)?

4. Ці існуюць прыказкі, якія страцілі прамое значэнне і ўжываюцца толькі ў пераносным (*узяўся за гуж, не кажы, што не дуж*)?

5. Якія тэматычныя групы прыказак і прымавак пераважаюць у вашай мясцовасці (пра прыроду, гаспадарчую дзейнасць, працу, матэрыяльны быт, грамадскае жыццё, сям'ю і сямейны быт, чалавека і яго якасці, мараль, розныя павучанні і назіранні, агульныя разважанні)?

6. Якія існуюць прыказкі на мясцовыя тэмы, з чым яны звязаны?

### Загадкі

1. Хто, каму і калі загадвае загадкі?
2. Ці існуюць мясцовыя назвы загадак?
3. Якія загадкі пра прадметы і з'явы сучаснага быту вядомы ў вашай мясцовасці?
4. Ці ведаюць выканаўцы загадкі-каламбуры, задачы-шарады?
5. Ці бытуюць загадкі літаратурнага паходжання?
6. Ці складаюцца цяпер новыя загадкі?

### Выслоўі

1. Ці існуюць мясцовыя назвы выслоўяў?
2. Якія выразы выкарыстоўваюцца часцей «для смеху», «да слова» і інш.?
3. Ці адрозніваюцца тосты, прыгаворкі, зычэнні, якія выконваюць пад час розных святкаванняў: сямейнага застолля, суседскіх частаванняў, вясковых урачыстасцей?
4. Каму ў першую чаргу адрасаваліся тосты і зычэнні?
5. Як было прынята вітацца, калі ўваходзілі ў хату ці пры сустрэчы?
6. Што казалі на развітанне?
7. Ці захаваліся ў вашай мясцовасці спецыяльныя вітанні (рыбаловам, як стрыгуць авечак, як будуюць хату, на ўваходзінах і інш.)?
8. Што казалі пры розных работах?
9. Якія вітанні ўжывалі на пахаванні і памінках?
10. Што казалі пры чханні?
11. У якіх выпадках гучалі выслоўі-праклёны?
12. Калі ўжываліся жартоўныя праклёны?
13. Якія адкляцці вядомыя ў вашай мясцовасці?
14. У якіх выпадках ужываліся выслоўі-ганьбаванні? Каму яны адрасаваліся?

### Прыкметы, павер’і, тлумачэнні сноў

1. Якія вы ведаеце прыкметы і павер’і, звязаныя з цяжарнасцю, родамі, вяселлем?
2. Ці ведаеце вы прыкметы і павер’і, якія прадказвалі ўраджай ці неўраджай?
3. Якія ёсць прыкметы і павер’і, звязаныя з прадказаннем надвор’я, стыхійных бедстваў, вайны?
4. Ці бываюць сны «вешчымі»?
5. Які прадмет, з’ява ў сне могуць прадказаць смерць блізкага чалавека, вяселле, нараджэнне дзіцяці, змену надвор’я?
6. У якія дні сны збываюцца, а ў якія не? Ці ёсць у вашай мясцовасці людзі, якія правільна тлумачаць сны?

## УЗОРЫ ЗАПІСУ ТВОРАЎ МАЛЫХ ЖАНРАЎ

| | |
|---|---|
| Выслоўі-жарты | Ах ты, стары пёс, калі ж я на цябе казаў сабака? Каб тое каб, да каб тое еслі, то самі б грыбы ў рот лезлі. |
| Застольнае выслоўе | Ешче вы, госційкі, ужывайце, толькі ў карманы не хавайце. |
| Выслоўі-вітанні | Добры дзень! — Добры дзень! Хай дае Бог добрае! |
| Выслоўі на развітанне | Заставайцеся здаровы! — Ідзі здарова! |
| Выслоўі пры рабоце | Памагай Бог! — Бог казаў, каб і ты памагаў. |
| Выслоўе на пахаванні і памінках | Добры чалавек быў пакойнік, няхай яму зямля пухам будзе! |
| Выслоўе пры чыханні | Будзь здароў, мей сто кароў! |
| Выслоўе-праклён | А каб табе жаба цыцкі дала! |
| Выслоўі-адкляцці | Твае рэчы ды табе ў плечы. Цыпун табе на язык. |
| Выслоўі-ганьбаванні | Бот ты з левае нагі! Які жа ты баламут! |

# 3. РЫТУАЛЬНА-МАГІЧНАЯ СФЕРА ФАЛЬКЛОРУ

## 3.1. ЗАМОВЫ

У рытуальна-магічнай сферы замовы стаяць паасобку. Асаблівы статус ім надае той факт, што ў тандэме «дзеянне — слова» менавіта слова выконвае ў замовах вядучую ролю. Зафіксаваць замовы даволі цяжка, паколькі бытаванне гэтых твораў мае спецыфічны характар: лічыцца, што носьбітамі замоў з'яўляліся, умоўна кажучы, «прафесіяналы», якія па розных прычынах трымалі ў тайне сакрэты свайго занятку.

**Увага!**
У населеным пункце можа быць свая «бабка», але верагоднасць таго, што яна адмовіцца адказваць на пытанні, даволі высокая. Вашыя намаганні прынясуць плён толькі тады, калі вы здолееце ўсталяваць добрыя ўзаемаадносіны з інфармантам. Напрыклад, вопытны фалькларыст ніколі не распачне размову пра замовы ў пачатку свайго знаёмства з выканаўцам; калі ж час настане, трэба пачынаць з пытанняў пра замовы супраць хвароб (напрыклад, паскардзіцца на дрэннае самаадчуванне) ці гаспадарчых замоў, і толькі ў апошнюю чаргу распытваць пра любоўныя.
Усе дзеянні і каментарыі, што суправаджаюць выкананне замоў, таксама трэба старанна і дакладна запісаць.

**Даведка**
Асноўныя групы замоў: 1) замовы, звязаныя з гаспадарчай дзейнасцю чалавека (*паляванне, рыбацтва, пчалярства, збор грыбоў, ягад, захаванне жывёлы, ураджаю*); 2) замовы супраць хвароб (*ліхаманка, зубны боль, пярэпалах, грыжа, урокі, укус змяі, крывацёк, каронавірус* і інш.); 3) замовы, звязаныя з сямейнымі адносінамі і прыватным бытам (*засцярогі ад напасці, смерці, зайздрасці, злога духа, нячыстай сілы, нагавору ў час вяселля, нараджэння дзіцяці* і г. д.); 4) замовы любоўнага прызначэння («*прысушкі*» і «*адсушкі*»); 5) замовы, звязаныя з грамадскімі адносінамі (*супраць злачынцаў, няправедных суддзяў, а таксама супраць вайны, супраць кулі на вайне* і інш.).

### ? АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ ЗАМОЎ

1. Як у вашай мясцовасці называюць замовы (*загаворы, шэпты, нагаворы, словы*)?

2. Ці ёсць у вас людзі, што ўмеюць замаўляць? Як іх называюць (*знахар, шаптун, чарадзей, вядзьмак, бабка*)? Ці вядома, каму і як яны перадавалі свае веды?

3. Ці захаваліся да цяперашняга часу замовы традыцыйныя (кананічныя), з устойлівай формулай і ўсвядомленымі адносінамі выканаўцы да твора?

4. Якімі словамі звычайна пачыналіся замовы?

5. Якімі словамі замовы заканчваліся?

6. Ці існуюць у вашай мясцовасці «механістычныя» замовы — традыцыйныя па форме, але з бяссэнсавым ужываннем асобных слоў або выразаў.

7. Якія замовы супраць хвароб часцей за ўсё згадваліся ў вашай мясцовасці (ад зубнога болю, ліхаманкі, укусу змяі, грыжы, кровацёку і інш.)?

8. Ці захаваліся замовы, звязаныя з паляваннем, рыбацтвам, пчалярствам, зборам грыбоў, ягад, захаваннем жывёлы, ураджаю і г. д.? Якія прадметы выкарыстоўваліся ў час замаўлення?

9. Як замаўлялі, каб засцерагчы ад смерці, напасці, злога духу, нячыстай сілы, бяссонніцы?

10. Ці выконваліся ў вашай мясцовасці спецыяльныя замовы падчас нараджэння дзіцяці, хрэсьбінаў, вяселля? Якія?

11. Калі і як выконваліся любоўныя «прысушкі» і «адсушкі»? Хто гэта рабіў?

12. Ці існавалі ў вашай мясцовасці спецыяльныя замовы супраць вайны, кулі; замовы грамадскага прызначэння?

13. Якія дзеянні неабходна было рабіць у час замовы (абліцца, павярнуцца тварам на ўсход, узяць у рукі хустку або хлеб, перахрысціцца і інш.)?

14. Ці ёсць у вашай мясцовасці замовы новаствор採ныя, якія ўзніклі ў больш познія часы, у сувязі з імкненнем выканаўцы прыблізіць, прыстасаваць кананічны тэкст замовы да новых з'яў жыцця (замова супраць ДАІ, замова ад крадзяжу, замова ад каронавірусу і інш.)?

15. Ці ўзнікаюць замовы ў наш час? Якія? Хто іх складае?

## УЗОРЫ ЗАПІСУ ЗАМОЎ

| | |
|---|---|
| Замова з устойлівай формулай | Ва імя Айца і Сына, і Святага Духа. Стану я, раб Божы (імя), благаслаўлясь, пайду, перахрышчась, з хаты ў чыста поле. У чыстым полі стаіць хата, у хаце з вугла ў вугал ляжыць даска, а на дошке ляжыць таска. Я той дошке, раб Божы (імя), памалюся, пакланюся: о, гэта таска, не хадзі ка мне, рабу Божаму (імя); хадзі, таска, навалісь, таска, на красну дзеву, у ясныя вочы, у чорныя |

| | |
|---|---|
| | бровы, у рэцівае сэрца, распалі ў ёй, рабы Божай (імя) рэцівае сэрца, кроў гарачую па мне, рабу Божаму (імя), не магла бы ні жыць, ні быць. Уся мая крэпасць. Амінь, амінь, амінь. |
| Пачатак замовы | Першым (другім, трэцім) разам, добрым часам, благаславі, святая Марыя, Зоры-зараніцы, красныя дзявіцы. |
| Заканчэнне замовы | Тым маім словам і прамовам ключавыя словы. Слова маё крэпка. Амінь, Ва, ва, ва, ва, няхай будзе на ўвесь свет мая слава. Перад сонейкам стаю, Госпада Бога прашу: Госпадзі Божа, спасі і дапамажы мне. |
| «Механістычная» замова | Пусіха, Расіха, Сохва-Сарохва! Ты яравая, гнаявая, гнілавая, калодная, балотная. Узнімі жыгала сваё. |
| Замова супраць хвароб | На сінім моры стаіць дуб на дванаццаць карней, на дванаццаць какатоў. У тых какатах гняздо, у тым гняздзе сядзіць змяя Салахвея. Салахвея! Сунімай сваіх дзяцей, не пускай на нас яду! |
| Замова на жывёлу | На жывёлу казалі так: «Зара-зараніца, ты ёсць адзініца. Я з малітваю тваёю, а ты з помашчу. Рабая кароўка глазлівая. Глаза сінія, глаза чорныя, глаза касыя-раскосыя, вам у маёй кароўцы не стаяць, цела яе не прымячаць, крыві яе не співаць. Ідзіце да мха на балота — там вам стаяць столікі засціланыя, кубкі наліваныя, там вам піць-гуляць, у маёй кароўкі не стаяць». |
| Любоўная замова | На моры-акіяні, на востраве на Буяне, там стаяў дуб, пад тым дубам сто карней, на тым дубе сто кашчэй, на тых кашчах сто чарцей. Дзярыце, дзярыце, чэрці, душу Івана, ды ўкладзіце яго душу ў душу Соніну. |
| Спецыяльная замова | Іду я на суд, цягну нагу за нагою, увесь суд за мною. Вужам еду, гадзюкаю паганяю, злачынцу губы і зубы замаўляю. А ты, суддзя, лезь на печ, замаўляю табе губы, зубы і рэч. Мая цоля, мая і воля. На моры на акіяні, на востраве на Буяне там сядзяць паны радамі. А вы, панікі, сэрца рэжце, а мяне не трогайце. |

## 3.2. КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫЯ ПЕСНІ

Каляндарна-абрадавая паэзія ў цяперашні час у жывым бытаванні з’ява рэдкая. Але ўсё ж такі з рознай ступенню інтэнсіўнасці калядныя песні, вяснянкі або купальскія песні можна запісаць ад людзей сталага ўзросту, а гэта значыць, што вы маеце магчымасць запісаць песні ўсіх чатырох цыклаў: зімовага, веснавога, летняга і восеньскага.

**Даведка**
Геаграфія распаўсюджання каляндарна-абрадавых песень прадстаўлена ў табліцы. Магчымы і выключэнні, прычыны якіх розныя, напрыклад міграцыя насельніцтва і інш.

**Геаграфія распаўсюджання каляндарна-абрадавых песень**

| Цыкл | Віды песень | Тэрыторыя бытавання |
|---|---|---|
| Зімовы | Калядныя і шчадроўскія | Паўсюдна ў Беларусі |
| | Засявальныя | Магілёўшчына |
| | Стрэчаньскія | Вядомы адзінкавыя прыклады (Касцюковіцкі раён, Віцебшчына) |
| Веснавы | Масленічныя | Віцебшчына, Міншчына, Магілёўшччына, радзей Гомельшчына |
| | Вяснянкі | Паўсюдна ў Беларусі |
| | Валачобныя | Віцебшчына, Міншчына, Магілёўшчына, радзей Гомельшчына |
| | Юраўскія | Паўсюдна ў Беларусі |
| | Песні абраду ваджэння і пахавання «стралы» | Гомельшчына (Веткаўскі, Добрушскі, Гомельскі, Чачэрскі, Рэчыцкі, Лоеўскі, Кармянскі, Хойніцкі, Брагінскі, Светлагорскі, Петрыкаўскі раёны), Берасцейшчына (Лунінецкі), Магілёўшчына (Бабруйскі), Міншчына (Барысаўскі, Мінскі раёны) |
| | Траецкія | Магілёўшчына |
| | Куставыя | Пінскі раён |
| | Русальныя | Гомельшчына (Веткаўскі, Добрушскі, Рэчыцкі, Лоеўскі, Лельчыцкі, Петрыкаўскі, Чачэрскі раёны) |

| Цыкл | Віды песень | Тэрыторыя бытавання |
|---|---|---|
| Летні | Купальскія | Паўсюдна ў Беларусі |
| | Пятроўскія і касецкія | Міншчына, Магілёўшчына, Гомельшчына, Берасцейшчына |
| | Жніўныя | Паўсюдна ў Беларусі |
| Восеньскі | Ярынныя | Цэнтральная Беларусь |
| | Ільняныя | Паўночная Беларусь, Падзвінне |
| | Канапельныя | Паўднёва-Усходняя Беларусь; |
| | Збіральніцкія | Паўсюдна ў Беларусі |
| | Талочныя | Паўсюдна ў Беларусі |
| | Піліпаўскія | Паўсюдна ў Беларусі |

**Увага!**
Пры фіксацыі каляндарна-абрадавага твора трэба ўказваць не толькі яго відавую аднесенасць (напрыклад, калядная песня), але і жанравую форму (напрыклад, калядная велічальная гаспадару).

## 3.2.1. Зімовы цыкл земляробчага календара

**Калядныя і шчадроўскія песні.** Калядныя і шчадроўскія песні спяваюцца на Каляды падчас хаджэння па хатах калядоўшчыкаў. Каталіцкія тэрміны святкавання — з 24 снежня да 6 студзеня, праваслаўныя — з 6 да 21 студзеня. Таму майце на ўвазе: калі інфарманты кажуць, што шчадроўскія песні спяваліся напярэдадні Новага года, то ў каталікоў гэта 31 снежня, а ў праваслаўных — 13 студзеня. *Абходныя калядныя* песні маюць яскрава выражаны велічальны характар і прысвячаюцца гаспадару, гаспадыні, дзяўчыне, хлопцу і інш. Акрамя велічальных, існуюць песні, у якіх цэнтральнымі персанажамі з’яўляюцца каза і Каляда.

**Парада**
Вы павінны дакладна пазначыць строфіку песень, якая абумоўлена рытмамеладычнай структурай твораў. Графічна вылучаецца прыпеў, які ставіцца крыху правей адносна асноўнага тэксту. Калі прыпеў паўтараецца без змяненняў, запісваем яго адзін раз і пазначаем зорачкай. Паўторы ў тэксце трэба запісваць цалкам. Назва песні даецца па першым радку, над ім — жанрава-відавое апісанне твора.

Шэраг шчадроўскіх песень мала чым адрозніваецца па сюжэце і вобразнасці ад уласна калядных. У іх нават можа згадвацца Каляда, але пазнаюцца яны па характэрных прыпевах: «Шчодры вечар!» або «Добры вечар, шчодры вечар, // Усім людзям на ўвесь вечар!» і пад.

Калядныя вечары вызначаліся ігрышчамі і вячоркамі, на якія збіралася ў асноўным моладзь. У гэты час гучала шмат песень, прыпевак, загадак, жартаў, *якія суправаджалі рытуальныя калядныя гульні і варожбы*. Сярод распаўсюджаных гульняў вядомыя «Яшчур», «Жаніцьба Цярэшкі», «Падушачкі» і інш. Абавязкова запытайцеся, ці суправаджаліся яны спецыяльнымі песнямі тыпу «Яшчур» і «Падушачка». Адзначайце, што прыгаворвалі ці спявалі дзяўчаты падчас варожбаў.

*Узор запісу*

Дзяўчына, паеўшы салёнага, кладзецца спаць і гаворыць: «Суджаны, напаі мяне!» Каго ў сне яна ўбачыць, той і будзе яе суджаным. Ці, кладучыся спаць, дзяўчына сыпле пад падушку некалькі зярнят і гаворыць: «Суджаны, дапамажы жаць!» Хто ёй у сне дапамагае, той яе і суджаны будзе.

Пры варожбах гуртам маглі выбіраць дзяўчыну на ролю Апалайніцы, якая «апалаець» складзеныя ў апалушкі дзявочыя паясы. У гэты час усе астатнія дзяўчаты падпявалі:

Святы Апанас, чым хутчэй ідзі да нас,
Бо нам у людзі пара.
Прышлі нам малойца прыгожага,
Сокала яснага,
Да людзей і да Бога шчаснага.
Святы Апанас, ой, хутчэй ідзі па нас.

Паводле старога стылю, дзень Новага года вядомы яшчэ пад назвай «Васілле». У гэты дзень раніцай сялянскія дзеці хадзілі па хатах з навагоднімі віншаваннямі. Імітуючы засявальнікаў, яны раскідвалі зярняты жыта, аўса, ячменю. Такое «засяванне» суправаджалася *заклінальнымі песнямі* і пажаданнем гаспадарам добрага ўраджаю і дастатку ў новым годзе.

**Песні, якія выконваліся на Стрэчанне (Грамніцы).** Стрэчанне (Грамніцы) — зімовае свята, якое прыпадае на 2 лютага ў каталікоў і на 15 лютага ў праваслаўных. Па народных меркаваннях, у гэты дзень зіма сустракаецца з летам. З архіўных матэрыялаў вядомы адзінкавыя запісы твораў, дзе зіма малюецца ў выглядзе старой хворай асобы, а лета, наадварот, маладым і поўным энергіі.

**Увага!**
У некаторых рэгіёнах Беларусі (Кармянскі, Чачэрскі, Добрушскі раёны Гомельскай вобласці) мясцовыя жыхары адносяць Стрэчанне да вясенніх свят. Пры запісе стрэчаньскіх песень ці прозы абавязкова звярніце ўвагу на гэту часавую акалічнасць.

## ? АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ ПЕСЕНЬ ЗІМОВАГА ЦЫКЛА

1. Калі адбывалася калядаванне і шчадраванне? Чым яны адрозніваюцца? Хто хадзіў калядаваць і шчадраваць? Ці хадзілі «засяваць»? Якія песні спяваліся падчас калядавання, шчадравання і «засявання»: велічальныя, рытуальныя, заклінальныя? Ці адрозніваюць калядкі ад шчадровак? Калі так, то якім чынам?

2. Ці пераапраналіся падчас калядавання і шчадравання? Як? Што рабілі пераапранутыя? Якія песні пры гэтым спявалі? Што казалі?

3. Ці носяць у вас «зорку» («звязду», «гвязду»)? Ці паказваюць батлейку? Як гэта адбываецца? Якімі віншавальнымі песнямі, прыгаворамі суправаджаўся абрад калядавання з зоркай?

4. Як прасілі дазволу пакалядаваць, пашчадраваць? Выконвалася адна песня ці больш? Якія песні былі для гаспадара, гаспадыні, іх дачкі, сына, старой бабкі, немаўляці, для каня, каровы, авечак, быка, вала? Якімі словамі дзякавалі гаспадарам за пачастункі? Ці пагражалі за сквапнасць?

5. Як адбывалася «ваджэнне казы»? Што пры гэтым казалі і спявалі? Як «гуляла каза» (падскоквала, паварочвалася з боку на бок, лажылася)? Запішыце песні пра казу, казла.

6. Ці спраўлялі на Каляды ігрышчы (у першы, другі, трэці дзень Каляд, на Новы год, у праводзіны Каляд на Вадохрышча)? Як да гэтага рыхтаваліся? Якія забавы ладзіліся на ігрышчах (песні-танцы, песенныя карагоды, карагоды-гульні, народныя танцы, напрыклад «Мяцеліца», «Барыня», «Верабей», «Чыжык», «Кадрыля», «Полька» і інш.)?

7. Якія традыцыйныя гульні былі на ігрышчах («Цярэшка», «Яшчур», «Падушачка»)? Якімі прамовамі, песнямі, танцамі, карагодамі яны суправаджаліся?

8. Ці існаваў у вашай мясцовасці звычай на Вадохрышча «адпраўляць Каляду на дуба»? Калі так, апішыце яго. Якімі абрадавымі песнямі, карагодамі, гульнямі ён суправаджаўся?

9. Як называўся першы дзень Новага года? Што казалі і спявалі «засявальнікі»?

10. Ці ведаеце вы песню «А ў нас сёння Стрэчанне»? Што ў вас кажуць пра свята Стрэчанне? Якія прыкметы існавалі на гэты дзень?

**Увага!**
Абавязкова адзначайце сучасны стан традыцыі. Задавайце пытанні тыпу: «Ці адбываецца “ваджэнне казы” цяпер?».

## УЗОРЫ ЗАПІСУ ПЕСЕНЬ ЗІМОВАГА ЦЫКЛА

### Калядная велічальная гаспадару «Добры вечар таму…»

Добры вечар таму,
Хто ў етым даму.

Святы вечар!
Хто ў етым даму.

А ў етым даму
Сам пан-гаспадар.

Святы вечар!
Хто ў етым даму.

Сам пан-гаспадар
На куце сядзіць.

Святы вечар!
Хто ў етым даму.

На куце сядзіць,
Калітку дзяржыць.

Святы вечар!
Хто ў етым даму.

Калітку дзяржыць,
Грошыкі лічыць.

Святы вечар!
Хто ў етым даму.

Грошыкі лічыць,
Шчадрушак дорыць.

Святы вечар!
Хто ў етым даму.

Дарыце, дарыце,
Да нас не пазніця.

Святы вечар!
Хто ў етым даму.

Да кароткія світкі,
Да памерзлі лыткі.

Святы вечар!
Хто ў етым даму.

### Песня выконваецца пры ваджэнні казы ў Шчодры вечар «Ой, ну-ну, каза…»

Ой, ну-ну, каза,
Ой, ну-ну, шэра!
Дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць,
Дзе каза хвастом,
Там жыта кустом,
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам.

### Карагодна-гульнявая песня «Яшчур»

У каго персцень найду,
Таго з лаўкі звяду.
У адказ:
Не ўгадала, панна (не ўгадаў, пан),
Не ўгадала, красна,
На чыёй руцэ
Залаты персцень,
Каляда!

### Гульнявая песня «Падушачка»

Падушачкі, падушачкі,
Да ўсе пухавыя,
Малодушкі, малодушкі,
Да ўсе маладыя.
Каго люблю, каго люблю,
Таго пацалую.
Таню* люблю, Таню люблю,
Яе пацалую.

* Імя дзяўчыны ці хлопца называлася ў залежнасці ад адрасата.

**Стрэчаньская песня**
**«А ў нас сёння Стрэчанне, Стрэчанне…»**

А ў нас сёння Стрэчанне, Стрэчанне,
Зіма з летам стрэлася, стрэлася.

Лета зіму піхнула, піхнула
І ножачку звіхнула, звіхнула.

Зіма пайшла плачучы, плачучы,
Лета пайшло скачучы, скачучы.

### 3.2.2. Веснавы цыкл земляробчага календара

**Песні масленічнага комплексу.** Масленічныя песні спяваліся на працягу Масленічнага (Сырнага) тыдня, апошняга перад Вялікім постам. Ваша задача — дакладна вызначыць прыналежнасць запісаных песень да той ці іншай функцыянальна-семантычнай групы: сустрэчы Масленіцы, абходных, праводзін, дакаральных песень, песень на гуляннях і г. д.

*Абходныя песні* спяваліся падчас наведвання маладых пар, якія ў мінулы мясаед ажаніліся (характэрна для Віцебшчыны і Міншчыны). *Дакаральныя песні хлопцам і дзеўкам* спяваліся для тых, што «засядзеўся» — доўга не жаніўся ці не выходзіў замуж, а таксама для Масленіцы за тое, што яна хутка заканчваецца. *Песні на гуляннях і гушкальныя (ці арэльныя песні)* выконваліся на працягу ўсяго Масленічнага тыдня, калі моладзь каталася на конях або на санках з узгоркаў, гушкалася на арэлях.

**Песні гукання вясны.** Вяснянкі пачыналі спяваць пры з'яўленні першых праталін у сакавіку і да таго часу, пакуль аратыя не выходзілі ў поле рыхтаваць глебу пад пасевы. Вясеннія святкаванні маглі пачынацца са спальвання або выгнання зімы, падчас якога спяваліся песні тыпу:

Благаславіце, старыя людзі,
Ай, вясну-красну загукаць,
Загукаці.
Люту ж зіму замыкаць,
Замыкаці.
Да вясну-красну на вулачку,
На вулачку ж,
Люту зіму ў каморачку,
У каморачку.

Вяснянкі лёгка пазнаць па спецыфічных мастацкіх сродках: у іх прысутнічаюць матывы «замыкання зімы» і «адмыкання лета», звароткі да вясны, сонейка, птушак, пчолкі, Бога, маці, запрашэнні да ўдзелу ў гульнях-карагодах. Класічныя вяснянкі змяшчаюць гукальныя рэфрэны на склады ці гукі [у-у!] і [ву-у!].

**Парада**
Пры запісе вяснянак абавязкова ўдакладняйце, калі і дзе яны спяваліся: да дня веснавога раўнадзенства ці ў залежнасці ад надвор'я, у нядзелю напярэдадні Вялікага посту, падчас абраду спальвання зімы (калі палілі на вогнішчы льняное мялле, зношанае адзенне і абутак, розныя непрыгодныя рэчы або асобнае кола (вядома толькі на Гомельшчыне), на пагорках у карагодах ці інакш.

**Песні перыяду Вялікадня (Пасхі).** *Валачобныя песні* — адметная з'ява беларускага фальклору. Час спявання валачобных песень — Вялікдзень (Пасха). Свята гэта перасоўнае, адзначаецца ў перыяд з 4 красавіка да 8 мая: у каталікоў — у нядзелю пасля поўні, якая наступае следам за 21 сакавіка, а ў праваслаўных — пасля 21 сакавіка адлічваецца ўперад 13 дзён і таксама вызначаецца нядзеля пасля поўнага месяца.

Валачобныя песні выконваліся падчас падворных абходаў, пераважна дарослымі мужчынамі. Падобна калядкам прысвячаліся гаспадару, гаспадыні, дарослай паненцы, нежанатаму сыну, бабцы, арандатару, дзяўчыне-падлетку, дзецям-сіротам і інш. Валачобныя песні маюць важнае адрозненне ад калядных — адмысловыя прыпевы «*Хрыстос уваскрос, Сын Божы!*», «*Слава табе, Божа, на ўвесь свет!*», «*Да й віно ж, віно зеляно!*», «*Вясна красна, зялёна!*» і інш.

**Парада**
Як правіла, валачобныя песні вельмі доўгія, таму пры запісе не трэба спяшацца: старайцеся зафіксаваць увесь тэкст.

**Песні юраўскага абрадавага комплексу.** Свята Юр'я прыпадае на 23 красавіка ў каталікоў і 6 мая — у праваслаўных. У гэты дзень першы раз выганялі на пашу хатнюю жывёлу, прычым сам выган суправаджаўся рознымі абрадавымі дзеяннямі, накіраванымі на захаванне жывёл ад звяроў і злых чараў ведзьмакоў. У адпаведнасці з рэгламентацыяй свята юраўскія песні тэматычна падзяляюцца на *песні, якія суправаджаюць абрад абходу ці агледзін поля, карагодныя юраўскія песні.*

У песнях першай групы цэнтральны персанаж — Юр'я (варыянты — Юр'ева маці, Бог), пра якога згадваецца як пра добрага апекуна ці да якога звяртаюцца з просьбай адамкнуць зямельку «ключамі» («выпусціць расу», «замкнуць зіму — выпусціць лета» і інш.). Гэта песні рытуальныя.

Песні другой групы (карагодныя) падкрэсліваюць аграрна-магічнае значэнне юраўскіх карагодаў. Тут Юр'я выступае падаўцом будучага ўраджаю.

**Парада**
Пазначаныя групы юраўскіх песень не маюць дакладнай рытуальнай прымеркаванасці. Напрыклад, вядома, што іх спявалі падчас агледзін нівы, хаджэння на юраўскую расу, пасля смачнага пачастунку на полі ці ў лузе, што з'яўлялася сведчаннем завяршэння юраўскіх абрадаў. Таму пры фіксацыі юраўскіх песень звяртайце ўвагу на тое, ці назіраецца ў дадзенай мясцовасці тэндэнцыя прымяркоўваць іх да пэўных абрадаў.

**Песні абраду ваджэння і пахавання «стралы».** Песні абраду ваджэння і пахавання «стралы» распаўсюджаны прыблізна ў 40 населеных пунктах 19 раёнаў сямі абласцей Беларусі, Украіны, Расіі. Звычайна абрад праводзіцца на Ушэсце (40-ы дзень — чацвер на шостым тыдні пасля Вялікадня), хоць існуюць звесткі і пра іншы час, таму пры запісе абраду абавязкова ўдакладніце гэту акалічнасць у інфармантаў. У жанравым плане гэта песні рытуальныя, карагодныя, лірычныя, прымеркаваныя да абраду. Існуе вялікая колькасць варыянтаў галоўнай карагоднай песні «Як пушчу стралу». Звярніце ўвагу на тое, ці прысутнічае ў ёй гукальная інтанацыя, і пазначайце яе.

**Даведка**
Акрамя асноўнай версіі, вядомы яшчэ чатыры: 1) у фінале жонка не бядуе, ідзе ў карагод і выбірае сабе новага мужа; 2) малайца не аплакваюць, а ў фінале яго цела цудоўным чынам «само схаранілася, калі зямля расступілася»; 3) адбываецца забойства сокала або чорнага ворана без аплаквання; 4) жартоўная, парадыйная версія. Магчыма, вам сустрэнуцца новыя варыянты фіналу.

Тэматыка карагодных песень «стралы» — сямейная і любоўная. У іх цэнтры вобраз жанчыны, яе ўзаемаадносіны з мужам і яго бацькамі, шлюбныя мары дзяўчат. Важная адметнасць карагодных песень «стралы» — прыпевы тыпу «*Ой і я ў люлі*», «*Ой лі, вой люлі*», «*Вой люлі, вой люлі*», «*Лёлюшкі-лёлі*», «*Ой лёлі, ой лёлі*», «*Ох і я ў лелю*», «*Ой гей лелю*», «*Ох і я хмелю*», «*Ух і ой люлі*», «*Ой, лялей вада кала гарода*».

**Песні траецка-русальнага комплексу.** *Траецкія песні* спяваліся на Сёмуху (Тройцу) — 50-ы дзень пасля Вялікадня. З суцэльнага абрадавага комплексу траецкіх свят, працягласць якіх можа дасягаць двух тыдняў (у суботу перад Тройцай — Траечныя дзяды, упрыгожванне зелянінай хаты і падвор'я, абрады завівання бярозкі і кумлення на Тройцу, у панядзелак — сашэсце Святога Духа, аўторак — Конскі Вялікдзень, у сераду — рытуалы здабывання і ўшанавання агню, чацвер — абрады выклікання дажджу, Наўскі Вялікдзень, у нядзелю — абрады развівання бярозкі).

Песнямі суправаджаліся абрады кумлення і завівання і развівання бярозкі. Цэнтральныя персанажы такіх песень — персаніфікаваная Бяроза, дзяўчаты, якія апяваюць дзеянні завівання і развівання вяночкаў, тлумачаць матывацыю кумлення. Названыя песні ў жанравым плане рытуальныя, аднак большасць траецкіх твораў — лірычныя ці любоўныя.

*Куставыя песні* спяваліся на Сёмуху падчас абраду ваджэння Куста. Гэта лакальная з'ява беларускага фальклору, вядомая на Піншчыне і часткова ў іншых раёнах Заходняга Палесся. Куставыя песні падзяляюцца на абходныя, якія непасрэдна звязаны з абрадам «Ваджэнне Куста» (цэнтральныя персанажы тут — Куст, «дзявоцкае войска», гаспадары), і карагодна-таночныя, звязаныя з сямейна-бытавой і любоўнай тэматыкай (іх героі — дзяўчаты, хлопцы, маці, бацька, доля).

*Русальныя песні* спяваліся на Русальным (Граным) тыдні, які адзначаўся праз тыдзень пасля Тройцы (Сёмухі). Яны падзяляюцца на дзве групы.

1. Песні, якія спяваюцца на працягу Русальнага тыдня. Гэта творы на сюжэт «На граной нядзелі русалкі сядзелі», «Ходзіць Пятрышча па вуліцы», «Русалачкі-зямляначкі», «Русалачка, дзе твая дачка?» і інш.

2. Песні, якія спяваліся падчас абраду провадаў русалкі. Кампазіцыйна гэта творы двухчасткавыя: у першай указваецца месца провадаў русалкі — поле, лясок, «да йгрушкі» і інш., у другой канстатуецца момант вяртання «да дому», «к падружкі», «да мамкі», «да дзяжы» і інш.

**Даведка**

З абрадам провадаў русалкі могуць быць звязаны таксама карагодныя (ці таночныя — у залежнасці ад мясцовасці) песні, у якіх яскрава вызначаецца любоўна-шлюбная тэматыка:

Ах, мая русалачка,
Летні ты цвяточак,
Вазьмі сабе дзевачак
Ў карагод-таночак.

А сярод тых дзевачак
Малады галубчык,
Малады галубчык,
Залаты пярсцёнак.

## АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ ПЕСЕНЬ ВЕСНАВОГА ЦЫКЛА

### Масленіца

1. Якімі песнямі і як сустракалі і праводзілі (выганялі) Масленіцу?
2. Ці гушкаліся на арэлях? Якія песні пры гэтым спявалі?
3. Ці хадзілі віншаваць маладых? Якія прыгаворы, віншаванні і песні пры гэтым выконвалі?

4. Ці былі строга вызначаныя песні, якія спявалі напачатку і ў канцы Масленічнага тыдня?

5. Якімі жартамі, прыпеўкамі, гульнямі суправаджаліся масленічныя святы?

6. Ці вядомыя масленічныя песні пра ластавіцу, вутачак, зайчыка? Ці ведаеце вы песні пра Масленіцу-«каўзуху», -«пакатуху», -«палізуху» і г. д.? Калі спявалі такія песні — напачатку, у сярэдзіне ці ў канцы тыдня?

**Гуканне вясны**

1. Ці праводзіўся абрад спальвання або выгнання зімы? Якімі песнямі суправаджаліся рытуальныя дзеянні?

2. Якія карагоды, танцы, веснавыя гульні суправаджалі абрады перыяду гукання вясны? Запішыце іх мясцовыя назвы і апісанні.

3. Якія песні спяваліся ў карагодах, танцах, гульнях?

**Саракі**

1. Як святкаваліся Саракі?

2. Ці вядомыя песні, звязаныя з Саракамі?

3. Як праводзілі гэты дзень: гушкаліся на арэлях, варажылі і г. д.?

4. Якія павер’і, звычаі, гаданні звязаны з названым прысвяткам?

**Вялікдзень**

1. Ці спявалі на Вялікдзень велікодныя песні? Ці гушкаліся на арэлях, спяваючы спецыяльныя песні? Ці вадзілі карагоды, спяваючы песні? Зафіксуйце ўсе песні, гульні, прыгаворы, якія выконваліся падчас велікодных свят.

2. Ці вядомы ў вашай мясцовасці валачобныя песні?

3. Якая размова адбывалася паміж валачобнікамі і гаспадарамі?

4. Якія песні выконваліся падчас абходу хат валачобнікамі? З якім прыпевам?

5. З чаго пачыналіся і чым заканчваліся віншаванні? Каму прысвячалася першая валачобная песня і каму наступныя?

**Юр’е**

1. Якія песні спявалі на Юр’е?

2. Ці вядомы песні, якія суправаджаюць першы выган жывёлы на пашу? На якія асаблівасці выгану ў іх звяртаецца ўвага?

3. Ці ходзяць на Юр’е качацца ці бегаць па расе, аглядваць засеянае поле, агароды, частавацца на полі (агародзе), закопваць рэшткі ежы на ўскраіне поля і г. д.? Ці суправаджаюцца названыя дзеянні песнямі і якімі?

4. Ці водзяць на Юр’е карагоды? Ці спяваюць карагодныя песні? Ці адрозніваюцца яны ад іншых юраўскіх песень? Чым?

### Ваджэнне і пахаванне «стралы»

1. Якія песні і пры якіх абставінах выконваліся падчас ваджэння і пахавання «стралы»?

2. Якія карагоды і карагодныя песні суправаджалі першую і другую частку абраду?

3. Ці існуе розніца ў рэпертуары песень падчас «ваджэння» і «пахавання»?

4. Якія яшчэ песні (прыпеўкі, рамансы і інш.) спявалі на Ушэсце?

### Тройца (Сёмуха)

1. Якія песні лічацца сёмушнымі (траецкімі)?

2. Ці суправаджаліся абрады завівання і развівання бярозкі спецыяльнымі песнямі?

3. Ці спявалі песні, калі накіроўваліся да бярозы? Якія?

4. Ці пускалі дзяўчаты развітыя вянкі на ваду? Якія песні пры гэтым спявалі?

5. Ці суправаджаўся абрад кумлення дзяўчат песнямі? Якімі?

6. Ці вадзілі карагоды вакол бярозкі? Ці спявалі пры гэтым карагодныя песні? Якія?

### Ваджэнне Куста

1. Якія песні выконваліся падчас абраду ваджэння Куста?

2. Ці адрозніваюцца песні, якія суправаджалі ваджэнне Куста па вуліцы, ад песень, якія спявалі ў двары гаспадара?

3. Ці вадзілі на вуліцы карагоды (танкі)? Якімі песнямі яны суправаджаліся?

### Провады русалкі

1. Якія песні выконваліся на Русальным (Граным) тыдні?

2. Ці вадзілі карагоды і калі: на працягу тыдня, падчас абраду провадаў, пасля абраду провадаў?

3. Ці вядомыя песні тыпу «На граной нядзелі русалкі сядзелі»?

4. Якія песні спявалі на працягу тыдня і падчас абраду провадаў русалкі?

5. Куды, паводле песень, праводзяць русалку? Ці супадаюць месцы провадаў у песнях і ў абрадзе?

6. Якія гульні, танцы ладзіліся пасля абраду провадаў? Ці суправаджаліся яны песнямі і якімі?

## УЗОРЫ ЗАПІСУ ПЕСЕНЬ ВЕСНАВОГА ЦЫКЛА

**Масленічная песня перыяду сустрэчы**
**«А мы Масленку дажыдалі…»**

А мы Масленку дажыдалі,
Дажыдалі, люлі, дажыдалі.

Ўсе на горачку выбігалі,
Выбігалі, люлі, выбігалі.

Гору масілцэм пылівалі,
Пылівалі, люлі, пылівалі.

Гору сырніцэй пасыпалі,
Пасыпалі, люлі, пасыпалі.

**Абходная масленічная песня для маладзіцы**
**«Маладая ты, Марутка…»**

Маладая ты, Марутка,
Выйдзі, выйдзі к нам на вулку!

У нас на вуліцы дзевак многа,
Дзевак многа і рыбят.

Вазьмі сыра — родзіш сына,
Вазьмі мачку — родзіш дачку…

**Масленічная дакаральная**
**песня для дзеўкі**
**«А ты, Масленіца»**

А ты, Масленіца,
Белый сыр,
Ай, люлі, белый сыр.
А хто замуж ні пайшла,
Суккіна дачка,
Ай, люлі, люлі,
Суккіна дачка.
А катора замуж пайшла,
Бацькіна дачка.
Ай, люлі, люлі,
Бацькіна дачка.

**Масленічная дакаральная**
**аб Масленіцы**
**«Масленіца-каўзуха»**

Масленіца-каўзуха,
Працягніся да Духа!
Мы думалі, Масляніцы
Сем нядзель,
Ажны яе, Масляніцы,
Адзін дзень!

**Масленічная арэльная песня**
**«А на гарэ сонца, калышуцца дзеўкі…»**

А на гарэ сонца, калышуцца дзеўкі,
Гу-ля-лё, рана маё!*
А я, маладзенька, часу прастаяла,
Часу прастаяла, касу расчасала.

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка (пры афармленні справаздачы такое скарачэнне не дапускаецца!).

**Заклінальная веснянка
«А памажы, Божа»**

А памажы, Божа,
Вясну-красну клікаць
На ціхае лета,
На спелае жыта.
А дай жа ты, Божа,
Ды ў снапу спорам,
А ў полі капамі,
А ў гумне сціртамі,
А ў пуні вазамі,
А ў клеці зернамі,
А ў млыне намолам,
А ў дзяжы падходам,
А на стале сыццю
Ды к добраму жыццю!

**Рытуальная веснянка
«Благаславі, маці…»**

Благаславі, маці,
Вясну гукаць, у-у!
Вясну гукаць,
Цёплага лета
Дажада… у-у!
Дажадаць.
— Ой, вясна, вясна,
Вясняна… у-у!
Вясняначка,
Дзе ж твая дачка
Мар’яна… у-у!

**Велікодная песня ў гонар гаспадара
«Ой, ці дома пане гаспадару?»**

Ой, ці дома пане гаспадару?
Ой, віно ж, віно зеляно!
А хоць дома не акажацца,
У казловыя боты абуваецца,
Пойдзе ў поле жыта глядзець.
А на гарэ — пахілілося,
А ў даліне — у трубы павілося.
Густа, часта, як на небе зоркі.
Дай табе Божа ў добрым здароўі
Дамоў звазіць і ў тарпы злажыць.
А дай Божа ў тарпе — прыкладна,
На таку — прысыпна,
У млыне — прымольна,
У дзяжы — падыходна,
У печы — румяна,
На стале — сытна,
У сям’і — змірна. Пане гаспадару!
Не тамі гасцей,
А дары іх барздзей:
З вялікіх паноў — па сто рублёў,
З меншых паноў —
хоць па трыццаць,
Пачынальніку — па дзесятнічку,
Механошы — па тры грошы,
А музычыне — кварту гарэлкі,
Сыру — на тарэлку,
пірог — на закуску.
Гаспадыня!
Твая рэч — скавародку ў печ,
А па сланіку — у клець.

**Юраўская рытуальная песня
«Маленькая пцічка…»**

Маленькая пцічка*
Віcока летае й —
Пад самыга й Бога,
Пад Юр’я ж Святога.
— Аддай, Юр’я, ключы
Замкнуць люту зіму,
Тамкнуць цёпла лета.

* Кожны радок паўтараецца (пры афармленні справаздачы такое скарачэнне не дапускаецца!).

**Юраўская карагодная песня**
**«Дзе карагод ходзіць…»**

Дзе карагод ходзіць,
Там жыта добрае родзіць.
…Дзе наша Юр'е хадзіла,
Там жыта ўрадзіла,
А дзе Юр'е юравала,
Там наша жыта красавала.

**Карагодная песня абраду**
**ваджэння і пахавання «стралы»**
**«Як пушчу стралу да й па ўдоль сяла…»**

Як пушчу стралу да й па ўдоль сяла,
Ох і ой лёлі, да й удоль ся… У!

Як уб'е страла добра молайца,
Ох і ой лёлі, добра молай… У!

Па том молайцу некаму плакаці,
Ох і ой лёлі, некаму плака… У!

Матка старэнька, сястра маленька,
Ох і ой лёлі, сястра малень… У!

Жана молада, кала горада,
Ох і ой лёлі, кала гора… У!

Дзеці дробныя да ўсе родныя,
Ох і ой лёлі, да ўсе родны… У!

Дзе матка плача — там калодзесі,
Ох і ой лёлі, калодзе… У!

Дзе сястра плача — там рэчкі цякуць,
Ох і ой лёлі, там рэчкі ця… У!

Дзе дзеткі плачуць — ручайкі цякуць,
Ох і ой лёлі, ручайкі ця… У!

Дзе жана плача — там расы нема,
Ох і ой лёлі, там расы не…. У!

**Траецкая рытуальная песня**
**«Пойдзем, дзевачкі, у луг гуляць»**

Пойдзем, дзевачкі, у луг гуляць,
Зялёных вяночкаў завіваць.
Заўём вянкі на ўсе святкі,
На ўсе святкі, на ўсе празнічкі.

**Траецкая лірычная песня**
**«Дзеўкі на Тройцу вянкі вілі…»**

Дзеўкі на Тройцу вянкі вілі,
Ай, на Купала дывівалі.
Пры сваю долечку гадалі.
— Калі ж ты, доля, шчаслівая —
Цвіці, вяночык, як васілёчык,
Калі ж ты, доля, нішчасная —
Ссохні, вяночык, як сухарочак.

**Кустававая рытуальная песня**
**«Ох, мы ж былі у харошаму й бору»**

Ох, мы ж былі у харошаму й бору
І звілі Куста ж із зялёнага клёну.

І звілі Куста із зялёнага клёну,
Да прывялі Куста ды й да слаўнага двору.

Да прывялі ды й Куста да слаўнага двору,
Проша пана выйсці з новага пакою.

Проша нам вынесці тры барылкі гарылкі,
Мы прывялі Куста да харошыя тры дзеўкі.

Ой, у нашага Куста ножанькі невялічкі,
Ой, проша вынесці да хоч на чаравічкі.

**Кустовая карагодна-таночная песня**
**«На гары на новай крамяніцы»**

На гары на новай крамяніцы
Танцавалі дзеўкі, маладзіцы.
Там ягомасць да на пэрэдачку ходзіць,
Сваю імасць да за белу ручку водзіць.
Ты, імасць, гардуеш ты мною,
Шчо быці сто год із табою.

**Русальная песня «На граной нядзелі…»**

На граной нядзелі
Русалкі сядзелі,
Эй, рана-рана,
Русалкі сядзелі.

Русалкі сядзелі,
На дзевак глядзелі,
Эй, рана-рана,
На дзевак глядзелі.

— Дзевачкі-сястрыцы,
Падайце вадзіцы,
Эй, рана-рана,
Падайце вадзіцы.

Падайце вадзіцы
З халоднай крыніцы,
Эй, рана-рана,
З халоднай крыніцы.

А хлопчыкі-брацця,
Вы спляціце лапці,
Эй, рана-рана,
Вы спляціце лапці.

## 3.2.3. Летні цыкл земляробчага календара

**Песні Купалля.** Купальскія песні суправаджалі святкаванне Купалля ў ноч з 23 на 24 чэрвеня ў каталікоў і з 6 на 7 ліпеня ў праваслаўных беларусаў. Вылучаюцца наступныя жанры купальскіх песень. *Рытуальныя*

*песні* спяваліся ля купальскага вогнішча пры апусканні на ваду вянкоў, сустрэчы ўсходу сонца. *Заклінальныя* — маюць выразна акрэслены матыў барацьбы з нячыстай сілай. *Карагодныя купальскія песні* маюць любоўна-шлюбную тэматыку. У *жартоўных* высмейваюцца хлопцы, ведзьма, прыдзірлівыя бацькі. У *баладных* апавядаецца пра пераўтварэнне ведзьмы ў жабу, мыш, яшчарыцу; пра ўдаву, якая нарадзіла двух сыноў; пра шлюб брата з сястрою, якія, даведаўшыся пра сваю роднасць, пераўтварыліся ў сінюю і жоўтую кветкі і інш.

**Пятроўскія і касецкія песні.** Выконваліся ў дні перадпятроўскага посту, які пачынаецца ад панядзелка пасля Траецкага тыдня і працягваецца да Пятра (12 ліпеня ў праваслаўных беларусаў, народная назва — Пятроўка). Паэтыка названых песень прыблізна аднолькавая: яны маюць зачын — зварот да сонца і Бога тыпу: «*Сонейка! Пятрова ночка невялічка, сонейка…*», «*Божа наш! Пятрова ночка маленька, божа наш…*», «*Божа наш! На сенажаці мядуначка, божа наш…*», просьбы пра добрае надвор'е. Аднак пятроўскія песні тэматычна шырэйшыя за касецкія. Калі ў апошніх згадваецца выключна пра касцоў ці гаспадара, якога касцы велічаюць, то ў пятроўскіх сустракаюцца таксама любоўна-шлюбныя матывы.

**Песні жніва.** Жніўныя песні спяваліся падчас пары жніва (канец ліпеня — пачатак жніўня, у залежнасці ад рэгіёну Беларусі). Некаторыя з іх суправаджалі абрады зажынак і дажынак, і таму ў жанравых адносінах гэта песні рытуальныя, якія маюць наступную класіфікацыю. *Зажынкавыя песні* апявалі моманты выхаду жней з дома, звароты да гаспадыні з пажаданнем атрымаць пачастунак, зразанне першага «снапочка-гаспадарочка», вяртанне ў хату да гаспадара. *Уласна жніўныя песні* ў жанравым плане творы лірычныя, яны апяваюць знакавыя для жніва вобразы жыта, поля, жней, палуднічкаў, сярпочкаў, малодачак, пана, прыганятага, павязнічка, дарогі, перапёлкі і інш. *Дажынкавыя* песні звязаны з апошнім днём жніва і яго звычаямі: пляценнем вянка з апошняй лапінкі жыта, завіваннем «барады», выбарам дзяўчыны — «багіні», прыходам да гаспадара, танцамі пасля дажынкавай вячэры. Напрыканцы жніва спявалі і *талочныя жніўныя песні* ў тым выпадку, калі група жней дапамагала ўбраць поле таму гаспадару, які не спраўляўся.

**Даведка**
Талочныя песні — адметная з'ява беларускай каляндарна-абрадавай паэзіі. Яны выконваліся падчас калектыўнай працы на падвор'і ці ў полі гаспадара, які не спраўляўся з веснавым пасевам, уборкай ураджаю, будаўніцтвам хаты ці з іншымі важнымі гаспадарчымі справамі. У залежнасці ад рэгіёну Беларусі талочныя песні маглі спявацца і вясной, і летам, восенню. Такая сезонная шырыня — своеасаблівая рыса названых твораў, таму пры запісе заўсёды пытайцеся ў інфарманта пра каляндарны час выканання талочных песень.

## АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ ПАЭЗІІ ЛЕТНЯГА ЦЫКЛА

### Купалле

1. Якія песні лічацца купальскімі? Пры якіх абставінах яны выконваліся?

2. Якія песні спяваліся падчас пляцення дзяўчатамі вянкоў?

3. Ці вадзілі карагоды вакол вогнішча? Пад якія песні?

4. Ці спявалі жартоўныя песні? Хто, каму і дзе?

5. Ці вядомы купальскія баладныя песні? На якія сюжэты?

6. Ці вядомы песні, у якіх згадваецца папараць-кветка, ведзьма?

7. Якімі песнямі суправаджалася назіранне за «ігрой» сонца пасля купальскай ночы?

### Пятроўка

1. Якія песні спяваліся на свята Пятра?

2. Да якіх стыхій звяртаюцца ў пятроўскіх песнях? Чым гэта абумоўлена?

3. Ці ладзіліся на Пятра арэлі? Ці былі ігрышчы? Якімі песнямі яны суправаджаліся?

4. Ці спяваліся песні маральна-павучальнага зместу пра паводзіны дзяўчыны і хлопца?

5. Ці вядомы ў вёсцы касарскія (касецкія) песні? Калі і дзе яны спяваліся? Ці адрозніваюцца яны ад пятроўскіх песень? Чым?

### Жніво

1. Якія песні ў вашай мясцовасці лічацца жніўнымі?

2. Ці спявалі песні на зажынках? Якія? Дзе і калі?

3. Якімі песнямі суправаджаліся дажынкі?

4. Ці апявалі пачатак апошняга дажыначнага дня, момант з’яўлення на полі ста копаў, час заканчэння жатвы, пляценне вянка гаспадару, дарогу да дома гаспадара?

5. Ці былі песні пра княгіню, «бараду», Спарыша, Раёк?

6. Ці вядомы песні пра жняю, якая жне горш за іншых, застаецца апошняй?

7. Якімі песнямі суправаджаўся адпачынак падчас абеду?

8. Якімі танцамі, гульнямі, песнямі адзначаліся дажынкі пасля вяртання з поля?

9. Якія сацыяльныя і бытавыя матывы сустракаюцца ў жніўных песнях (сіроцкія, сямейныя, любоўныя і г. д.)?

## УЗОРЫ ЗАПІСУ ПЕСЕНЬ ЛЕТНЯГА ЦЫКЛА

**Купальская рытуальная песня**
**«Божа наш, ой, месяцу, месяцу…»**

Божа наш, ой, месяцу, месяцу,
Да ўзыйдзі раненька, Божа наш.

Божа наш, да ўзыйдзі раненька,
Развядзі купаллейка, Божа наш.

Божа наш, дзевачкам пяяннейка,
Хлопчыкам гуляннейка, Божа наш;

**Купальская заклінальная песня**
**«Звала Купала Іллю на ігрышча…»**

Звала Купала Іллю на ігрышча. То-то-то!
— Хадзі, Ільішча, ка мне на ігрышча. То-то-то!

— Не маю часу, Купалічка. То-то-то!
Гэту ночку мне не спаці. То-то-то!

Нада жыта пільнаваць. То-то-то!
Каб змяя заломаў не ламала. То-то-то!

У жыце карэнні не капала. То-то-то!
У кароў малака не адбірала. То-то-то!;

**Купальская карагодная песня**
**«Пойдзем, дзеўкі»**

Пойдзем, дзеўкі,
Пойдзем, дзеўкі, кала жыта,
Кала жыта.

Ці ні найдзем,
Ці ні найдзем каго ў жыце,
Каго ў жыце.

Ці коніка,
Ці коніка варанога,
Варанога.

Ці молайца,
Ці молайца маладога,
Маладога.

На коніку,
На коніку пагарцуем,
Пагарцуем.

А з малойцам
А з малойцам патанцуім,
Патанцуім.

На коніку,
На коніку ездзіць будзім,
Ездзіць будзім.

А з малойцам,
А з малойцам гуляць будзім,
Гуляць будзім.

**Парада**
Звярніце ўвагу на страфічны запіс тэксту дадзенай песні. Як бачыце, песенны слупок складаюць тры радкі, у межах якіх паўтараюцца па два словы папярэдняга радка. Гэта вельмі важны ў страфічных адносінах падзел, абумоўлены мелодыяй песні. Калі ласка, улічвайце такія моманты пры перазапісе песні на картку ці пры падрадковым запісе ад інфарманта адразу пры спяванні.

**Купальская жартоўная песня**
**«Да сягоння Купала, заўтра — Іван…»**

Да сягоння Купала, заўтра — Іван,
Будзе, дзецюкі, ліха вам.

А якое ліха — ліхое,
Пагоніце сабакі ў поле.

Да ад свіныя лебядзіцы
Пагоніце сабакі да вадзіцы.

**Пятроўская песня**
**«Божа наш! Пятрова ночка невялічка…»**

Божа наш! Пятрова ночка невялічка.
Божа наш!
Божа наш! А хто ж у нас не выспаўся?
Божа наш!
Божа наш! Млода Манечка ўсю ноч не спала.
Божа наш!
Божа наш! Усю ноч не спала, паясы ткала.
Божа наш!
Божа наш! Паясы ткала шалковыя.
Божа наш!
Божа наш! Хусткі рабіла паркалёвыя.
Божа наш!

**Касецкая песня «Касцы косяць…»**

Касцы косяць,
Бога просяць:
— Ой, дай, Божа, пагоданьку
Да на нашу работаньку.
Сена пакасіці,
Дадому звазіці.

**Зажынкавая рытуальная песня**
**«Выпраўляюцца малажайкі…»**

Выпраўляюцца малажайкі
На спраўленне зажынак,
Паглядзець на дабро гаспадаркі
Да прыняць поўны жыта абірак <…>

Да гатоў жа, гатоў, гаспадыня,
Сустрэчанне ім шчырае,
Рашчыняй, калі ёсць, скрыня
Да бяры нясі мёд з вырая <…>.

**Жніўная лірычная песня**
**«Ой, не ляжы, ветру, ў полі…»**

Ой, не ляжы, ветру, ў полі,
Паміж горачак, у разоры,

Да ўстань, ветру, памаленьку,
Павей, ветрык, паціхеньку,

Развей хмарачку цямненьку —
Маю тугу цежаленьку…

**Жніўная талочная песня**
**«Наша ніўка залатая»**

Наша ніўка залатая,
Нашы сярпы вострыя,
Наш пан гаспадар налягае,
Штоб мы не былі чорствыя.

— Ой, чыё ж то поле
Зажаўцелае стаіць?
— Янукова поле
Зажаўцелае стаіць!..

## 3.2.4. Восеньскі цыкл земляробчага календара

У адрозненне ад іншых каляндарных твораў восеньскія песні зусім не інтэграваны з абрадамі, не выяўляюць якой-небудзь прымеркаванасці да пэўных свят, сувязь з працоўнай дзейнасцю селяніна ў іх паслаблена. У залежнасці ад мясцовасці восеньскімі лічацца песні, якія тэматычна закранаюць паслядажынкавы этап сельскагаспадарчых работ і перадвясельны перыяд. У сувязі з гэтым восеньскія творы не маюць такой дакладнай класіфікацыі, як іншыя цыклы каляндарна-абрадавых песень. Таму пры запісе песень, якія інфарманты будуць называць восеньскімі, звяртайце ўвагу на іх функцыянальныя разнавіднасці: ярынныя, ільняныя, канапельныя, спасаўскія, кірмашовыя, збіральніцкія, пастухоўскія. Азначэнні могуць вар'іравацца ў залежнасці ад геаграфічнага распаўсюджання. Спынімся на найбольш вядомых.

*Ярынныя песні*, або *песні яравога жыта*, падзяляюцца на творы аграрнай (у жанравым плане часам заклінальныя) і перадвясельнай (матывы няшчаснага кахання, будучага замужжа) тэматыкі.

**Увага!**
Ярынныя песні перадвясельнай тэматыкі выконваюцца падчас канца лета — пачатку восені, пакуль вяселлі яшчэ не спраўляліся, таму іх трэба адрозніваць ад абрадавых вясельных.

*Ільняныя і канапельныя песні* выконваліся падчас уборкі лёну і канапель. Яны, як і ярынныя, закранаюць тэмы будучага замужжа дзяўчыны, яе далейшага лёсу, жыцця замужніцы, удовінага кахання. Іх адметнасць — прадстаўленыя шляхам паэтычнага паралелізму вобразы ільну, льнянога поля, ільнішча, канапелькі (канаплінкі) і заручонай дзяўчыны.

*Збіральніцкія песні* выконваюцца пры збіранні арэхаў, ягад і грыбоў). Матывы ў іх любоўныя і сямейна-бытавыя. Сюжэтныя сітуацыі ў такіх песнях абумоўлены акалічнасцямі, якія могуць здарыцца са збіральнікамі. Найбольш распаўсюджаны сюжэт, калі дзяўчына заблукала ў лесе, ёй трапляецца хлопец, які абяцае дапамагчы пры пэўнай умове.

*Піліпаўскія (прадзільныя) песні* займаюць у календары прамежкавае становішча. Яны спяваліся на працягу Піліпаўкі — шасцітыднёвага перадкаляднага посту, які пачынаецца з 15 (28) лістапада і заканчваецца 24 снежня (6 студзеня) — падчас апрацоўкі льновалакна, з якога сукалі і пралі ніткі. Большасць такіх твораў элегічныя і жартоўныя, у іх пераважаюць матывы стомленасці, прадчуванне Каляд, нешчаслівага замужжа.

У *талочных песнях* талачане называюць гаспадара «панам», а сябе — «мужове-панове».

## АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ ПЕСЕНЬ ВОСЕНЬСКАГА ЦЫКЛА

1. Якія песні ў вас лічацца восеньскімі? Ці ёсць іншыя назвы песень, якія выконваліся ў гэты час (ільняныя, канапельныя, збіральніцкія, кірмашовыя, спасаўскія, яравыя)? Чаму песню адносяць да восеньскай?

### Талака

1. Ці вядомыя ў вас талочныя песні?
2. Якія песні спявалі пра талаку?
3. Калі спявалі талочныя песні: вясной, летам ці восенню? Якія песні адрасаваліся гаспадарам?
4. Пра якія падзеі, выпадкі, сітуацыі, віды працы спявалася ў такіх песнях?

### Піліпаўка

1. Якія песні ў вас лічацца піліпаўскімі? Калі яны спяваліся?
2. Ці была нейкая пэўная прымеркаванасць піліпаўскіх песень да часу і месца спявання: увечары, на працягу дня, калі збіраліся ў адной хаце?

3. Ці існуюць полаўзроставыя абмежаванні пры спяванні піліпаўскіх песень?

4. Што спявалі пра лянівую праллю?

## УЗОРЫ ЗАПІСУ ПЕСЕНЬ ВОСЕНЬСКАГА ЦЫКЛА

**Ярынная заклінальная**
**«Дай, Бог, каб парасло…»**

Дай, Бог, каб парасло
На ўсякую долю:
І на хазяйскую,
І на Разанскую,
І на цыганскую,
І на ўсіх добрых людзей!

**Ярынная перадвясельная**
**«А зялёненькі мой авясец…»**

А зялёненькі мой авясец,
А каго ж ка мне Бог прынясець?
А калі старога — не хачу,
А калі маладога — біці буду,
А калі ж роўніцу — жыці буду.

**Восеньская ільняная песня**
**«Бедаваў зялёны лён…»**

Бедаваў зялёны лён,
Пры дарозе стоячы.
Пры дарозе стоячы,
Галоўкамі звонячы:
— Ой, бяда ж мая, бяда,
Што сцюдзёная вада
Не дала мне вырасці,
Майму семю выспеці.
— Адкуль на мяне, маладзеньку,
Усё й тыя добрыя людзі?
Як сталі хадзіць, мёд-віно насіць,
Мяне ў татачкі прасіць <…>
Датуль хадзілі, мёд-віно насілі,
Пакуль у татачкі ўпрасілі.

**Восеньская канапельная песня**
**«Ой, гаварыла канапелька…»**

Ой, гаварыла канапелька,
Стоячы ў народзе:
— Адкуль на мяне, канапелечку,
Усё й тыя буйныя ветры?
Як сталі веяць, сталі павяваць,
Канапелечку абіваць.
Ой, гаварыла маладая дзевачка,
Жывучы ў татачкі:
Бедавала дзяўчынка,
У таткі гуляючы:
— Ой, бяда ж мая, бяда
Ды з частымі сватамі.
Не далі мне вырасці,
Русай коскі выплесці.

**Восеньская збіральніцкая песня**
**«Да парадзіла мяне маці…»**

Да парадзіла мяне маці,
Ай, ні ўдзень, ні ўначы.

Да спарадзіла мяне маці,
Ягады беручы.

Ягадкі ў прыполлі,
Мяне на далоні.

**Восеньская талочная песня**
**«А мы свайму пану…»**

А мы свайму пану
А ўчынілі славу.

Славу ўчынілі.
Гнаёк навазілі,
Ніўку ўкрасілі.

Радзі ж, божа,
Жыта на навозе.

Жыта ядраное,
Калоссе буйное.

**Піліпаўская жартоўная песня**
**«Дуня ж, наша Дуня…»**

Дуня ж, наша Дуня
Тонкапраха была.
Тонкапраха была,
Тры дні нітачку віла.
У гадочак прасціночак,
У нядзельку нітачку.
Вот дзівятая вясна,
Як не ставіла красна.
На дзісятая вясна
Дуня паставіла красна.

Скрозь гораду ткала,
Колам прабівала.
Ехалі казакі,
Бог-помач казалі:
— Памажы, Бог, Дуні
Рагожу даткаці.
— Хоць жа вы казакі,
Дык жа вы дуракі.
Гэтая ж тканіна —
Тонка парусіна.

**Піліпаўская песня аб Калядах**
**«Ой, Калядачкі, прыбліжыцеся…»**

Ой, Калядачкі, прыбліжыцеся,
Ай, люлі, люлі, прыбліжыцеся.
Ай, каўбасачкі, паніжыцеся,
Ай, люлі, люлі, паніжыцеся.

Мы ж вас, Калядачкі, шанаваць будзем,
Ай, люлі, люлі, шанаваць будзем.

Кожны вечарок святкаваць будзем,
Ай, люлі, люлі, святкаваць будзем.

То на йгрышчайка, то з ігрышчайка,
Ай, люлі, люлі, то з ігрышчайка.

На ігрышча йдучы, аж душа гарыць,
Ай, люлі, люлі, аж душа гарыць.

З ігрышча йдучы, галава баліць,
Ай, люлі, люлі, галава баліць.

## 3.3. СЯМЕЙНА-АБРАДАВЫЯ ПЕСНІ

Сямейна-абрадавы комплекс складаецца з трох цыклаў: радзіннага (радзінна-хрэсьбінныя песні), вясельнага (вясельныя песні) і пахавальнага (пахавальна-памінальныя песні).

Радзіны, хрэсьбіны, вяселле і пахаванне — гэта той пласт народнай творчасці, які ў большай ці меншай ступені вядомы кожнаму. Для вас не стане цяжкасцю пошук інфарманта. Аднак не кожны выканаўца адразу пагодзіцца праспяваць песню. У гэтым выпадку пачніце размову з пытанняў, якія непасрэдна датычацца лёсу і жыцця інфарманта, напрыклад пра яго асабістае вяселле ці пра нараджэнне яго дзяцей і г. д.

**Парада**
Для запісаў паэтычных твораў лепш за ўсё карыстацца тэхнічнымі сродкамі. Вельмі важна, каб запісы песні рабіліся «з голасу»: гэта дазваляе адчуць мелодыку твора, правільна вызначыць строфіку і сістэму паўтораў.
Памятайце, што не заўсёды радкі пачынаюцца дакладна. Бывае, дадаюцца новыя гукі і выклічнікі ці, наадварот, скарачаюцца апошнія словы. Часта другі радок, які паўтараецца, з'яўляецца пачаткам наступнай страфы і спяваецца інакш, чым папярэдні. Ён можа мець сэнсавае адзінства з наступнай часткай песні, напрыклад:
Благословы, Божэ,
Благословы, Божэ, тэй посажэ,
Благословы, Божэ.

Памылковым будзе падчас запісу разбурыць страфічны малюнак твора, напрыклад:
Благословы, Божэ (2 разы)

Тэй посажэ,
Благословы, Божэ.

Улічвайце гэтыя парады пры расшыфроўцы запісаў песенных твораў. Пры афармленні запісу трэба абавязкова запісаць жанрава-відавое вызначэнне твора, а таксама ўказваць назву, якая часцей за ўсё (калі няма заўваг інфарманта) даецца па першым радку песні.

**Радзінна-хрэсьбінныя песні.** Пры запісах гэтага пласта сямейна-абрадавага комплексу трэба ўлічваць малую колькасць радзінных песень. Асноўныя іх персанажы — парадзіха, дзіця, бабка, бацька дзіцяці. Іншая справа — хрэсьбінныя песні. Яны існуюць у розных жанравых разнавіднасцях: *заклінальныя, велічальныя, жартоўныя, бяседныя песні.*

**Вясельныя песні.** Вывучаючы вясельныя песні, даследчыкі вылучаюць два асноўныя прынцыпы класіфікацыі: этнаграфічны і філалагічны. Этнаграфічная класіфікацыя падзяляе творы вуснай народнай творчасці ў адпаведнасці з прымеркаванасцю да розных этапаў вяселля: *песні сватання, песні заручын, песні зборнай суботы, каравайныя песні, песні пасаду, песні падчас вяселля ў маладога, песні-пярэзвы* і г. д.

Сярод вясельных песень вылучаюцца *рытуальныя, заклінальныя, велічальныя, дакаральныя (жартоўныя), лірычныя.*

**Увага!**
У чыстым выглядзе творы названых жанраў у вясельным кантэксце амаль не захаваліся. Таму параім вам спачатку фіксаваць вясельныя песні ў адпаведнасці з этнаграфічным прынцыпам — адпаведна ходу вяселля, а потым паспрабаваць вызначыць іх жанравую прыналежнасць. Пры афармленні запісу трэба адзначаць моманты вясельнага абраду, у якія выконваецца твор, напрыклад: песні сватання, песні каравая і г. д.
Можа стацца так, што інфармант выканае толькі адну-дзве песні. Абавязкова ўдакладніце, у які момант вяселля яны спяваліся.

**Даведка**
Выключнае становішча ў беларускай вясельнай паэзіі займаюць шматлікія сірочыя песні, якія сваім зместам, а часта і формай адрозніваюцца ад іншых вясельных і функцыянальна ахопліваюць усе этапы вяселля. Таму яны вылучаюцца ў асобны раздзел.

**Пахавальна-памінальныя песні.** Песні-псальмы — гэта разнавіднасць рэлігійных песень, якія нараспеў чыталіся з «Псалтыра» падчас хаўтуроў (провадаў нябожчыка для пахавання), а таксама на дзевяціны, Радаўніцу і г. д.

## АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ СЯМЕЙНА-АБРАДАВЫХ ПЕСЕНЬ

### Радзінна-хрэсьбінныя песні

1. Хто і калі пачынаў спяваць радзінныя песні?
2. Ці ўзгадваюцца ў радзінных песнях дні, якія лічыліся шчаслівымі для нараджэння дзіцяці?
3. Ці выконваліся падчас родаў спецыяльныя заклінальныя песні? З якой мэтай (дапамагчы парадзісе, засцерагчы яе і дзіця ад сурокаў, забяспечыць здароўе нованароджанаму і інш.)?
4. Ці адрозніваліся песні, якія выконваліся пры нараджэнні хлопчыка ці дзяўчынкі?
5. Ці захавалася ў вашай мясцовасці традыцыя спяваць ці прыгаворваць у час першага купання нованароджанага, першага кармлення, першага ўкладвання ў калыску (люльку) і г. д.? Якія творы выконваліся?
6. Ці спяваліся песні падчас наведвання парадзіхі пасля родаў?
7. Ці існавалі спецыяльныя песні для незамужняй дзяўчыны-парадзіхі?
8. Ці спявалі песні перад адпраўленнем у царкву? Якія?
9. Што трэба было казаць, калі кумы вярталіся з царквы? Ці спявалі песні? Якія?
10. Ці існавала спецыяльная песня, якая б адкрывала хрэсьбіннае застолле?
11. Якія песні гучалі ў час хрэсьбіннага святочнага стала?
12. Ці спяваліся велічальныя песні? Каму яны прысвячаліся: нованароджанаму, яго маці, бабцы-павітусе, куму, куме?
13. У які момант хрэсьбіннага стала гучалі песні аб долі і далейшым лёсе немаўляці?
14. Каму адрасаваліся жартоўныя песні (бацьку дзіцяці, бабцы-павітусе, куму, куме)?
15. Ці спяваліся адпаведныя песні падчас «бабінай кашы»?
16. Якія бяседныя песні гучалі падчас хрэсьбіннага святочнага стала?
17. Ці вядомы ў вашай мясцовасці хрэсьбінныя прыпеўкі?
18. Хто і пра што спяваў на заканчэнне хрэсьбіннага стала?
19. Ці захаваліся ў вас песні абраду «змывання мура» («муравінак», «жмурак», «злівак»)?

### Вясельныя песні

1. Ці захавалася ў песнях указанне на найбольш спрыяльны час правядзення вяселля?
2. Хто з боку маладога (маладой) спяваў вясельныя песні?

3. Калі пачыналі спяваць вясельныя песні: у час сватання ці раней?

4. Якія песні спявалі ў час сватання?

5. Якія песні пераважалі на запоінах і заручынах: велічальныя, заклінальныя, жартоўныя, лірычныя, рытуальныя? Хто спяваў?

6. Ці спявалі падчас гэтай часткі вяселля жартоўныя песні? Каму яны адрасаваліся (свату, дзяўчыне, маладому і інш.)?

7. Ці выконваліся велічальныя песні?

8. Як пасля заручын у песнях называлася дзяўчына (запітай, прапітай, заедзенай яечняй і г. д.)?

9. Ці захаваліся ў вашай мясцовасці песні абраду «злучэння» маладых?

10. Як, паводле песень, павінна была паводзіць сябе дзяўчына пасля заручын?

11. Як у песнях вашай мясцовасці называўся вечар перад вяселлем, калі да нявесты прыходзілі яе сяброўкі?

12. Ці зафіксаваліся ў вясельных песнях асноўныя падзеі зборнай суботы: завіванне вянкоў, падрыхтоўка кветак для дружыны жаніха, падрыхтоўка вясельнага дрэўца ёлкі і інш.?

13. Ці існавалі ў вашай мясцовасці спецыяльныя песні, выкананне якіх азначала пачатак вяселля?

**Парада**
Каравайныя песні лепш запісваць адпаведна ходу каравайнага абраду.

14. Ці спявалі песні, калі рашчынялі каравай?

15. Якія песні спявалі, замешваючы каравай: заклінальныя, велічальныя і інш.?

16. Ці спявалі песні, калі садзілі каравай у печ?

17. Якія песні выконвалі, калі вымалі каравай з печы?

18. Як у вясельных песнях ілюструецца падзел каравая? Калі гэта адбывалася?

19. Як у песнях называецца месца пасада (дзяжа, лава і інш.)?

20. Як у песнях расказваецца пра расплятанне касы нявесты?

21. Якіх песень гучала больш: велічальных, заклінальных, лірычных, рытуальных?

22. Ці выконваліся ў вашай мясцовасці песні падчас пасада маладога?

23. Ці захаваліся песні абраду «перапою» маладога?

24. Як у песнях ілюструюцца зборы маладога ў дарогу да нявесты? Хто і якія песні спяваў у гэты час?

25. Што, паводле песень, павінна была сказаць маці жаніха непасрэдна перад самым ад’ездам?

26. Якія песні выконваюць у дарозе да маладой?

27. Што спявалі, калі дружына маладога пад’язджала да дому маладой?

28. Якія песні спявалі, калі малады ўваходзіў у хату?

29. Ці спявалі адпаведныя песні, калі жаніх і нявеста абменьваліся падарункамі?

30. Якія песні спяваліся, калі маладыя ад’язджалі да вянца (ці ў ЗАГС, сельсавет на рэгістрацыю шлюбу)?

31. Ці выконваліся адпаведныя песні пасля вянца, падчас вяртання дадому?

32. Ці выконваюцца адпаведныя песні, калі нявеста дорыць падарункі радні маладога?

33. Якія песні спяваюць падчас вясельнага гуляння ў доме жаніха?

34. Ці спяваюць жартоўныя песні пра дружак, свата, свацццю?

35. Якія песні спяваюць тыя, хто не быў запрошаны, каб атрымаць пірага ад свата і свацці?

36. Якімі песнямі суправаджаецца адыход маладых у камору пасля вясельнага гуляння?

37. Ці захаваліся ў вашай мясцовасці песні абраду завівання маладой (пераапранання яе ў жаночае адзенне — намітку, чапец, хустку)?

38. Якія песні спявалі, калі ў хату маладога прыносілі пасаг маладой?

39. Ці вядомы ў вашай мясцовасці спецыяльныя песні, якімі заканчваецца вяселле?

40. Якія песні спявалі падчас ад’езду дадому гасцей маладой?

41. Якія песні спявалі ў час перазову?

42. Ці спяваюць песні на так званым «бабскім вечары»? Якія песні пераважаюць — сумныя ці вясёлыя?

43. Якую назву, паводле песень, мела паслявясельная частка абраднасці («хвэст», «цыгане», ражаныя, разгрэбіны, кура, банкеты, пята, карэнне, печкін выкуп, бяседы)?

44. Ці спявалі ў гэты момант спецыяльныя песні?

45. Якія адметныя рысы сіроцкага вяселля вылучаюцца ў песнях?

46. Ці хадзіла сірата перад вяселлем галасіць на могілкі бацькоў? Аб чым яна іх прасіла ў галашэннях?

47. Ці спяваюць асобныя песні сірацэ, калі выпякаюць каравай?

48. Якія песні ў вашай мясцовасці выконваліся для жаніха-сіраты? Хто і як галасіў, калі малады быў сіратой?

49. Што спявалі сіраце падчас вясельнага застолля?

50. Ці выконваліся сірочыя песні, калі дзялілі каравай ці ў любы іншы момант пасля вяселля?

### Пахавальна-памінальныя песні

1. Як у вашай мясцовасці называлі людзей, якія ўмелі галасіць? Ці вучылі яны іншых?

2. Калі звычайна пачыналі галасіць па нябожчыку? Хто рабіў гэта першым?

3. Ці адрозніваліся галашэнні, якія адрасаваліся жанчынам, мужчынам, дзецям, старым, халастым? Чым?

4. Ці працягвалі галасіць, калі нябожчыка абмывалі, апраналі, клалі ў труну?

5. Хто і як галасіў, калі адбывалася наведванне роднымі і суседзямі нябожчыка ў яго хаце?

6. Ці існавала ў вашай мясцовасці традыцыя выконваць песні-псальмы? Хто і калі гэта рабіў?

7. Як галасілі, калі выносілі труну з хаты?

8. Ці існуюць спецыяльныя галашэнні падчас дарогі да могілак?

9. Як галасілі на могілках у момант пахавання?

10. Ці галасілі, калі ўпрыгожвалі крыжы?

11. Ці існавалі спецыяльныя галашэнні для няхрышчаных дзяцей, для памерлых не сваёй смерцю, чараўнікоў?

12. Ці апісвалася ў галашэннях ці песнях-псальмах, які выгляд мае смерць, душа памерлага?

13. Якія галашэнні выконвалі падчас памінальнага стала: хаўтурныя ці памінальныя? Чым пахавальныя галашэнні адрозніваліся ад памінальных?

14. Ці прынята было галасіць, калі наведвалі могілкі на другі дзень пасля пахавання?

15. Ці выконвалі памінальныя галашэнні і песні-псальмы на трэці, дзявяты, саракавы дзень пасля пахавання? Якія назвы носяць гэтыя дні (дзевяціны, саракавіны)?

16. Дзе было прынята галасіць у час гадавых памінак: дома ці на могілках?

17. Як галасілі ў памінальныя дні? Ці згадвалася ў галашэнні, якія гэта дні (Дзяды, Бабы, Наўскі Вялікдзень, Наўская Тройца, Асяніны)?

18. Ці захавалася ў вашай мясцовасці традыцыя галашэння?

## УЗОРЫ ЗАПІСУ СЯМЕЙНА-АБРАДАВЫХ ПЕСЕНЬ

### Радзінная бяседная песня «У нядзельку рана-параненьку…»

У нядзельку рана-параненьку
Усе званы званілі,
Усе жоначкі маладзенькія
К ютрані хадзілі.
Адна наша парадзіха маладзенькая
У ютрані не была.
Да яна ж, сабе, маладзенькая,
Борзда дзела зачала,
А яна ж сабе да маленькага
Сыночка спавіла.

### Радзінная заклінальная песня «Бяжыць яна скарэсенька…»

Бяжыць яна скарэсенька,
Просіць бога шчырэсенька:
— Дай жа, бог, маёй унучцы
Лягесенька, дабрэсенька, скарэсенька…

### Хрэсьбінная велічальная песня «Венаград на дварэ!.. »

Венаград на дварэ!
Так наша бабка,
Так наша любка на куце.
Як золат персцень на руцэ,
Так наша бабка на куце.
Як золат персцень шаруюць,
Так нашу бабку шануюць.
Бабка мая, любка мая,
Венаградаў цвет!

**Хрэсьбінная заклінальная песня**
**«А ў нядзелечку спараненечку…»**

А ў нядзелечку спараненечку
На небе развіднела,
Наша бабачка ходзіць, дзіцяцю носіць,
А ў бога долі просіць:
— А дай, божа, етай дзіцяці
Усякую долю ўзяці:
І хлебавую, і салявую,
Трэцяю — здаровейкую.

**Хрэсьбінная жартоўная песня**
**«Казалі, наша бабка хваравіта…»**

Казалі, наша бабка хваравіта,
Ажны наша бабка варавіта.
Таўчы, малоць — нядужа,
А па намётачку — дасужа.

**Хрэсьбінная велічальная песня**
**«Бабка кашу нясець…»**

Бабка кашу нясець,
А кум казной трасець.
У бабкі кашка смашна,
А ў кума казна ясна.

**Хрэсьбінная прыпеўка**
**«Ой, кум куме рад…»**

Ой, кум куме рад,
Павёў куму ў вінаград:
— Шчыплі, кумка, ягодкі,
Каторыя салодкі,
А каторы горкі,
Кідай для маёй жонкі.

**Вясельная песня сватання**
**«Прыехалі сваты на двор…»**

Прыехалі сваты на двор,
Пусцілі стралу ў акно.
— Страла мая, страла,
Па што ты прыйшла,
Чы па мёд, па гарэлку,
Чы па красную дзеўку…

**Вясельная песня заручын**
**«Прыехалі на заручыны»**

Прыехалі на заручыны,
Там дзверы закручаны.
Мы дзверы круцілі,
Мы дзевачку заручылі.

Ехалі на запоіны,
Там дзверы закованы.
Мы ж дзверы адкавалі,
Мы дзевачку запівалі.

**Вясельная песня заручын**
**«Як запівалі, заручалі…»**

Як запівалі, заручалі —
Сем кароў, казалі,
А як прыйшлося, у месца сышлося —
Адзін бычанёначак.
Як пайду даіць,
Адзін бык стаіць,
Я да яго з даёначкай,
Ён да мяне з капыцікам.

**Вясельная песня заручын**
**«Ой, прыходзіць да дзяўчыны…»**

Ой, прыходзіць да дзяўчыны
Малады Ясенька, —
Сам бялявы, вус чарнявы,
Прыкрасна лічэнька…

**Вясельная песня заручын**
**«Сучыся, пер'ейка, сучыся…»**

Сучыся, пер'ейка, сучыся,
Злучыся, Наташа, з Грышкаю, злучыся.
А ўжо пер'ейка ссучылась,
Наташка з Грышкаю злучылась.

**Вясельная зачынальная песня**
**«Развіваецца, развіваецца…»**

Развіваецца, развіваецца
Ды ў гародзе зелечко,
Зачынаецца, зачынаецца
У Ганулі вяселечко.
Бог ёй дае, Бог ёй дае,
Татулечко (матулечко, брацейка,
цётачко, суседзечко) спамагае…

**Вясельная зачынальная песня**
**«Ты, святы Кузьма-Дзямьян…»**

Ты, святы Кузьма-Дзямьян,
Да ты скуй нам свадзебку,
Да штоб крэпка-накрепка,
Да штоб вечна-навечна…

**Вясельная песня дзявочага вечара**
**«Сягоння субота, сваты дзянёчак…»**

Сягоння субота, сваты дзянёчак,
Ой, субота, сваты дзянёчак.

Віла Ганначка з руты вяночак,
Ой, віла з руты вяночак.

Ой, віла, віла, усё гаварыла,
Ой, віла, віла, усё гаварыла:

Мае дзевачкі, мае сястрыцы,
Вы мае дзевачкі, мае сястрыцы,

Радзьце радачку, што мне рабіці,
Ці замуж ісці, ці дзеўкай быці?

**Словы, з якімі прасілі благаславення**
**рашчыняць каравай**

Хросная маці або старэйшая каравайніца перад тым, як сыпаць у дзяжу муку, просіць благаславення:

— Благаславіце, айцец, маці,
І ўся родзінонька ў хаце,
Маладой Ганульцы каравай рашчыняці.

**Каравайная песня**
**«Убірайся, коровай…»**

Убірайся, коровай,
То ў мяту,
То ў руту,
То ў ружовыя кветкі,
Шоб любіліся дзеткі.

**Каравайная песня**
**«Дружко коровай крае…»**

Дружко коровай крае,
Золоты ножык мае,
Срэбрану талерачку,
Шоўкаву хусціначку.

**Вясельная песня пасаду маладой**
**«Брат сястру на пасад вядзе…»**

Брат сястру на пасад вядзе,
Месца рыхтуе, цяжка сумуе:
— Тут мая сястра сядзе,
Ой, на пасад сядзе.

**Вясельная песня пасада маладой**
**«Кукавала зязюля ў садочку…»**

Кукавала зязюля ў садочку,
Прыклаўшы галоўку к лісточку…

Плакала дзеванька ў святліцы,
Прыклаўшы галоўку к сястрыцы:

— А хто ж маю косаньку распляце,
Хто ж мае ўплёты ды прыбярэ.

Ой, распляце косаньку братухна,
Прыбярэ ўплёты ды матухна.

**Вясельная песня збораў маладога па маладую**
**«Не забудзь, сыночак, не забудзь…»**

Не забудзь, сыночак, не забудзь,
Не пей первыя чарачкі,
Не пей первыя чарачкі.
Выллі коніку за грыўку,
Выллі коніку за грыўку.
Штоб была грывачка ільняна,
Штоб была грывачка ільняна,
Штоб была нявеста слухмяна.

**Вясельная песня прыезду маладога да маладой**
**«Пышная цёшча, пышна…»**

Пышная цешча, пышна,
Проці зяця не выйшла.
Пакінь, цёшча, пыхаваць,
Выйдзі зяця вітаць.
Ці кажуха не маеш,
Ці ты зяця не знаеш?
Мы кажуха пазычам,
Мы зяця ды ўкажам.

**Вясельная песня абмена падарункамі паміж маладымі**
**«Каціўся гарошак па сенажаці…»**

Каціўся гарошак па сенажаці,
Хваліўся Колечка Надзечку ўзяці.
Яна, маладая, яго жалавала,
Выняла хусцінку да й падаравала.
— Дарую хусцінку бялым-бяленьку,
Глядзі, Колечка, каб доля добранька.
Мая хусцінка шоўкам нашыта,
Глядзі, Колечка, каб не была біта.

**Вясельная песня ад’езду да маладога**
**«З добрым векам, з добрай доляй…»**

З добрым векам, з добрай доляй,
Каб здарова была, як зіма,
А вясёла, як вясна,
А ціха, як лета,
А багата, як восень.
Каб табе вадзіла і пладзіла.

**Вясельная песня адʼезду да маладога**
**«Ой, ворогі, ворогі…»**

Ой, ворогі, ворогі,
Ступэтэ з дорогі.
Ой, ворогі, ворожэнькі,
Ступэтэ з дорожэнькі

**Вясельная песня прыезду да маладога**
**«Адчыні, маці, аконца…»**

Адчыні, маці, аконца,
Едзе нявеста, як сонца.
Адчыні, маці, новы двор,
Едзе нявеста, як явор.

**Вясельнае пажаданне**
**«Колькі ў хаце сталоў…»**

Колькі ў хаце сталоў,
Колькі ў сталах дошчачак,
Каб столькі сыноў і дочачак!

**Вясельная песня завівання маладой**
**«Мы цябе, Ганночка, завіваем…»**

Мы цябе, Ганночка, завіваем,
Шчасцем, долею обсыпаем.
Ой, будзь здарова, як зямля,
Ой, будзь багата, як вада,
Ой, будзь прыгожа, як ружа.

**Песня заканчэння вяселля**
**«Едзьця, сваты, дадому…»**

Едзьця, сваты, дадому,
Бо паелі конікі салому…

**Вясельнае галашэнне сіраты**
**«А мой ты родны татанька…»**

А мой ты родны татанька,
А мая ты родная маманька,
Падыйдзіце ж пад маё вакошачка
І паглядзіце пад ясную зораньку:
Ці не ўвідзіце там сваю дачушачку родненькую,

Ці не прыйдзеце вы на яе пірушачку?
Пажалейце мяне, горкую сіротачку,
А мне ж ісці ў чужыя людзі.

**Пахавальная песня-псальма**
**«Ужэ слонцэ на заходзе, спаці не ложуса…»**

Ужэ слонцэ на заходзе, спаці не ложуса,
До споведзі неготовый, Богу не молюса.
Кажуць людзі, што я умру, а я хочу жыці.
Покуль жыці на гэтым свеці, мушу согрэшыці.
Есьць у мяне срэбро, злото, там гэто не трэба,
Чтэры дошкі, зямлі трошкі, збавеньня з неба,
Дадуць табе цёмну хату і смутну ложу.
Не дай, Божа, в грэхах уміраць, а мой моцны Божа!
Як зазвоняць во все звоны пры остатней годзіне,
Поклонюса ўсему свету і своей родзіне.
Я думаў доўга жыці, але трэба ў цэмне гніці.

**Пахавальнае галашэнне**
**«Ах, мая ж ты зязюлечка…»**

Ах, мая ж ты зязюлечка,
Ах, мая ж ты матулечка!
Ах, чаму ж ты мяне пакідаеш?
Ах, каму ж ты мяне астаўляеш?
Хто ж мяне цяпер будзе наўчаці?
Хто ж цяпер мне будзе спагадаці?
Ах, нашто ж ты мяне асіраціла?
Ах, я бедна бяздомніца несчаслiва!

**Пахавальнае галашэнне**
**«Разнясіце, вецярочкі…»**

Разнясіце, вецярочкі,
Маю пячаль па мамачцы,
Падніміце радзіцельку
З зямелькі сырой цяжанькай.
Разнясіце досачкі сасновыя,
Развяжыце ручкі яе белыя,
Адкрыйце вочкі яе ясныя,
Вярніце мне маю мамачку!

# 4. КАРАГОДНЫЯ ПЕСНІ

Стан карагоднай традыцыі мяняецца ад эпохі да эпохі. Паступовае паслабленне традыцыі ваджэння карагодаў характэрна для ўсёй Беларусі. Істотна адрозніваецца ступень захаванасці карагодных песень у розных рэгіёнах. Найбольш устойлівымі перад часам аказаліся карагоды ў Падняпроўі (Магілёўска-Гомельскае Падняпроўе) і на Палессі. Вылучаюцца кропкавыя і лакальныя фальклорна-этнаграфічныя зоны актыўнага бытавання таго ці іншага карагода. Можна спаслацца на Веткаўшчыну, дзе ў многіх вёсках на Ушэсце падчас абраду ваджэння і пахавання «стралы» выконваюць карагод «Страла», які суправаджаецца песняй «Ляцела страла ды ўздоўж сяла», арнаментаванай варыянтнымі прыпевамі тыпу «Вох, і вой люлі» з паўторам другой часткі папярэдняга радка.

Можна натрапіць на зусім новы карагод, які да вас ніхто не паспеў запісаць, або на цікавы варыянт вядомага. Напрыклад, студэнтамі двойчы, у розны час, быў запісаны велікодны карагод «Стрылка» ў в. Бездзеж Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Ён выконваўся на Вялікдзень пасля царкоўнай службы на плошчы перад храмам. Звестак пра гэты арыгінальны карагод з яго адмысловай песняй вы не знойдзеце ні ў старых выданнях, ні ў энцыклапедыях «Этнаграфія Беларусі» і «Беларускі фальклор». Ужо адзін гэты прыклад павінен натхніць дапытлівага студэнта, патрыёта роднага краю, на пошукі. Але перш чым шукаць, трэба ўзброіцца ведамі, якія дапамогуць пазнаць карагодную песню нават тады, калі інфармант не згадвае пра яе прымеркаванасць. А пазнаўшы, можна распачынаць гутарку і пра сам карагод, час і форму яго выканання.

**Графіка карагодаў.** Практыканты-філолагі павінны памятаць, што карагоды — сфера прасторава-часавага мастацтва. Міф пра рух карагоднікаў быццам бы выключна «па сонцы» не мае пад сабой падстаў. Менавіта таму трэба звярнуць асаблівую ўвагу на харэаграфію карагодаў, іх графічны малюнак і зрабіць агульныя заўвагі наконт выканання. Напрыклад, можна адзначыць, што калядная лірычная песня-карагод «Васіль, Васілёчак» мае наступны рухомы малюнак: дзяўчаты ўтваралі кола, стоячы ў патыліцу адна за адной, тварам *супраць* ходу сонца, і выкарыстоўвалі розныя крокі-прытупы («падскокі з прытупам», «трайныя крокі-прытупы», «простыя крокі-прытупы» і інш.). А калядны карагод

«*Пайду я, пайду кыла цёмныга лесу*» мае пераменны напрамак: дзяўчаты рухаюцца па крузе ў розныя бакі, трымаючыся за рукі.

Гульнявы карагод «*Как у слаўным у горадзі Казарне*» ўтвараецца з паўкола і танцавальна-ілюстрацыйнага экспромту саліста, які выбірае пару і танцуе з абранай дзяўчынай пад гэтую песню.

На Тройцу хадзілі каля бярозак па-living: па крузе або змейкай пад песню «Пайдзём, дзевачкі, мы на луг гуляці».

Вядомы карагод «Проса» шарэнгавай формы, дыялагічнага тыпу выконваўся пад песню «А мы просу сеялі, сеялі».

**Увага!**
Нават самыя простыя заўвагі ў дачыненні да графікі карагодных песень характарызуюць мясцовую традыцыю і таму маюць навуковую каштоўнасць.

**Народная тэрміналогія і навуковая дэфініцыя карагодных песень.** Практыкант павінен запісаць народнае азначэнне твора (напрыклад, харавод, каравод, калавод, круг, танок, «спяваюць ходзячы» і інш.) і даць навуковае азначэнне, абапіраючыся на два наступныя прынцыпы.

1. Структурны прынцып, калі ўлічваецца перавага таго ці іншага кампанента — песні, харэаграфіі, дзеяння. Адпаведна вылучаюцца песенныя, гульнявыя, танцавальныя карагоды.

*Песенныя карагоды* маюць нескладаны харэаграфічны малюнак і простыя рухі (звычайны крок, пераменны, з рухам убок). Малюнак карагода — кола, ланцужок, змейка, ручаёк, адвольны рух (напрыклад, гуртам упоперак вуліцы).

*Гульнявыя карагоды* пабудаваны на пэўным дзеянні з вылучэннем салістаў або груп. Песні маюць дыялагічную форму, сюжэтную інтрыгу, тэмп карагода больш хуткі з дакладным рытмам. Майстэрства салістаў выяўляецца ў імправізацыі падчас выканання ролі з выкарыстаннем элементаў драматычнага (пантаміма, міміка) і харэаграфічнага (вярчэнне, прытупы, падскокі, воплескі і г. д.) мастацтва. Яскравы прыклад — карагод «Перапёлачка», калі жанчына ў крузе паказвае мімікай і жэстамі, што баліць у «перапёлачкі».

*Танцавальныя карагоды* бываюць павольныя і хуткія з даволі складаным харэаграфічным малюнкам, які ўяўляе сабой камбінацыю розных фігур («спіраль», «вароты», «матылёк» і інш.). Дэкаратыўныя запляценні рук карагодніц — яшчэ адна прыкмета гэтых карагодаў. Песні даволі простыя, галоўная іх мэта — задаць карагоду рытм.

2. Функцыянальны прынцып, калі ўлічваецца сувязь з абрадам або яе адсутнасць. Вялікую групу складаюць *каляндарныя карагоды*: зімо-

выя калядныя, веснавыя масленічныя, велікодныя, «страла», юраўскія, траецкія, куставыя, русальныя, летнія купальскія і жніўныя.

Значна меншая група *вясельных карагодаў*. Імі суправаджаецца вынас каравая, абход з ім хаты, танец маладых, у карагод ператвараецца выхад з-за стала і інш. Яшчэ менш *хрэсьбінных карагодаў*.

*Пазаабрадавыя карагоды* або канцэнтруюцца ў межах каляндарнага свята, або не маюць дакладнай каляндарнай прымеркаванасці. Падобныя карагоды характарызуюць наступным чынам: «карагод вясной, а больш у каляды», «вясной карагод розачка», «карагод у хаце зімой», «у Піліпаўку», «калі хочаш».

**Увага!**
Абапіраючыся на пазначаныя вышэй навуковыя прынцыпы, трэба даваць больш разгорнутае апісанне твора з улікам мясцовай традыцыі. Практычна афармленне запісу ў дзённіку будзе выглядаць наступным чынам:

*Узор запісу*

**Веснавы песенны карагод**
**«Як з-пад лесіку, лесу цёмнага…»**

Як з-пад лесіку, лесу цёмнага,
Гой ты гей люлі, лесу цёмнага.
З-пад таго лесу, з-пад зялёнага,
Гой ты гей люлі, з-пад зялёнага.
Туды шлі — прайшлі два малайчыка,
Гой ты гей люлі, два малайчыка.
Яны шлі — прайшлі, станавіліся,
Гой ты гей люлі, станавіліся.
За адну дзевачку пабраніліся...

На жаль, студэнткі не далі сваіх каментарыяў да запісу і не прывялі заўвагі інфарманта, што зніжае каштоўнасць твора.

А вось запіс карагоднай песні «Што з-пад лесіку, лесу цёмнага», зроблены М. Козенка ў 1994 г. у в. Цялуша Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці ад В. А. Крычко, 1928 г. н., і групы спявачак, падаецца разам з заўвагай выканаўцаў: «вясновы карагод, вадзілі ад Пасхі да Ўшэсця»[1].

**Увага!**
Вызначэнне часавай (абрадавай) прымеркаванасці карагодаў мае важнае навуковае значэнне: характарызуе мясцовую традыцыю, дазваляе праводзіць параўнальнае вывучэнне карагодаў розных фальклорнаэтнаграфічных зон і рэгіёнаў.

[1] *Мажэйка З. Я.* Песні Беларускага Падняпроўя. Мінск, 1999. С. 384

Прывядзём ***прыклады разгорнутага каменціравання твораў***.

У юраўскім карагодзе гаворыцца пра палкае імкненне «Юры барадатага» да Ружы, якая апісваецца як кветка (кожны радок паўтараецца, што звычайна пры выкананні карагоднай песні):

— Юра барадаты,
Стары, не жанаты,
Юра, ажаніся.
— Матка, дзевак нету,
Толькі адна ружа,
І тая ў агародзе.
Садам абсаджана,
Тынам абтынена,
Жытам абсеяна.
Я сад парублю,
Я й тын паламлю,
Жыта на хлеб сажну,
Ружу к сабе вазьму.[1]

Сумленныя збіральнікі Л. Салавей і П. Каруза далі наступнае тлумачэнне: «Спяваюць дзяўчаты, якія ходзяць кругам, пабраўшыся за рукі. "Ружа" — у сярэдзіне круга. "Юра" — за кругам. Пры словах "Я сад парубаю" "Юра" кідаецца на круг, каб ухапіць "Ружу". Дзяўчаты не пускаюць. Калі "Ружа" схоплена, гульба пачынаецца ўжо з рознымі салістамі».[2]

Без гэтых заўваг функцыя песні, запісанай у в. Груздава Пастаўскага раёна, засталася б зацемненай.

Дарэчы, на Мядзельшчыне варыянт песні ўжо не звязаны з карагодам: на Юр'я кожны вечар моладзь збіралася ля жыта і спявала.

Звернемся да вясельных карагодаў. Студэнты шмат разоў у розных рэгіёнах запісвалі песню пра маці, якая просіць каравайніц дапамагчы вырабіць вясельны хлеб. Яны вызначалі яе як каравайную песню, бо нікому не прыходзіла ў галаву падрабязна распытаць інфармантаў пра форму выканання твора. Больш ўважліва ставяцца да гэтага этнахарэографы і музыказнаўцы. Так, Мікола Козенка суправаджае запіс песні «Чыя эта мамка» наступным каментарыем:

«Чыя эта мамка?»
(в. Стаі, Лепельскі раён Віцебскай вобласці)

---

[1] Веснавыя песні / склад.: Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей. Мінск, 1979. С. 177—178.

[2] Там жа. С. 524.

Паводле сцвярджэння Ніны Жарнасек (1931 г. н.) і Яўгеніі Быкавай (1933 г. н.), «ету песню і другія спяваюць у суботу вечарам, калі каравай учыняюць. Каравайніца замешвае, а мы ходзім і пяём. Вот так! Дзяжа стаіць на табурэтцы, а мы з песнямі кругом ходзім… Нада было хадзіць. Хадзілі так: хто прынасіў муку, хто прынасіў ваду, хто прынасіў масла, хто прынасіў яйцо — ета ўсё ў каравай!» Жанчыны, якія сабраліся для прыгатавання вясельнага каравая, за рукі пабраўшыся, а то і проста так, праходзяць па ходзе сонца мернымі, натуральнымі крокамі і адначасова спяваюць:

Чыя эта мамка,
Чыя эта мамка
Па вуліцы ходзіць?

Па вуліцы ходзіць,
Па вуліцы ходзіць,
Суседачак просіць:

Суседачкі мае,
Суседачкі мае,
Хадзіця ж вы ка мне.

Не ка мне, а к дзіцяці,
Не ка мне, а к дзіцяці,
Каравай учыняці.

Пасоблі ўчыніці,
Пасоблі ўчыніці,
Пасобця й замясіці.

Пасоблі замясіці,
Пасоблі замясіці,
Пасобця ў печ пасадзіці.

Затым, падахвоціўшы каравайніцу рознымі «добрымі словамі» і плясканнямі ў далоні, гурт, злучыўшы зноў рукі, ходзіць «па сонцы» і спявае ёй наступную песню: «Зняслі, звязлі сем пур мукі»[1].

Раім вам арыентавацца на гэты ўзор і ў збіральніцкай працы, і пры афармленні дзённіка фальклорнай практыкі.

Прывядзём ***прыклады няпоўнага апісання песенных твораў***, што вядзе да зніжэння ацэнкі за практыку.

---

[1] Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. Мінск, 2001—2013. Т. 2 : Віцебскае Падзвінне. 2004. С. 575—576.

1. Не пазначаны час выканання карагоднай песні:

**Карагодная песня**
**«Мальчышка малодзенькі…»**

— Мальчышка малодзенькі,
Паўшубачак кароценькі,
А чаго ж ты ня жэнішся,
На каго ты надзеешся?

— Я надзеюся на дзенюшкі,
А жанюся я на дзевушкі,
Кальцом абвенчаюся,
Пацалуя дажыдаюся.

— У карагодзі мы былі,
Ой, люлі, мы былі,
Ну каго ж мы відзелі?
Мы відзілі парачку —
Кавалера з барышней,
Ой, люлі, з барышней.

Стань, парачка, разыйдзіся,
У друг на дружку рассматрысь,
Ой, люлі, рассматрысь,
І хоць нямножка прытанцуй,
Каго любіш — пацалуй,
Ой, люлі, пацалуй.

(Запісана ад Трафімавай Марыі Рыгораўны
ў г. п. Ушачы Віцебскай вобласці.)

Жанр з філалагічнага пункту гледжання быў пазначаны правільна — «карагодная песня», але ў дадзеным выпадку гэта няпоўнае апісанне твора, а значыць, частковае выкананне патрабавання.

Запіс не суправаджаецца заўвагамі, якія тычацца часу яго выканання. Вядомы феномен часавага зруху ў бытаванні дадзенага карагода. Напрыклад, старэйшыя жыхары Падзвіння (в. Рамашкава Талачынскага раёна Віцебскай вобласці) адносілі карагод з песняй «У карагодзе мы былі» да Каляд, а маладзейшыя жанчыны сцвярджалі, што яго вадзілі і летам.

2. Не пазначана абрадавая прымеркаванасць карагоднай песні.

У 1973 г. студэнты філфака БДУ, якія збіралі фальклор у в. Азяраны Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці, пазначылі песню, запісаную ад Лізаветы Пашэвіч (1905 г. н.), як «карагод». Гэтага недастаткова, бо перад намі хрэсьбінны гульнявы карагод:

— А мы кіселю наварым,
Сваю бабусю пазавем.

— А мы кіселю паямо,
Вашай бабусі не дамо.

— А мы баршчэчку наварым,
Сваю бабусю пазавем.

— А мы баршчэчку паямо,
Вашай бабусі не дамо.

— А мы кашыцы наварым,
Сваю бабусю пазавем.

— А мы кашыцу паямо,
Вашай бабусі не дамо.

Ад гэтай жа спявачкі практыканты запісалі скарочаны варыянт гульнявога карагода «А мы проса сеялі, сеялі» з прыгожым прыпевам «Зялёная рутанька, жоўты цвет», але не адзначылі яго часавае прымеркаванне і форму выканання. Памылкова лічыць, што запеў твора паказвае на вясну. Напрыклад, у Падзвінні збіральнікі адзначылі наступныя адказы: «вадзілі больш на Купалу — каля агню, лініямі са спевамі»; «гульня такая, ну, проста адпачынак пасля танцаў»; «гульня-карагод, у які гулялі дзеці»; «веснавая гульня, у якую станавілася хоць пар васімнаццаць»; «зімой на вечарынках — на танцах. Во, надаесць нам ужо танцаваць, во і гуляем. Летам гулялі на вуліцы, найбольш ля клуба — тамака на гарэ. І тута, ля дамоў гулялі»[1].

А як у в. Азяраны? Мы не ведаем. Вялікая раскіданасць азначэнняў карагода ў межах Падзвіння пераконвае, што заўсёды трэба высвятляць мясцовую традыцыю выканання таго ці іншага твора.

**Фармальныя адзнакі карагодных песень.** Фармальныя прыкметы карагодных песень, якія вы павінны мець на ўвазе, наступныя.

1. Прамое ўказанне на карагод: «Ідзе, ідзе карагод», «Да хадзіў карагод», «У карагодзе мы былі», «Карагод вялікі, вуліца малая», «Карагод дзевак водзіць Ванечка» і пад.

2. Наяўнасць назвы песні. Звычайныя лірычныя творы, за рэдкім выключэннем, не маюць замацаванай назвы. Інакш у выпадку з карагоднымі. Калі вам скажуць, што праспяваюць «Проса», «Мак», «Пляцень», «Стралу», «Падушачку» і г. д., пасля выканання трэба распытаць інфарманта, ці не карагодная гэта песня. А калі так, то далей задавайце пытанні і не спыняйцеся, нават калі ў дадзенай спявачкі не знойдзеце адказаў. Не трэба бянтэжыцца: магчыма, падкажуць іншыя. Уявіце сябе філолагам-дэтэктывам і апішыце свой пошук у дзённіку.

[1] Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Т. 2. С. 565.

3. Прыпевы. Яны бываюць розных тыпаў — традыцыйныя і нетрадыцыйныя.

Традыцыйныя прыпевы не звязаны з тэкстам песні, гэта свайго роду топасы, уласцівыя шэрагу карагодных песень. Напрыклад:

- *ой, люлі, ой, люлі; ой, люлі, люлі; ай, лялё, рана; ой, лі, ой, люлі; ой, лі, вой, лялі; ох, і вой, люлі і пад.*;
- *каліна; рана-рана; сонейка; божа наш і пад.*

Так, прыпеў са словам «рана» можна сустрэць у веснавых і купальскіх карагодах.

Нетрадыцыйныя прыпевы шчыльней — эмацыянальна і сэнсава — звязаны з тэкстам песні. Такія, напрыклад, купальскія прыпевы: «На Йвана-Купала», «Ой, рана на Йвана» і пад.:

Ой рана, рана,
Ой, рана на Івана
Выйшлі дзеўкі на луг,
Ой, ды сталі ў круг.

Ой, рана, рана,
Ой, рана на Івана
Выйшлі хлопцы на луг,
Ой, ды сталі ў круг.

Ой, рана, рана,
Ой, рана на Івана
Распалілі касцёр,
Ой, гулялі да зор[1].

Памятайце, што прыпевы могуць быць рознага аб'ёму — ад аднаго-двух слоў да некалькіх радкоў.

Вельмі часта прыпеў складаецца са слова ці словазлучэння і паўтору апошняй часткі папярэдняга радка. Напрыклад, як у гульнявым карагодзе:

— Баяры, а мы к вам прышлі,
Маладыя, а мы к вам прышлі.

— Баяры, вы за чым прышлі?
Маладыя, вы за чым прышлі?

Тут рэфрэн «Маладыя» паўтараецца пасля кожнага радка з другой яго часткай.

Па такім узоры спалучаюцца з творам традыцыйныя прыпевы.

[1] Песні народных свят і абрадаў / уклад. Н. Гілевіч. Мінск, 1974. С. 140.

*Узор запісу*

**Веснавы песенны карагод**
**«Пасеялі дзеўкі лён»**

Пасеялі дзеўкі лён,
Эй, люлі, дзеўкі лён.

Пасеяўшы, палолі,
Эй, люлі, палолі.

Адна дзеўка не палі,
Эй, люлі, не палі,

Вядзі каня да вады,
Эй, люлі, да вады.

На шалковым паваду,
Эй, люлі, паваду.

Конь марскій вады ня п’ець,
Эй, люлі, конь ня п’ець.

Капытамі зямлю б’ець,
Эй, люлі, зямлю б’ець.

(Запісана ад Пяшкевіч Чаславы Казіміраўны, 1930 г. н.,
у в. Мількі Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці.)

Акрамя таго, тут паўтараюцца і асноўныя радкі.

Прыпеў ужываецца самастойна і паўтараецца пасля кожнага радка.

Хаджу я, гуляю вакруг карагода,
Розачка алая!

Адзін і той жа карагод можа мець розныя прыпевы. Напрыклад, у калядным абрадавым карагодзе «Яшчар» сустракаюцца такія:

Сядзі, сядзі, яшчар,
Ладу, ладою,

Сярод карагоду,
Ладу, ладою…

або:

Сядзі, сядзі, яшчар,
Гэй, нам, гэй!

На залатым крэслі,
Гэй, нам, гэй!

Адсюль зразумела: калі студэнт прапусціў прыпеў, то яго нельга ўзнаўляць па запісе аналагічнай песні.

Асобную групу складаюць карагоды з прыпевамі, роўнаскладовымі з радкамі песні. Напрыклад, дзесяціскладовымі:

— А мы ляда капалі, капалі,
Зялёная рутачка, жоўты цвет!

—А мы проса сеялі, сеялі,
Зялёная рутачка, жоўты цвет!..

Частка карагодаў мае страфічны паўтор прыпеву з роўнаскладовымі ці рознаскладовымі радкамі, як, напрыклад, у знакамітым веснавым карагодзе «Лука» з трохрадковым прыпевам змешанага тыпу (5 + 9 + 9):

Што на луцэ, на луцэ
Ды на шоўкавай траве.

Эй, лука мая,
Лука мая ды шырокая,
Трава-мурава зялёная.

Прыпеў паўтараецца пасля кожнага двухрадкоўя. Выканаўца патлумачыла: «Вадзілі гэты карагод на Благавешчанне ланцужком “у крывулькі” паміж трох дзяцей, пасаджаных на трох вуглах»[1].

4. Разнастайныя паўторы.

Паўторы ёсць і не ў карагодных песнях, але ў карагодных яны больш рэгулярныя, абапіраюцца на прыпевы, якія надаюць творам дакладную слоўна-музычную строфіку.

**Тыповыя памылкі.** Прынцып паўтаральнасці распаўсюджваецца і на асобныя элементы песні, і на складаныя сінтаксічныя структуры страфы, і на ўвесь твор цалкам. Песенныя паўторы шчыльна звязаны з музычным ладам твораў, толькі разам яны арганізуюць строфіку. Вось чаму асноўнае патрабаванне — запісваць песню «з голасу», каб атрымаць дакладны страфічны малюнак.

Частка слоў прыпева можа паўтарацца. Гэта не значыць, што мы маем дакладнае музычнае паўтарэнне. Хутчэй наадварот. У такім выпадку запіс павінен афармляцца з улікам пазначанай акалічнасці:

А мы копань копалі, копалі,
Зялёная рутачка, белы цвет,
Белы цвет!

А мы ляда ўбіралі, ўбіралі,
Зялёная рутачка, белы цвет,
Белы цвет!

[1] *Мажэйка З. Я.* Пазнач. твор. С. 117; 384.

Будзе памылкай, калі практыкант запіша твор так:

А мы копань копалі, копалі,
Зялёная рутачка, белы цвет, белы цвет.

або:

Зялёная рутачка,
Белы цвет (двойчы).

Яшчэ раз пакажам на прыкладзе, як не трэба запісваць песню, асабліва пабудаваную на ўнутраным прыпеве. Унутраны прыпеў — гэта захоп-паўтор папярэдняга радка, часам абсалютна літаральны, але інтанацыйна (музычна) адрозны. Пры запісе падобных твораў магчымы дзве памылкі. Першая — дакладна рэгіструюцца паўторы, але строфы не адзначаюцца. Атрымліваецца наступнае:

Красно лето подоспело,
Соловьи с моря слетели,
Соловьи с моря слетели,
Молодым гулять велели,
Молодым гулять велели,
На зеленом на лугу,
На зеленом на лугу,
На крутом берегу…

Яшчэ горш другая памылка — скарочана запісаны тэкст:

Красно лето пролетело,
Соловьи с моря слетели, (2 р.)
Молодым гулять велели… (2 р.)

Правільнае афармленне выглядае такім чынам:

Красно лето пролетело,
Соловьи с моря слетели.

Соловьи с моря слетели,
Молодым гулять велели.

Молодым гулять велели
На зеленом на лугу.

На зеленом на лугу,
На крутом берегу…

Як бачым, паўтараюцца ўсе радкі, акрамя першага, сэнсава завершанага. Пры інтанацыйнай нятоеснасці паўтораў іх трэба адносіць да розных строф.

**Увага!**
Практыканту вельмі дапаможа кніга У. Раговіча «Песенны фальклор Палесся. Т. 1. Песні святочнага календара» (Мінск, 2001).

З запісаў У. Раговіча добра бачны страфічныя варыянты асобных карагодаў нават у межах аднаго раёна, але ў розных вёсках, што сведчыць на карысць думкі аб трываласці мясцовых традыцый.

Параўнаем пачаткі песеннага карагода «Ой, ны росты, кропэ».

I варыянт:

— Ой, ны росты, кропэ,
Ой, ны росты, кропэ,
Вышэй огорода.

Ой, ны ходы, старый,
Ой, ны ходы, старый,
Кай мого батька двура.
(в. Ганчары Пінскага раёна Брэсцкай вобласці)

Заўвага збіральніка: «Танок водылы на Вылыкдэнь».

II варыянт:

— Ой, ны росты, кропэ,
Ой, ны росты, кропэ,
Вышэй огорода,
Вышэй огорода.

Ой, ны ходы, діду (бородатый),
Ой, ны ходы, діду,
Коло мого батька двора,
Коло мого батька двора...
(в. Казляковічы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці)

Прымеркаванасць тая ж самая. Заўвага збіральніка: «Песня-танок тыповага напеву».

III варыянт:

— Ой, нэ росты, кропэ,
Ой, нэ росты, кропэ,
Вышэй огороду,
Вышэй огород(у).

Ой, нэ ходы, старый,
Нэ ходы, нэдужый,
Коло мого батька плоту,
Коло мого батька плот(у)...
(в. Пінкавічы Пінскага раёна Брэсцкай воблаці)

Рытміка паўтораў застаецца вызначальным элементам карагодных песень, нават калі самі карагоды зніклі з побыту.

**Змястоўна-структурныя прыкметы карагодных песень.** Ёсць некалькі змястоўных прыкмет, якімі характарызуюцца карагодныя песні.

1. Вобразны паралелізм арніталагічнага тыпу.

Абедзве паралелі развіты да памераў страфы. Змест першай — пошукі, выбар, захоп птушкай сабе пары, змест другой — пошукі, выбар, захоп хлопцам дзяўчыны ў карагодзе або пошукі і выбар дзяўчынай хлопца.

Вобразны паралелізм — кампазіцыйны прыём часткі любоўна-шлюбных карагодных песень каляндарнага і вясельнага цыклаў. Часам гэтыя песні маюць пэўныя прыпевы-індыкатары, якія не дазваляюць памыліцца адносна каляндарна-святочнай прымеркаванасці твораў.

2. Адначленны паралелізм арніталагічнага тыпу з нулявой другой часткай і наяўнасцю прыпеву. Напрыклад:

Ляцелі дзве пцічкі,
Ростам невялічкі.
Тут лета, тут зіма,
Пцічка весела была.
Ляцелі, ляцелі,
Селі, пасядзелі.
Тут лета, тут зіма,
Пцічка весела была.
Сталі расставацца,
Крэпка цалавацца.
Тут лета, тут зіма,
Пцічка весела была.

3. Тэма боскага шлюбавання прама прадстаўлена ў юраўскіх карагодах і больш завуаліравана ў купальскіх.

Шлюбныя матывы могуць арганічна спалучацца з аграрна-магічнымі:

Дзе наша Юр'е хадзіла,
Там наша жыта ўрадзіла.
А дзе наша Юр'е юравала,
Там наша жыта красавала.[1]

4. Тэма карагоднага навучання працэсу гаспадарчай працы, прычым настаўнікі — птушка або маці. Напрыклад, «Соловэйко-горобэйко» паказвае карагодніцам, як сеюць, полюць, здымаюць мак, «маці» вучыць дачку «на лён землю пахаці», даглядаць і ўбіраць лён.

---

[1] Беларускі фальклор у сучасных запісах. Брэсцкая вобласць. Традыцыйныя жанры / склад. В. А. Захарава. Мінск, 1973. С. 76.

Аграрная тэма можа натуральным чынам пераходзіць у любоўна-шлюбную.

5. Згадванне пацалункаў або пабуджэнне да іх. Звычайна ў падобнага тыпу карагодах хлопец бегае за дзяўчынай, імкнецца дагнаць яе, тая вырываецца, збягае, не адразу дазваляе сябе пацалаваць. Пацалунак — знак прыналежнасці дзяўчыны хлопцу, пра што гаворыцца ў песні з нулявой другой часткай:

Што за садам, за садом, за садом
Расла трава шаўкова, шаўкова.
Па той траве пава йшла, пава йшла,
А за ёю паў ляцеў, паў ляцеў,
Крычыць: «Пава ты мая, ты мая!»
— Не, яшчэ я не твая, не твая,
Цалуй мяне тры разы, тры разы —
Тады буду я твая, я твая[1].

6. Сямейна-бытавая тэма выяўляецца праз умоўныя, далёкія ад рэальнасці сітуацыі. У адрозненне ад сапраўдных пазаабрадавых сямейных песень, якія характарызуюцца глыбокім драматызмам стасункаў персанажаў, карагодныя песні вызначаюцца палегчаным канфліктам, які да таго ж падаецца ў гумарыстычнай афарбоўцы. Часам песні маюць тыпова карагодную прыкмету — прыпеў. Напрыклад:

А хто кажа, што мой муж добры,
Кабы таму такі век доўгі,
Калінка-малінка мая,
У саду ягада-малінка мая.

І далей апавядаецца пра клопаты жонкі і вар'яцкую рэакцыю мужа: яна яму *яешню*, *кашкі з маслам*, *на тарэлку піраг*, *кашулечку мые*, *пасцель сцеле*, *добрае слова*, а ён — *чапялой па баку*, *па насу палонікам*, *кулаком у шыю*, *галавою аб сцяну*, *кулаком знова*.

Нагнятанне жудасных дэталей мела на мэце калектыўна «занатаваць» іх у карагодзе, знішчыць з жыцця: нічога асабістага, проста калектыўная замова на шчасце метадам ад процілеглага.

Карагодныя песні сямейнай тэматыкі лёгка пазнаць па мнагачленным паралелізме, умоўнай сітуацыі, асабліва калі яны маюць прыпеў, як, напрыклад, у наступнай песні:

А ўчора мяне свякор набіў,
Ой, ля-лёй, рана свякор набіў.

---

[1] Песні народных свят і абрадаў. С. 129.

Набіўшы мяне, сам у пір пайшоў,
Ой, ля-лёй, рана сам у пір пайшоў.

У піру седзячы, выхваляецца,
Ой, ля-лёй, рана выхваляецца...[1]

Менавіта ў карагодах змяшчалася патэнцыя будучых любоўных, сямейных і гумарыстычных песень. Частка іх сапраўды выйшла з карагодаў, але захавала «радзімыя плямы» зместу і кампазіцыі карагодных песень.

Задача збіральніка — высветліць мясцовае прымеркаванне твораў. Майце на ўвазе, што ў адных выпадках твор можа ўсведамляцца як карагодны, у другіх — як каляндарна прымеркаваны, у трэціх — як звычайная пазаабрадавая песня.

## ? АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ КАРАГОДНЫХ ПЕСЕНЬ

1. Ці вадзілі ў вашай мясцовасці карагоды (танкí)? Да чаго яны былі прымеркаваны (Каляды, вясна, Вялікдзень, жніво, вяселле і інш.)? Як яны называліся («Вялікі карагод», «Дажыначны карагод», «Матылёк» і інш.)?

2. Якія карагоды прымеркаваны да Каляд (укажыце назвы такіх карагодаў, форму іх выканання, хто вадзіў, якія песні пры гэтым спявалі)?

3. Якія карагоды лічацца веснавымі («Як пушчу стралу», «Ды ляцела страла ўздоўж сяла», «А ў бару сасна калыхалася», «А мы проса сеялі», «А мы ляда капалі», «Разгуляўся Юр'еў конь», «І да раілася пчолка», «А на дварэ раса», «Ды хадзіў карагод», «Вы кумушкі, галубушкі» і інш.)? Укажыце назвы такіх карагодаў, форму іх выканання, хто вадзіў, якія песні пры гэтым спявалі.

4. Ці вадзілі карагоды на Благавешчанне («А ў нас сёння Благавешчанне»)? Апішыце гэтыя карагоды.

5. Якія карагоды вадзілі на Вялікдзень («Вялікі карагод», «Як на першы дзень, на Вялікадня»)? Якой была форма іх выканання, хто вадзіў, якія песні пры гэтым спявалі?

6. Ці вядомы карагоды, прымеркаваныя да сёмушна-траецкіх «зялёных» свят: Тройцы («А мы кумушкі, галубушкі»), Куста («Куста вадзіць»), Русальнага тыдня (крывы танок), абраду ваджэння і пахавання «стралы» («сулы») («Да ляцела страла да ўздоўж сяла»)? Апішыце гэтыя карагоды.

7. Якія карагоды вадзілі на Купалле? Укажыце назвы такіх карагодаў, форму іх выканання, хто вадзіў, якія песні пры гэтым спявалі.

[1] Сямейна-бытавыя песні / [склад. І. К. Цішчанка]. Мінск, 1984. С. 125.

8. Якія карагоды былі прымеркаваны да пачатку/канца палявых работ (напрыклад, жніва), часу адпачынку (гулянні моладзі) і інш.? Апішыце гэтыя карагоды.

9. Ці вадзілі карагоды на вяселлях? Суправаджалі карагоды пэўныя этапы вяселля (апрананне маладой, прыезд маладога да маладой і інш.) ці выконваліся безадносна да пэўнага этапу вяселля? Апішыце гэтыя карагоды, запішыце карагодныя песні.

10. Ці вядомы ў вашай мясцовасці так званыя абходныя карагоды (абходы поля, вёскі), якія вадзілі з якой-небудзь прычыны (стыхійнага бедства — засухі, мору, паводкі і інш.)?

**Даведка**

У якасці падказкі інфарманту вы можаце выкарыстоўваць класіфікацыю карагодаў, заснаваную на крытэрыі тэматычных груп назваў, якія ўключаюць указанне на розныя рэаліі навакольнай рэчаіснасці, характар карагодных рухаў, каляндарна-абрадавую прымеркаванасць і інш. Магчыма, гэтыя назвы дапамогуць інфармантам успомніць вядомае.

1. Назвы раслін: *дрэў* («Бярозка», «Вішанька», «Пад вішняю», «Грушка», «Каліна», «Яблынька», «Явар»), *кветак* («Васількі», «Мак», «Розачка мая», «Ружа», «Уюн»), *зерневых* («Жыта», «Зярнятка», «Канапелька», «Проса»), *гародніны* («Капуста», «Качан», «Крывы агурок»), іншых раслін («Лебяда», «Лён», «Укроп», «Хрэн»).

2. Назвы прадстаўнікоў жывёльнага свету: *птушак* («Птушка», «Верабей», «Зязюля», «Кукушачка», «Каршун», «Пава», «Перапёлка», «Пеўнік»), *жывёл, рыб, гадаў, насякомых* («Заяц», «Матылёк», «Ёрш», «Вуж»).

3. Назвы са згадваннем ракі, вады («На рэчаньку», «На росу», «Рэчанька»).

4. Назвы каляндарных свят («Велікодны карагод», «Карагод пасля Калёд», «Купальскі карагод», «Куст», «Ой, у нас сёння Благавешчанне»).

5. Назвы пор года («Ой ты, зімушка-зіма», «Веснавы карагод», «Лета»).

6. Назвы вясельнай абраднасці: *агульныя назвы* («Вясельны карагод», «Вяселле», «Сабіралі вяселле»), *назвы маладога* («Каралёк», «Чарнавусы каралёк», «Цар», «Царэвіч-каралевіч»), *назвы паязджан ці маладых* («Баяры»).

7. Назвы па імені чалавека («Арынка», «Васіль», «Дуня», «Кацярына», «Лука», «Машанька», «Таццянка», «Халімон», «Трухман»).

8. Назвы, якія ўказваюць на роднасць («Былі ў бацькі», «Кумка», «Ятэрматэр»).

9. Назвы, якія ўказваюць на працоўны працэс («Проса сеялі», «А мы ляда капалі», «Дзеўкі хмель садзілі», «Мак сеялі», «Як сеюць зелянец», «Ткацтва»).

10. Назвы прафесій («Каваль», «Касары», «Малатар», «Трубачыст», «Шэўчыкі»).

11. Назвы рэчыўнага свету («Карзінка», «Карагод з паясамі», «Кошык», «Падушка», «Рушнік», «Рагуля», «Сіта»).
12. Назвы збудаванняў («Вароты», «Мост», «Пляцень»).
13. Рух па крывых лініях («Крывы танок», «Крывы танец», «Крывы агурок», «Крывы Васіль»).
14. Рух па крузе («Кола», «Кругавая», «Кружок»).
15. Першы радок карагоднай песні («Аддавалі маладу за сівую бараду», «Верабеюшка па сенюшцы паскоквае», «Ішла я вулачкай, перавулачкай», «Ляцелі дзве птушкі»).

# 5. БАЛАДНЫЯ ПЕСНІ (БАЛАДЫ)

Баладныя песні — адзін з самых яркіх фальклорных жанраў. У гістарычнай рэтраспектыве балада звязана з танцамі, карагодамі, абрадамі. Шэраг беларускіх балад захоўвае гэтую сувязь да нашых дзён. Шмат хто з інфармантаў засведчываў, што выкананне баладных песень прымяркоўвалася да пастоў, галоўным чынам, Піліпаўскага і Вялікага посту: тады яны пазначаліся як *пастав́ыя*.

Сучасны стан баладнай традыцыі — найлепшае сведчанне духоўнага патэнцыялу беларускага народа, узроўню яго культурнай свядомасці. Падзеі агульнанароднага значэння ўзнаўляюцца ў баладных песнях праз лёс канкрэтнага чалавека, што і робіць гэтыя творы такімі прыцягальнымі для выканаўцаў і слухачоў.

> **Увага!**
> Тэрмін «баладныя песні», або «балады», — выключна навуковы. У свядомасці выканаўцаў яны існуюць як *доўгія,* таму што іх памер перавышае памер звычайнай лірычнай песні. Лічыцца, што яны ўзніклі вельмі даўно, адсюль другое азначэнне — *даўнія.* Балады сапраўды былі першым фальклорным жанрам, які скіраваў увагу на лёс асобнага чалавека, драматычныя і трагічныя калізіі сямейнага жыцця. Менавіта таму яны ўсведамляюцца як *праўдзівыя жыцельныя.* Іх сюжэты не ведаюць шчаслівага канца, адсюль зразумела, чаму іх называюць *смутныя, жаласныя.* Такім чынам, калі вас зацікавілі балады і вы вырашылі мэтанакіравана шукаць іх, раім карыстацца народнымі азначэннямі гэтых песень.

***Галоўнае пытанне:*** «Ці спяваюць у вас доўгія (даўнія, праўдзівыя, жаласныя) песні? Можа, вы ведаеце іх?»

***Галоўнае патрабаванне да практыканта — пісьменнае вызначэнне жанравага віду запісаных балад.***

Згодна з агульнай класіфікацыяй, вылучаюцца тры гістарычныя тыпы балад:

1) міфарытуальныя балады;
2) класічныя балады;
3) «новыя» балады.

**Класіфікацыя міфарытуальных балад.**

1. Асноўны матыў *уласна міфалагічных балад* — ператварэнне гераіні (маці, дачкі, нявесткі, жонкі) у птушку (зязюлю, ластаўку, салавейку і інш.), радзей у кветкі, дрэвы, камяні, рэчкі і г. д.).

2. *Уласна рытуальныя балады* звязаны з пэўнымі каляндарнымі абрадамі і часцей за ўсё выконваліся падчас ваджэння карагода (танка). Трэба вызначыць, да якога абраду адносіцца запісаны баладны твор. Напрыклад, баладная карагодная песня «Ляцела страла» складае аснову абраду ваджэння і пахавання «стралы», баладная танковая песня «Ой, шчо ж гэто бідна вдовонька діе» ўваходзіць у склад абраду ваджэння Куста, баладная карагодная песня пра дзяўчыну Ціхоню адносіцца да купальскага абраду і г. д. Іх асноўныя ідэі: віна (часта ўяўная) і пакаранне персанажа з наступным ператварэннем, разарваннем; беспрычынная смерць пры незвычайных акалічнасцях; цудоўны жаніх тапельніцы; інцэстны шлюб і пад.

3. *Рытуальна-міфалагічныя балады* маюць наступныя разнавіднасці:

а) казачныя балады, матывы і канфлікты якіх супадаюць з матывамі і канфліктамі казак (напрыклад, матыў шлюбнага спаборніцтва, канфлікт мачахі з падчаркай і пад.);

б) легендарныя балады, якія арыентуюцца на хрысціянскія легендарныя сюжэты і хрысціянскую мараль (пра святую Алену, пра Юр'я і Цмока, дзеўку-дзетагубніцу);

в) балады з загадкамі, ідэя якіх — вытрыманае выпрабаванне;

г) карагодна-гульнявыя балады з матывамі выбару пары, перавагі мілага над іншымі персанажамі.

**Азначэнне запісанага баладнага твора.** Азначэнне запісанага баладнага твора залежыць ад асноўнага баладнага матыву і магчымай абрадавай функцыі твора. Арыентавацца ў складзе балад, іх сюжэтаў і матываў, пачаць размову з інфармантам дапаможа наступная даведка.

**Даведка**

***Міфарытуальныя матывы*:**

• дачка- (жонка-, маці-) птушка; тры птушачкі ля забітага малойчыка; свякруха заклінае нявестку ў дрэва (расліну, быліну і інш.); брат і сястра ператвараюцца ў кветку; закляты ў явар малойчык; дзяўчына-тапельніца («Ціхоня»); дзяўчына (сястра) абярнулася вярбою (краскаю, яблынькаю); дзяцюк стаў цёрнам, дзеўка — калінаю, муж стаў яварам, жонка — рэчкаю; сястра і браты-разбойнікі; муж-Дунай; заклятае вяселле; брат сватаецца да сястры; забіты арол; маці атручвае нявестку; маці разгадвае дзіўны сон; ваўкі-нянькі;

• мачаха і Ганууся; воўк перамагае ў шлюбным спаборніцтве; зязюля — вястунка смерці; смерць — памочніца нявесткі (мужа); вятры — памочнікі жонкі; труна прамаўляе; гора (ліхая доля); Юр'я і Цмок; Дарота (Варвара); дзеўка і шатан;

• адгадаеш — замуж возьмем (персцень атрымаеш; скажам, дзе коні).

Прыклады міфалагічных балад: «Хлопец ператварыўся ў явар з-за пракляцця маці»; «Свякроўка зачароўвае нялюбую нявестку ў рабіну»; «Дзяўчына па сваёй волі "ператкідваецца" ў яблыню»; «Тры птушачкі ля забітага малойчыка»; «Дачка ператвараецца ў зязюльку» і да т. п.

Прыклады *азначэння* рытуальных балад: рытуальная стралавая балада «Страла забівае малойчыка»; рытуальная балада «Удава і сыны-карабельнікі»; рытуальная купальская балада «Маці загадвае Ціхоні ўтапіцца»; рытуальная жніўная балада «Ваўкі-нянькі» і да т. п.

***Матывы карагодна-гульнявых балад:*** малодка і яе радня; удава ратуецца ад татараў; выкуп з няволі; дзяўчына тоне на моры; ластаўка на моры; паненка згубіла пярсцёнак; мужык жонку б'е, катуе; брат у брата каня просіць; малойчык у няволі; развітанне з мілым; жонка не верыць, што мілы забіты.

Сэнсавае супастаўленне некалькіх асоб з вылучэннем апошняга, звычайна мілага, — тыповая рыса балад карагодна-гульнявога складу. Напрыклад, дзяўчына адмаўляе ў перавозе цераз рэчку ўсім родным і робіць выключэнне толькі для міленькага; турак прымае выкуп за дзяўчыну-паланянку ад усіх, але адпускае яе толькі за выкуп, які прыслаў мілы; ніхто з родных не здольны вярнуць дзяўчыну з ігрышча, гэта ўдаецца зноў жа толькі міламу; бацька хоча аддаць дачку за старога, малога, але яна згаджаецца толькі на роўню.

У гістарычным плане дадзеныя беларускія балады, падобна заходнееўрапейскім, першапачаткова выконваліся выключна пад скокі, у карагодзе. Адсюль умоўнасць іх зместу і безумоўнасць ідэі: мілы даражэйшы і лепшы за родных. Здаецца, што дзяўчына, якая тоне на моры, павінна ўхапіцца за руку першага выратавальніка, але яна паслядоўна адхіляе прапановы мамачкі, татачкі, брацікa, сястрыцы і толькі міламу дазваляе сябе выратаваць.

Такі ўмоўны змест псеўдагістарычных балад («Выкуп з турэцкай няволі»), сямейна-бытавых («Мужык жонку б'е, катуе») і іншых таго ж кампазіцыйнага тыпу.

**Парада**

Цяпер карагоды знікаюць, дзе-нідзе зусім зніклі. Менавіта таму вам трэба ўважліва прыглядацца да мастацкіх дэталей і кампазіцыі твораў сямейнай тэматыкі, каб не пераблытаць карагодныя песні з лірычнымі, якія выконваюцца калі заўгодна і дзе заўгодна, хорам і сола. Напрыклад, нават у акадэмічным выданні — томе «Сямейна-бытавыя песні» са зводу БНТ (Мінск, 1984) — змешчаны творы тыповай баладнай кампазіцыі з ана-

фарыстычнай строфікай, са з'яўленнем новага персанажа ў кожнай з іх і станоўчай адзнакай апошняга. Так, у песні «Мілы як п'е, так п'е» ніхто не бароніць жанчыну ад пабояў мужа — ні *свёкарка*, ні *свякроўка*, ні *дзеверка*, толькі *залвіца* пашкадавала нявестку. Тая ж самая сітуацыя ў песні «Мужык жонку катуе»[1].

Зразумела, што творы ўзыходзяць да карагодна-гульнявай балады «Мужык жонку б'е, катуе», дзе гранічная ўмоўнасць зместу пазначаецца праз умоўны локус публічнага пакарання жонкі мужам — «а й у Слуцку на рыначку». Разгортваецца звычайная дынамічная карціна: свёкарка, свякроўка, дзевярка падкідаюць родзічу нагаечку са словамі: «Ой, бі, сынку (братко), бі, вуму-разуму вучы!» І толькі адна залоўка на баку нявесткі.

**Склад класічных балад і іх вызначэнне.** Да класічных балад адносяцца балады гістарычныя і навелістычныя. З цягам часу да іх далучыліся так званыя «новыя» балады з сацыяльным тыпам канфлікту. Некаторыя з іх, напрыклад, пра Бандароўну, ужо асэнсоўваюцца як класічныя.

1. Адметнасць *гістарычных балад* палягае ў тым, што канфлікт у іх абумоўлены не акалічнасцямі сямейных стасункаў, а пэўнымі гістарычнымі абставінамі. У іх лёс асобнага чалавека падаецца як залежны ад гістарычных акалічнасцей (набегі і войны, палон і продаж у няволю, сутыкненне з татарамі і г. д.). Героямі тут могуць выступаць тыя ж дзяўчына або хлопец, якіх сватаюць за нялюбых, з той розніцай, што «нялюбымі» выступаюць чужынцы татары, якія у выніку бяруць дзяўчыну супраць яе волі, або турэцкі цар, што хоча аддаць сваю дачку за «слаўнага рыцара Байду», але той выбірае лепш смерць, чым шлюб з царэўнай-паганкай. Паланёная дзяўчына, якую вядуць у чужую старану, хоча пазбавіць сябе жыцця, тое самае хоча зрабіць і маладзіца, што вымушана жыць у сям'і татарына, і г. д.

Гістарычныя балады трэба ўмець адрозніваць ад гістарычных песень. Апошнія блізкія да балад сюжэтамі і часта трагічнай афарбоўкай, але адрозніваюцца тым, што звяртаюцца да канкрэтных падзей (напрыклад, асада Крычава татарамі). У баладах жа ўвага скіравана на перажыванні героямі пэўных падзей. Нават калі героем выступае князь, ён паказваецца ў сваіх асабістых, сямейных стасунках, а не дзяржаўнай дзейнасці. Гістарычныя песні робяць акцэнт на патрыятычных і гістарычных ідэях, а балады сканцэнтраваны на выражэнні маральных ацэнак персанажаў, яны абараняюць права на выяўленне пачуццяў і жаданняў асобнага чалавека.

2. *Навелістычныя балады* — самая вялікая група баладных песень. Усе падзеі ў іх падкрэслена жыццёвыя, аднак выпадкі, апісаныя ў тво-

[1] Сямейна-бытавыя песні. С. 67, 169—170.

рах, нечым адметныя — ці то абставінамі, ці то паводзінамі персанажаў. Выкарыстоўваецца ў іх і мастацкая ўмоўнасць. Напрыклад, размаўляюць дрэвы, лугі, рэкі, птушкі, звяры.

Мастацкі свет навелістычных балад — свет небяспечны, яго падмурак — псіхапаталогія грамадскага і штодзённага жыцця, поўнага злачынстваў, дэфармаваных зносін, пакалечаных характараў і лёсаў.

**Баладнае ўвасабленне тэмы вайны.** Вайна падаецца адхіленнем ад натуральнай плыні жыцця. Ад яе пакутуюць літаральна ўсе: тыя, хто на вайне, і сямейнікі. Ад'езд на вайну, малойчык на вайне, смерць мужа, брата, сына, казака на вайне, смерць жонкі, якая не дачакалася мужа з вайны, — звычайныя тэмы балад. Іх пацыфісцкі характар узмацняецца праз матыў сіроцтва дзяцей. Двaістае ўражанне пакідаюць балады на тэму «сватанне — напад». Праз тыповы матыў абрадавых вясельных песень у баладах ставіцца праблема безабароннасці жанчыны ва ўмовах вайны. Яна — трафей, і яе пачуцці не прымаюцца ў разлік. І зусім не ўмоўным выглядае фінал драмы, гэты шлюб па няволі, калі дзяўчына лічыць за лепшае пайсці «камянём на дно».

**Баладнае ўвасабленне звычайнага жыцця праз адхіленні ад нормы.** Увага канцэнтруецца або на выпадковых трагічных здарэннях па неасцярожнасці, неабачлівасці, залішняй даверлівасці самога чалавека, або на трагедыях, якія адбываюцца пад ціскам абставін, калі злачынства, можна сказаць, вымушанае. Адна справа, калі дзяўчына ненаўмысна падае ў ваду (мора, рэчку) і патанае, зусім іншая — калі яна топіць дзіця, народжанае ў дзявоцтве, ці сама кідаецца ў ваду, бо баіцца зняслаўлення сям'і, ганьбы, людскога прысуду. Ахвярамі ўласнай легкадумнасці становяцца дзяўчаты, якія паддаюцца на ўгаворы казакоў, матросаў, чужаземцаў, згаджаюцца на вандроўку і гінуць.

**Балады аб веры ў магію.** У навелістычных баладах адлюстравалася вера ў сілу чараў, магічнага ўздзеяння жанчыны на нявернага каханка. Гэтыя забабоны нагадваюць аб тых часах, калі любую жанчыну маглі палічыць за ведзьму. Праз цемрашальства загінула шмат ні ў чым не вінаватых, акрамя сваёй прыгажосці, жанчын у Заходняй Еўропе. Усходнеславянскія баладныя сюжэты сведчаць аб адсутнасці падобнай істэрыі ў беларусаў. Тэма «дзеўка чаруе хлопца» вырашаецца ў спакойным ключы. Калі «кінуў казак любіці», калі праз таварышаў перадае, каб яго не чакала, то легкадумнага каханка вяртаюць чары: «Яшчэ корэнь не ўскіпеў, // Як малойчык прыляцеў», пры гэтым ён не ўспрымае дадзеную падзею за трагедыю. У баладах не асуджаюць дзяўчыну, якая атручвае хлопца за

нявернае каханне. «Вот табе, сыночак, якая заплата: // Тры дошкі сасновы і цёмная хата», — толькі і здолелі сказаць бедныя бацькі.

**Асноўны тып баладнага персанажа ў навелістычных творах.** Гэта чалавек пад уладай сваіх страсцей, прагных жаданняў, моцных псіхалагічных імпульсаў. Ён не вядзе вечны бой з самім сабой, яго не мучаюць сумненні і дакоры сумлення. Прыхаваная да часу нянавісць з'яўляецца рысай характару маці, якая зжывае са свету нявестку. Братавая-здрадніца губіць гонар залвіцы, сястра топіць сястру ў моры, абстаўляючы правакацыю як няшчасны выпадак, жонка забівае нялюбага мужа, але ж і муж, лічачы жонку няўдаліцай, усялякімі жудаснымі спосабамі імкнецца пазбавіцца ад яе, сястра труціць брата па намове каханка. Акты жорсткасці рэдка калі караюцца, маральнае асуджэнне часцей за ўсё зыходзіць з вуснаў ахвяры і вельмі рэдка належыць фальклорнаму аўтару. Аднак самі за сябе гавораць сюжэты, дзе паказваецца, як у розных напрамках рвуцца кроўныя і вясельныя вузы.

**Навелістычныя балады аб трагічным разрыве кроўных сувязей.** Сваяцтва па крыві лічылася самым моцным і свяшчэнным, яно — апора сям'і ў жыццёвых нягодах, але чалавек забываецца на ўсё, калі ім пачынаюць кіраваць свавольства і распуста. Здараецца неверагоднае: маці прапівае дачку, муж — жонку, брат прадае сястру, бацька прайграе дачку ў карты, малодка кідае малых дзяцей і збягае з казакамі. Яшчэ больш жудаснымі з'яўляюцца ўчынкі персанажаў, скіраваныя супраць няродных: муж засек жонку нагайкай па намове маці, нявестка ўтапіла свякруху.

Сын, што без долі радзіўся, просіць маці прадаць каня і ажаніць яго, але маці шкада каня, і яна ахвяруе сынам: «Па беламу чорным піша: "Сына ў рэкруты аддаці"». Выпадак выключны, што асабліва бачна на фоне рэкруцкіх песень, дзе па рэкруце плача, як гаворыцца, уся яго радня. Відаць, і ў гэтай маці шчыміць сэрца, яна хоча даведацца пра сына ў ворана, той паведамляе ёй пра смерць адзінага сына ў чыстым полі, але ў песні не апісваецца рэакцыя жанчыны. Твор завяршаецца аўтарскай сентэнцыяй: «Ой, не дай, божа, смерці. // На чужом краю ўмерці. // Да некаму дазіраці // Салдацкае смерці».

**Навелістычныя балады аб драмах і трагедыях кахання.** Найвялікшым шчасцем лічыцца каханне, аднак балады канцэнтруюцца на сітуацыях, калі яно нясе пагібель. Закаханыя паміраюць адначасова, туга па мілым становіцца прычынай смерці дзяўчыны, хлопец гіне за дзяўчыну, а пакінутая дзяўчына памірае ад скрухі — усё гэта прыклады, калі трагічныя развязкі толькі падкрэсліваюць сілу пачуцця. А вось калі муж

губіць жонку па намове каханкі, то рухавіком дзеянняў абаіх з’яўляюцца атрутная пошасць, незадаволеная ганарыстасць і сябелюбства.

Паэтыка навелістычных балад адметная тым, што пакуты і смерць герояў служаць выкрыванню зла, несправядлівасці, дэспатызму і тых душэўных заганаў, якія штурхаюць чалавека на злачынства.

Вызначэнне класічных балад адбываецца паводле іх тэмы. Адпаведна пазнаецца «Гістарычная балада пра...», «Навелістычная балада пра...»

**Склад «новых» балад.** Адметная рыса «новых балад» — ярка выражаны сацыяльны канфлікт. Такія, напрыклад, балады пра пана Канеўскага і Бандароўну, пра князя Валконскага, яго жонку і яе каханка Ваньку-ключніка, пра халопа і панскую дачку. Другая рыса — новыя персанажы, якіх не было ў класічных баладах (напрыклад, салдат, герой, партызан, купец і пад.), і новы гістарычны фон.

Частка «новых» балад — крыху або значна фальклярызаваныя вершы вядомых паэтаў. У народнае асяроддзе яны траплялі часцей за ўсё з рэпертуару папулярных спявачак канца XIX — XX ст., цыганскіх хароў, вандроўных груп, а таксама дзякуючы фоназапісам.

Да «новых» балад даследчыкі адносяць наступныя творы.

1. Апрацаваныя народам балады літаратурнага паходжання. Асабліва папулярныя на тэрыторыі Беларусі «Хас-Булат» Амосава, «Траснік» Лермантава, «Пад вечар осенью ненаснай» Пушкіна і інш.

2. Балады, створаныя народнымі, невядомымі, малавядомымі, самадзейнымі аўтарамі згодна з літаратурным узорам. Даволі часта запісваліся творы «Каця-пастушка», «Скакаў казак чэраз даліну», «Как на кладбішчы Мітрафаньеўскім», «Этат случай саўсем быў нядаўна» і інш.

3. Літаратурныя песні баладнага тыпу.

Сярод «новых» балад пераважаюць рускія тэксты, крыху асімляваныя беларусамі. Частку твораў адносіць да «новых» балад можна толькі ўмоўна. Такая, напрыклад, песня «Па Дону гуляе казак маладой». Яна пра прадказанне цыганкі, якое спраўдзілася, хоць казак і заклікаў дзяўчыну не верыць ілжывым словам: дзяўчына сапраўды загінула ў дзень свайго вяселля. Беларусы чуйна рэагавалі на новыя баладныя творы, пабудаваныя на рэальных канфліктах, інакш не дайшла б да нашага часу балада сюжэтнага тыпу «мілая паміpae з тугі па мілым», але ліра-эпічнага характару. Герояў разводзяць не багацце і беднасць (яны не перашкода шчыраму каханню), а родныя хлопца, якіх не задавальняе матэрыяльнае становішча дзяўчыны. Сын мусіць падпарадкавацца, і толькі смерць любай штурхае яго да запозненага бунту, як у творы «Зайдзі, зайдзі, месяц ясны», запіса-

ным у 1986 г. у Жлобінскім раёне Гомельскай вобласці. Дадзеная балада адчула ўплыў лірычных твораў. Яна пачынаецца з маналогу лірычнай гераіні, але тэма «недабраная пара» далей вырашаецца ў апавядальным ключы з выкарыстаннем маналогу і дыялогу. Лексічныя дэталі «мілка», «радной папаша», «отчым» схіляюць да думкі, што дадзены тэкст належыць пазнейшаму за класічныя балады часу.

Да новых адносіцца песня пра разбойніка, які забіў свайго бацьку, не ведаючы, хто перад ім, хоць сюжэт вядомы з часоў Антычнасці. На тэрыторыі Беларусі шырока бытуюць новыя рускія балады «Ванька-ключнік» («У саду ягада-маліна пад прыкрыцієм расла»), «Ацец сыну не паверыў», «Ехалі салдаты са службы дамоў» і інш.

**Парада**
Апошнім часам усё больш у запісах студэнтаў сустракаюцца балады літаратурнага паходжання, беларускія апрацоўкі сюжэтаў вядомых рускіх балад. Распрацоўваецца жанр балады ў творчасці пісьменнікаў і спевакоў-бардаў. Калі вам сустрэнуцца балады такога кшталту, вызначце, у якой форме яны бытуюць: у вуснай, дзённікавай, пісьмовай ці інш., каб не прывесці запіс аўтарскага пісьменніцкага твора ў якасці фальклорнай адзінкі.

Для таго каб знайсці і зафіксаваць баладную песню, вам трэба ставіць пытанні так, каб актывізаваць менавіта баладную памяць выканаўцы, скіраваць яе ў бок сюжэтных песень з вострымі канфліктамі. Пэўную дапамогу вы атрымаеце ад апытальніка па тэме «Баладныя песні», але майце на ўвазе, што пытанні сфармуліраваны прыблізна. У жывой гутарцы іх мэтазгодна карэкціраваць, каб у іх чулася ваша зацікаўленасць і давер.

**Адрозненні балад ад лірычных песень з баладнымі матывамі**. Лірычныя песні ў адрозненне ад балад а) аднаэпізодныя; б) маюць, як правіла, адну сюжэтную сітуацыю; в) нягледзячы на «баладнасць», ім не ўласціва ярка выражаная кульмінацыя; г) развязка таксама адсутнічае. Напрыклад, паранены салдат просіць ворана ці свайго каня перадаць родным апошняе прывітанне, наказы, вестку аб смерці.

Трэба памятаць, што песні ўяўляюць сабой выказванне лірычнага героя аб падзеях, якія адбываліся з ім у мінулым. Напрыклад, вязень расказвае, за што ён трапіў за краты, колькі загубіў душ і г. д. Або лірычны герой думае, што з ім адбудзецца, што ён зробіць або мае намер зрабіць. Напрыклад, дзяўчына запэўнівае, што яна хоча з гора ўтапіцца і нават уваччу бачыць, як яна гэта робіць.

**Адрозненні баладных песень ад рамансаў.** Рамансы — творы пераважна любоўнай тэматыкі, сваім з’яўленнем на Беларусі яны абавязаны

ў першую чаргу ўплыву рускай песеннай культуры. Яны пачалі трапляць у беларускія гарады, мястэчкі, вёскі з XIX ст. праз песеннікі, грамафонныя пласцінкі, вусным шляхам і вельмі слаба паддаваліся лексічнай асіміляцыі. Іх папулярнасць тлумачыцца псіхалагічнымі і культурна-гістарычнымі прычынамі. Яны вабілі слухачоў і выканаўцаў прастатой формы, шчырасцю лірычнага героя ці гераіні, своеасаблівай жыццёвасцю прыватных падзей, меладраматызмам, сентыментальнасцю, напалам страсцей і пачуццяў, карацей кажучы, усім тым, што супрацьстаіць прозе жыцця і што было часткова ўласціва баладным песням. Як і балады, яны задавальнялі патрэбу чалавека ў незвычайным, звышардынарным, нават жудасным. Рамансы нібыта адчынялі дзверы зусім у іншы свет, не падобны на звыклы лад жыцця, былі экзотыкай, што заўсёды прыцягвае ўвагу.

Не трэба з пагардай ставіцца да выканаўцаў, якім падабаюцца рамансы, у тым ліку і жорсткія. Яны дасталіся ад старэйшага пакалення і ва ўмовах Беларусі набылі статус харавых песень, падпалі пад уплыў мясцовага меласу, але іх рускія карані бачны даволі ясна. Вось ад гэтых твораў і трэба адрозніваць балады. Перад намі не балада, а раманс, калі глыбокія любоўныя перажыванні герояў не маюць трагічнага канца. У некаторых выпадках рамансы настолькі падобныя да балад, асабліва калі ў наяўнасці трагічная развязка, што нават спецыялісты могуць памыліцца пры вызначэнні жанравай прыналежнасці твораў. Майце на ўвазе наступныя прыкметы дадзеных рамансаў: а) яны не маюць разгорнутага сюжэта, б) ім уласцівы лірызм, в) трагічны фінал часцей за ўсё ўяўны, а не сапраўдны.

## ? АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ БАЛАДНЫХ ПЕСЕНЬ

1. Ці спяваюць у вас доўгія, жаласныя песні? Дзе і калі іх чулі? Ці самі ведаеце іх? Якія? Ад каго навучыліся?

2. Ці ёсць у вашай вёсцы песні пра дачку, што ператварылася ў птушку і паляцела да маці, або пра жонку-птушку, маці-птушку? Пра маці, сястру, жонку, якія ў выглядзе птушак прыляцелі да забітага малойчыка? Пра свякруху, што закляла нявестку ў каліну (рабіну, быліну, явaрыну)? Пра малойчыка, зачараванага ў явар? Наогул пра розныя ператварэнні чалавека ў расліну, дрэва, рэчку, або пра маці, якая атруціла сына і нялюбую нявестку, і дрэвы, што выраслі на іх магілах?

3. Можа, вам даводзілася чуць песні пра тое, як мачаха адпраўляе падчарку Ганусю ў лес, каб яе з’елі ваўкі? Або пра ваўкоў — нянек дзі-

цяці, якога маці забыла на полі? Ці пра шэрага ваўчка, які ўсіх перамог у шлюбным спаборніцтве за царэўну?

4. Ці ведае хто-небудзь з вас песню пра труну, якая раптам загаварыла? Пра гора і ліхую долю? Пра Юр'я і цмока? Пра дзеўку і шатана?

5. Ёсць песні, дзе хлопец ці хто іншы загадвае дзяўчыне загадкі, а яна дае правільныя адказы: што гарыць без полымя, што расце без кораня і г. д. Ці ведаеце вы які-небудзь з іх?

6. Я ведаю, што ёсць вельмі падобныя адна да адной песні, дзе дзяўчыне або малодцы не дапамагае ніхто з радні, а толькі яе мілы. Напрыклад, маладзіца нясе дзіця ў прыполе, радня адмаўляецца ад яе, а мілы шкадуе. Або як ўдава ратуецца ад татараў і схіляецца толькі да мілага. Ці як турак толькі ад мілага прымае выкуп за дзяўчыну. Або пра дзяўчыну, якая патанае на моры і згодна падаць руку толькі міламу, пра дзяўчыну-ластаўку, якая толькі міламу давярае зняць яе «з камушка з бялога». І толькі мілы згодны дастаць для паненкі яе пярсцёнак з мора. Ці сустракаліся вам падобныя песні?

7. Ці вядомы вам песні пра жудасныя здарэнні ў сем'ях: муж забівае жонку па намове маці, сястра атручвае брата, жонка губіць нялюбага мужа, муж сплаўляе па рацэ жонку-няўдаліцу, нявестка ўтапіла свякруху, браты караюць сястру за яе паводзіны, брат забівае брата і г. д.?

8. Ці звярталі вы ўвагу на песні, дзе ёсць хітрасць або падман? Напрыклад, жонка прыкідваецца мёртвай, каб праверыць вернасць мужа, хлопец прыкідваецца мёртвым, каб завабіць дзяўчыну, якую пільна сцеражэ маці, хлопец выкрадае дзяўчыну, пераапрануўшыся ў дзявочае адзенне, і да т. п.?

9. Ёсць шэраг песень пра няшчасці з дзяўчынай. Напрыклад: дачка памірае, бо маці не аддае яе замуж за любага; даверлівую дзяўчыну звозяць матросы, казакі, хлопец-зводнік; яе прапівае маці або брат; яна топіць дзіця, народжанае ў дзявоцтве; яе пакідае мілы, і дзяўчына памірае з жалю... Ці ведаеце вы такія сумныя песні?

# 6. ДУХОЎНЫЯ ВЕРШЫ, КАНТЫ І ПСАЛЬМЫ

Духоўныя вершы (народная назва — песні старэцкія) — творы эпічнага і ліра-эпічнага характару на хрысціянскія матывы і сюжэты (выконваліся аднагалосна ў пазалітургічных абставінах). Запісаць іх можна ад хрысціян праваслаўнага веравызнання. Духоўныя вершы маюць наступныя тэматычныя разнавіднасці:

1) вершы пра Галубіную кнігу, дзе апавядаецца пра першапачаткі Сусвету, стварэнне зямной іерархічнай сістэмы і барацьбу Праўды і Крыўды, вынік якой прадвызначыў лёс усяго чалавецтва;
2) вершы на старазапаветныя і евангельскія тэмы;
3) вершы пра святых і велікамучанікаў;
4) вершы аб падзвіжніках і праведніках;
5) вершы пра Пятніцу;
6) вершы пра жабрацкую брацію;
7) стараверскія і сектанцкія вершы.

**Парада**
Духоўныя вершы — творы вялікіх памераў. Калі інфармант спыніцца, абавязкова запытайцеся, ці гэта канец твора, таму што ўвесь тэкст можа ім і не ўспомніцца. Большасць духоўных вершаў не мае падзелаў на пэўныя строфы, паколькі знаменны распеў характарызуецца манатоннасцю гучання, у сувязі з чым усе вядомыя тэксты, як правіла, падаюцца ў зборніках як суцэльныя астрафічныя творы.

***Канты*** (ад лац. *cantus* — ‘спевы’) — бытавыя свецкія вакальна-харавыя песні-гімны адметнай вакальна-паэтычнай стылістыкі. Гэтыя творы бытавой культуры займаюць прамежкавае становішча паміж прафесійным і народным мастацтвам.

***Псальмы —*** вусна-паэтычныя творы на хрысціянскія тэмы, запісаць якія вы зможаце ад паслядоўнікаў каталіцкага і пратэстанцкага веравызнання на рускай, польскай ці беларускай мовах.

Сярод кантаў і псальм знаходзяцца гімнічныя, славільныя, пакаянныя, эсхаталагічныя, апакаліптычныя, пахавальныя, філасофскія, сямейна-бытавыя, пастаральныя, застольныя, канты сацыяльнай скіраванасці, антыкаталіцкія, маральныя, панегірычныя, віватныя, жартоўныя, у тым ліку жывёльныя гратэскі, агрублена-непрыстойныя, калядныя, велікодныя і інш. Напрыклад, тыповым апакаліптычным творам можна

лічыць «О Божэ муй, Божэ, што робіцца в свэці», сіроцкім — «Ой, пушла сірытка матэра шукаты», памінальным — «Памінайця міня, брацця», перадвелікодным («страстным») — «Пресветлая Матер, прэ крэстом стаяла» і г. д.

**Увага!**
У народнай традыцыі замацаваліся каляндарныя канты-псальмы — калядныя і велікодныя.

*Псальмы-калядкі* вельмі паэтычныя. Іх асноўны змест — Нараджэнне Хрыстова і яго акалічнасці: зорка, што заззяла на небе, прыход трох вешчуноў (цароў, каралёў) з дарамі, пастухі, якія першымі засведчылі нараджэнне маленькага Хрыста, цар Ірад, які імкнецца даведацца пра дарогу да нованароджанага. Звычайна псальмы-калядкі суправаджалі хаджэнне з каляднай зоркай. Самымі папулярнымі былі псальмы-калядкі «А вчора з вечора», «Днесь звезда на востоке возсіяла», «Весела свету новіна», «Віде Бог, віде Створітель», «Нова радость стала», «Послушайте, что ся стало», «Народілся нам спасітель», «Хрісте з Девы ся раждает», «Велможно панно», «В Ерузаліма рано звонілі», «А ў Ярдані ціха вода стаяла», «Добры вечар усім вам», «Радуйся, Адама племя», «Бог ся раждае, хто ж то можа знаці» і інш.

Да Вадохрышча была прымеркавана псальма «На Іордані ціхая вода».

*«Васольныя» (велікодныя, вельканоцныя) псальмы* апавядалі пра ўкрыжаванне Хрыста (напрыклад, «На мрачнай гарэ, у паднож'я крэста») і яго ўваскрашэнне. Некаторыя выконваліся валачобнікамі падчас абходу двароў (часам з батлейкай).

Сярод *жартоўных кантаў* вылучаюцца «жывёльныя гратэскі» і агрублена-непрыстойныя. У іх, напрыклад, апавядаецца аб прыгодах птушак, насякомых, звяроў: пра вяселле камара і мухі і пагібель камара, пра пагібель мухі, пра чачотку, якая выдавала сваіх дачок замуж, пра сінічку за морам, пра птушыны баль, пра верабейку і яго жніво, пра саву на печцы, пра сойку, злоўленую бацькам, пра хваробу верабейкі, пра вайну грыбоў і інш.

Шэраг жартоўных сямейна-бытавых і эратычных кантаў зазнаў такую моцную фальклtechарызацыю, што па сваёй стылістыцы яны амаль не адрозніваюцца ад традыцыйных песень. Напрыклад, «Да задумаў верабей хуценька жаніціся», «Служыў я ў пана паўтара лета», «Як паслала мяне маць яравое жыта жаць» , «А на гары вецер вее», «Там пад вішнею» і інш.

*Лірніцкія канты і псальмы* — варыянты класічных псальмаў пра святога Юрыя, яго перамогу над праклятым цмокам і хрысціянізацыю краю, а таксама пра сіротку.

*Пахавальныя псальмы* можна запісаць, калі ведаць пачатковыя радкі («А ты маці прэсвятая», «Ах, Божа мой, Божа, з высокага неба», «Вой, Божа мой, пакравіцелю», «Душа, прачніся», «На прах взірая бездыханны» і інш.) і звярнуцца з адпаведным пытаннем да спявачкі. Звычайна вяскоўцы добра ведаюць людзей, якія здольны спяваць псальмы над нябожчыкам.

## АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ ДУХОЎНАЙ ПАЭЗІІ

1. Якія духоўныя вершы (старэцкія песні) вам вядомы? Якія персанажы ў іх удзельнічаюць: Праўда/Няпраўда (Крыўда), Багародзіца, Ягорый Пераможца, жабрацкая брація, Пятніца, Аляксей, чалавек Божы, ці інш.?

2. Ці чулі вы вершы пра Галубіную кнігу з апавяданнем пра першапачатак Сусвету, стварэнне зямной іерархічнай сістэмы, барацьбу Праўды і Няпраўды?

3. Ці ведаеце вы вершы пра падзвіжнікаў і праведнікаў (Хвёдара Церына; Аляксея, чалавека Божага; Алісахвія-царэвіча і інш.), святых і велікамучанікаў (Ягорыя Пераможцу, Мікіту — Хрыстова мучаніка, Барыса і Глеба, Зміцера Салунскага і інш.)?

4. Ці спяваюць у вас духоўныя вершы на старазапаветныя і евангельскія тэмы: пра Адама, Восіпа Прыгожага, Багародзіцу, Узнясенне Хрыстова, пакуты Хрыстовы, Лазара?

5. Ці ведаеце вы вершы пра Пятніцу, жабрацкую брацію? Пра якія з вершаў старавераў можаце расказаць?

6. Ці вядомы ў вашай мясцовасці псальмы? Пра што ў іх спяваецца?

## УЗОРЫ ЗАПІСУ ДУХОЎНАЙ ПАЭЗІІ

### Духоўны верш пра Галубіную кнігу «Як с-под Кіява, с-под Чарнігава…»

Як с-под Кіява, с-под Чарнігава,
Находзіла туча, туча цёмная,
Находзіла хмара, хмара грозная.
С тые хмары, хмары грозныя
Выпадала кніга Галубіная…
Пісав ету кнігу свет Асай-пророк,
Цытав ету кнігу Іван Быгослов,
Ён цытаў іе ровно трі года,
Процытав во кнігі толькі трі ліста…

**Псалом**
**«Ужаснися, человече…»**

Ужаснися, человече,
И слезися своим сердцем,
Что душею помрачился,
Потерял себя ты ныне
Во грехех своих.
Отложи свои забавы
И утехи сего мира,
Не отдайся в рабство вечно,
Не теряй своей свободы…

**Велікодная псальма**
**«Вялік святой нам дзень настаў»**

Велік святой нам дзень настаў,
Йсус знову з гроба вассіяў.
Хрыстос, Гасподзь, наш вечны свет.
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс!

**Велікодная псальма**
**«На Велікдзень, на первы дзень»**

На Велікдзень, на первы дзень
Маці сына парадзіла.
Хрыстос васкрос,
Хрыстос васкрос,
Хрыстос васкрос!

**Лірніцкая псальма**
**«Жылі-жылі людзі ды няверныя... »**

Жылі-жылі людзі ды няверныя,
Жылі-жылі людзі ды няверныя,
Ня верылі яны Госпаду Богу,
Толькі верілі пыганыму цмоку.
Пыганыму цмоку ўсяго многа нада,
Што ў Бога дзень — еў пы чалавеку,
Нядзеля ў нядзелю — пы малым дзіцятку.
А ў нашага цара мала людзей стала,
Прыішла чыріда ды сымаго царя:
Хуць сам выхадзі, хуць жану вывадзі...
Сымаму пайсці — царства лішыцца,
А жану аддаць — дзяцей сіраціць,
Прыходзіцца царю цареўну аддаць...

# 7. ПАЗААБРАДАВАЯ ЛІРЫКА

У навуковай літаратуры існуе праблема класіфікацыі пазаабрадавай лірыкі. І гэта зразумела: у жанравым плане фальклор вельмі багаты; прапанаваць ідэальную класіфікацыю, у якую б укладваліся абсалютна ўсе творы, складана. У сувязі з гэтым мы паспрабавалі ўлічыць усе вядомыя падыходы да класіфікацыі пазаабрадавай паэзіі і прапануем вам наступны варыянт.

**Бытавыя песні.** У складзе бытавых песень вылучаюцца наступныя разнавіднасці твораў, звязаных з пазаабрадавай сферай жыцця чалавека: любоўныя, элегічныя, сямейныя, сіроцкія, удовіны, прымацкія.

> **Увага!**
> У зводзе беларускага фальклору (БНТ: Беларуская народная творчасць) названыя разнавіднасці песень пададзены крыху інакш: асобнымі тамамі прадстаўлены любоўныя і сямейна-бытавыя песні. Да апошніх аднесены ўласна сямейныя, сіроцкія, удовіны творы. У плане класіфікацыі гэта тыя ж творы, якія мы прапануем пад агульнай назвай «Бытавыя песні». Прымацкія песні ў зводзе змешчаны ў томе «Сацыяльна-бытавыя песні».

Кожная з тэматычных разнавіднасцей песень мае свае характарыстыкі, таму іх можна лёгка распазнаць і правільна вызначыць.

*Любоўныя песні (ці песні пра каханне)* прысвечаны тэме кахання — шчаслівага, нешчаслівага, ідэальнага і г. д. У цэнтры твораў — лірычны герой (дзяўчына ці хлопец), яго эмацыянальна афарбаваныя роздумы, пачуцці і перажыванні. Формай іх перадачы, як правіла, з’яўляюцца маналагічныя споведзі-прызнанні, споведзі-скаргі, дыялогі. Важная роля ў перадачы псіхалагічнай карціны любоўнага перажывання належыць пейзажным замалёўкам.

> **Увага!**
> Часта ў якасці аб’екта кахання дзяўчыны выступае хлопец-*казачэнька*. У традыцыйнай лірыцы гэта тыповы вобраз маладога нежанатага хлопца, а не ўказанне на сацыяльную прыкмету: казакі як асобная група з’яўляюцца цэнтральнымі вобразамі-персанажамі ў *сацыяльных казацкіх песнях*. Каб не заблытацца ў вызначэнні віду песні, уважліва прачытайце тэкст твора, вызначце яго тэму і калізію. Калі твор пра дзяўчыну і хлопца-казачэньку — перад вамі тыповая любоўная песня.

*Элегічныя песні* (паводле класіфікацыі В. Гусева) падобны на песні пра каханне, таму што вызначаюцца такім жа лірызмам, перадачай пачуццяў

і настрояў. Іх адрозненне — у вобразнай сістэме твора: у элегічных песнях суб’ект перажывання (хлопец, дзяўчына) не прадстаўлены, акцэнт робіцца на апісанні прыроды (пейзажныя малюнкі), радзей — на інтэр’ер хаты. У іх перадаецца агульны характар перажывання.

*Сямейныя песні* распрацоўваюць тэмы сямейнага дэспатызму і жаночай долі. Асноўныя матывы — сум па роднай хаце і бацьках (праз успаміны і звароты да братоў і родных), скаргі, слёзы і праклёны прыгнечанай нявесткі, папрокі зяцю ад цешчы і г. д. Сустракаюцца, хоць і рэдка, песні, дзе гаворыцца аб добрым і чулым свёкры. Асобную групу складаюць песні-аповеды пра ўзаемаадносіны жонкі і мужа, жыццё з нялюбым (нялюбай) ці старым мужам, нявернасць мужа (радзей — жонкі) і г. д. Названыя творы ў большасці сваёй спяваліся жанчынамі.

*Сіроцкія і ўдовіны песні* прысвечаны тэме няшчаснага, складанага лёсу дзяцей і ўдавы пасля страты бацькоў і мужа. Для іх характэрны матывы скаргаў на долю, слёз, пакут у перадачы шчымлівага болю, звароты да памерлых, долі, Бога (напрыклад, Гасподзь Бог навучае сірату, як і дзе знайсці сваю маму, і г. д.). Форма арганізацыі твора, як правіла, аповедна-дыялагічная.

*Прымацкія песні* з’яўляюцца люстраным адбіткам сямейных жаночых песень, з той толькі розніцай, што ў іх жаліцца на свой лёс прымак, які жыве ў хаце жонкі. Часам сярод прымацкіх песень сустракаюцца творы жартоўна-гумарыстычныя.

**Сацыяльныя песні.** Сацыяльныя песні падзяляюцца на рэкруцкія, салдацкія, казацкія, антыпрыгонніцкія, батрацкія, бурлацкія, чумацкія, турэмныя. Іх вызначальная рыса — мастацкая прэзентацыя сацыяльнай прыналежнасці герояў і таго асяроддзя, у якім яны дзейнічаюць.

На сённяшні дзень наўрад ці ўдасца запісаць шмат антыпрыгонніцкіх (пра панскі прыгнёт і несправядлівыя адносіны да селяніна), батрацкіх і бурлацкіх (пра цяжкую вымушаную працу ў наймальніка), рэкруцкіх (пра сялянскіх хлопцаў, якіх забіралі ад родных сем’яў амаль у пажыццёвае рэкруцтва — службу ў імператарскай арміі), салдацкіх (пра парадкі і складанасці вайсковай службы і г. д.) і чумацкіх (пра людзей, якія займаліся рознымі заробкамі, у асноўным перавозкай солі і рыбы) песень. Фактычна названыя жанры ўтвараюць класічны, але малапрадуктыўны ў плане функцыянавання фонд сацыяльных песень. Магчыма, вам удасца зафіксаваць *казацкія песні*, дзе гаворыцца пра адыход казака на службу і на вайну, развітанне казака з жонкай, маці, нявестай, казацкі паход, смерць казака на полі бою, вяртанне дадому і г. д.

**Даведка**
Казацтва — сацыяльная праслойка рускага і ўкраінскага народаў. У XVI—XVII стст. беларускія сяляне і бедныя жыхары гарадоў разам з казакамі і паўсталымі сялянамі Украіны вялі барацьбу супраць феадалаў Рэчы Паспалітай і шляхты. Многія беларускія сяляне збягалі ад прыгонніцтва «на ніз», ва Украіну, і ўступалі ў атрады запарожскіх казакоў. Былі і іншыя казакі — вольныя дробныя зямельныя ўладальнікі, якія збеглі ў XVI ст. з Маскоўскай дзяржавы ў Літву і аселі ў Полацку, на Смаленшчыне і Чарнігаўшчыне. Названыя гістарычныя падзеі знайшлі адлюстраванне ў беларускіх казацкіх песнях.

Посттрадыцыйныя сацыяльныя песні складаюцца з салдацкіх (аб службе ў арміі нашага часу), турэмных і «блатных» (аб жыцці і парадках у спецыялізаваных установах для тых, хто парушыў закон), фанацкіх (песні фанатаў спартыўных клубаў, папулярных артыстаў і г. д.), студэнцкіх песень (аб вучобе, быце і адпачынку ў студэнцкім асяроддзі).

**Парада**
Названыя творы ў мастацкім плане разнаякасныя. Іх прыкметай з'яўляецца выкарыстанне спецыфічнай лексікі (жарганізмаў, арго, вульгарызмаў), увага да сферы інтарэсаў адпаведных субгруп насельніцтва. Па магчымасці фіксуйце найбольш яркія, выразныя, эстэтычна вартыя творы, якія карыстаюцца папулярнасцю ў пэўным асяроддзі. Памятайце, што вы збіраеце мастацкія творы, па якіх наступныя пакаленні будуць меркаваць аб узроўні і вартасцях нашай культуры. Неэстэтычныя, нізкаякасныя і проста брудныя па змесце творы лепш не запісвайце.

**Жартоўныя песні.** Асноўнымі тэмамі жартоўных песень з'яўляюцца сямейна-бытавыя адносіны, узаемныя насмешкі дзяўчат і хлопцаў, кума і кумы, жартоўныя спрэчкі жонкі і мужа, дзеда і бабы, зяця і цешчы, камічныя супярэчнасці ў сям'і, недарэчныя ўчынкі, алагічныя сітуацыі, небыліцы пра жывёл і птушак, неверагодныя гісторыі і інш. Сустракаюцца жартоўныя творы эратычнага зместу.

**Увага!**
Пры запісе жартоўных песень побач з вызначаным відам указвайце тэматычную разнавіднасць песні, напрыклад: жартоўная песня пра хлапечыя заляцанні, пра лянівую жонку, пра насякомых і г. д.

**Прыпеўкі.** Прыпеўкі — самы прадуктыўны песенны жанр. Іх вызначальныя паэтычныя рысы — лаканічная чатырохрадковая форма, наяўнасць рыфмы і харэічнага метру, здольнасць хутка, дасціпна і з гумарам адгукацца на любыя змены ў грамадстве, побыце і прыватным жыцці чалавека.

**Парада**

Пры запісе прыпевак звяртайце ўвагу на якасць гумару і паэтычнай вобразнасці, на мастацкасць твора. Пры вызначэнні віду ўказвайце не толькі «прыпеўка», але і яе тэматычную разнавіднасць, напрыклад, «прыпеўка пра каханне хлопца да дзяўчыны», «прыпеўка пра мужа-п'яніцу», «палітычная прыпеўка» і інш.

## АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ ПАЗААБРАДАВАЙ ПАЭЗІІ

1. Дзе і калі спяваюцца песні пра каханне і сямейнае жыццё («за кудзеляй», «на бяседзе» і г. д.)? Якія матывы распрацоўваюцца ў такіх песнях: няшчаснага (шчаслівага) кахання (шлюбу), вымушанага расстання, жыцця з нялюбым (нялюбай), прыгнёту ў сям'і мужа і г. д.?
2. Ці ведаеце вы песні пра горкую долю ўдавы, беднай сястры, сіраты, прымака?
3. Ці захаваліся ў вёсцы песні пра казакоў, бурлакоў, батракоў, чумакоў, паноў?
4. Ці спяваюць зараз песні пра службу ў войску (казацкія, рэкруцкія, салдацкія)?
5. Дзе часцей за ўсё можна пачуць жартоўныя песні?
6. Ці ведаеце вы песні з загадкамі?
7. Ці вядомы вам спецыяльныя песні і прыпеўкі да танцаў?

## УЗОРЫ ЗАПІСУ ПАЗААБРАДАВАЙ ПАЭЗІІ

**Любоўная песня**
**«Ой, рэчанька, рэчанька…»**

— Ой, рэчанька, рэчанька,
Чаму ж ты не поўная?

Ай, люлі, люлі, люлі, люлі,
Чаму ж ты не поўная?

Чаму ж ты не поўная,
З беражком не роўная?

Ай, люлі, люлі, люлі, люлі,
З беражком не роўная?

— А як жа мне поўнай быць,
Ясь млоды каня паіць.

Ай, люлі, люлі, люлі, люлі,
Ясь млоды каня паіць.

Ясь млоды каня паіць,
Кася воду чэрпаіць.

Ай, люлі, люлі, люлі, люлі,
Кася воду чэрпаіць.

— Ах, Ясенька, Ясенька,
Чаму ж ты не жэнішся?

Ай, люлі, люлі, люлі, люлі,
Чаму ж ты не жэнішся?

Чаму ж ты не жэнішся,
На каго надзеішся?

Ай, люлі, люлі, люлі, люлі,
На каго надзеішся?

— Ой, рэчанька, рэчанька,
Чаму ж ты не поўная?

Ай, люлі, люлі, люлі, люлі,
Чаму ж ты не поўная?

**Элегічная песня**
**«Стаіць гара высокая…»**

Стаіць гара высокая,
А над гарою гай,
Зялёны гай, красівенькай,
Не йначай праўда рай.

Прыпеў:
Зялёны гай, красівенькай,
Не йначай праўда рай.

А ў том гаю цячэ рэчка,
Як шкло вада блішчыць.
Далінаю шырокаю
Куды яна бяжыць?

Прыпеў:
Далінаю шырокаю
Куды яна бяжыць?

Бяжыць яна край берага,
Дзе вяжуцца галіны.
Схіліліся тры дзераўца
Тай журацца яны.

Прыпеў:
Схіліліся тры дзераўца
Тай журацца яны.

Пройдзець вясна, за ім лецейка,
Наступяць халада.
Асыпяцца з іх лісцейка,
Да й панясе вада.

Прыпеў:
Асыпяцца з іх лісцейка,
Да й панясе вада.

Асыпецца з іх лісцейка,
Да й панясе вада.
А маладосць не вернецца,
Не вернуцца гада.

Прыпеў:
А маладосць не вернецца,
Не вернуцца гада.

**Сямейная песня пра родную хату «Каліна-маліна, не стой над вадою…»**

Каліна-маліна, не стой над вадою
Да не раўнуйся са мною.
Было табе тады раўнавацца,
Як я ў роднай мамкі жыла:
Бялей твайго цвету цвіла,
Чырваней ягодак была.
Як стала ў свёкаркі жыць —
Стала жоўта, як ліпінька,
Стала тонка, як былінка.

**Сямейная песня аб добрым свёкры «Чый свёкар благі…»**

Чый свёкар благі,
А мой свёкар добры,
Ён мяне не судзіць,
Раненька не будзіць,
Ён сам устаніць,
А мяне накрываіць:
— Спі, спі, нявехначка,
Спі, маё дзіцятка,
Тваё дзіця мала,
Ночкі не даспала,
Усю ночку сядзела,
Свечачка гарэла.

**Сіроцкая песня «Ой, на гары, ой, на крутой…»**

Ой, на гары, ой, на крутой,
Хадзілі-варкавалі пара галубоў,
Адкуль ні вазьміся ахотнік прыйшоў,
Разбіў, разлучыў пару галубоў.
Галубка забіў, галубку злавіў,
Узяў пад полу, прынёс дадому.
Прынёс дадому, дый кінуў да долу.
Наліў ёй з крыніцы студзёнай вадзіцы,
Поўна карытца насыпаў пшаніцы.
Галубка не есць, галубка не п’е,
На тую круту гору ўсё плакаць ідзе…

**Удовіна песня «Кувала зязюля…»**

Кувала зязюля,
Цераз сад летучы,
Плакала сіротка,
На службу ідучы.
— Не кувай, зязюля,
Цераз сад летучы,
Не плач ты, сіротка,
На службу ідучы.
Маеш ручкі, ножкі,
Светленькія вочкі —
Будзеш ты рабіці
Да цямненькай ночкі…

**Прымацкая песня**
**«Як паехаў наш прымак у поле араці…»**

Як паехаў наш прымак у поле араці,
Ой, забыўся ж наш прымак хлеба, солі ўзяці.
Гарэ прымак, гарэ прымак з гары ў даліну,
Яго жонка гаварыла: «Я цябе пакіну!»
Аж прыходзіць яго жонка на другі дзень рана,
Настукала, нагрукала: наараў прымак мала.
А ён кажа: «Не дзівіся, дзе саха арала,
А дзівіся, мая міла, дзе скрыпачка грала.
Скрыпачка з ліпанькі, а струны із руты,
Як зайграе — сэрца вяне, па Украіне чуці».
Прыехаў прымак з поля і не ўспеў сесці,
Яго цешча загадала: «Нясі свінням есці!»
— Бадай, свінні паздыхалі, а хата згарэла,
Як мне гэта прымацкае жыццё надаела!

**Сацыяльная казацкая песня**
**«Ой, у полі там жанкі жнуць…»**

Ой, у полі там жанкі жнуць,
Ой, да пад гарою туман даліною,
Казакі йдуць.
Ой, даліною, ой, шырокаю
Казакі йдуць.
Папе-папераду Дарашэнька
Вядзе сваё войска, войска Запарожска

Харашэнька.
А па-, а пазаду Сагайдачны.
Памяняў ён жонку на табак і люльку,
Да й няўдачна.
Эй, даліною, эй, шырокаю,
Да няўдачна.
— А мне, а мне жонка —
не вадзіца,
А табак і люлька казаку ў дарозе
Прыгадзіцца.
Эй, даліною, эй, шырокаю,
Прыгадзіцца.

**Жартоўная песня-небыліца пра жывёл «А што ж гэта за чутка была…»**

А што ж гэта за чутка была,
Ды што курачка бычка радзіла.
Парасёначак яечка знёс,
А бязрукі яечка ўхапіў
Ды голаму за пазуху заклаў.
А бязногі іх пабег даганяць,
А сляпы на старожках стаяць,
А глухі стаў падслухваць,
А нямы закрычаў: каравул!

# 8. ЖОРСТКІ РАМАНС

Жорсткі раманс — гэта лірычна-драматычная песня аб падзеях, найчасцей звязаных з праблемамі любоўнага трохкутніка. Вырашэнне канфлікту ў ім меладраматычнае: трагічная, часам недарэчная смерць гераіні (героя). Жорсткі раманс з'яўляецца адной з форм раманса як музычна-паэтычнага твора.

Паводле свайго сюжэту і тэматыкі жорсткі раманс падобны на баладныя песні пра нешчаслівае каханне, драматычныя ці трагічныя выпадкі ва ўзаемаадносінах паміж дзяўчынай і хлопцам. Асноўнае адрозненне жорсткага раманса ад балады заключаецца ў тым, што ў ім узноўлена псіхалогія маргінальнага асяроддзя, свет сучасных каштоўнасцей, а невырашальны характар канфлікту абумоўлены дэградацыяй маральнага стану грамадства.

У большасці і лексічна, і вобразна-інтанацыйна жорсткія рамансы суадносяцца з «новымі» баладамі — рускімі жорсткімі рамансамі («Маруся отравилась», «Как на кладбище Митрофаньевском», «Кирпичики»). Ім уласцівы таксама займальны змест, драматызм падзей, вастрыня інтымнай праблематыкі: каханне і рэўнасць, каханне і здрада, каханне і паклёп, каханне і трагічная смерць. Але заўсёды ў якасці першаасновы тут выступае матыў кахання. Без яго няма сюжэту, няма паўнацэннай мастацкай рэальнасці. Афектацыя, пэўная экзальтацыя ўчынкаў і пачуццяў герояў — характэрная якасць жорсткіх рамансаў.

**Даведка**
Гістарычна жорсткі раманс — набытак гарадской культуры, аднак у другой палове XX ст. сфера яго бытавання пашырылася. На вёсцы, ды і ў горадзе пры запісе ад інфарманта назвы «жорсткі раманс» можна і не пачуць: і балады, і жорсткі раманс яны могуць назваць як «жаласныя песні» пра некага (нешта). Таму правільнае вызначэнне віду твора будзе залежаць ужо ад вашых ведаў.

**Увага!**
Для таго каб правільна вызначыць жанр, трэба арыентавацца на ключавыя рысы жорсткага раманса: 1) невырашальны характар канфлікту звязаны з матывам кахання і абумоўлены дэградацыяй маральнага стану грамадства; 2) найчасцей сюжэтная формула твораў гэтага жанру — «он ее любил, он ее и убил», хоць канцоўкай можа быць падман і растанне; 3) узнаўленне псіхалогіі маргінальнага асяроддзя, свету сучасных каштоўнасцей.

Нагадаем таксама, што жорсткія рамансы функцыянуюць у жывой маўленчай практыцы пераважна на рускай мове або на трасянцы.

**Парада**
Больш падрабязную інфармацыю пра жорсткія рамансы вы можаце атрымаць, пазнаёміўшыся з даведачнымі выданнямі і спецыяльнымі даследаваннямі [Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.]. Мінск, 2005—2006. 2 т. ; Восточнославянский фольклор: словарь научной и народной терминологии / редкол. : К. П. Кабашников (отв. ред.) [и др.]. Минск, 1993].

## АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ ЖОРСТКІХ РАМАНСАЎ

1. Ці вядомы ў вас «жаласныя» песні (пра забойства, атручванне, дачку-птушку, братоў-разбойнікаў, спрэчку каня з арлом, ваўкоў-нянек, заклятае вяселле, смерць, гора, долю, Бандароўну, мужа Дуная, дзяўчынуціхоню і г. д.)?
2. Ці спяваюць жаласныя песні мужчыны? Як яны да іх ставяцца?
3. Ад каго вы пачулі жаласныя песні: ад бабулі, маці, сябровак?

## УЗОРЫ ЗАПІСУ ЖОРСТКІХ РАМАНСАЎ

### Жорсткі раманс «Кагда я мела лет 17…»

Кагда я мела лет 17,
Я не любіла нікаво.
А кагда стала 19,
Я палюбіла аднаво.
Ужасна я ево любіла,
Но й страсна он меня любіл.
Мы ажыдалі ў жызні шчасця
І ў брак законны паступіць.
Но маць ево не захацела
Нашага шчасця савершыць
І сыну строга прыказала,
Мяне, няшчасную, забыць.
Но сын не вынес той печалі,
В пасцелю лёг і болен стал,
І перад самаю канчынай
Он маць пазвал і ей сказал:
«Мама, мяне благаславіце
І з тэй, каторую люблю.
І наша шчасце савершыце,
Быць можэт, я йшчо пажыву».
Мама пазволіла, но позна,
Кагда канчыне прыйшоў час.
І он назвал её на імя,
І сам навек закрыл глаза.
Вот была чудная пагода,
Кагда друзья на кладбішча няслі,
І сквозь валністыя туманы
Всё прабіралася ана.
І кагда ўвідзела магілу,
На камень бросілась ана
І горка-горка плакаць стала,
І богу душу аддала.
— Не знал, не знал,
Што крэпка любіш,
Не знал, што ты будзеш мая.
Цяпер абое мы ў магіле,
Радная мама, чэраз цебя.

# 9. ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР

Дзіцячы фальклор аб'ядноўвае даволі вялікую групу твораў. Трэба памятаць, што тэксты дзіцячага фальклору складаюцца як дарослымі (калыханкі, забаўлянкі), так і дзецьмі (песні-заклічкі, песні-небыліцы, дакучныя песні, дражнілкі, лічылкі, слоўныя прыгаворы, анекдоты, «страшылкі»). Таму відавочна, што запісваць дзіцячы фальклор можна і ад дарослых, якія, па-першае, лепш ведаюць творы некаторых відаў і жанраў (калыханкі, забаўлянкі), па-другое, самі калісьці былі дзецьмі, таму таксама могуць узгадаць і лічылкі, і дражнілкі, і дзіцячыя песенькі.

**Парада**

Запісваючы фальклор ад дзяцей, вы павінны быць вельмі назіральнымі і чулымі да выканаўцаў. Перш за ўсё трэба заваяваць іх давер, высветліць, хто больш ведае гульняў і песень. Пажадана са слоў дзяцей запісаць умовы гульні, яе ход з дакладным драматычным тэкстам-«сцэнарыем», а потым папрасіць правесці гэтую гульню, суаднесці з запісаным расказам, удакладніць, адзначыць імправізатарскія моманты.

## АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ ДЗІЦЯЧАГА ФАЛЬКЛОРУ

1. Якія творы ў вашай мясцовасці дарослыя выконваюць выключна для дзяцей (калыханкі, уцешкі, забаўкі і інш.)?
2. Ці спяваюць цяпер дзецям калыханкі? Якія?
3. Ці ўмеюць спяваць калыханкі падлеткі, маладыя маці?
4. Як весяляць дзяцей малодшага ўзросту (аднаго, двух гадоў)? Якімі гульнямі і дзеяннямі суправаджаецца выкананне забаўлянак?
5. Ці ведаюць дзеці ў вашай мясцовасці калядкі, вяснянкі, іншыя абрадавыя песні?
6. Хто выконваў песні-небыліцы? Каму яны прызначаліся?
7. Які ўзроставы рэпертуар гульняў у дзяцей 7—10, 11—14 гадоў? Хто ўдзельнічае ў гульнях? Ці існуюць гульні толькі для дзяўчынак ці толькі для хлопчыкаў?
8. Якія гульні суправаджаюцца выкананнем песень, разыгрываннем роляў?
9. Якія лічылкі ведаюць дзеці? Калі яны выконваюцца?
10. Якія існуюць песенькі-заклічкі? Каму яны адрасаваны?

11. Якія дражнілкі існуюць у вашай мясцовасці? Чым тлумачыцца паходжанне тых ці іншых дражнілак?

12. Ці захаваліся ў вашай мясцовасці жартоўныя песні, галоўнымі персанажамі якіх з'яўляюцца жывёлы, птушкі, насякомыя?

13. Якія «страшныя гісторыі» («страшылкі») расказваюць дзеці? Як гэтыя гісторыі называюць у вашай мясцовасці?

## УЗОРЫ ЗАПІСУ ДЗІЦЯЧАГА ФАЛЬКЛОРУ

**Калыханка**
**«Апсік, апсік, каточак…»**

Апсік, апсік, каточак,
Злавіў рыбку за хвасточак.
Ці самому есці,
Ці дзіцятку несці?
Еж ты рыбку сам, каток,
Ідзі з хаты за парог.
Не мяшай дзіцяці спаць,
А мне Натку калыхаць.

**Забаўлянка**
**«Ішлі козы рагатыя, багатыя…»**

Ішлі козы рагатыя, багатыя:
— Каго пападу, таго забаду!
Аксютку папалі,
Аксютку забадалі:
Будык — будык — будык!

**Дзіцячая песня-небыліца**
**«Раба курачка бычка прывяла…»**

Раба курачка бычка прывяла,
Парасёначак яечак нанёс,
А бязрукі яечкі пабраў,
Да іх голаму за пазуху паклаў.

Сляпы прыгледзеўся,
Глухі прыслухаўся,
Нямы «каравул» закрычаў,
Бязногі бегам пабяжаў.

### Гульня «Слепа бабулечка»

Усе дзеці ходзяць па кругу. Выбіраецца слепа бабулечка. Ёй завязваюць вочы. Яна ходзіць у сярэдзіне круга. Усе пяюць:

Наша слепа бабулечка
Па вошчупу ходзіць,
Шукае каго-небудзь,
Хто яе асвабодзіць.
Бабулечка, хадзі бліжэй,
Усе цябе просяць.
Даткні каго, угадай, хто ён,
А мы асвабодзім.

Яна падыходзіць да каго-небудзь, датыкаецца, адгадвае, хто гэта. Калі адгадае, той становіцца слепай бабулечкай.

### Лічылка «Цыкаў, цыкаў…»

Цыкаў, цыкаў
Матацыкл.
Усе дарогі перацыкаў.
Ён паехаў у Ленінград
Выбіраць сабе нарад:
Красны, жоўты, галубой —
Выбірай сабе любой.

### Дзіцячая песня-заклічка «Ідзі, ідзі, дожджыку…»

Ідзі, ідзі, дожджыку,
Звару табе боршчыку,
Пастаўлю пад елкаю,
Накрыю талеркаю,
Сама пакаштую,
Цябе пачастую.

### Дражнілка «Іван-балван…»

Іван-балван,
На сасне дран,
На ліпінке луплен,
За тры грошы куплен.

### Дражнілка «Доктар Пенкін…»

Доктар Пенкін
Лечыць блох
З дзесяці
Да чатырох.
Доктар Пенкін
Лечыць дарам,
Мажа плечкі
Скіпідарам.

**Дзіцячая жартоўная песня**
**«У нас у нядзелю свадзьба будзе…»**

У нас у нядзелю свадзьба будзе,
Камар муху сватаць будзе,
У нас, у нас.

Прыляцелі стары мухі,
Узялі камара на рукі,
Прыляцелі.

Да панеслі ў даліну,
Прывязалі за травіну.
Стой, стой, стой!

Камар злосці напітаўся,
Ад травіны адарваўся.
Уцёк, уцёк, уцёк!

Паляцеў ён у лясочак,
Сеў на зялёненькі лісточак.
Сеў, сеў, сеў!

Захадзілася фура-бура,
Камарочка з дуба здула.
Упаў, упаў, упаў!

Упаў камар з высакосці,
Паламаў робры і косці.
Забіўся!

# 10. НАРОДНА-ДРАМАТЫЧНАЕ МАСТАЦТВА

Народна-драматычнае мастацтва ўключае наступныя віды:
1) драматургію фальклорна-этнаграфічных комплексаў;
2) драматургію хрысціннай і вясельнай абраднасцей;
3) драматургію моладзевых і дзіцячых гульняў;
4) тэатральна-драматызаваныя прадстаўленні ўсенародных гулянняў;
5) батлейку;
6) інтэрмедыі;
7) народную драму.

Сярод прадстаўленай класіфікацыі відаў на сённяшні дзень на вёсцы і ў горадзе рэальна зафіксаваць драматургію першых чатырох разнавіднасцей.

**Даведка**
Фальклорна-этнаграфічнымі комплексамі з'яўляюцца Каляды, комплекс Масленічнага тыдня, «Ваджэнне Куста», ваджэнне і пахаванне «стралы», Сёмушны тыдзень, Русальны тыдзень, Купалле.

**Парада**
Паколькі па каляндарнай абраднасці вам прапануецца фіксацыя матэрыялу ў раздзелах «Каляндарна-абрадавая паэзія» і «Каляндарна-святочная проза», а ў сямейнай абраднасці — у раздзелах «Паэзія сямейна-абрадавага комплексу» і «Сямейна-абрадавая проза», у дадзеным раздзеле вы можаце звярнуць увагу інфарманта на рытуальныя і сацыяльныя ролі выканаўцаў абрадаў, песень, танцаў, гульняў, карагодаў. Драматургія прадугледжвае пэўную тэатралізаванасць, прадстаўнічасць, таму ўсе асаблівасці паводзін, адзенне, абставіны правядзення пэўных прылюдных мерапрыемстваў і прадстаўленняў пажадана акуратна занатаваць. Уявіце, што па вашых запісах абрад ці гульня пасля будуць пастаўлены на сцэне. Толькі ад вас залежыць, ці будзе магчымым здзяйсненне такой пастаноўкі з боку дастатковасці матэрыялу. Памятайце, што кожная дэталь у вашых запісах — сапраўдная каштоўнасць.

# 11. СУЧАСНЫ ФАЛЬКЛОР: ГАРАДСКІ І ВЯСКОВЫ

Сучасным гарадскім фальклорам умоўна названа тая вобласць мастацкай творчасці, якая ў самых розных формах і відах існуе цяпер. На сённяшні дзень яна не абмяжоўваецца гарадской лакацыяй, а азначэнне «гарадскі», такім чынам, проціпастаўляецца папярэдняй вуснай вясковай традыцыі. Сучасны фальклор як сукупнасць традыцыйных, новых жанраў і маргінальных форм на сённяшні дзень бытуе як у вёсцы, так і ў горадзе і дэманструе пры гэтым непарыўнасць развіцця і зменлівасць характару. Гэта з'ява вельмі дынамічная, яна актыўна развіваецца і трансфармуецца, таму класіфікаваць яе можна толькі прыблізна.

Сучасны гарадскі фальклор, у адрозненне ад традыцыйнага, акрамя вуснай, знаходзіць рэалізацыю і праз пісьмовыя (шырэй — выяўленчыя) формы бытавання. У дачыненні да такіх форм навукоўцы часта выкарыстоўваюць тэрмін парафальклор.

Асяродкам функцыянавання асобных фальклорных жанраў і твораў становяцца малыя сацыяльныя групы (сям'я, студэнцкая група, працоўны калектыў, спартыўны клуб, турэмная камера, прыход вернікаў, дваравыя таварыствы («кампашкі») і пад.), што дае падставы гаварыць пра фальклор канкрэтнай сям'і, байкераў, студэнтаў, медыкаў, праграмістаў, геймераў і пад.

З канца XX ст. фальклор цесна звязаны з інфармацыйнымі тэхналогіямі, таму цяпер значна прасцей фіксаваць фальклорныя адзінкі, апрацоўваць сабраны матэрыял і даносіць яго да патэнцыяльнай аўдыторыі. Інтэрнэт стаў не толькі месцам і сродкам захоўвання/трансляцыі фальклорнага матэрыялу, але ў некаторых выпадках — самім фальклорам ці сродкам яго стварэння і існавання. З'явілася новае паняцце — інтэрнэт-фальклор. Часам у дачыненні да яго ў асяродку даследчыкаў-фалькларыстаў ужываюцца такія тэрміны, як сеціўны фальклор, віртуальны фальклор і інтэрнэтлор.

## 11.1. ВУСНЫЯ ФОРМЫ

Вусныя формы сучаснага фальклору ўключаюць: гарадскі абрадавы фальклор, гарадскую фальклорную прозу, малыя формы фальклору, гарадскую фальклорную паэзію, фальклор гарадскіх субкультур. Многае з названага ўжо разглядалася вышэй у раздзелах, прысвечаных традыцыйнаму фальклору. Тут мы спынімся на адметнасцях сучаснага фальклору.

**Гарадскі абрадавы фальклор.** Гарадскі абрадавы фальклор датычыцца грамадскага і хатняга быту, выяўленага найперш праз святочны каляндар. Акрамя таго, кожная асобная субкультура (напрыклад, студэнты, салдаты тэрміновай службы, турысты, праграмісты, крымінальнікі, касплэеры) фарміруе свой святочны каляндар, у які могуць быць уключаны як афіцыйныя святы (Новы год, Міжнародны жаночы дзень, Дзень абаронцы Айчыны), так і святы, характэрныя толькі для дадзенай субкультуры (апошні званок, выпускны, 1 Верасня, пэўныя абрады-пасвячэнні, карпаратывы і пад.). Апошнім часам у свеце назіраецца пэўнае размыццё нацыянальных культур, што не магло не адбіцца і на каляндарнай традыцыі. Так, многія беларусы сёння святкуюць Дзень святога Валянціна, Дзень святога Патрыка, Хэлоўін і інш.

Для хатняга (сямейнага) календара таксама характэрны сімбіёз разнастайных святаў і знамянальных дат, — дзяржаўных, рэлігійных, асабістых. Тут, акрамя ўжо пералічыных вышэй, варта назваць юбілеі, народзіны, хрысціны, вяселле, памінкі, провады на тэрміновую службу, гадавіны важных для канкрэтнай сям’і падзей і інш.

Жанравая прастора святочнага дыскурсу даволі разнастайная. Яна ўключае і традыцыйныя для святочнага застолля жанры (песні, віншаванні, тосты, пажаданні), і жанры з іншых сфер (плакаты, улёткі, лозунгі, рэкламныя ролікі, слоганы, гульні, конкурсы і пад.).

Каб запісаць сучасны абрадавы фальклор, а найперш абрадавы фальклор той ці іншай субкультуры, вам неабходна валодаць інфармацыяй пра свайго субяседніка: дзе працуе ці вучыцца, чым любіць займацца ў вольны час. І ўжо сыходзячы з яго адказаў, фармуляваць пытанні. Абавязкова зафіксуйце інфармацыю пра часавыя межы свята, з якой мэтай яно ладзіцца, месца правядзення і хто ў ім удзельнічае.

**Сучасная фальклорная проза.** Сучасная фальклорная проза характарызуецца разнастайнасцю форм. Аповеды пра выпадкі з жыцця, страшныя і смешныя гісторыі, сямейныя легенды, байкі пра знакамітых людзей, гісторыі пра снабачанні і незвычайнае, чуткі, плёткі — усё гэта складае значную частку маўленчай паўсядзённасці сучаснага чалавека. У жанравым плане сучасная фальклорная проза мала чым адрозніваецца ад традыцыйнай фальклорнай прозы. Праўда, варта адзначыць, што дамінуючую ролю тут ужо адыгрываюць жанры няказкавай прозы — легенды, міфы, былічкі, вусныя апавяданні-ўспаміны, анекдоты, жарты, чуткі і плёткі.

Варта памятаць, што змест вусных апавяданняў часта цесна звязаны з гістарычнымі падзеямі краіны ці краю. Таму для пачатку, улічваючы ўзрост субяседніка, месца яго жыхарства, месца працы і іншыя біяграфіч-

ныя факты, можна запытацца пра канкрэтныя падзеі (пра Першую сусветную вайну, польскую вайну, фінскую вайну, Айчынную вайну, рэвалюцыю, паўстанні і хваляванні (Слуцкае паўстанне 1920 г. і слуцкія хваляванні 1967 г., навасёлкаўскае, асташынскае, скідзельскае паўстанні, барысаўскі бунт, забастоўка нарачанскіх рыбакоў, салігорскіх шахцёраў і пад.), аварыю на ЧАЭС, стыхійныя бедствы (напрыклад, ураган 1997 г.), выбух на мінскім радыёзаводзе (1972 г.), трагедыя на Нямізе (1999 г.), выбух у мінскім метро (2011 г.), падзеі жніўня 2020 г. і пад.).

Чуткі — своеасаблівая народная версія гісторыі. Іх значэнне ўзрастае ў пераломны, нестабільны час. У гэтым сэнсе паказальным аказаўся 2020 год, багаты на разнастайныя крызісныя сітуацыі і — як вынік — на змяняючыя адна адну чуткі пра замоўчванне сапраўднай колькасці памерлых, пра таемна спаленых у крэматорыях людзей і інш. Чуткі — праз адсутнасць ці, наадварот, вялікую колькасць супярэчлівай інфармацыі — вельмі часта выступаюць пэўнай інструкцыяй да дзеянняў. Як прыклад — перыядычна праходзяць чуткі пра нейкія непаладкі на бліжэйшых ад мяжы з Беларуссю атамных станцыях, у выніку якіх насельніцтва актыўна пачынае закупацца прэпаратамі з ёдам.

**Фальклор субкультур.** Як ужо пісалася вышэй, у сучасным гарадскім фальклоры пераважае дыферэнцыяцыя па прыкмеце пэўнай агульнасці. Гэта можа быць узрост і месца вучобы ці часовага пражывання (маладзёжны, студэнцкі, школьны, армейскі, турэмны фальклор, фальклор бальнічнай палаты, фальклор дзіцячага лагера), прафесія (фальклор медыкаў, пажарных, праграмістаў, прадстаўнікоў крымінальнага свету (блатны фальклор), фізікаў, матэматыкаў і пад.), хобі (рыбацкі, паляўнічы, турысцкі, фанацкі фальклор, фальклор геймераў), светапогляду (маецца на ўвазе найперш фальклор рэлігійных аб'яднанняў: прыхрамавы фальклор, сектанцкі фальклор, фальклор неаязычнікаў, сатаністаў).

## ? АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ СУЧАСНАГА ФАЛЬКЛОРУ

1. Ці вядомы вам традыцыі святкавання сучасных свят і падзей (Дзень горада, вечары сустрэч, выпускныя вечары)? Што характэрна для іх правядзення?

2. Ці вядомы вам асаблівасці правядзення «пасвячальных» абрадаў (у салдат тэрміновай службы, турыстаў, пажарных, студэнтаў і г. д.)? Якія дзеянні і творы яго суправаджаюць?

3. Што характэрна для рэпертуару сучаснага сямейнага застолля?

4. Якія асаблівыя даты і падзеі адзначаюцца ў вашай сям'і? Як гэта адбываецца?

## Гарадскія былічкі

1. Ці вядомы вам былічкі, звязаныя з тымі ці іншымі «дрэннымі месцамі», напрыклад з палянамі ці пячорамі ў павер'ях турыстаў, альпіністаў і спелеолагаў; з падваламі і дахамі гарадскіх будынкаў у прымхлівых апавяданнях падлеткаў і г. д.?

2. Якія былічкі аб НЛА, касмічных прышэльцах, выкраданні імі людзей і іншых анамальных з'явах вы чулі?

3. Ці існуюць былічкі, якія апавядаюць аб сустрэчах з рознымі формамі мутацый (людзей, жывёл, раслін), якія ўзніклі ў выніку тэхнагенных катастроф (аварыі на ЧАЭС і пад.)?

## Вусныя апавяданні

(ці ***мемарат*** — аповед пра асабісты вопыт)

1. Аб якіх войнах, катастрофах ці іншых драматычных падзеях вы памятаеце ці чулі?

2. Што вы ведаеце пра сваіх продкаў? Як складваўся іх лёс?

## Гарадскія легенды

1. Ці бытуюць у вашым горадзе легенды аб боскім умяшанні (напрыклад, аб звышнатуральнай дапамозе, дзівосным выратаванні) ці аб прадвесці важных падзей (сны, бачанні, абнаўленні ікон, метэаралагічныя з'явы)?

2. Ці ведаеце вы сучасныя легенды, звязаныя з помнікамі, будынкамі, могілкамі ці раёнамі (мікрараёнамі) вашага населенага пункта?

**Увага!**
У гэтым кантэксце абавязкова фіксуйце неафіцыйныя назвы «мясцін памяці» і звязаныя з імі тапанімічныя легенды. Калі вы самі ведаеце такія назвы, то адразу можаце задаваць пытанні пра канкрэтныя гарадскія топасы, што пра іх ведае/чуў ваш суразмоўца. Гэта можа аблегчыць вашу працу.

## Чуткі, плёткі, байкі

Якія чуткі, плёткі, байкі ўвесь час узнаўляюцца ў вашым горадзе?

## Анекдоты

Якія анекдоты вы ведаеце?

## Малыя формы фальклору

1. Якія сучасныя прыказкі, прымаўкі ці выслоўі вам вядомы? Пры якіх абставінах яны гучаць?

2. Ці вядомы вам камічныя пераробкі прыказак і прымавак?

### Гарадская фальклорная паэзія

1. Якія тэксты гарадскіх рамансаў ці баладных песень вам вядомы? Аб чым у іх спяваецца?

2. Што характэрна для песеннага рэпертуару вашага горада (выкананне ваенных, палітычных, бытавых, парадыйных і іншых тэкстаў)?

3. Ці ведаеце вы пераробкі папулярных песень? Калі яны выконваюцца? Ці вядома вам гісторыя стварэння такіх перапрацаваных твораў?

### Крычалкі, выразы, прыгаворкі (застольныя, стадыённыя, палітычныя, дзіцячыя)

Ці можаце вы прывесці прыклады выразаў, крычалак, прыгаворак?

### Фальклор субкультур

1. Ці вядома вам спецыфіка маладзёжнага (студэнцкага, школьнага) фальклору?

2. Ці выконваюцца ў «вольным» жыцці творы армейскага фальклору (песні, павер'і, «маразмы» і інш.)? Пры якіх абставінах?

3. Якія творы блатнога фальклору вам вядомы? Ці часта вы да іх звяртаецеся?

4. Як ілюструецца ў фальклорных традыцыях прафесійных і аматарскіх супольнасцей (рабочых, турыстаў, медыкаў, парашутыстаў і г. д.) спецыфіка іх працоўнай дзейнасці?

5. Ці ёсць у вас спецыфічныя прыкметы ці рытуалы, звязаныя з дзейнасцю, перад пачаткам ці канцом працы (аперацыі, паходу)?

6. Ці ведаеце вы гісторыі з жыцця прыходу, пра паломніцтвы, руйнаванне храма, рэпрэсіі святароў і вернікаў, ураттаванне ікон і іншых святынь, пра мясцовых праведнікаў; творы, якія выконваюцца па-за богаслужэннем, сучасныя прароцтвы і пад.?

**Увага!**
Гэта тычыцца не толькі праваслаўнага асяродку, але і каталіцкага, пратэстанцкага, стараверскага, а таксама мусульманскага, іудзейскага і інш. У кантэксце рэлігійнага фальклору разглядаецца і фальклор разнастайных сект, рэлігійных рухаў і культаў (пяцідзясятнікаў, баптыстаў, вахабітаў, мармонаў, сведкаў Іеговы і пад.).

## УЗОРЫ ЗАПІСУ СУЧАСНАГА ФАЛЬКЛОРУ

### Легенда «О дьяволе»

Когда случилась давка на Немиге, среди людей был дьявол. Он собирает жизни людей раз в 65 лет.

**Анекдот**

Родственники собрались в доме покойного и с нетерпением ожидают, когда прочтут завещание. Наконец, юрист вскрывает конверт и читает: «Будучи в здравом уме и твердой памяти, все свои деньги я растратил…»

**Прыказкі-пераробкі**

Сколько волка ни корми, а он все ест и ест; на вкус и цвет фломастеров нет; кто рано ложатся, те поздно выходят замуж.

**Прымаўка-пераробка**

Видно птицу по помету; чем дальше влез, тем ближе вылез.

**«Новая» балада**
**«В одном городе жила парочка…»**

В одном городе жила парочка:
Муж был шофер, она — счэтовод.
И у них была дочка Аллочка,
Ей пошел уж двенадцатый год.

Началась война, мужа — в армию.
Он с вещами идет на вокзал.
И прощается с женой верною,
И такое ей слово сказал:

«Я иду на фронт биться с немцами
За страну и тибе зашчышчать.
А тибе прошу, будь ты верною,
Обещайся почашче писать».

Вот уж год прошел, и второй настал,
Надоело жане мужа ждать.
Стала модничать, носить шапочки,
С лейтенантами стала гулять.

Один раз она поздним вечэрам
Пошла друга свойго провожать.
Доч грустит, что ей делать нечэго,
И рэшыла письмо написать.

«Милый папочка! Пишет Аллочка.
Ты успомни, мине как любил,
И по улице ты возил миня
И гостинцы всегда приносил.

Милый папочка! Пишет Аллочка.
Стала мама тибе забывать.
С дядем Петею, с лейтенантиком
Каждый вечер уходит гулять.

Милый папочка! Пишет Аллочка.
А ешчо я забыла сказать:
Вчэра вечэрам приказала мать
Дядю Петю отцом называть».

Вот пришло письмо, получыл его,
Перестал он собой дорожить,
И в одном баи получыл он смерть
И сейчас у могиле лежить.

Ах вы, женшчыны, мужьям неверные!
Муж на фронте, а вы здесь — гулять…
Как прыдут ваши мужья с армии,
Что вы будете им отвечать?

Я кончаю петь, вы послушайте,
Что у песни печальный конец.
Мужа вы себе скоро сышчэте,
Но детям он не родный отец.

**Песня-пераробка**
**«Ты живешь в соседнем доме…»**

Ты живешь в соседнем доме
На четвертом этаже.
Мы с тобой давно знакомы,
Но не знаю я уже,
Ой, нужна ль нам эта дружба
Или вовсе не нужна.
Только знаешь, ты мне нужен.
Может, я тебе нужна?
Прыпеў:
Там-там, тампарам-пам, пам-пам,
Тампарам-там, там-там, тарарарам.

**Крычалка**
**«“Спартак”, не робей!»**

«Спартак», не робей!
По своим воротам бей!
Если в наши попадешь,
До медпункта не дойдешь!

**Крычалка**
**«Великая, могучая…»**

Великая, могучая,
Никем непобедимая,
Команда Новополоцка,
Ты самая любимая!

**Афарызмы**

Последним смеется тот, кто не врубился сразу; от знаний еще никто не умирал, но рисковать не стоит; жизнь — игра: продумано фигово, но графика обалденная; еще один день оказался напрасной тратой макияжа.

**Студэнцкая песня**
**«Иду по проспекту**
**в дырявых галошах…»**

Иду по проспекту в дырявых галошах,
Голодный, как волк, и усталый,
как лошадь.
Эйнштейн и Спиноза меня доконали.
Эх, как бы покушать картошки на сале.
Пальтишко мое на рыбьем меху,
Перчатки мои на змеином пуху.
Стипуху в общаге проели в три дня.
Ну кто же сегодня покормит меня?

**Армейская песня-**
**пераробка**
**«С чего начинается армия…»**

С чего начинается армия?
С рассказа сержанта в купе,
С последней родной остановки
И серых ворот КПП.
А может, она начинается
С повестки, которую ждал;
И парень с девчонкой
прощается,
Любуется ими вокзал…

**Маразм**

Всем заправить сапоги в штаны.

### Медыцынская байка

У одного мужчины появились боли в спине, он не мог ходить. Обнаружили грыжу в поясничном отделе позвоночника. Лечили его консервативно несколько месяцев, улучшений практически не было. Он был прикован к постели, при малейшем движении — страшные боли. Положили на вытяжение. Лежит он весь такой несчастный и больной в палате, вставать не может — боли ужасные. Приходит санитарка мыть пол. Санитарка была под хорошим градусом, машет шваброй из стороны в сторону, все у нее летит. И стукнула мужика ручкой от швабры по спине, по больному месту. Мужик аж взвился от боли, слетел с кровати, стал кричать на эту санитарку; вдруг сообразил, что у него ничего не болит, он стоять может. Он эту санитарку уже чуть не обнимает. Когда ему сделали снимок, оказалось, что грыжи нет. Санитарка ручкой швабры ударила ему по больному месту и вправила грыжу. Мужик выписался здоровым.

### Гісторыя з жыцця прыходу

Это было в 2009 году в Браславе. 22 августа, в день Найсвяцейшай панны Марыі, Валадаркі неба і зямлі, была коронация иконы Браславской Божьей Матери. Было много священников. Вёл службу архиепископ из Кёльна, было 100 священников, один даже из Австралии, много монахов, монахинь. Много было иностранцев, в Браслав приехали 20 тысяч человек, это при населении Браслава в 10 тысяч. Икону вынесли из храма, поставили на конструкцию, похожую на корабль. Много людей было во дворе костёла, и вдруг все стали оборачиваться. А вокруг солнца свет — радуга вокруг солнца, а на концах как крест. Это было как чудо.

### Рэлігійная (праваслаўная) песня

Придите все во Храм,
Христос дает милость вам.
Он одает всем благодать,
Чтоб грех нам побеждать.

Взгляни на Крест святой
С поникшею главой.
Так церковь нам велела чтить
И тем любовь излить.

Как грешницы уста,
Святые у Христа
Лобзали ноги, и Христос
Простил ее с небес.

Кто против церкви идет,
В погибель тот пойдет.
Он есть язычник и мытарь, —
Спаситель нам Сам сказал.

Брат, больше не греши,
Покайся, в Храм спеши.
Лишь ты услышишь Божий звон,
Что в сердце будет Он.

## 11.2. ПІСЬМОВЫЯ ФОРМЫ

Пісьмовыя формы сучаснага фальклору ўключаюць рукапісныя і друкаваныя песеннікі, альбомныя вершы, паэмы і апавяданні (турэмныя, дэмбельскія, школьныя, дзявоцкія), вершаваныя подпісы (да фотаздымкаў, паштовак, лістоў), графіці, «святыя лісты» і «лісты шчасця», аўдыя- і відэазапісы.

Многія жанры пісьмовага фальклору існуюць ужо не адно стагоддзе і развіваюцца па законах фальклорных твораў. Яны таксама маюць розныя варыянты, аднак тут змяніўся сам механізм перадачы інфармацыі. Калі ў вуснай традыцыі яна перадаецца ад выканаўцы слухачу, то ў пісьмовай — праз фіксаваны тэкст ад таго, хто гэты тэкст стварае, да таго, хто яго чытае.

Пісьмовы фальклор можна падзяліць на наступныя групы:

1. Абрадавы фальклор. Сюды можна аднесці сцэнарыі святочных урачыстасцяў. Аднак апошнім часам з'явілася вельмі шмат шаблоннай друкаванай і электроннай прадукцыі, што значна ўскладняе задачу збіральніка фальклору і ў пэўным сэнсе абясцэньвае падобны матэрыял.
2. Альбомны фальклор. Да гэтай групы адносяцца творы, якія захоўваюцца ў рукапісных альбомах, і самі альбомы як цэласная адзінка.
3. Эпісталярны фальклор. У гэтую групу ўваходзяць розныя жанры (эпісталы, подпісы да фотаздымкаў, віншаванні), якія сустракаюцца ў прыватнай перапісцы, а таксама «магічныя лісты».
4. Графіці. Гэтую групу складаюць надпісы на сценах, мэблі і інш.
5. У кантэксце пісьмовых форм сучаснага фальклору варта разглядаць і многія жанры інтэрнэт-фальклору (які нельга блытаць з фальклорам такіх груп, як праграмісты, геймеры і пад., дзе фальклорныя творы могуць існаваць як у вуснай форме, так і ў электроннай).

**Парада**
У вашым сямейным архіве абавязкова знойдуцца фотаздымкі з дарчымі подпісамі, старыя віншавальныя паштоўкі, магчыма, яшчэ захоўваюцца бацькоўскія ці нават вашы ўласныя рукапісныя альбомы (анкеты). Пачніце збіраць фальклор з вывучэння свайго сямейнага архіва.

**Альбомны фальклор.** Сучасны рукапісны альбом звычайна ўяўляе сабой школьны сшытак (48 ці 96 старонак) ці нататнік з песнямі, вершамі, цытатамі, малюнкамі, стыкерамі, уклейкамі розных выразак і фотаздымкаў. Фальклarysты разглядаюць яго як асаблівым чынам аформлены феномен рукапіснага пісьменства — шматжанравы зборнік тэкстаў, якія могуць суправаджацца малюнкамі. Дадзеныя тэксты выконваюць

шэраг функцый, звязаных з мастацкім самавыражэннем складальнікаў такіх альбомаў і іх сацыялізацыяй у сваім асяродку.

Даследчыкі падзяляюць альбомы на дзявочыя (уласна альбомы, песеннікі, анкеты, гадалкі) і мужчынскія (дэмбельскія альбомы, салдацкія блакноты, турэмныя альбомы і пад.).

**Эпісталярны фальклор.** Эпісталярныя (звязаныя з прыватнай перапіскай) формы пісьмовага фальклору прадстаўлены тэкстамі дзвюх груп: альбомнымі і неальбомнымі. Да першай адносяцца вершаваныя віншаванні, пажаданні, эпісталярныя клішэ і формулы (інакш — эпісталы) і вершаваныя подпісы да фотаздымкаў. Падобныя творы шырока прадстаўлены ў альбомнай традыцыі. Да другой групы адносяцца «магічныя лісты» («святыя лісты» і «лісты шчасця»).

*Эпістала* — традыцыйная нарыхтоўка, якая выкарыстоўваецца ў ліставанні. Часцей за ўсё — для афармлення пачатку і канца ліста. Часам сустракаюцца даволі вялікія ўрыўкі лістоў і нават цэлыя лісты, асабліва ў крымінальным асяродку.

«*Магічныя лісты*» — гэта лісты, якія рассылаюцца розным людзям для перапісвання і рассылкі ў пэўнай колькасці і быццам бы могуць уздзейнічаць на жыццё таго, хто спрыяў ці не спрыяў іх распаўсюджванню.

Даследчыкі размяжоўваюць «*святы ліст*» і «*ліст шчасця*». Першы звычайна аперыруе рэлігійнымі паняццямі і мае стабільную структуру:

1) малітоўны зачын;
2) аповед пра цудоўнае з’яўленне і сілу ліста (эпічная частка);
3) указанні па перапісванні і распаўсюджванні лістоў;
4) заключныя формулы.

«Лісты шчасця» звязаны са свецкай сімволікай. Мэтай тут з’яўляецца шчасце (багацце, поспех і пад.), а асноўны спосаб яго дасягнення — капіраванне і распаўсюджанне гэтага ліста. «Ліст шчасця» мае больш падрабязную эпічную частку і прадпісанні. Акрамя таго, могуць дадавацца адвольныя наборы знакаў, літар і лічбаў, якія быццам бы маюць магічную сілу. Часта фігуруюць гістарычныя і псеўдагістарычныя асобы.

**Увага!**
Пры перапісванні подпісаў да фотаздымкаў пажадана пазначаць пол дарыльшчыка і атрымальніка, а таксама год, калі быў зроблены надпіс (гэтая інфармацыя можа адсутнічаць на фотаздымку).
Пры перапісванні эпістал, віншаванняў і пажаданняў пазначайце крыніцу (ліст, віншавальная паштоўка, альбом, нататнік).
Пры фіксацыі «магічных лістоў» абавязкова ўдакладніце месца, час і абставіны атрымання ліста, а таксама асаблівасці яго выканання (знешні выгляд, папера, почырк перапісчыка). Зрабіце яго копію (фота ці скан).

**Графіці.** Традыцыйна графіці лічыцца праявай акта вандалізму і ацэньваецца як асацыяльная з'ява. Такое стаўленне, праўда, не распаўсюджваецца на старажытныя насценныя надпісы, якія сучасным грамадствам успрымаюцца як каштоўны артэфакт культуры і помнік гісторыі. Сёння навукоўцы часцей сталі звяртаць увагу на сучасныя насценныя надпісы і малюнкі. Вывучэннем графіці займаюцца як фалькларысты, так і лінгвісты, сацыёлагі, псіхолагі, антраполагі.

Графіці — даволі старажытная з'ява народнай культуры. Сёння гэта не толькі вулічныя насценныя надпісы, але і тэксты і выявы на сценах розных памяшканняў, на мэблі вучэбных устаноў, на старонках бібліятэчных кніг і г. д. Графіці могуць быць мастацка-выяўленчымі і тэкставымі. Апошнія і з'яўляюцца аб'ектам вывучэння філолагаў.

Існуе мноства класіфікацый графіці:

- па ступені іх даступнасці: latrinalia (надпісы ў грамадскіх прыбіральнях) і публічныя;
- па аўтарскім прынцыпе: графіці розных субкультур (студэнцкія, турэмныя, фанацкія, школьнікаў, вернікаў і г. д.);
- у залежнасці ад пола іх аўтараў: мужчынскія і жаночыя. Такое размежаванне часцей за ўсё магчыма зрабіць у адносінах да latrinalia;
- па тэматыцы: палітычныя, эратычныя, рэлігійныя, музычныя, гумарыстычныя і г. д.;
- па жанравай прыналежнасці: слоганы, загадкі, афарызмы, лімерыкі, дыялогі, папраўкі і дапісванні.

Даследаваць графіці немагчыма ў адрыве ад гістарычнага кантэксту. Таму падобныя матэрыялы абавязкова павінны суправаджацца падрабязнай інфармацыяй пра месца і час запісу.

Графіці — адзін з тых відаў народнай творчасці, які прадугледжвае самастойную фіксацыю (пажадана фота) і не патрабуе прысутнасці выканаўцы для яго запісу, бо заўсёды знаходзіцца ў адкрытым доступе. Аднак у сваіх інфармантаў вы можаце пацікавіцца, ці ведаюць яны месцы, дзе часцей з'яўляюцца падобныя надпісы; якія надпісы найбольш запомніліся; ці перапісвалі яны іх куды-небудзь. Калі ж ваш інфармант акажацца актыўным графіцістам, то неабходна распытаць пра тэхніку і спосабы нанясення графіці, пра слэнг, пра прычыны з'яўлення і сэнсе канкрэтных выяў.

**Інтэрнэт-фальклор.** Дзякуючы сучасным інфармацыйным тэхналогіям, фальклорныя тэксты таксама атрымалі здольнасць імгненна

распаўсюджвацца, ахопліваць шырокую аўдыторыю і змяняцца. Інтэрнэт стаў не толькі сродкам захавання і трансляцыі традыцыйнага фальклору, але і асяродкам існавання і распаўсюджвання яго асобных жанраў. Гаворка ідзе, канешне, пра інтэрнэт-жанры, ці інтэрнэт-фальклор. Асноўнымі асаблівасцямі такіх твораў з'яўляюцца гіпертэкстуальнасць, інтэрактыўнасць і візуальнасць. У інтэрнэт-прасторы атрымалі распаўсюджанне такія вядомыя жанры, як анекдот, віншаванне, разнастайныя пераробкі і пад. Набылі новыя рысы і формы знаёмыя жанры страшылак і нескладух — іх рысы мы можам знайсці ў крыпі-гісторыях, вершыках-піражках і вершыках-парашках (*рус. стишки-пирожки, стишки-порошки*).

Аднак найбольш папулярнымі з'яўляюцца мемы, фотажабы, дэматыватары і коміксы. Дадзеныя жанры ўяўляюць сабой пераважна спалучэнне пэўнай выявы з тэкставымі ўстаўкамі. Распаўсюджванне магчыма выключна ў інтэрнэце ці з дапамогай тэхнічных сродкаў (праз друк).

*Інтэрнэт-мем* — інфармацыйная адзінка інтэрнэт-камунікацыі, якая функцыянуе пераважна як спалучэнне выявы і тэксту, але не абмяжоўваецца толькі гэтай формай (рыс. 1). Акрамя «класічнай» формы мема-карцінкі з подпісам, сустракаюцца проста тэкставыя мемы, якія складаюцца са слова ці фразы («гонять во всю мощь», «хлопотное дельце»); мемы-карцінкі без подпісаў і відэамемы.




*Рыс. 1.* Мем «Наташа, ты спишь?»

Асноўныя характарыстыкі мемаў — лаканічнасць, інфармацыйнасць, універсальнасць (часта служыць асновай для больш складаных адзінак, такіх як дэматыватары, коміксы, фотажабы і інш.) і камічнасць. Важную ролю таксама адыгрывае магчымасць колькаснага крэатыўнага відазмянення і напаўнення мема новымі кантэкстамі (мем з катамі «Наташ, ты спишь?» і яго варыянты).

*Фотажаба* — графічная работа карыкатурнага характару, створаная шляхам мантажу з выкарыстаннем сродкаў графічнага рэдактара. Праз аб'яднанне фрагментаў некалькіх выяў камічнага зместу даносіцца процілеглае значэнне першакрыніцы ці іншы варыянт развіцця сюжэту (рыс. 2).



*Рыс. 2.* Фотажаба «Джаконда»

*Дэматыватары* таксама носяць парадыйны характар і ўяўляюць сабой малюнак у рамцы (часам і без) з подпісам-каментаром (рыс. 3).

*Комікс* — гісторыя ў карцінках, уключае 2—4 ілюстрацыі гісторыі з характэрным мінімалізмам афармлення і шаблоннымі элементамі (рыс. 4).




*Рыс. 3.* Дэматыватар
«Мэл Гібсан і Ісус»




*Рыс. 4.* Комікс
«Милая, ну не дуйся…»

Запіс інтэрнэт-фальклору — гэта найперш працэс пошуку і капіравання. Інфармант тут пераважна адсутнічае, але абавязкова павінна пазначацца крыніца запісу (электронны адрас сайта, назва чата, суполкі ці старонкі (альбо нік).

## АПЫТАЛЬНІК ПА ЗБОРЫ ПІСЬМОВЫХ ФОРМ СУЧАСНАГА ФАЛЬКЛОРУ

1. Ці вёў хто-небудзь з вашай сям'і (вы, маці, бацька, бабуля) альбом (дэмбельскі, армейскі блакнот, анкеты, гадалкі, песеннікі і пад.)? Як ён называўся? З якой мэтай ён ствараўся? Як выкарыстоўваўся? Што запісвалася ў альбом? Якім чынам ён папаўняўся? Ці мог хто-небудзь іншы пісаць у вашым альбоме?

2. Ці атрымлівалі вы фотаздымкі, лісты, паштоўкі з вершаванымі ўстаўкамі, віншаваннямі і пажаданнямі (ці пісалі самі)? Ці перапісвалі вы такія вершы ў асобны сшытак (альбом, блакнот)?

3. Ці атрымлівалі вы «лісты шчасця» («святыя лісты»)? Што рабілі пасля іх атрымання? Можа ведаеце людзей, якія атрымалі такі ліст? Ці чулі вы гісторыі пра тое, што здарылася з людзьмі, якія верылі (ці не верылі) у іх магічную сілу?

## УЗОРЫ ЗАПІСУ ПІСЬМОВЫХ ФОРМ СУЧАСНАГА ФАЛЬКЛОРУ

**Графіці**

Хутчэй бы дадому
Ну хоць на хвілінку,
Каб чорнага хлеба
Угрызці скарынку.

Женщина-филолог не филолог,
Мужчина-филолог не мужчина.

**Вершык-парашок**
**«Когда Дюймовочка сбежала…»**

когда дюймовочка сбежала
жизнь жабья словно замерла
но тут внезапно залетает
стрела

**Вершык-піражок**
**«На лето задали госдуме…»**

на лето задали госдуме
антиутопии читать
и в сентябре они похоже
вернутся полными идей

**Альбомны верш**
**«Альбом лежит, часы проходят…»**

Альбом лежит, часы проходят,
И я не знаю, что писать.
Одно на ум лишь мне приходит:
Добра и счастья пожелать.
Пусть жизнь тебя ласкает,
Как мать любимое дитя.
Пусть сердце горести не знает,
Не унывай, живи шутя.

**Эпістала**
**«Пишу письмо, а сердце вянет…»**

Пишу письмо, а сердце вянет.
И сердцу очень нелегко.
Письмо уйдет, а я останусь,
Останусь где-то далеко.

**Подпіс да фотаздымка**
**«Я подарила бы тебе горы…»**

Я подарила бы тебе горы,
Но они далеко.
Я подарила бы тебе небо,
Но оно высоко.
Я подарила бы тебе сердце,
Но его не достать.
Я дарю тебе фото,
Чтобы меня вспоминать.

**«Письмо счастья»**

Однажды, читая одну из местных газет, я наткнулась на эту статью [Алесь Достанко. «Письмо счастья» — массовым тиражом]. Каково же было моё удивление, когда Фролова Лилия показала мне такое письмо.

Фролова Лилия Сергеевна (1991 г. р., белоруска, местная, учится в СШ № 13, перешла в 9-й класс) нашла это письмо среди книг. Как и когда оно попало в дом, она не знает.

«Письмо счастья»

Письмо находится в Ливерпуле, оно обошло вокруг света 444 раза. С получением этого письма придёт к вам счастье, но с условием — письмо необходимо послать тому, кому желаете вы счастья. После получения письма к вам придёт счастье. Вы даже не поверите, счастье из параллельных миров. Всё зависит от вас. Жизнь письма началась в 1234 г. В Россию попало в начале XX века. Его

получила бедная крестьянка Урунова и через четыре дня откопала клад, потом вышла замуж за князя Голицына, потом стала миллионершей в Америке. В 1937 г. письмо попало к маршалу Тухачевскому. Он его выбросил и через четыре дня его арестовали, затем расстреляли. В 1921 г. Конан Дойл получил письмо, но не размножил его. Он попал в катастрофу, и ему ампутировали обе руки. Н. С. Хрущеву письмо прислали в 1964 г. на дачу. Он его выбросил, и через четыре дня его свергли. В 1980 г. Алла Пугачёва размножила его и отправила 20 писем, и через четыре недели на её счету было 2 млн долларов. Таких примеров много. Ни в коем случае не рвите письмо, отнеситесь к нему серьезно. Это нить между Вашим настоящим и Вашим будущим. Отправить письмо можно в открытом конверте, лишь бы оно дошло до адресата.

Текст не менять

x — 816 15 — 18<br>
Т — 01x x11 — 42 IX — IIX<br>
Е ЕПТ

Эти знаки принесут Вам счастье. Письмо-счастье делает второй оборот вокруг света за 9 лет. Сейчас оно посетило ваш дом. Отправьте его тем людям, которые в нём нуждаются. Не задерживайте письмо более 98 часов. Только не посылайте денег. Отправьте письмо своим приятелям и ждите сюрприза.

1. Дакте получил письмо и поручил своему секретарю отправить копии и через несколько дней он выиграл 20 000.

2. Девире скончался через несколько дней, как порвал письмо.

3. Дезире получил письмо, но не размножил его и при родах умерла его жена, а родившийся ребенок был болен. Через несколько дней он отправил копии письма и обреченный мальчик выздоровел.

Сделайте 20 писем-копий и обязательно отошлите. Это не шарлатанство. Ждите сюрприза.

# 12. ШМАТНАЦЫЯНАЛЬНЫ ФАЛЬКЛОР БЕЛАРУСІ

Усё напісанае вышэй тычыцца найперш беларускага фальклору. Аднак на тэрыторыі нашай краіны жывуць прадстаўнікі іншых этнічных і нацыянальных меншасцей. Яўрэі, палякі, татары, літоўцы, цыганы існуюць на адной тэрыторыі з беларусамі ўжо не адно стагоддзе, але іх культура (і, адпаведна, фальклор) дагэтуль, на жаль, мала вывучана. Ёсць асобныя працы, прысвечаныя тым ці іншым пытанням, аднак іх колькасць вельмі малая. У 1920-х гг. беларускія вучоныя пачалі сістэматычнае збіранне і вывучэнне яўрэйскага, латышскага і польскага фальклору ў межах працы адпаведных аддзелаў і камісій Інбелкульта. Пасля ўтварэння Беларускай акадэміі навук дадзеныя аддзелы былі рэарганізаваны ў адпаведныя сектары, а пазней — аб’яднаны ў асобны Інстытут нацыянальных меншасцей БелАН (1935 г.). Аднак ужо праз два гады інстытут быў ліквідаваны, а многія супрацоўнікі — рэпрэсаваныя. Архівы сабранага матэрыялу перайшлі ў падпарадкаванне НКУС, нешта захоўвалася ў Гістарычным архіве АН БССР, але большая частка была страчана падчас вайны.

Праблема даследавання фальклору этнічных і нацыянальных меншасцей застаецца актуальнай і сёння. Працы, прысвечаныя яўрэям, літоўцам, цыганам Беларусі, безумоўна, ёсць. Але фальклор у іх амаль не разглядаецца. Мяркуем, што такое становішча выклікана адсутнасцю фактычнага матэрыялу і яго недаступнасцю для вывучэння праз, па-першае, моўны бар’ер (каб збіраць і даследаваць літоўскі ці яўрэйскі фальклор, неабходна валодаць мовай), а па-другое, пэўнай закрытасцю і недаверам да чужога з боку інфармантаў.

Каб хоць трохі змяніць сітуацыю, прапануем вам звяртаць увагу і на фальклор іншых нацыянальнасцей. Асабліва калі вы самі з’яўляецеся іх прадстаўніком ці ў той мясцовасці, дзе вы праходзіце фальклорную практыку, пражываюць прадстаўнікі адпаведных нацыянальных меншасцей.

Арыентавацца вы можаце на апытальнікі для збору беларускага фальклору, але акцэнт неабходна рабіць на нацыянальныя асаблівасці пэўнага абраду ці жанру. Пры гэтым можна трохі расказаць пра беларускія абрады, а пасля запытацца: «А як у вас?». Звяртайце ўвагу на асаблівасці святочнага харчавання, пахавальныя традыцыі, дні памяці, традыцыі сватання, падрыхтоўкі да вяселля, абрады, звязаныя з нараджэннем дзіцяці і яго сталеннем (абрад абразання і пад.), абрадавыя дзеянні для спрыяльнага надвор’я і пад.

**Даведка**
Асноўныя яўрэйскія каляндарныя святы: Пасах, Пурым, Ханука, Ём-Кіпур, Рош-ха-Шана, Шабат. Асноўныя татарскія каляндарныя святы: Курбан-байрам, Ураза-байрам, Кадыр-ноч, Раджаб-байрам, Мяўлюд, Ашура.

**Увага!**
Абавязкова падавайце творы на мове арыгіналу (пажадана з транскрыпцыяй) і пераклад на беларускую (ці рускую) мову.
Зразумела, што гэта патрабуе дадатковых высілкаў пры афармленні справаздачных матэрыялаў, але ў дадзеным выпадку абавязковы мінімум запісаных твораў скарачаецца ўдвая.

# СПІС ЛІТАРАТУРЫ


**Працы супрацоўнікаў філалагічнага факультэта БДУ**

Баладныя песні (балады) : метад. указанні і іл. матэрыял да правядзення фальклор. практыкі студэнтаў І курса філал. фак. / Р. М. Кавалёва [і інш.] ; пад рэд. Р. М. Кавалёвай. Мінск, 2010.

*Кавалёва, Р. М.* Фальклорная няказкавая проза : метад. указанні і іл. матэрыял да правядзення фальклор. практыкі студэнтаў І курса філал. фак. / Р. М. Кавалёва, Т. В. Лук'янава, В. С. Дзянісенка. Мінск, 2012.

Карагодныя песні (карагоды) : метад. указанні і іл. матэрыял да правядзення фальклор. практыкі студэнтаў І курса філал. фак. / склад.: Р. М. Кавалёва, Т. В. Лук'янава ; пад рэд. Р. М. Кавалёвай. Мінск, 2009.

Масленічныя песні : метад. указанні і іл. матэрыял да правядзення фальк. практыкі студэнтаў І курса філал. фак. / аўт.-склад.: Р. М. Кавалёва [і інш.] ; пад рэд. Р. М. Кавалёвай. Мінск, 2008.

Современный городской фольклор : метод. указания и ил. материал по проведению фольклор. практики студентов I курса филол. фак. / сост.: О. В. Приемко [и др.] ; под ред. О. В. Приемко. Минск, 2014.

Пазаабрадавыя песні : метад. указанні і іл. матэрыял да правядзення фальклор. практыкі студэнтаў І курса філал. фак. / склад.: В. В. Прыемка [і інш.] ; пад рэд. Т. А. Марозавай. Мінск, 2010.

**Працы іншых аўтараў**

Адраджэнне традыцыйнай мастацкай культуры Палесся: канцэптуальныя асновы і праграмныя накірункі : зб. арт. Мінск, 1994.

*Аникин, В. П.* Русское устное народное творчество : метод. указания / В. П. Аникин. М., 1981.

Апытальнік для збору матэрыялаў па беларускаму танцавальнаму фальклору / распрац. М. А. Козенка. Мінск, 1998.

Апытальнік для збору матэрыялаў па каляндарнай абраднасці беларусаў / распрац. В. І. Басько. Мінск, 1998.

Апытальнік для збору матэрыялаў па сямейнай абраднасці беларусаў / распрац.: Т. Б. Варфаламеева (Вяселле), Т. І. Кухаронак (Пахаванне), Т. П. Канстанцінава (Радзіны) ; навук. рэд. Т. Б. Варфаламеева. Мінск, 1998.

*Балашов, Д. М.* Как собирать фольклор (руководство по сбору произведений устного народного творчества) / Д. М. Балашов. М., 1971.

*Барташэвіч, Г. А.* Сучасны стан беларускай народнай паэтычнай творчасці / Г. А. Барташэвіч, К. П. Кабашнікаў. Мінск, 1973.

Беларускія традыцыйныя абрады і святкаванні : метад. рэкамендацыі для сярэд. спец. навуч. устаноў. Мінск, 1991.

*Гілевіч, Н. С.* З клопатам пра песні народа / склад. Н. С. Гілевіч. Мінск, 1970.

*Гончарова, А. З.* Русский фольклор Великой Отечественной войны / сост. А. З. Гончарова. Калинин, 1985.

*Гусев, В. Е.* Методика полевых исследований русского фольклора / В. Е. Гусев // Русский фольклор : в 33 т. М. ; Л., 1964—2008. Т. 9 : Проблемы современного народного творчества. 1964. С. 195.

Інструкцыя і метадычныя матэрыялы па збіранні і вывучэнні беларускага фальклору / пад рэд. С. К. Майхровіча. Мінск, 1961.

Інструкцыя па збіранні беларускай народнай вусна-паэтычнай творчасці. Мінск, 1959.

*Кабашнікаў, К. П.* Методыка збірання беларускай народнай вусна-паэтычнай творчасці / К. П. Кабашнікаў. Мінск, 1978.

*Кабашнікаў, К. П.* Месца фальклору ў сучасных славянскіх культурах. Фальклор і нацыянальнае адраджэнне / К. П. Кабашнікаў. Мінск, 1998.

*Казлоўскі, Р. К.* Славянскі фальклор : вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў / Р. К. Казлоўскі, М. У. Мікуліч. Мінск, 1999.

*Каладзінскі, В. В.* Метадычныя ўказанні па правядзенні фальклорнай практыкі студэнтаў першага курса філалагічнага факультэта / В. В. Каладзінскі. Мінск, 1978.

*Криницкая, Н. А.* О методике собирания преданий / Н. А. Криницкая // Русский фольклор : в 33 т. М. ; Л.; 1964—2008. Т. 23 : Полевые исследования. Л., 1985. С. 107—110.

*Круглов, Ю. Г.* Фольклорная практика / Ю. Г. Круглов. 2-е изд. М., 1986.

*Лазутин, С. Г.* Программа и методические рекомендации по проведению учебной практики по фольклору / С. Г. Лазутин. Воронеж, 1979.

Метадычныя ўказанні і ілюстрацыйны матэрыял да правядзення фальклорна-краязнаўчай практыкі студэнтаў І курса філалагічнага факультэта / пад рэд. Р. М. Кавалёвай. Мінск, 1997. Вып. 1 : Каляндарная абраднасць Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці.

Метадычныя ўказанні і ілюстрацыйны матэрыял да правядзення фальклорнай практыкі студэнтаў І курса філалагічнага факультэта / пад рэд. Р. М. Кавалёвай. Мінск, 1997. Вып. 2 : Каляндарна абрадавая паэзія.

Метадычныя ўказанні і ілюстрацыйны матэрыял да правядзення фальклорнай практыкі студэнтаў І курса філалагічнага факультэта / пад рэд. Р. М. Кавалёвай. Мінск, 1998. Вып. 3 : Беларуская вясельная абраднасць.

Метадычныя ўказанні і ілюстрацыйны матэрыял да правядзення фальклорнай практыкі студэнтаў І курса філалагічнага факультэта / пад рэд. Р. М. Кавалёвай. Мінск, 1998. Вып. 4 : Валачобныя песні (серыя «Беларускі фальклор у запісах выкладчыкаў і студэнтаў»).

Метадычныя ўказанні і ілюстрацыйны матэрыял да правядзення фальклорнай практыкі студэнтаў І курса філалагічнага факультэта / пад рэд. Р. М. Кавалёвай. Мінск, 1999. Вып. 5 : Купальская абраднасць.

Методичні рекомендації для збірання фольклорно-єтнографічного матеріалу про українські народні маски. Київ, 1987.

*Морохин, В. Н.* Методика собирания фольклора : учеб. пособие для вузов / В. Н. Морохин. М., 1990.

*Новикова, А. М.* Как записывать фольклор / А. М. Новикова // Русское народное поэтическое творчество : хрестоматия / под ред. А. Л. Новиковой. М., 1971. С. 483—485.

Программа Полесского этнолингвистического атласа / сост.: А. З. Гура, О. А. Терновская, С. М. Толстая // Полесский этнолингвистический сборник. М., 1983. С. 21—47.

*Савушкина, Н. И.* О собирании фольклора : учеб. пособие / Н. И. Савушкина. М., 1974.

*Селиванов, Ф. М.* Студенческая фольклорная практика : учеб.-метод. пособие / Ф. М. Селиванов. М., 1982.

*Фядосік, А. С.* Ілюзорнасць і сапраўднасць / А. С. Фядосік. Мінск, 1991.

*Чистов, К. В.* Современное народное творчество, его собирание и изучение / К. В. Чистов. М., 1963.

# ЗМЕСТ

**Слова да практыкантаў** ... 3

**Крытэрыі ацэнкі справаздачы студэнта па фальклорнай практыцы** ... 5

**Парады па афармленні фальклорных матэрыялаў** ... 7

**Патрабаванні да запісу фальклорных матэрыялаў** ... 15

**Праграма-апытальнік** ... 16

1. Фальклорная проза ... 16
   1.1. Фальклорная няказкавая проза ... 16
   1.2. Фальклорная казкавая проза ... 86
2. Малыя жанры беларускага фальклору ... 90
3. Рытуальна-магічная сфера фальклору ... 93
   3.1. Замовы ... 93
   3.2. Каляндарна-абрадавыя песні ... 96
   3.3. Сямейна-абрадавыя песні ... 119
4. Карагодныя песні ... 132
5. Баладныя песні (балады) ... 149
6. Духоўныя вершы, канты і псальмы ... 159
7. Пазаабрадавая лірыка ... 163
8. Жорсткі раманс ... 171
9. Дзіцячы фальклор ... 173
10. Народна-драматычнае мастацтва ... 177
11. Сучасны фальклор: гарадскі і вясковы ... 178
    11.1. Вусныя формы ... 178
    11.2. Пісьмовыя формы ... 186
12. Шматнацыянальны фальклор Беларусі ... 194

**Спіс літаратуры** ... 196

Вучэбнае выданне

**Кавалёва** Рыма Мадэстаўна
**Прыемка** Вольга Віктараўна
**Марозава** Таццяна Анатольеўна і інш.

**ФАЛЬКЛОРНАЯ ПРАКТЫКА:
МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ
І ПРАГРАМА-АПЫТАЛЬНІК**

**Вучэбна-метадычны дапаможнік**

3-е выданне,
дапрацаванае і дапоўненае

Рэдактар *А. В. Яфімаў*
Мастак вокладкі *Т. Ю. Таран*
Тэхнічны рэдактар *В. П. Явуз*
Камп’ютарная вёрстка *Д. А. Бабенка*
Карэктар *А. І. Данілава*

Падпісана да друку 30.06.2021. Фармат 60×84/16. Папера афсетная.
Лічбавы друк. Ум. друк. арк. 11,62. Ул.-выд. арк. 12,1.
Тыраж 45 экз. Заказ 275.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальнік друкаваных выданняў № 1/270 ад 03.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 4, 220030, Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.